БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

# ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ:
## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

## ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ

МІНСК
БДУ
2025

УДК 34:378.4(476-25)096(091)
ББК 67р31(4Беи)г
Ю-84

Рэдакцыйны савет:
дацэнт *А. В. Шыдлоўскі* (старш.), прафесар *С. А. Балашэнка*,
прафесар *В. М. Бібіла*, прафесар *Р. А. Васілевіч*,
дацэнт *Л. Л. Голубева*, прафесар *І. А. Грунтоў*,
прафесар *Т. І. Доўнар*, дацэнт *С. А. Калінін*,
прафесар *В. С. Камянкоў*, прафесар *В. І. Чупрыс*

Рэдакцыйная калегія:
дацэнт *А. В. Шыдлоўскі* (гал. рэд.),
дацэнт *Л. Л. Голубева* (нам. гал. рэд.),
прафесар *Н. А. Антановіч*, прафесар *Н. Л. Бандарэнка*,
прафесар *Р. А. Васілевіч*, прафесар *А. А. Данілевіч*,
прафесар *Т. І. Макарава*, дацэнт *В. С. Міхайлоўскі*,
дацэнт *М. В. Мяшчанава*, дацэнт *В. М. Раманава*,
прафесар *А. Л. Савенок*, дацэнт *А. А. Свадкоўская*,
*В. П. Сухапараў*, прафесар *В. Б. Шабанаў*

**Юрыдычны** факультэт: гісторыя і сучаснасць : да 100-годдзя з дня заснавання / рэдсавет: А. В. Шыдлоўскі (старш.) [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Шыдлоўскі (гал. рэд.), Л. Л. Голубева (нам. гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2025. – 335 с. : іл.
Ю-84
ISBN 978-985-881-827-2.

Змешчана інфармацыя аб зараджэнні, станаўленні і развіцці ўніверсітэцкай юрыдычнай адукацыі і навукі ў Беларусі, удзеле выкладчыкаў, студэнтаў і выпускнікоў Мінскага юрыдычнага інстытута ў ваенных аперацыях Вялікай Айчыннай вайны, асаблівасцях студэнцкага жыцця, аб вучоных – выкладчыках факультэта і напрамках іх навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці, а таксама славутых выпускніках альма-матар.

**УДК 34:378.4(476-25)096(091)**
**ББК 67р31(4Беи)г**

**ISBN 978-985-881-827-2**

© БДУ, 2025

## Паважаныя калегі,
## прадстаўнікі юрыдычнай супольнасці!
## Дарагія студэнты!



Прыміце ад мяне асабіста і ад усяго калектыву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта самыя шчырыя віншаванні з нагоды 100-гадовага юбілею юрыдычнага факультэта.

Юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта як самастойнае падраздзяленне (факультэт права і гаспадаркі) быў заснаваны 26 жніўня 1925 г. Яго адкрыццё стала пачаткам цэлай эпохі ў гісторыі юрыдычнай навукі і вышэйшай юрыдычнай адукацыі ў краіне.

Юрыдычны факультэт з'яўляецца неад'емнай часткай гісторыі ўніверсітэта, уносіць значны ўклад у развіццё айчыннай і сусветнай навукі, нацыянальнай прававой сістэмы, у адукацыю, выхаванне і падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў – сапраўдных патрыётаў Беларусі.

Універсітэт ганарыцца яркімі старонкамі біяграфіі факультэта, імёнамі тых, хто некалі стаяў ля вытокаў яго стварэння, і тых, хто забяспечвае яго аўтарытэт і запатрабаванасць сёння. Вялікая ўдзячнасць ветэранам факультэта, якія заклалі асновы і традыцыі калектыву, перадалі свой вопыт і найлепшыя традыцыі маладому пакаленню, паказалі дастойны прыклад адданасці нашай Радзіме.

За 100 гадоў факультэт даў пуцёўку ў жыццё тысячам выпускнікоў, якія ўнеслі бясцэнны ўклад у развіццё нацыянальнай юрыспрудэнцыі. Многія з іх сёння займаюць кіруючыя пасады ў органах заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, праваахоўных органах, у адвакатуры, ва ўстановах адукацыі і навукі, у сістэме народнай гаспадаркі і інш.

У нашы дні юрыдычны факультэт з'яўляецца сучасным адукацыйным цэнтрам, дзе побач з класічным наборам юрыдычных спецыяльнасцей у навучанне і навуку актыўна ўкараняюцца інавацыі. Высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі састаў рэалізуе перадавыя ідэі і новыя тэхналогіі на стыку міждысцыплінарных ведаў і крэатыўных методык. Гэта дазваляе ствараць эфектыўныя формы працы са студэнтамі. Платформы па правядзенні віртуальных расследаванняў, мадэляванне судовых працэсаў, інтэрактыўныя падыходы да трактоўкі заканадаўчай базы ствараюць імідж і аўтарытэт юрыдычнай адукацыі не толькі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, але і ў краіне.

Жадаю прафесарска-выкладчыцкаму саставу факультэта далейшай плённай педагагічнай і навуковай дзейнасці, інавацыйных ідэй і паспяховай іх рэалізацыі! Студэнтам – асабістых перамог, унікальных унутраных пошукаў і адкрыцця жыццёвых сэнсаў! Юрыдычнаму факультэту – далейшых гістарычных і памятных здзяйсненняў, новых дасягненняў і росквіту!

*Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*Андрэй Дзмітрыевіч Кароль*

**Паважаныя выкладчыкі, выпускнікі!**
**Дарагія студэнты!**



Юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, наша альма-матар, у кастрычніку 2025 г. адзначае юбілей – 100-годдзе з дня заснавання. Разам з гэтай датай мы падводзім вынікі важнага этапу ў развіцці беларускай юрыдычнай навукі і адукацыі.

За векавы перыяд альма-матар прайшла вялікі і значны шлях. Наша юрыдычная школа мела розныя назвы і арганізацыйна-прававыя формы дзейнасці: факультэт права і гаспадаркі (1925), факультэт савецкага будаўніцтва і права (1930), Інстытут савецкага будаўніцтва і права (1931), Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут (1932), Мінскі юрыдычны інстытут (1938), юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1954). Аднак заўсёды галоўным кірункам дзейнасці юрыдычнай школы з'яўляюцца падрыхтоўка высокакваліфікаваных юрыстаў і выхаванне дастойных грамадзян нашай Айчыны.

Юбілей юрыдычнага факультэта дазваляе нам успомніць важныя вехі і яскравыя старонкі яго гісторыі, і перш за ўсё людзей, якія стваралі факультэт, а таксама працавалі і вучыліся на ім у розныя гады. Заснавальнікамі многіх навуковых юрыдычных школ былі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны – прафесары «вогненнага» выпуску, прадстаўнікі пакалення Пераможцаў. Слаўныя традыцыі факультэта захоўваюцца і сёння.

За ўсю гісторыю існавання юрыдычны факультэт выпусціў больш за 35 000 юрыстаў. Сярод іх вядомыя вучоныя, прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады, юрысты-практыкі, а таксама 84 заслужаныя юрысты Беларусі (БССР, Рэспублікі Беларусь), 3 заслужаныя дзеячы навукі Рэспублікі Беларусь, 3 заслужаныя работнікі адукацыі Рэспублікі Беларусь і 5 членаў-карэспандэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Сёння на факультэце вышэйшую адукацыю атрымліваюць каля 3000 навучэнцаў. Паспяхова абараняюцца кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

Юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – гэта флагман айчыннай юрыдычнай навукі, калыска юрыдычных ведаў і класічнай універсітэцкай юрыдычнай адукацыі. Сапраўдны гонар факультэта – адораныя студэнты, вопытныя выкладчыкі і найлепшыя выпускнікі!

Шчырая павага і ўдзячнасць усім тым, хто звязаны з факультэтам! Сваёй працай, рыхтуючы новае пакаленне юрыстаў, мы ствараем будучае Беларусі, выхоўваем сапраўдных патрыётаў краіны!

Віншую вас, дарагія сябры! Жадаю калектыву юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і ўсім яго выпускнікам і студэнтам развіцця і росквіту, новых творчых поспехаў і перамог, прафесійнага даўгалецця і ўдачы!

Са святам, родны факультэт! З юбілеем, юрфак!

*Дэкан юрыдычнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*Андрэй Віктаравіч Шыдлоўскі*



# ЗАРАДЖЭННЕ І СТАНАЎЛЕННЕ ЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ І НАВУКІ Ў БЕЛАРУСІ*

Існаванне дзяржавы і грамадства, патрэбы заканатворчай і правапрымяняльнай дзейнасці заўсёды абумоўлівалі навуковае развіццё ў галіне права.

Беларуская юрыдычная адукацыя і навука маюць глыбокія карані. Яны арганічна спалучаны з дзяржаўнай арганізацыяй грамадства і адначасова з'яўляюцца як прадуктам развіцця грамадства, так і адным з вызначальных фактараў яго належнага будаўніцтва. Вытокі знаходзяцца ў далёкай старажытнасці і звязаны з узнікненнем дзяржавы і пісьменства на тэрыторыі Беларусі.

Пазней, калі старажытныя беларускія землі сталі палітыка-эканамічным цэнтрам буйной феадальнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), – узнікла і рэалізавалася неабходнасць ва ўдасканаленні заканадаўства і прафесіянальных юрыстах. Асабліва гэта тэндэнцыя праявілася ў XVI ст., калі ў дзяржаве былі праведзены кадыфікацыя заканадаўства і шэраг дзяржаўных рэформ: зямельная, адміністрацыйна-тэрытарыяльная, судовая, адукацыйная і інш.

Развіццю права садзейнічала палітыка-прававая думка, якая паслужыла тэарэтыка-ідэалагічным фундаментам для ўзнікнення новай, больш прагрэсіўнай грамадскай правасвядомасці. У XVI ст. шэраг знакамітых мысліцеляў (С. Будны, А. Валовіч, А. Волан, М. Літвін, Л. Сапега, Ф. Скарына, М. Радзівіл Чорны і інш.) на падставе папярэдніх навуковых напрацовак даследавалі праблемы дзяржавы і права, прапаноўвалі шляхі іх удасканалення. Усе яны ў той ці іншай ступені былі прыхільнікамі тэорыі натуральнага права. Так, у творах Ф. Скарыны, які з'яўляўся адным з пачынальнікаў беларускай прававой навукі і заснавальнікам кнігадрукавання, выказваліся думкі пра ролю народа ў гістарычным працэсе і праватворчасці, народны суверэнітэт, справядлівасць закона, яго адпаведнасць мясцовым звычаям і накіраванасць на карысць усяго народа. Ён падзяляў права на натуральнае (уласціва кожнаму чалавеку ў роўнай ступені ад нараджэння і не залежыць ад звычаяў, часу і месца) і пісанае (у ім вылучаў боскае, царкоўнае (кананічнае) і земскае права).

Ідэі Ф. Скарыны выявіліся ў Статуце 1529 г., у падрыхтоўцы якога ён прымаў удзел, і аказалі значны ўплыў на далейшае развіццё палітыка-прававой думкі беларускага народа.

---

* Аўтары: А. В. Шыдлоўскі, С. А. Балашэнка, Т. І. Доўнар і Л. Л. Голубева.

Актывізацыя навуковай дзейнасці была выклікана практычнымі патрэбамі заканатворчасці, што і знайшло адлюстраванне ў правядзенні на працягу XVI ст. некалькіх агульных кадыфікацый заканадаўства. Сапраўдным дасягненнем у праватворчасці было стварэнне ў ВКЛ статутаў 1529, 1566, 1588 гг. – першых такога ўзроўню зводаў законаў, заснаваных на мясцовым звычаёвым праве, традыцыях народа і напісаных на старажытнай беларускай мове. Менавіта гэта мела важнае значэнне, бо ў той час большасць краін карысталіся рымскім правам і лацінскай мовай. Сістэматызацыя заканадаўства патрабавала перапрацоўкі вялікай колькасці назапашанага ў дзяржаве нарматыўнага прававога матэрыялу, што павялічвала каштоўнасць нацыянальнага права і пашырала сферу дзеючай юрыспрудэнцыі.

З увядзеннем у дзеянне Статута 1529 г. узнікла яшчэ большая патрэба ў тэарэтычным асэнсаванні вынікаў правапрымянення, у выпрацоўцы новых тэарэтычных ідэй і прававых тэорый. Гэты працэс знайшоў адлюстраванне ў шматлікіх навуковых працах беларускіх мысліцеляў, асветнікаў і правазнаўцаў. У XVI ст. у Беларусі сфарміравалася кола дзеячаў, якія імкнуліся аб'яднаць тэорыю юрыдычнай навукі з практыкай. Менавіта ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі было шмат айчынных мысліцеляў, якія і распрацоўвалі новую прававую тэорыю, маючы галоўнай мэтай удасканаленне існуючых грамадскіх адносін.

У выніку актывізацыі ў Беларусі рэнесансных і гуманістычных тэндэнцый адбылося ўзмацненне свецкай інтэрпрэтацыі палітыка-прававых інстытутаў, у тым ліку і свецкай трактоўкі натуральнага права, што знайшло адлюстраванне ў навуковых працах А. Волана, Аарона (Адама, Аляксандра) Алізароўскага і іншых мысліцеляў. Напрыклад, толькі А. Воланам было напісана каля 30 навуковых прац палітыка-прававога, паленіка-тэалагічнага і этычнага характару, у тым ліку «Пра палітычную або грамадзянскую свабоду» (1572), «Прадмова да сената…» (1572), «Пра шчаслівае жыццё, або найвышэйшае чалавечае дабро» (1596), «Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці» (1608). Дзяржаву, права і іншыя сацыяльна-палітычныя інстытуты А. Волан разглядаў як вынік чалавечай дзейнасці, аб'екты ўвасаблення рацыянальных пошукаў і мудрасці людзей. Ён адзначаў, што імкненне да свабоды з'яўляецца важнейшай натуральнай уласцівасцю чалавека, абараняць якую і прызначана права. У натуральна-прававой дактрыне А. Волана вылучаліся тры найважнейшыя элементы права: яно павінна быць справядлівым, разумным і абараняць (быць гарантам) свабоду і роўнасць людзей. У працы «Пра палітычную або грамадзянскую свабоду» А. Волан падкрэсліваў, што ніякая грамадская супольнасць, ніякі мір і спакой паміж людзьмі не могуць існаваць без законаў, а «дабрадзейства свабоды» залежыць ад правільнага і ўпарадкаванага заканадаўства.

А. Алізароўскі ў працы «Аб палітычнай супольнасці людзей» (1651) прапанаваў наступную класіфікацыю права: боскае, натуральнае і права народаў. Пры гэтым боскае і натуральнае права выступаюць як самастойныя віды і дапаўняюць адзін аднаго. А. Алізароўскі аб прызначэнні боскага права пісаў: «Боскае права забараняе несправядлівасць, прыгнечанне бедных і ўсялякія крыўды». Ён пераважна аналізаваў натуральнае права і адзначаў, што прырода заклала яго ў чалавеку як сацыяльнай і біялагічнай істоце. У сацыяльным аспекце прынцыпы натуральнага права выяўляюцца праз развіццё і ўдасканаленне сацыяльнай арганізацыі жыцця людзей.

Значны ўклад у развіццё прававой навукі ўнеслі такія прадстаўнікі рэфармацыйнага руху ў Беларусі, як С. Будны, П. Гезка, Л. Крышкоўскі, М. Чаховіц,

В. Цяпінскі-Амельяновіч. Яны непасрэдна займаліся праблемамі прававога рэгулявання грамадскіх адносін, праваразумення, крыніц права і інш.

На працягу XVI ст. многія беларускія мысліцелі і дзяржаўныя дзеячы выпрацоўвалі новыя тэарэтычныя палажэнні і прапановы па ўдасканаленні заканадаўства. Важным кірункам іх дзейнасці быў удзел у падрыхтоўцы асобных нарматыўных прававых актаў і кадыфікаванага заканадаўства. У гэтым плане асаблівае значэнне мела тэарэтычная і практычная дзейнасць А. Валовіча і М. Радзівіла Чорнага па падрыхтоўцы і рэдагаванні Статута 1566 г., а таксама А. Валовіча і Л. Сапегі па падрыхтоўцы Статута 1588 г. – сапраўднай канстытуцыі дзяржавы, якая замацавала суверэнітэт ВКЛ насуперак Люблінскай уніі. Акрамя таго, Л. Сапега быў адным з ініцыятараў стварэння ў 1581 г. Галоўнага суда (Трыбунала) дзяржавы – вышэйшай судовай апеляцыйнай інстанцыі, а таксама аўтарам выдадзенага ў 1616 г. працэсуальнага кодэкса «Спосаб разгляду спраў у Трыбунале». Л. Сапега выступаў прыхільнікам абмежаванай манархіі, што павінна грунтавацца на вяршэнстве закона, які, у сваю чаргу, на думку асветніка, павінен быць аднолькавым і абавязковым для ўсіх саслоўяў, а разам з гэтым павінен быць накіраваным супраць асобных правапарушальнікаў. Калі ў грамадстве адсутнічае павага да права, пануе беззаконнасць, яно не можа лічыцца чалавечым і справядлівым, а з'яўляецца «воўчай зграяй». Права Л. Сапега разглядаў як сапраўднае праяўленне розуму чалавека, якое павінна забяспечыць дзяржаве ўнутраны парадак, стабільнае і ўстойлівае развіццё і сацыяльны мір. Жыццё ў адпаведнасці з законамі – абавязковая ўмова існавання дзяржавы. Толькі павага да права дае магчымасць быць сапраўды свабоднымі. Кожны чалавек павінен ведаць межы сваёй свабоды, а для гэтага неабходна вывучаць законы. Асноўнае прызначэнне права, на думку Л. Сапегі, заключалася ў гарантаванасці свабоды, прыватнай уласнасці і асабістай бяспекі чалавека, што і з'яўляецца фундаментам грамадскага дабрабыту. Ён лічыў, што дзяржава паўстала натуральным шляхам і прызначаецца для дасягнення магчымага лепшага жыцця. Яна заснавана на прынцыпах унутранага адзінства, цэнтралізму, правапарадку і законнасці. Асветнік выступаў за юрыдычную адукацыю народа і менавіта з гэтай мэтай на свае сродкі ажыццявіў тыпаграфскае выданне Статута 1588 г.

Рост цікавасці да права і прававой адукацыі актывізаваў кнігадрукаванне і выданне спецыяльнай юрыдычнай літаратуры. У ВКЛ у XVI ст. было надрукавана 16 юрыдычных кніг. Гэтым спосабам выдаваліся і заканадаўчыя акты (напрыклад, Статут 1588 г., Закон аб Галоўным судзе (Трыбунале ВКЛ) 1581 г. і інш.). Усяго ў XVI ст. было выдадзена каля 500 кніг на лацінскай, беларускай і іншых мовах, а ў XVII ст. іх колькасць павялічылася ў шмат разоў (паводле некаторых звестак – да 5 тыс.).

Пашырэнне ў XVI ст. сферы прававога рэгулявання і рэформа судовай сістэмы, у выніку якой былі створаны выбарныя, аддзеленыя ад выканаўчай улады суды для шляхецкага саслоўя, павялічвалі патрэбу ў прафесійных юрыстах. Пачаў фарміравацца і інстытут прафесійнай адвакатуры, што знайшло адлюстраванне ў заканадаўстве. Так, калі Статут 1529 г. уключаў толькі адзін артыкул адносна адвакацкай дзейнасці, то Статут 1588 г. ужо даволі падрабязна рэгламентаваў правы і абавязкі адвакатаў, адзначаючы, што ўдовам, сіротам і бедным людзям адвакаты павінны прызначацца бясплатна.



Першая старонка Статута ВКЛ 1529 г.



СТАТУТ ВЕЛИКОГО КНЯЗСТВА ЛИТОВСКОГО

Ѡ наяснейшего г(о)с(по)д(а)ря короля его м(и)л(о)сти
Жикгимонта третего на коронацыи
в Кракове выданы року
а. ф. пи.

Смотрите што маете чинити. Бо не справуете суду человеческого але суду Божего. А што кольвек будете судити, на вас ся то вбалити. Нехай будет боязнь Господня з вами. А справуйте все с пилностью, бо нет у Бога Господа нашего неправости, ани врахованья особ, ани прагненья даров.

Книги втор. паралип. глава

Милуйте справедливость, которые судите землю.
Хто любит неправду, тот ненавидит души своее.
Правом судите сынове человечестии.

З ласки и з привилеем короля его м(и)л(о)сти.
В Вильни. Друковано в дому Мамоничов.

Тытульны ліст Статута ВКЛ 1588 г.

Падрыхтоўка юрыдычных кадраў ішла рознымі шляхамі. Частку юрыстаў рыхтавалі заходнееўрапейскія ўніверсітэты, дзе з сярэдзіны XV ст. павялічылася колькасць кафедр рымскага права. Першай спецыяльнай юрыдычнай навучальнай установай у ВКЛ стала Святаянская школа грамадзянскага права, створаная ў Вільні ў 1566 г. Веды ў галіне права можна было атрымаць і ў кальвінісцкіх і арыянскіх школах, якія існавалі ў Беларусі ў перыяд Рэфармацыі. У прыватнасці, права выкладалі ў Слуцкім кальвінісцкім вучылішчы і арыянскіх школах у Іўі, Клецку, Койданаве, Любчы, Лоску, Нясвіжы, Навагрудку і інш. Аднак гэтыя цэнтры падрыхтоўкі юрыстаў не маглі поўнасцю задаволіць патрэбу ў кадрах, і таму значная колькасць рыхтавалася ў прыватных школах («палестрах»), набывалі прававыя веды ў вопытных юрыстаў-практыкаў.

У XVI ст. на землях Беларусі існавала шмат навучальных устаноў, першай з якіх стала Віленская езуіцкая акадэмія (1579). Паступова ўзнікалі езуіцкія калегіумы (сярэднія навучальныя ўстановы) у Полацку (1580), Нясвіжы (1587), Оршы (1616), Брэсце (1616), Хойніках (1622), Гродне (1625), Пінску (1638), Навагрудку (1644), Віцебску (1649), Мінску (1672). Па сваёй структуры і вучэбнай праграме яны з'яўляліся свецкімі школамі, у якіх можна было атрымаць і пэўныя прававыя веды.

Перш за ўсё веды ў галіне права давала найстарэйшая вышэйшая навучальная ўстанова – Віленская езуіцкая акадэмія, што ў 1570 г. была заснавана ў ВКЛ як калегіум. У 1578 г. кароль Стэфан Баторый выдаў прывілей (зацверджаны 30 кастрычніка 1579 г. булай Папы Грыгорыя XIII), на падставе якога калегіум быў пераўтвораны ў акадэмію, што давала права прысвойваць вучоныя ступені, мець выбарную адміністрацыю і правы ўласнай юрысдыкцыі. Першым рэктарам акадэміі стаў галоўны ідэолаг Контррэфармацыі, знакаміты мысліцель П. Скарга. Акадэмія мела філасофскі і тэалагічны факультэты. На філасофскім факультэце выкладаліся ўсе гуманітарныя і прыродазнаўчыя навукі таго часу: фізіка, метафізіка, матэматыка, логіка, рыторыка, паэтыка, геаграфія, старажытныя (грэчаская, лацінская, яўрэйская) і новыя (нямецкая, французская) мовы; на тэалагічным – Свяшчэннае Пісанне, тэалогія (палемічная, маральная, схаластычная), казуістыка і кананічнае права. Студэнты абодвух факультэтаў вывучалі беларускую мову.

Матэрыяльную падтрымку акадэміі аказвалі каталіцкая царква і мясцовыя феадалы. Сын Л. Сапегі – К.-Л. Сапега – садзейнічаў адкрыццю ў 1641 г. у Віленскай езуіцкай акадэміі юрыдычнага факультэта, перадаў акадэміі каштоўную бібліятэку свайго бацькі і ахвяраваў факультэту на ўтрыманне прафесараў 12 500 польскіх злотых. Ён запрасіў на працу чатырох прафесараў-правазнаўцаў: двух немцаў – прафесара цывільнага права С. Дзільгера і прафесара кананічнага права І. Шаўэра, іспанца – прафесара цывільнага права Б. Сокcо – і ўраджэнца Віцебшчыны – А. Алізароўскага, які меў дзве ступені: доктара цывільнага права і доктара кананічнага права.



Казімір Леў Сапега

Пазней юрыдычны факультэт уваходзіў у склад Галоўнай школы ВКЛ (1773), Галоўнай Віленскай школы (1796) і Віленскага ўніверсітэта (1803). Акадэмія мела права прысвойваць вучоныя ступені. Паводле прыблізных падлікаў,

з 1583 па 1781 г. акадэмія прысвоіла сваім выпускнікам 4076 навуковых ступеней, у тым ліку 3510 – па філасофіі, 417 – па тэалогіі і 149 – па праве. Сярод найбольш вядомых выпускнікоў акадэміі можна назваць М. Сматрыцкага, С. Полацкага, М. Сарбеўскага, А. Каяловіча.

Для перыяду знаходжання беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай характэрны пэўныя дасягненні ў прававым развіцці. Напрыклад, у канцы XVIII ст. было распрацавана шмат нарматыўных актаў больш значнай якасці і прагрэсіўнага зместу, у тым ліку законаў несумненнага канстытуцыйнага характару. Шмат зрабіла ў галіне адукацыі і навукі заснаваная ў 1770-я гг. Адукацыйная камісія Рэчы Паспалітай (правобраз міністэрства адукацыі). У яе склад уваходзілі такія знакамітыя навукоўцы і палітычныя дзеячы, як І. Храптовіч, Т. Патоцкі, М. Пачобут-Адляніцкі, Г. Калантай, Я. Снядэцкі. Адукацыйная камісія правяла рэформу Віленскага ўніверсітэта, пераўтварыўшы яго з духоўнай установы ў свецкую. Яна распрацавала новыя праграмы навучання ў духу ідэй асветніцтва і гуманізму. Заслугай камісіі з'яўляецца выданне васьмі тамоў «Валюміна легум» – храналагічнага збору законаў, соймавых пастаноў і іншых нарматыўных актаў, якія дзейнічалі з 1347 па 1795 г.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі павялічылася цікавасць да гісторыі беларускага народа. Навукоўцы пачалі актыўна вывучаць станаўленне і развіццё інстытутаў дзяржавы і права Беларусі, друкаваць кнігі і дакументальна-прававы матэрыял. У 1803 г. Галоўная Віленская школа была рэарганізавана ва ўніверсітэт з чатырма факультэтамі: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычным, медыцынскім, літаратурным і вольных мастацтваў. У ім выкладалі 34 прафесары і 12 ад'юнктаў (памочнікаў прафесараў). Вучоныя даследавалі прававыя і гісторыка-прававыя праблемы, аб чым сведчаць працы І. Анацэвіча, М. Баброўскага, І. Даніловіча, І. Лялевеля, Т. Чацкага, Ю. Ярашэвіча. У апошнія гады існавання ўніверсітэта з 47 прафесараў 36 былі ўраджэнцамі беларускіх зямель. З яго сцен выйшлі такія вядомыя вучоныя, грамадскія дзеячы і пісьменнікі, як Ю. Славацкі, Ю. Крашэўскі, І. Даніловіч, І. Дамейка і інш. У 1832 г. па загадзе расійскага імператара Мікалая I універсітэт быў закрыты. Найбольш вядомымі выпускнікамі, якія займаліся даследаваннем гісторыка-прававой спадчыны беларускага народа, былі Ю. Славацкі, Ю. Крашэўскі, І. Даніловіч, І. Дамейка.

На базе Полацкага езуіцкага калегіума 29 мая (10 чэрвеня) 1812 г. была адкрыта Полацкая акадэмія – вышэйшая навучальная ўстанова, якой былі нададзены правы ўніверсітэта. Яна мела тры факультэты: філасофскі і тэалагічны, вольных навук, старажытных і сучасных моў. Сярод 39 выкладчыкаў былі і ўраджэнцы Беларусі – прафесары В. Бучынскі, Н. Гаўрылевіч і інш. Фармальна навучанне было пазаканфесійным, пазасаслоўным і бясплатным. Колькасць студэнтаў дасягала 7 тыс. чалавек. Акадэмія мела права прысвойваць навуковыя ступені магістраў вольных навук і філасофіі, дактароў тэалогіі, грамадзянскага і кананічнага права. Выкладанне вялося па ўласных падручніках, якія выдаваліся ў полацкай друкарні пры акадэміі. У 1820 г. акадэмія была закрыта, а частка студэнтаў пераведзена ў Пецярбургскі ўніверсітэт.

Пасля закрыцця Полацкай акадэміі, а затым Віленскага ўніверсітэта навуковыя даследаванні права ў Беларусі былі прыпынены. Юрыдычныя праблемы, у тым ліку прававой гісторыі Беларусі, з гэтага часу даследаваліся ва ўніверсітэтах Пецярбурга і Масквы. Многія беларусы ў гэты час атрымлівалі

вышэйшую адукацыю ў расійскіх універсітэтах і ўнеслі значны ўклад у развіццё як расійскай, так і беларускай прававой навукі (напрыклад, знакамітыя вучоныя У. Д. Спасовіч і Л. І. Петражыцкі).

Даследчыкі ўказанага перыяду, сярод якіх было нямала беларусаў, у сваіх навуковых працах закраналі шматлікія тэарэтыка-прававыя і гісторыка-прававыя праблемы, у тым ліку давалі характарыстыку папярэдніх прававых набыткаў, аналізавалі гістарычнае развіццё асобных галін і інстытутаў права, вышэйшых і мясцовых органаў улады і кіравання, звярталі ўвагу на дзейнасць сойма, павятовых соймікаў ВКЛ і інш. Творы гэтых навукоўцаў сталі значнай прыступкай у фарміраванні айчыннай прававой і гісторыка-прававой навукі. Так, праблемы права ў пачатку XIX ст. распрацоўвалі ўраджэнцы Беларусі І. Даніловіч, Т. Нарбут, Ю. Ярашэвіч і інш. Асаблівая заслуга ў даследаванні прававой гісторыі Беларусі належыць І. Даніловічу, які з верасня 1814 г. пачаў выкладаць у Віленскім універсітэце мясцовае (па сутнасці беларускае) права. Ён знайшоў і надрукаваў шэраг помнікаў права: Судзебнік Казіміра 1468 г., летапіс «Хроніка Быхаўца», Статут 1529 г. У 1821 г. І. Даніловіч быў запрошаны на працу ў кадыфікацыйную камісію М. Сперанскага з мэтай падрыхтоўкі Зводу законаў заходніх губерняў, які меркавалі ўключыць у Звод законаў Расійскай імперыі. Звод законаў заходніх губерняў быў падрыхтаваны ў пачатку 1830-х гг., аднак не быў уведзены ў дзеянне. З 1839 г. І. Даніловіч пачаў працаваць у Маскоўскім універсітэце.

Паступова многія беларускія дзеячы і пісьменнікі (браты І. і А. Луцкевічы, А. С. Пашкевіч (Цётка), В. У. Ластоўскі, А. І. Цвікевіч, Янка Купала, Якуб Колас, З. Х. Жылуновіч (Цішка Гартны) і інш.) усё больш акцэнтавалі ўвагу на самабытнасці беларускага народа і яго гістарычна абумоўленым імкненні да самастойнасці і самавызначэння. М. В. Доўнар-Запольскі ў даследаванні «Беларускае мінулае» (1888) упершыню стварыў асноўнае ядро канцэпцыі гістарычнага развіцця беларускага народа і паставіў праблему неабходнасці нацыянальнага адраджэння Беларусі.

У пачатку XX ст. з’явіўся шэраг публікацый, прысвечаных ідэі аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Так, прафесар М. В. Доўнар-Запольскі ў працы «Асновы дзяржаўнасці Беларусі» (1919) абгрунтаваў, што беларусы з далёкай старажытнасці мелі сваю дзяржаўнасць і маюць права на яе аднаўленне. Увогуле гэты навуковец адыграў значную ролю ў развіцці айчыннай гісторыка-прававой навукі. Вынікам рэвалюцыйнага руху стала ўтварэнне 1 студзеня 1919 г. Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР).



# ВЕКАВАЯ ГІСТОРЫЯ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

## СТАНАЎЛЕННЕ ЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ДАВАЕННЫ ЧАС[*]

Узнаўленне развіцця беларускай юрыдычнай адукацыі і навукі непасрэдна звязана з адкрыццём у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ), які, згодна з пастановай Прэзідыума Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) Саветаў Беларусі аб адкрыцці ў Мінску Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, складаўся з пяці факультэтаў: рабочага, грамадскіх навук, медыцынскага, сельска-гаспадарчага і фізіка-матэматычнага[1].

Загад аб прызначэнні рэктарам БДУ У. І. Пічэты быў выдадзены 8 чэрвеня 1921 г. Згодна з загадам № 39 ад 8 ліпеня 1921 г. аб прызначэнні Праўлення БДУ у яго склад уваходзілі прафесары У. І. Пічэта, У. М. Ігнатоўскі, М. Я. Фрумкіна, Ф. Ф. Турук. Старшынёй Праўлення быў прафесар У. І. Пічэта. Зацвярджаўся склад факультэтаў: рабочы факультэт, факультэт грамадскіх навук (праўавое аддзяленне з судовым і адміністратыўным цыкламі, а таксама эканамічнае аддзяленне), этнолага-лінгвістычны, фізіка-матэматычны, сельска-гаспадарчы і медыцынскі факультэты. Самым буйным і шматпрофільным быў факультэт грамадскіх навук (739 студэнтаў).

У сувязі з утварэннем універсітэта Народны камісарыят адукацыі РСФСР накіраваў у БССР групу вучоных. Значны ўклад у развіццё прававой навукі ў гэты перыяд унёс першы рэктар БДУ У. І. Пічэта, які кіраваў даследаваннямі і распрацоўваў шматлікія праблемы гісторыі Беларусі. Першымі выкладчыкамі на прававым аддзяленні былі Г. С. Гурвіч (савецкае дзяржаўнае права), У. М. Дурдзянеўскі (дзяржаўнае права буржуазных краін), М. Б. Кроль (судовая псіхіятрыя), І. Т. Цітоў (судовая медыцына), М. В. Грэдзінгер (грамадзянскае права і працэс), Б. В. Чрэдзін (рымскае права), Ф. Ф. Турук (гісторыя мясцовага права) і інш.

[*] Аўтары: А. В. Шыдлоўскі, С. А. Балашэнка, Т. І. Доўнар і Л. Л. Голубева.
[1] Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1.



Пратакол № 2 пасяджэння факультэта грамадскіх навук ад 29 кастрычніка1921 г.
К р ы н і ц а: Ф. 205. Воп. 1. № 1113

Дэканам факультэта грамадскіх навук быў прызначаны прафесар У. М. Ігнатоўскі, а ў 1922 г. – прафесар С. Я. Кацэнбоген. Гэта былі яркія, неардынарныя асобы і навукоўцы. Актывізацыі навуковай дзейнасці спрыяла стварэнне пры БДУ навуковага таварыства, якое мела і юрыдычную секцыю. Да 1930 г. было выдадзена 25 выпускаў навуковых прац. Сярод аўтараў асабліва вылучаліся прафесары У. І. Пічэта, М. В. Грэдзінгер, В. М. Шыраеў і інш.

Адразу пасля заснавання БДУ на факультэце грамадскіх навук былі ўтвораны прадметныя камісіі, якія разглядалі і зацвярджалі праграмы курсаў і практычных заняткаў. Старшынёй камісіі па эканамічных і прававых дысцыплінах быў прызначаны «Валтэрсон, членамі камісіі былі Кацэнбоген, Кнорын, Герцык, Якукін, Гурвіч, Мейчык».

1 верасня 1925 г. у БДУ быў адкрыты факультэт права і гаспадаркі. Прадметныя камісіі разгарнулі актыўную працу. Так, 20 мая 1926 г. на аб'яднаным пасяджэнні эканамічнай і прававой прадметных камісій факультэта права і гаспадаркі, на якім прысутнічаў дэкан гэтага факультэта прафесар С. Я. Вольфсан, быў заслуханы даклад рэктара ўніверсітэта У. І. Пічэты аб дзейнасці факультэта права і гаспадаркі, а таксама прававой і эканамічнай прадметных камісій. У. І. Пічэта адзначыў, «что факультет права и хозяйства благодаря особо выдающейся деятельности деканата уже в первом году своего существования достиг значительных результатов, в силу которых факультет занял определенное видное положение в системе высшего образования БССР и выражает полную признательность деканату за его работу, выражая уверенность в том, что и в дальнейшем факультет права и хозяйства будет поставлен на еще большую высоту и соберет вокруг себя выдающиеся научные силы»[1].

У БДУ змяняліся вучэбныя планы, удакладняліся і прыстасоўваліся да новых умоў жыцця вучэбныя праграмы. Так, у 1924 г. была ўнесена прапанова аб абмежаванні лекцыйнай сістэмы выкладання як не вельмі эфектыўнай. Народны камісарыят асветы даў указанне аб адмене лекцыйнага метаду выкладання і замене яго семінарскімі, практычнымі заняткамі па прынцыпе лабараторна-брыгаднага метаду. Гэта новаўвядзенне мела мэтай падрыхтоўку спецыялістаў у найбольш сціслыя, скарочаныя тэрміны: за тры гады замест чатырох-пяці.

Нарада прафесараў і выкладчыкаў трэцяга курса факультэта грамадскіх навук адбылася 4 лістапада 1924 г. Было прынята рашэнне «прызнаць магчымымі дыпломнымі работы для студэнтаў прававога аддзялення на тэмы па наступных спецыяльнасцях:

1. Гістарычны матэрыялізм.
2. Гісторыя сацыялізму. З кропкі гледжання права.
3. Сацыялогія.
4. Дзяржаўнае права. Агульнае і савецкае.
5. Крымінальнае права і працэс.
6. Адміністратыўнае права, уключаючы рабочае.
7. Гісторыя права.
8. Агульная тэорыя права.

[1] Ф. 205. Воп. 1. Адз. сховішча 1141.

9. Зямельнае права.

10. Грамадзянскае права і працэс.

11. Міжнароднае права»[1].

Першы выпуск студэнтаў адбыўся ў лютым 1925 г., другі – у ліпені 1925 г. За 5 гадоў у БДУ было падрыхтавана ўжо 130 юрыстаў.

На 1926/1927 навучальны год запланавалі набор на прававое аддзяленне факультэта права і гаспадаркі 80 чалавек (пратакол пасяджэння Праўлення БДУ ад 14 ліпеня 1926 г.)[2].

У 1925/1926 навучальным годзе на факультэце права і гаспадаркі працавалі ўжо 13 прафесараў: У. І. Пічэта, С. Я. Вольфсан, А. В. Гарбуноў, М. А. Гельфер, М. В. Грэдзінгер, У. М. Дурдзянеўскі, М. В. Доўнар-Запольскі, С. Я. Кацэнбоген, Н. Н. Краўчанка, М. А. Прыляжаеў, У. М. Перцаў, В. М. Шыраеў, Б. В. Чрэдзін, а таксама дацэнты і асістэнты: А. М. Арцымовіч, Ф. І. Гаўзэ, С. М. Гофман, М. А. Канаплін і інш. У сувязі з гэтым актывізаваліся навуковыя даследаванні. Так, адзін з першых даследчыкаў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі Р. Я. Парэчын выдаў кнігу «Наша Канстытуцыя» (1928), якая апісвала папярэдняе развіццё беларускай савецкай дзяржаўнасці і змяшчала аналіз Канстытуцыі БССР 1927 г. Савецкаму дзяржаўнаму праву былі прысвечаны працы В. Н. Дурдзянеўскага, М. М. Гуткоўскага, І. І. Крыльцова, Н. А. Канапліна, Л. А. Рудзіцкага, П. М. Галанзы. Прафесар Н. А. Канаплін і дацэнт Л. А. Рудзіцкі выдалі манаграфію «Выбары тут і там» (1931), у якой, параўноўваючы савецкую сістэму выбараў з буржуазнай, падкрэслівалі, што апошняя з цягам часу страчвае сваю прагрэсіўнасць. Прыкметны след у юрыдычнай навуцы пакінулі працы М. В. Грэдзінгера, прысвечаныя грамадзянскаму праву і працэсу БССР, В. М. Шыраева – крымінальнаму праву і працэсу, Н. Н. Краўчанкі, Э. В. Зайчыка – працоўнаму праву, К. І. Таўсталес – шлюбна-сямейнаму і грамадзянскаму праву, Ф. І. Гаўзэ – грамадзянскаму праву і інш.

Навуковыя даследаванні 1920–30-х гг. былі адказам на пытанні, якія ставіла ў той час практыка савецкага дзяржаўнага будаўніцтва і правапрымяняльная дзейнасць. У адкрытым у 1922 г. Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульт) была створана камісія па савецкім будаўніцтве (пераўтвораная потым у прававую секцыю), у якой прымалі ўдзел і юрысты – выкладчыкі БДУ. Цэнтральны выканаўчы камітэт і Савет народных камісараў (СНК) БССР з мэтай атрымання ад навукоўцаў неабходных рэкамендацый даручылі Інбелкульту вывучэнне пытанняў дзяржаўна-прававога жыцця рэспублікі. Па ўказанні ЦВК БССР інстытут узяў на сябе функцыі вядучай навуковай арганізацыі па даследаванні прычын злачыннасці і па даручэнні ўрада вывучаў прававыя праблемы землекарыстання і землеўладання, дзейнасці мясцовай гаспадаркі і іншыя пытанні дзяржаўна-прававога будаўніцтва ў Беларусі.

Навукоўцы займаліся таксама праблемамі ўпарадкавання і сістэматызацыі заканадаўства (Ф. І. Гаўзэ, М. М. Гуткоўскі і інш.). Так, значным дасягненнем беларускай юрыдычнай навукі і прыкладам цеснай сувязі навукі і практыкі стала праца М. М. Гуткоўскага «Сістэматычны паказчык (спроба сістэматыкі)

[1] Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1.

[2] Там жа. Адз. сховішча 218.

заканадаўства Беларускай ССР за 1919–1928 гг.» (1929). У ёй сістэматызацыя заканадаўства дапаўнялася алфавітна-прадметным паказальнікам. Размяшчэнне ў ім па пэўнай сістэме больш за 4 тысячы законаў і ведамасных актаў сведчыла аб актыўнай заканадаўчай дзейнасці ў БССР. Старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў у прадмове да гэтай працы падкрэсліў, што яе аўтар паклаў пачатак сістэматызацыі заканадаўства рэспублікі.



Вучэбны корпус Мінскага юрыдычнага інстытута,
вул. Акадэмічная, 4

Юрыстаў Беларусі цікавілі таксама пытанні аб прававых формах узаемаадносін савецкіх рэспублік, прыродзе іх дзяржаўнага саюзу, развіцці заканадаўства. Акрамя таго, Інбелкульт пачаў выданне дзяржаўна-прававых актаў XVI–XVII стст., якія ўваходзілі ў склад Літоўскай метрыкі. Былі надрукаваны тры тамы кнігі «Беларускі архіў» (1927–1930). Адметнай з’явай у сферы юрыдычных даследаванняў Інбелкульта сталі «Запіскі аддзела гуманітарных навук. Працы кафедры сучаснага права» – збор артыкулаў па розных галінах юрыдычнай навукі: дзяржаўнага, адміністрацыйнага, крымінальнага, грамадзянскага і зямельнага права, судаводства, гісторыі і тэорыі дзяржавы і права, які выйшаў у 1929 г. (М. В. Грэдзінгер, Р. Я. Парэчын, М. А. Канаплін, В. М. Шыраеў, С. А. Слупскі, Ф. І. Гаўзэ, М. М. Гуткоўскі, Е. А. Вішнеўскі, Н. А. Бонч-Асмалоўскі). Друкаваліся асобныя кнігі, прысвечаныя грамадзянскаму і грамадзянска-працэсуальнаму праву, крымінальнаму і крымінальна-працэсуальнаму праву, шлюбна-сямейнаму праву і інш. Так, М. В. Грэдзінгер апублікаваў падручнік па грамадзянскім працэсе БССР, В. М. Шыраеў прысвяціў свае працы дзейнасці следчых органаў, органаў суда і пракуратуры, а У. М. Дурдзянеўскі, М. А. Канаплін, Л. А. Рудзіцкі і П. М. Галанза – дзяржаўнаму праву.

Значнае месца ў даследаваннях правазнаўцаў БДУ займала гісторыя беларускага народа, і пачатак гэтаму паклалі працы першага рэктара БДУ У. І. Пічэты, які выдаў больш за 130 навуковых даследаванняў, прысвечаных гісторыі права, эканоміцы, культуры і палітычнай гісторыі Беларусі (пазней, у 1961 г., быў выдадзены збор яго прац «Белоруссия и Литва XV–XVI вв.»). Менавіта пад кіраўніцтвам У. І. Пічэты распрацоўвалі пытанні прававой гісторыі Беларусі А. В. Бурдзейка, В. Д. Дружчыц, Т. І. Забела, А. І. Таўсталес і інш.

Для развіцця юрыдычнай айчыннай навукі важнае значэнне мела заснаванне ў 1929 г. Беларускай акадэміі навук (БАН), у складзе якой была створана кафедра савецкага будаўніцтва і права, дзе даследаваліся пытанні арганізацыі і дзейнасці дзяржаўнага апарата, развіцця заканадаўства, прычыны злачыннасці, абагульняўся вопыт правапрымяняльнай дзейнасці.

У 1930 г. факультэт права і гаспадаркі быў пераўтвораны ў факультэт савецкага будаўніцтва і права. У гэтым жа годзе былі скасаваны прадметныя камісіі. Цэнтрамі вучэбна-метадычнай і навуковай работы на факультэце сталі кафедры.

Савет народных камісараў БССР 7 ліпеня 1931 г. прыняў пастанову «О реорганизации Белорусского государственного университета», згодна з якой факультэт савецкага будаўніцтва і права быў рэарганізаваны ў самастойны Інстытут савецкага будаўніцтва і права з трохгадовым тэрмінам навучання.

У 1932 г. Інстытут савецкага будаўніцтва і права быў пераўтвораны ў Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут – галоўную ўстанову па падрыхтоўцы нацыянальных юрыдычных кадраў. У 1983 г. на савеце Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута быў прыняты Устаў Мінскага юрыдычнага інстытута. У перадваенны перыяд Мінскі юрыдычны інстытут узначальвалі дацэнт А. Н. Юрашкевіч (1937–1938), дацэнт М. Н. Цвяткоў (1938), прафесар А. М. Штэйнгарт (1938–1941), дацэнт І. С. Андрэйчык (1944–1945), дацэнт Г. А. Павецьеў (1945–1954). У гэты перыяд у інстытуце ўжо былі спецыялізаваныя кабінеты і лабараторыі. Напрыклад, значную дапамогу ў паляпшэнні выкладання крыміналістыкі аказвалі кабінет крыміналістыкі і крыміналістычная лабараторыя, па іншых дысцыплінах – кабінеты гісторыі і тэорыі дзяржавы і права, савецкага дзяржаўнага права, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права і працэсу.

У 1930-я гг. на кафедры крымінальнага права паспяхова працавалі М. А. Гельфер, С. М. Гофман, В. К. Пракуровіч, А. А. Сакалова. Выкладчыкі кафедры рыхтавалі праект Закона ад 27 чэрвеня 1935 г. «О запрещении абортов» і распрацоўвалі яго практычнае прымяненне. Я. Г. Мар'яхін завяршыў дысертацыю «Вина и ответственность в советском уголовном праве».

У 1935 г. на аснове аб'яднання Навукова-даследчага інстытута савецкага будаўніцтва і права і Інстытута філасофіі БАН быў створаны Інстытут філасофіі і права БАН, з якім узаемадзейнічалі і выкладчыкі БДУ. Аднак новы інстытут не паспеў у поўнай ступені разгарнуць сваю работу, бо ў 1938 г. многія яго супрацоўнікі былі рэпрэсіраваны.

Цяжкія страты панесла прававая навука Беларусі і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. У сувязі з гэтым у першыя пасляваенныя гады з-за адсутнасці навуковых кадраў даследаванні па прававых праблемах амаль не праводзіліся. Ужо ў жніўні 1944 г. пачалося аднаўленне дзейнасці Акадэміі навук (АН) БССР і Мінскага юрыдычнага інстытута.



В дело [подпись]

СОВЕТ НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР

ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 594

20 сентября 1944 г. г. Минск

О возобновлении деятельности Белорусского Государственного юридического института в г. Минске

Совет Народных Комиссаров Белорусской ССР ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Возобновить деятельность Белорусского Государственного Юридического Института в гор. Минске с 1 октября 1944 года.

2. Установить план приема на 1 курс в Белорусский Государственный юридический Институт на 1944-45 учебный год 150 чел.

3. Обязать Исполнительный Комитет Минского Городского Совета депутатов трудящихся / т. Гударина /:

а/ закрепить за Юридическим Институтом для общежития студентов дома [illegible] 33,35 по ул. Заславльской, № 23-а по ул. Революционной ранее принадлежавшие институту;

б/ до 1 октября с.г. выделить Юридическому Институту дополнительно жилой площади для размещения 150 студентов и 8 квартир для профессорско-преподавательского состава.

4. Наркомфину БССР / т. Котлярову/ включить в план финансирования Юридический институт с 1 октября 1944 г.

5. Наркомторгу БССР / т. Выходцеву/ внести в план снабжения продуктами питания и промтоварами студентов и профессорско-преподавательский состав института с 1 октября с.г.

6. Обязать Наркомюст БССР /т. Пайуто/ представить на утверждение СНК БССР смету и штатное расписание юридического института к 20 сентября 1944 года.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР /А. Шаров /

Управляющий делами СНК БССР / С.[illegible]/

Пастанова СНК БССР № 594 ад 20 верасня 1944 г.
«О возобновлении деятельности Белорусского государственного юридического института в г. Минске».
К р ы н і ц а: Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1



Вучэбны корпус Мінскага юрыдычнага інстытута,
вул. Кірава, 49. 1944–1949 гг.

# СВЕТЛАЯ ПАМЯЦЬ І СЛАВА ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА: «ВОГНЕННЫ» ВЫПУСК*

## Выкладчыкі, студэнты і выпускнікі Мінскага юрыдычнага інстытута – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны



**Азарноў Арон Давыдавіч**
(1917–1942)
Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).
Палітрук роты.



**Акуліч Надзея Матвееўна**
(1914–1942)
Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).
Кіраўнік падпольнай маладзёжнай групы ў в. Навінкі Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Сувязная партызанскага атрада.

**Баран Мірон Цалкавіч**
(1898–1979)
Выпускнік БДУ (1930).
Загадчык кафедры палітэканоміі Мінскага юрыдычнага інстытута. Намеснік дырэктара названага інстытута. Дацэнт.



**Бондар Аляксей Георгіевіч**
(1908–1994)
Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1935).
Пракурор БССР (1949–1967). Старшыня Вярхоўнага Суда БССР (1967–1984). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1950, 1954, 1958). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947, 1951, 1963, 1967).
Член падпольнага абкома Камуністычнай партыі Беларусі (КП(б)Б) і намеснік камандзіра Мінскага партызанскага злучэння па разведцы Мінскай, Палескай і Бабруйскай абласцей. Працаваў у апараце Цэнтральнага камітэта (ЦК) КП(б)Б.

* Аўтары: А. В. Шыдлоўскі, С. А. Балашэнка, Т. І. Доўнар і Л. Л. Голубева.

У лютым 1944 г. быў адклікаПы з фронту і прызначаны Старшынёй Вярхоўнага Суда БССР (1944). Быў абраны сакратаром Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (1945). Па сумяшчальніцтве працаваў загадчыкам кафедры крымінальнага права ў Мінскім юрыдычным інстытуце (1945–1948).

Заслужаны юрыст БССР (1968).

Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1949), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1974), Чырвонага Сцяга (1943), двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1945, 1967), Дружбы Народаў (1978), Чырвонай Зоркі (1942) і многімі медалямі.



**Бромберг Рафаэло Маносавіч**

(1916–?)

Студэнт другога курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Член падпольнай арганізацыі, якую ўзначальвала М. Б. Осіпава. Кіраўнік падпольнай групы.

Узнагароджаны ордэнамі і медалямі Вялікай Айчыннай вайны.



**Бугаёў Васіль Іванавіч**

(1915–1943)

Студэнт Мінскага юрыдычнага інстытута.

Узнагароджаны ордэнамі і медалямі за баявыя заслугі ў Вялікай Айчыннай вайне.



**Вяроўкін Аляксей Паўлавіч**

(1921–?)

У 1937 г. паступіў у Мінскі юрыдычны інстытут.

Ваенны следчы ваеннай пракуратуры ваенна-марской базы, памочнік ваеннага пракурора флоту.

Узнагароджаны ордэнамі і медалямі.



**Гейфман Гірш Матусавіч**

(1906–1945)

З 1934 г. – выкладчык гісторыі партыі ў Мінскім юрыдычным інстытуце. З 1939 г. – загадчык кафедры гісторыі партыі.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ступені, Чырвонай Зоркі, а таксама медалямі «За адвагу» і «За абарону Сталінграда».

**Гарковіч Сцяпан Сцяпанавіч**

(1915–1944)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Удзельнік Бабруйскага падполля і партызанскага руху.

Пасмяротна ўзнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».



**Дашкоўскі Уладзімір Фёдаравіч**

(1916–1944)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).



**Дудкоўскі Пётр Вікенцьевіч**

(1917–1997)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Намеснік, першы намеснік пракурора БССР і адначасова начальнік следчага ўпраўлення (1962–1964).

Намеснік камандзіра партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны I ступені, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, васьмю медалямі, «Знакам Пашаны», а таксама нагрудным знакам «Ганаровы работнік пракуратуры СССР».



**Жудро Васіль Сцяпанавіч**

(1917–1942)

Студэнт Мінскага юрыдычнага інстытута.

Кіраўнік падпольнага руху на тэрыторыі Беларусі.

Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны I ступені.





**Каган Барыс Залманавіч**
(1919–1941)

Студэнт трэцяга курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Палітработнік.



**Каржанеўскі Мікалай Канстанцінавіч**
(1904–1943)

Выпускнік юрыдычнай школы.

Працаваў у Народным камісарыяце юстыцыі БССР. Выкладчык Мінскага юрыдычнага інстытута.

Удзельнік падпольнага руху на тэрыторыі Беларусі.

Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны І ступені.



**Ленчнер Айзік Якаўлевіч**
(1923–?)

Студэнт першага курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Ваяваў у яўрэйскім партызанскім атрадзе № 106 пад камандаваннем Ш. Зорына.

Пасля вайны 36 гадоў працаваў у Мінскай абласной калегіі адвакатаў.

Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені і Айчыннай Вайны І ступені, а таксама медалём «За адвагу».



**Максімаў Фёдар Дзмітрыевіч**
(1921–1942)

У 1939 г. паступіў у Мінскі юрыдычны інстытут.

Кіраўнік падпольнай камсамольскай маладзёжнай арганізацыі ў в. Казімірава.



**Малаковіч Марыя Фядосаўна**
(1903–1943)

Выкладчык асноў марксізму-ленінізму, гісторыі партыі ў Беларускім юрыдычным і Беларускім політэхнічным інстытутах.

Кіраўнік Калодзішчанскай падпольнай арганізацыі ў Мінскім раёне.

Узнагароджана ордэнам Айчыннай Вайны І ступені.

**Марцючэнка Мікалай Васільевіч**
(1917–1944)
Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).



**Мар'яхін Якаў Рыгоравіч**
(1911–1941)
Выкладчык Мінскага юрыдычнага інстытута. Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт. Чытаў курс «Крымінальны працэс».



**Мельнік Міхаіл Паўлавіч**
(1919–1943)
Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).
Ваенны следчы пракуратуры 417-й стралковай дывізіі.

**Мінін Эфраім Зелекавіч**
(1920–1942)
Студэнт трэцяга курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).
Следчы ваеннай пракуратуры 4-й гвардзейскай дывізіі (лістапад 1941 г. – студзень 1942 г.). Следчы ваеннай пракуратуры 92-й стралковай дывізіі (студзень – чэрвень 1942 г.).



**Мітрафанаў Лаўрэнцій Ісаевіч**
(1921–1941)
Студэнт трэцяга курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).
Служыў у стралковай дывізіі.





**Осіпава Марыя Барысаўна**

(1909–1999)

Выпускніца Вышэйшай партыйнай школы Беларусі (1935) і Мінскага юрыдычнага інстытута (1940).

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947–1963). Член Вярхоўнага Суда БССР, рэспубліканскай камісіі садзейнічання Савецкаму камітэту абароны міру.

Кіраўнік антыфашысцкага падполля ў Мінску. У ліпені 1941 г. з выкладчыкаў і студэнтаў юрыдычнага інстытута арганізавала адну з першых падпольных груп у Мінску. Сувязная партызанскіх атрадаў М. М. Нікіціна, «Дзімы», «Мясцовыя», брыгады «Дзядзя Коля».

Ганаровы грамадзянін Мінска і Нурэка (Таджыкістан).

Герой Савецкага Саюза (званне прысуджана 29 кастрычніка 1943 г.).

Узнагароджана ордэнамі Леніна, Айчыннай Вайны I ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, а таксама медалямі.



**Песнякевіч Георгій Ціханавіч**

(1919–1976)

Студэнт Мінскага юрыдычнага інстытута.

Член падпольнай камсамольскай арганізацыі «Адам» і падпольнай арганізацыі, якую ўзначальвала М. Б. Осіпава.

Пасля заканчэння вайны працаваў юрысконсультам у Белкаапсаюзе.



**Плоткін Барыс Абрамавіч**

(даты нараджэння і смерці невядомы)

Студэнт чацвёртага курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

**Прасаловіч Савелій Людвігавіч**

(даты нараджэння і смерці невядомы)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Следчы ваеннай пракуратуры (13-я дывізія народнага апалчэння Масквы). У 1943 г. у складзе 133-й стралковай дывізіі прымаў удзел у вызваленні гарадоў і вёсак Калінінскай і Смаленскай абласцей.

**Пузырны Аляксей Паўлавіч**

(1921–1944)

Студэнт Мінскага юрыдычнага інстытута.

Змагаўся ў партызанскім атрадзе імя М. І. Кутузава 1-й брыгады імя К. С. Заслонава.



**Рубінчык Павел Яфрэмавіч**

(1904–?)

З 1938 г. – дацэнт Мінскага юрыдычнага інстытута, выкладчык марксісцка-ленінскай філасофіі.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны І ступені і медалём «За баявыя заслугі».



**Рэпін Дзмітрый Аляксеевіч**

(1914–1942)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Член антыфашысцкай падпольнай арганізацыі ў Магілёве. Змагаўся ў партызанскім палку імя К. М. Белавусава.



**Сакалова Антаніна Аляксееўна**

(1906–1942)

Выпускніца факультэта права і гаспадаркі БДУ (1927). Кандыдат юрыдычных навук. Выкладчык Мінскага юрыдычнага інстытута. Адначасова работнік абласной пракуратуры.

Член падпольнай арганізацыі, якую ўзначальвала М. Б. Осіпава.



**Сахараў Васіль Пятровіч**

(1910–?)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Намеснік камандзіра партызанскага атрада «25 гадоў Кастрычніка» па разведцы і контрразведцы.

У 1944 г. выбраны сакратаром Сакалкоўскага падпольнага рэспубліканскага камітэта Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі, а потым прызначаны на пасаду памочніка сакратара Беластоцкага падпольнага абкома КП(б)Б.

Да мая 1969 г. – пракурор Гродненскай вобласці.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі і асабістай баявой зброяй.





**Смарчак Уладзімір Захаравіч**

(даты нараджэння і смерці невядомы)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

З 1955 па 1982 г. – член Вярхоўнага Суда БССР.

Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі «За адвагу», «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945».



**Срэценскі Уладзімір Іванавіч**

(1916–1942)

Студэнт чацвёртага курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).



**Столаў Маціяс Эфраімавіч**

(1922–1942)

Студэнт другога курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Член падпольнай арганізацыі, якую ўзначальвала М. Б. Осіпава. Змагаўся ў партызанскім атрадзе М. М. Нікіціна.



**Тарлер Аркадзь Абрамавіч**

(1921–2003)

Студэнт другога курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

Разведчык. Радыст. Старшы сяржант 6-га танкавага корпуса. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі.

У 1951 г. атрымаў дыплом аб заканчэнні Мінскага юрыдычнага інстытута. Адвакат Полацкай юрыдычнай кансультацыі.

Кавалер ордэнаў Славы I і II ступені.



**Фралоў Аляксей Міхайлавіч**

(1921–1943)

Студэнт другога курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).

**Церахаў Генадзь Афанасьевіч**

(1909–?)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута (1933).

Выконваючы абавязкі Галоўнага транспартнага пракурора (1954–1960). Начальнік аддзела па наглядзе за следствам у органах дзяржаўнай бяспекі Пракуратуры СССР (1960–1972). Удзельнік следчай групы Пракуратуры СССР па справе Л. Берыі і яго супольнікаў (1954).

Дзяржаўны саветнік юстыцыі 2-га класа.

Заслужаны юрыст РСФСР (1976). Ганаровы работнік пракуратуры (1982).

Узнагароджаны ордэнамі і медалямі.



**Эпштэйн Міхаіл Ільіч**

(1917–1943)

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута.

Узнагароджаны ордэнамі і медалямі Вялікай Айчыннай вайны.



**Янушкевіч Анатоль Аляксандравіч**

(1918–1941)

Студэнт трэцяга курса Мінскага юрыдычнага інстытута (1941).



**Ярмоленка Канстанцін Паўлавіч**

(даты нараджэння і смерці невядомы)

Студэнт трэцяга курса Мінскага юрыдычнага інстытута.

Служыў у органах ваеннай пракуратуры Узброеных Сіл СССР (1945–1972): займаў пасаду ваеннага пракурора Архангельскага гарнізона.



# Выкладчыкі юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны



**Андрэеў Яўген Пятровіч**
(1924–2003)

Нарадзіўся 14 кастрычніка 1924 г. у в. Валоўнікі Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

У 1958 г. скончыў БДУ.

З 1958 па 1966 г. – старшы выкладчык юрыдычнага цыкла спецыяльнай сярэдняй школы міліцыі імя М. В. Фрунзэ Міністэрства аховы грамадскага парадку БССР. З 1966 па 1995 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага права Мінскай вышэйшай школы Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі. З 1995 па 2000 г. – дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1972 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Правоздольнасць і дзеяздольнасць непаўналетніх па савецкім грамадзянскім праве».

Узнагароджаны 2 ордэнамі і 15 медалямі.



**Бякешка Сяргей Пятровіч**
(1923–2001)

Нарадзіўся 10 сакавіка 1923 г. у в. Зарэчча Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці.

У 1950 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут.

З 1953 па 2001 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, з 1969 па 1974 г. – загадчык кафедры крымінальнага працэсу, намеснік дэкана юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1955 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Абарона ў стадыі судовага разбіральніцтва ў савецкім крымінальным працэсе».



**Варабей Георгій Аляксандравіч**
(1934–2012)

Нарадзіўся 23 верасня 1934 г. у в. Старыцы Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

У 1965 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1971 г. – выкладчык, дацэнт юрыдычнага факультэта БДУ. З 1983 па 1988 г. – намеснік дэкана названага факультэта. З 1997 па 2004 г. – суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. Прысвоены вышэйшы кваліфікацыйны клас суддзі.

У 1979 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Кантрольныя функцыі Прэзідыума Вярхоўнага Савета саюзнай рэспублікі». Аўтар звыш 100 навуковых прац.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2003).

З 1944 па 1945 г. – сын палка, выхаванец музычнага ўзвода 51-га стралковага запаснога палка.

## Галаўко Анатоль Аляксандравіч



(1925–2014)

Нарадзіўся 12 снежня 1925 г. у г. Аляксееўцы Белгародскай вобласці.

У 1950 г. скончыў Харкаўскі юрыдычны інстытут.

З 1954 па 1959 г. – старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і права АН БССР. З 1959 па 1965 г. – дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, з 1965 па 1990 г. – загадчык кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, з 1990 па 2012 г. – прафесар кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1953 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дзеянне іскавой даўнасці ў савецкім грамадзянскім праве», а ў 1973 г. – доктарскую дысертацыю «Арганізацыйна-прававыя праблемы ў дзейнасці Саветаў па кіраўніцтву калгасным будаўніцтвам». Прафесар (1974). Падрыхтаваў 35 кандыдатаў юрыдычных навук (з іх 9 – грамадзяне замежных краін) і 8 дактароў юрыдычных навук. Аўтар каля 400 навуковых прац.

З'яўляўся членам двух спецыялізаваных саветаў па абароне дысертацый, узначальваў Навукова-кансультатыўны савет пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Прымаў удзел у рабочых групах па падрыхтоўцы праектаў трох канстытуцый: Канстытуцыі СССР 1977 г., Канстытуцыі БССР 1978 г., Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.

Заслужаны юрыст БССР (1990).

Узнагароджаны трыма баявымі ордэнамі, у тым ліку за вызваленне г. Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, а таксама Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Прымаў удзел у Парадзе перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 г.

## Гарэлік Іосіф Ісаакавіч



(1921–2008)

Нарадзіўся 3 снежня 1921 г. у г. Бабруйску Магілёўскай вобласці.

У 1944 г. скончыў Ленінградскі юрыдычны інстытут, а ў 1947 г. – аспірантуру гэтага інстытута.

З 1947 па 1992 г. – дацэнт, прафесар кафедры крымінальнага права Мінскага юрыдычнага інстытута, юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1947 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Крымінальна-прававая ахова асабістай уласнасці грамадзян. Крадзеж», а ў 1965 г. – доктарскую дысертацыю «Злачынствы, небяспечныя для жыцця і здароўя (пастаўленне ў небяспеку і пакіданне ў небяспецы)». Прафесар (1966). Падрыхтаваў трох кандыдатаў юрыдычных навук. Аўтар звыш 80 навуковых прац, у тым ліку аўтар і рэдактар 1-га тома двухтомнага падручніка «Уголовное право БССР» (1978).

Працяглы час з'яўляўся членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным Судзе БССР. Удзельнічаў у падрыхтоўцы праекта Крымінальнага кодэкса БССР 1960 г. Унёс уклад у распрацоўку Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1999 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны II ступені і медалямі.



**Дарогін Васіль Аляксандравіч**
(1912–1995)

Нарадзіўся ў 1912 г. у в. Ірхіна Валагодскага раёна Валагодскай вобласці.

У 1933 г. скончыў Ленінградскі юрыдычны інстытут.

З 1936 па 1938 г. узначальваў кафедру тэорыі дзяржавы і права Алма-Ацінскага юрыдычнага інстытута. З 1944 па 1947 г. – памочнік ваеннага пракурора г. Вільнюса. З 1947 па 1954 г. – намеснік дырэктара Мінскага юрыдычнага інстытута па навуковай і вучэбнай рабоце. З 1954 па 1972 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ. З 1959 па 1964 г. – дэкан названага факультэта.

Аўтар звыш 50 навуковых прац.

Узнагароджаны ордэнамі і медалямі.



**Драбязка Сцяпан Рыгоравіч**
(1922–2019)

Нарадзіўся 7 жніўня 1922 г. у в. Уюнішча Сасніцкага раёна Чарнігаўскай вобласці.

У 1949 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут.

З 1950 па 2019 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, з 1974 па 1988 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1953 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Закон саюзнай рэспублікі». У 1969 г. у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце абараніў доктарскую дысертацыю «Эфектыўнасць заканадаўства ў стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы грамадства». Прафесар (1971). Аўтар звыш 200 навуковых прац.

Удзельнічаў у распрацоўцы праектаў Канстытуцыі СССР 1977 г., Канстытуцыі БССР 1978 г., Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. З'яўляўся старшынёй Дзяржаўнага экспертнага савета па сацыяльна-эканамічных праблемах і праблемах развіцця дзяржаўнасці Рэспублікі Беларусь, членам Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Ганаровы работнік юстыцыі Беларусі. Лаўрэат вышэйшай юрыдычнай прэміі «Феміда». Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1996).

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны II ступені і медалямі.



**Дулаў Андрэй Васільевіч**
(1924–2018)

Нарадзіўся 21 кастрычніка 1924 г. у г. Ленінградзе.

З 1939 па 1941 г. – электраманцёр на Ленінградскім заводзе «Чырвоная зара». З 1944 па 1951 г. працаваў у пракуратуры г. Ленінграда.

У 1951 г. скончыў юрыдычны факультэт Ленінградскага ўніверсітэта.

З 1952 па 1958 г. – аспірант, асістэнт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1958 па 2017 г. – дацэнт, прафе-

сар кафедры крыміналістыкі, з 1972 па 1990 г. – загадчык кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1955 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Экспертиза на предварительном следствии», а ў 1965 г. – доктарскую дысертацыю «Проблемы теории судебной экспертизы». Прафесар (1966). Падрыхтаваў звыш 50 кандыдатаў і дактароў юрыдычных навук. Аўтар каля 600 навуковых прац.

Узнагароджаны дзвюма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты. Заслужаны работнік БДУ. Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (2000).

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ступені, а таксама медалямі СССР.



**Кічыгіна Кацярына Васільеўна**

(1923–2002)

Нарадзілася 22 чэрвеня 1923 г. у г. Белябеі (Башкірыя, Расія).

У 1949 г. скончыла юрыдычны інстытут у г. Свярдлоўску, а ў 1961 г. – аспірантуру АН БССР.

З 1949 па 1957 г. – намеснік старшыні Новасібірскага транспартнага суда. З 1957 па 1958 г. – старшы рэвізор Міністэрства юстыцыі БССР, народны суддзя Ленінскага раёна г. Мінска. З 1961 па 1993 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1961 г. у Інстытуце дзяржавы і права АН СССР абараніла кандыдацкую дысертацыю «Крымінальная адказнасць за парушэнне правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі аўтамотатранспарту або гарадскога электратранспарту». Дацэнт (1963). Аўтар звыш 30 навуковых прац.

Узнагароджана ордэнам Айчыннай Вайны II ступені і медалямі.



**Курылёў Сяргей Васільевіч**

(1919–1968)

Нарадзіўся ў 1919 г. у г. Загорску (сёння – Сергіеў Пасад) Маскоўскай вобласці.

З 1961 па 1968 г. – дацэнт, прафесар кафедры грамадзянскага права і працэсу юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1953 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Тлумачэнні бакоў як доказ у савецкім грамадзянскім працэсе», а ў 1967 г. – доктарскую дысертацыю «Устанаўленне ісціны ў савецкім правасуддзі». Аўтар звыш 30 навуковых прац.

Прымаў актыўны ўдзел у рабоце па кадыфікацыі заканадаўства БССР у 1960-я гг., а таксама ў падрыхтоўцы Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса БССР 1964 г. З'яўляўся членам Грамадскага савета па прававых пытаннях пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР, членам Навукова-метадычнага савета Вярхоўнага Суда БССР.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.



**Лейзераў Аркадзь Цевелевіч**

(1922–2007)

Нарадзіўся 17 студзеня 1922 г. у г. Мінску.

У 1949 г. скончыў Ваенную юрыдычную акадэмію Савецкай арміі, у 1953 г. – Ваенны інстытут замежных моў.

З 1963 па 1977 г. – дацэнт, з 1988 па 2005 г. – прафесар кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1965 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Развіццё выбарчага заканадаўства БССР», а ў 1988 г. – доктарскую дысертацыю «Тэарэтычныя праблемы ўдасканалення дэмакратычных пачаткаў у фарміраванні і дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў (сацыяльна-прававы аспект)». Прафесар (1990). Аўтар каля 300 навуковых прац.

У 1993–1994 гг. – член Камісіі па распрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. З'яўляўся членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.



**Матусевіч Ірына Антонаўна**

(1927–2000)

Нарадзілася 20 красавіка 1927 г. у г. Полацку Віцебскай вобласці.

У 1950 г. скончыла Мінскі юрыдычны інстытут.

З 1963 па 1995 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і крыміналістыкі (з 1972 г. – кафедра крыміналістыкі) юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1968 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Вывучэнне асобы абвінавачваемага ў працэсе папярэдняга расследавання злачынстваў». Аўтар каля 30 навуковых прац.

Сувязная партызанскага атрада «Беларусь».

Узнагароджана медалямі.



**Мацвіенка Яўген Аляксандравіч**

(1925–1998)

Нарадзіўся 15 красавіка 1925 г. у г. Абакане Краснаярскага краю.

З 1951 па 1954 г. – выкладчык Мінскага юрыдычнага інстытута. З 1954 па 1988 г. – дацэнт, загадчык кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1951 г. у Інстытуце права АН СССР абараніў кандыдацкую дысертацыю «Судовае следства ў крымінальным працэсе». Дацэнт (1953). Прафесар (1978). Аўтар 60 навуковых прац.

**Павецьеў Гаўрыіл Аляксеевіч**
(1909–1971)



Нарадзіўся 6 красавіка 1909 г. у с. Стара-Яшкіным Тузулукскага раёна Самарскай губерні.

У 1933 г. скончыў Ленінградскі інстытут савецкага права імя М. У. Крыленкі, потым аспірантуру 1-га Ленінградскага юрыдычнага інстытута.

З 1937 па чэрвень 1941 г. – дацэнт кафедры працоўнага права, памочнік загадчыка вучэбнай часткі 1-га Ленінградскага юрыдычнага інстытута.

З 1941 па 1943 г. – член, намеснік старшыні Ваеннага трыбунала Войск абароны тылу Ленінградскай вобласці. З 1943 па 1945 г. – інспектар, старшы інспектар Упраўлення ваенных трыбуналаў Войск абароны тылу ў цэнтральным апараце Народнага камісарыята юстыцыі СССР. З 1945 па 1946 і з 1948 па 1954 г. – дырэктар Мінскага юрыдычнага інстытута. З 1954 па 1962 г. – прарэктар па навуковай рабоце БДУ. З 1950 па 1971 г. – загадчык кафедры грамадзянскага права і працэсу юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1948 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў для сацыялістычнай прамысловасці». Дацэнт (1951). Аўтар звыш 25 навуковых прац.

З'яўляўся членам урадавай камісіі па кадыфікацыі заканадаўства, Навукова-метадычнага савета пры Вярхоўным Судзе БССР і Метадычнага савета пры Пракуратуры БССР, Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў школ, вышэйшых навучальных і навуковых устаноў, рэктарам Грамадскага ўніверсітэта прававых ведаў.

У якасці члена дэлегацый БССР прымаў удзел у рабоце VII, VIII і XVII сесій Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) (1952, 1953 і 1967), а таксама 1-й і 2-й канферэнцый ААН па марскім праве (1958 і 1960).

Адзін з галоўных арганізатараў стварэння нацыянальнай юрыспрудэнцыі ў практычнай, педагагічнай і навуковай галінах. Пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронены шэраг кандыдацкіх дысертацый.

За працоўныя поспехі ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўную адзнаку», «За доблесную працу», а таксама Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

За ваенныя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай Вайны I ступені, а таксама медалямі «За абарону Ленінграда» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.».

**Плюта Яўхім Фядотавіч**
(1902–1988)



Нарадзіўся 14 красавіка 1902 г. у с. Ясназор'і Вінкавіцкага раёна Хмяльніцкай вобласці.

З 1931 па 1934 г. – студэнт Харкаўскага фінансава-эканамічнага інстытута. У 1937 г. скончыў Харкаўскі юрыдычны інстытут.

З 1937 па 1941 г. – пракурор г. Магілёва-Падольскага Вінніцкай вобласці УССР. З 1941 па 1960 г. – пракурор арміі

ў Кіеўскай і Беларускай ваенных акругах, намеснік пракурора Беларускай ваеннай акругі. З 1960 па 1985 г. – выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу юрыдычнага факультэта БДУ. Аўтар шэрага навуковых прац.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай Вайны І і ІІ ступені, а таксама 12 медалямі.

**Пракудовіч В. К.**

(1901–1968)

Выпускнік факультэта права і гаспадаркі БДУ 1929 г.

Выкладчык крымінальнага права Мінскага юрыдычнага інстытута. Намеснік Пракурора БССР. Народны камісар юстыцыі БССР. Міністр юстыцыі БССР.

Інвалід Вялікай Айчыннай вайны.



**Пруднічэнка Вольга Львоўна**

(1923–?)

Старшы выкладчык кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

Партызанка атрада імя П. Е. Казанакава.

**Рудзіцкі Лазар Абрамавіч**

(1901–1959)

Выпускнік факультэта права і гаспадаркі БДУ 1927 г.

Загадчык кафедры Мінскага юрыдычнага інстытута. Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.



**Тагуноў Яўген Мікалаевіч**

(1925–2012)

Нарадзіўся 18 ліпеня 1925 г. у г. Мураме Уладзімірскай вобласці.

У 1950 г. скончыў Казанскі юрыдычны інстытут.

З 1953 па 1961 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры дзяржаўнага права, дырэктар Новасібірскага філіяла Усесаюзнага юрыдычнага завочнага інстытута. З 1961 па 1966 г. – дацэнт кафедры партыйнага будаўніцтва Новасібірскай вышэйшай партыйнай школы. З 1966 па 1997 г. – дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1953 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Пракурорскі нагляд за захаваннем сацыялістычнай законнасці ў дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных». Аўтар 80 навуковых прац.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай Вайны ІІ ступені, а таксама медалямі.

**Цішкевіч Іван Станіслававіч**

(1919–2001)



Нарадзіўся 1 студзеня 1919 г. у г. Хойнікі Гомельскай вобласці.

У 1948 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут, а ў 1951 г. – аспірантуру гэтага інстытута.

Прайшоў усе этапы выкладчыцкай кар'еры ў Мінскім юрыдычным інстытуце, а потым на юрыдычным факультэце БДУ. З 1965 па 1988 г. – загадчык кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ. Выконваў абавязкі дэкана названага факультэта.

У 1953 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Паняцце падрыхтоўкі да злачынства і замаху на злачынства па савецкім крымінальным праве», а ў 1969 г. – доктарскую дысертацыю «Абарона ад грамадска небяспечнага замаху і меры па затрыманні злачынца». Прафесар (1971). Падрыхтаваў шэсць кандыдатаў юрыдычных навук. Аўтар звыш 120 навуковых прац.

Шмат гадоў з'яўляўся членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным Судзе БССР. Удзельнічаў у падрыхтоўцы праекта Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1999 г.

Заслужаны юрыст БССР (1971).

**Чыгір Васіль Фёдаравіч**

(1924–2024)



Нарадзіўся 8 верасня 1924 г. у в. Лешні Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

У 1949 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут, а ў 1952 г. – аспірантуру гэтага інстытута.

З 1950 па 1954 г. – выкладчык, старшы выкладчык Мінскага юрыдычнага інстытута. З 1954 па 1971 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага і сямейнага права, з 1971 па 1993 г. – загадчык кафедры грамадзянскага і сямейнага (з 1991 г. – грамадзянскага) права, з 1993 па 2018 г. – прафесар кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 1973 па 1983 г. – дэкан названага факультэта.

У 1954 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дагавор будаўнічага падраду», а ў 1970 г. – доктарскую дысертацыю «Жыллёвыя праваадносіны». Прафесар (1973). Заснавальнік навуковай школы па жыллёвым праве. Падрыхтаваў 1 доктара і больш за 20 кандыдатаў юрыдычных навук. Аўтар звыш 550 навуковых прац, у тым ліку 20 манаграфій.

Апублікаваў шмат навуковых прац, якія ахопліваюць практычна ўсю ключавую праблематыку грамадзянскага права. Пад яго кіраўніцтвам і з яго ўдзелам падрыхтаваны і апублікаваны вядомыя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па грамадзянскім, сямейным і жыллёвым праве. З'яўляўся кіраўніком аўтарскага калектыву, аўтарам многіх глаў і адказным рэдактарам першага ў Беларусі навучальнага дапаможніка «Гражданское право» (у 3 тамах; 1975, 1977, 1978) і першага падручніка «Гражданское право» (у 2 частках; 2000, 2002), падручніка «Гражданское право» (у 3 тамах; 2008, 2010, 2011) і многіх каментарыяў да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

З'яўляўся членам рабочай групы па падрыхтоўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., членам рабочай групы па падрыхтоўцы праекта Грамадзянскага кодэкса БССР 1964 г., Жыллёвага кодэкса БССР 1983 г. Уваходзіў у рабочую групу па падрыхтоўцы ўсіх трох частак Мадэльнага грамадзянскага кодэкса (рэкамендацыйнага заканадаўчага акта для краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў) і праекта Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

З 1994 па 1998 г. – старшыня экспертнага савета па юрыдычных навуках Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. Шмат гадоў узначальваў савет па абароне доктарскіх дысертацый па юрыдычных навуках пры БДУ.

Заслужаны юрыст БССР (1971).

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ступені і шматлікімі медалямі.



**Швяцоў Васіль Сцяпанавіч**

(1919–1988)

Нарадзіўся 20 лютага 1919 г. у с. Убен Дражжанаўскага раёна.

У 1941 г. скончыў Казанскі юрыдычны інстытут.

З 1942 па 1972 г. служыў у ваеннай юстыцыі, быў членам ваеннага трыбунала Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. З 1972 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1967 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па праблемах прававога рэгулявання пакарання ў выглядзе накіравання ў дысцыплінарны батальён. Аўтар шэрага навуковых прац.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.



**Шкурко Васіль Адамавіч**

(1919–1998)

Нарадзіўся 17 красавіка 1919 г. у в. Буркі Брагінскага раёна Гомельскай вобласці.

Пасля заканчэння ў 1937 г. педагагічнага вучылішча ў г. Рэчыцы працаваў настаўнікам, дырэктарам вясковай школы і завочна вучыўся ў Гомельскім педагагічным інстытуце на гісторыка-філалагічным факультэце. У лістападзе 1939 г. быў прызваны ў армію. У 1950 г. скончыў юрыдычны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта, а ў 1953 г. – аспірантуру гэтага ўніверсітэта.

З 1953 па 1958 г. – старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры крымінальнага права і працэсу Іркуцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Выконваў абавязкі дэкана юрыдычнага факультэта гэтага ўніверсітэта. З 1958 па 1962 г. – старшы навуковы супрацоўнік аддзела прававых навук АН БССР.

З 1962 г. – дацэнт кафедры крымінальнага права і працэсу юрыдычнага факультэта БДУ. З 1965 па 1972 г. – дэкан названага факультэта. У наступныя гады працаваў дацэнтам, прафесарам кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1953 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Барацьба са службовай нядбайнасцю па савецкім крымінальным праве». Падрыхтаваў трох кандыдатаў юрыдычных навук. Аўтар звыш 60 навуковых прац, а таксама некалькіх выданняў навукова-практычных каментарыяў да Крымінальнага кодэкса БССР.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны I ступені і некалькімі медалямі.

**Юркевіч Мікалай Рыгоравіч**



(1928–2017)

Нарадзіўся 18 студзеня 1928 г. у с. Сяргеевічы Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

У 1950 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут.

З 1953 па 2016 г. працаваў на юрыдычным факультэце БДУ. З 1974 па 1978 і з 1981 па 1994 г. – загадчык, а з 1994 па 2016 г. – прафесар кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1955 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Праваздольнасць грамадзяніна СССР па савецкім грамадзянскім праве», а ў 1967 г. – доктарскую дысертацыю «Шлюб і яго прававое рэгуляванне ў СССР (па матэрыялах Беларускай ССР)». Прафесар (1970). Пад яго навуковым кіраўніцтвам падрыхтаваны больш за 20 кандыдатаў юрыдычных навук. Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 7 індывідуальных і 10 калектыўных манаграфій.

З 1994 па 2005 г. узначальваў Міжнародны арбітражны суд пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце. З'яўляўся галоўным рэдактарам створанага ім часопіса «Прамыслова-гандлёвае права».

Уваходзіў у склад групы па распрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны першапачатковы тэкст праекта Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1998 г. і праекта Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 г. «Аб міжнародным арбітражным (трацейскім) судзе». З'яўляўся членам савета па абароне дысертацый пры БДУ, членам спецыялізаванага савета НАН Беларусі.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1996). Уладальнік вышэйшай юрыдычнай прэміі «Феміда» ў намінацыі «Юрыдычныя навукі» (2008). Ганаровы работнік юстыцыі. Ганаровы работнік гаспадарчага суда. Заслужаны работнік БДУ.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Айчыннай Вайны II ступені, а таксама юбілейнымі медалямі.

**Юхо Іосіф (Язэп) Аляксандравіч**



(1921–2004)

Нарадзіўся 19 сакавіка 1921 г. у г. Мінску.

З 1939 па 1946 г. служыў у арміі. У 1949 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут.

Працаваў народным суддзёй, малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права АН БССР, дацэнтам кафедры грамадзянскага і грамадзянска-працэсуальнага права юрыдычнага факультэта БДУ, намеснікам Старшыні

Юрыдычнай камісіі пры Савеце Міністраў БССР, загадчыкам кафедры гісторыі дзяржавы і права, намеснікам дэкана юрыдычнага факультэта БДУ, прафесарам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права названага факультэта.

У 1954 г. у Інстытуце дзяржавы і права АН СССР абараніў кандыдацкую дысертацыю «Устанаўленне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі ў 1939 г.», а ў 1980 г. – доктарскую дысертацыю «Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў XVI ст.». Прафесар (1981). Аўтар звыш 200 навуковых прац.

Заснаваў навуковую школу гісторыі дзяржавы і права Беларусі і на працягу многіх гадоў з'яўляўся яе кіраўніком. У 1963 г. распрацаваў і пачаў чытаць курс лекцый па гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Працаваў у складзе Канстытуцыйнай камісіі па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Удзельнічаў у перавыданні статутаў ВКЛ 1566 і 1588 гг.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай Вайны I ступені, медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

## АДНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА Ў САВЕЦКІ ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД*

У 1954 г. Мінскі юрыдычны інстытут быў пераўтвораны ў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дэканам юрыдычнага факультэта быў прызначаны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Я. М. Семярыхін (1914–1963), які працаваў у Мінскім юрыдычным інстытуце і на юрыдычным факультэце БДУ з 1947 па 1963 г. З 1947 па 1950 г. Я. М. Семярыхін быў дырэктарам Мінскага філіяла Усесаюзнага юрыдычнага завочнага інстытута. З 1954 па 1955 і з 1958 па 1959 г. ён працаваў дэканам юрыдычнага факультэта БДУ.




Мінскі юрыдычны інстытут. 1940–50-я гг.

* Аўтары: А. В. Шыдлоўскі, С. А. Балашэнка, Т. І. Доўнар і Л. Л. Голубева.

Пазней дэканамі названага факультэта былі дацэнты В. А. Дарогін (1956–1957, 1959–1964), М. Н. Меркушаў (1957–1958), прафесары І. М. Ігнаценка (1964–1965), В. А. Шкурко (1965–1972), В. Ф. Чыгір (1973–1983), В. Г. Ціхіня (1983–1989), В. М. Гадуноў (1989–2002), С. А. Балашэнка (2002–2020) і дацэнт Т. М. Міхалёва (2020–2021). З 2021 г. па сёння юрыдычны факультэт БДУ ўзначальвае кандыдат юрыдычных навук дацэнт А. В. Шыдлоўскі.

У другой палове 1950-х гг. у СССР пачаўся працэс пашырэння праў саюзных рэспублік, у тым ліку і ў галіне заканатворчасці, што значна актывізавала навуковыя юрыдычныя даследаванні. Распрацоўка і прыняцце новых законаў (у тым ліку кодэксаў) патрабавалі ўдзелу ў заканатворчым працэсе прадстаўнікоў юрыдычнай навукі. У гэты перыяд у рэспубліцы быў пакладзены пачатак новаму кірунку гісторыка-прававой навукі – гісторыі дзяржавы і права БССР (кніга С. П. Маргунскага «Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921–1925)», 1966 г.). У 1958 г. была выдадзена калектыўная праца «Очерки по истории государства и права БССР», а ў 1970–1976 гг. надрукаваны два тамы калектыўнай «Истории государства и права Белорусской ССР». Выкананне гэтай значнай і вялікай навуковай працы стала магчымым дзякуючы супрацоўніцтву навукоўцаў БДУ і АН БССР.

У БДУ пачалі пашырацца даследаванні па ўсіх кірунках прававой навукі, у тым ліку па тэорыі дзяржавы і права (В. А. Дарогін, С. Р. Драбязка), канстытуцыйным і адміністрацыйным праве (А. А. Галаўко, Л. А. Прыходзька, А. Ц. Лейзераў, А. М. Крамнік), гісторыі дзяржавы і права Расіі (Б. Я. Бабіцкі, А. С. Фарфель, Э. А. Калініна, У. П. Сярэбранікаў). Было выдадзена шмат прац: «Правовое положение населения Белоруссии в XVI в.» І. А. Юхо (1978), «Деятельность Советов Белоруссии по осуществлению экономической политики в деревне в 1927–1936 годах» А. А. Галаўко (1968), «История суда в БССР» І. І. Марціновіча (1961) і інш.

Складаныя пытанні савецкага будаўніцтва і права адлюстравалі ў сваіх навуковых працах В. А. Дарогін («Суверенитет в советском государственном праве», 1948), С. Р. Віхараў («Суверенитет Белорусской ССР в составе Союза ССР», 1958), С. Р. Драбязка («Право и материально-техническая база коммунизма», 1967), А. Ц. Лейзераў («Конституционный принцип гласности работы Советов народных депутатов», 1981), А. М. Абрамовіч («Государственное управление строительством в СССР», 1982), А. Г. Цікавенка («Начальник и подчиненный. Правовые аспекты служебных отношений», 1984), А. А. Галаўко («БССР – суверенное социалистическое государство», 1989), А. М. Крамнік («Адміністрацыйныя паўнамоцтвы сельскага Савета дэпутатаў працоўных», 1974), Я. М. Тагуноў («Народный контроль над деятельностью аппарата управления местных Советов», 1975), П. К. Еўдакімаў («Ответственность лиц, ведущих паразитический образ жизни», 1963) і інш.

Аб'ектам увагі навукоўцаў-цывілістаў сталі праблемы абавязацельнага, жыллёвага права, грамадзянска-прававога забеспячэння правоў і інтарэсаў грамадзян і іншыя пытанні. Былі надрукаваны працы В. Ф. Чыгіра («Договор подряда по капитальному строительству», 1958; «Советское жилищное право», 1968), Ф. І. Гаўзэ («Обязательственное право», 1968; «Социалистический гражданско-правовой договор», 1972), а таксама даследаванні А. М. Рамановіч, В. В. Левага і інш. Пазней праблемы навукі грамадзянскага права пачалі распрацоўваць В. М. Гадуноў, Г. С. Драбязка, У. А. Раманенка, С. П. Сакалоў, І. М. Шчамялёва і інш. Пад кіраўніцтвам В. Ф. Чыгіра склалася навуковая школа грамадзянскага

і жыллёвага права. Ён заклаў фундамент для развіцця права інтэлектуальнай уласнасці.

У сферы шлюбна-сямейных праваадносін шырока вядомымі сталі даследаванні прафесара М. Р. Юркевіча («Семья в современном обществе», 1964; «Заключение брака по советскому праву», 1965) і інш. Дзейнасці судовых органаў і дзяржаўнага арбітража, а таксама тэарэтычным праблемам грамадзянскага працэсуальнага права былі прысвечаны манаграфіі С. В. Курылёва («Объяснение сторон как доказательство в советском гражданском процессе», 1956; «Основы теории доказательства в советском правосудии», 1969). У публікацыях В. С. Курылёвай, А. А. Война, Х. Т. Мялешкі, Н. І. Красоўскай, В. П. Дуюна, Т. М. Петачэнкі, Т. І. Каробкінай, Г. Б. Шышко разглядаліся шматлікія пытанні працоўнага права. Самыя актуальныя праблемы грамадзянска-працэсуальнага права адлюстраваны ў даследаваннях Т. А. Бяловай, І. М. Калядкі, І. М. Казей, В. В. Ціхановіча, В. Г. Ціхіні, М. Р. Юркевіча і інш. Склалася беларуская навуковая школа грамадзянска-працэсуальнага і працоўнага права.



Прафесарска-выкладчыцкі састаў
юрыдычнага факультэта БДУ. 1970-я гг.

Вучоныя факультэта займаліся навуковымі даследаваннямі пытанняў крымінальнага права, аказвалі дапамогу праваахоўным і судовым органам у юрыдычнай кваліфікацыі супрацьпраўных дзеянняў, справядлівым прыцягненні вінаватых у злачынстве да крымінальнай адказнасці. Пра гэта сведчаць назвы апублікаваных прац: «Ответственность за оставление в опасности» (1960), «Квалификация преступлений опасных для жизни и здоровья» (1973) І. І. Гарэліка, «Приготовление и покушение по советскому уголовному праву» (1958), «Условия и пределы необходимой обороны» (1989) І. С. Цішкевича, «Ответственность за телесные повреждения по советскому уголовному праву» (1964) П. А. Дубаўца, «Ответственность за нарушение безопасности движения городского транспорта» (1966) К. В. Кічыгінай. Розныя праблемы крымінальнай навукі савецкага часу знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыях М. А. Бабія, А. У. Баркова, І. А. Грунтова, М. М. Меркушава, У. М. Хоміча, В. В. Цімошчанкі, В. А. Шкурко і інш.

Значную дапамогу практыцы аказвалі навуковыя працы працэсуалістаў: «Судебная речь» (1967), «Приговор суда и его исполнение» (1968), «Подозреваемый в советском уголовном процессе» (1969) Я. А. Мацвіенкі, «Адвокатура в БССР» (1973) С. П. Бякешкі і І. І. Марціновіч, «Содержание и формы уголовного судопроизводства» (1974) В. М. Шпілёва і інш. Праблемы крымінальнага працэсу, аспекты арганізацыі і дзейнасці пракуратуры распрацоўвалі В. М. Бібіла, С. П. Бякешка, А. А. Данілевіч, Л. Л. Зайцава і інш.

Вучоныя факультэта актыўна праводзілі даследаванні праблем крыміналістыкі, судовай псіхалогіі і інш. Былі апублікаваны працы А. В. Дулава («Вопросы теории судебной экспертизы», 1953; «Введение в судебную психологию», 1970; «Основы психологического анализа на предварительном следствии», 1973; «Судебная психология», 1970), М. М. Гапановіча («Опознание в судопроизводстве», 1975), А. І. Кастрова («Судебная фотография», 1971), А. В. Лапіна («Криминалистическое оружиеведение», 2005), І. А. Матусевіч («Изучение личности обвиняемого в процессе предварительного расследования преступлений», 1975), Ю. І. Новіка «Психологические проблемы правового регулирования», 1989), Р. А. Шумака («Бухгалтерский анализ как метод расследования преступлений», 1985) і інш.



Прафесарска-выкладчыцкі састаў
юрыдычнага факультэта БДУ. 1980-я гг.

Ва ўзаемадзеянні з вучонымі АН БССР ажыццяўляліся даследаванні пытанняў землекарыстання, аховы прыроды, арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і інш. Выйшлі манаграфіі М. В. Сторажава «Правовое положение колхозов на современном этапе» (1975), «Правовой режим мелиорированных земель» (1986), «Материальная ответственность колхозников» (1971), а таксама навуковыя работы А. А. Шынгеля.

Міжнародная дзейнасць БССР асвятлялася ў працах Ю. П. Броўкі, Л. В. Паўлавай і іншых выкладчыкаў БДУ. Значным дасягненнем у гэтай сферы сталі манаграфіі Ю. П. Броўкі «Международная правосубъектность БССР» (1967) і «Белорусская ССР – суверенный участник международного общения» (1974).



Вучэбны корпус юрыдычнага факультэта БДУ,
вул. Маскоўская, 17. 1979–2005 гг.

Вучоныя-прававеды ўніверсітэта прымалі ўдзел у падрыхтоўцы энцыклапедычных выданняў, у тым ліку «Беларускай савецкай энцыклапедыі». Па іх ініцыятыве ў 1989 г. быў выдадзены «Юрыдычны слоўнік». Юрысты-гісторыкі (Я. А. Юхо, Т. І. Доўнар, Л. В. Паўлава і інш.) удзельнічалі ў перавыданні знакамітага помніка права – Статута ВКЛ 1588 г. (1989), падрыхтоўцы шэрага энцыклапедычных выданняў: «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (у 6 тамах; 1994–2003), энцыклапедычнага даведніка «Мысліцелі і асветнікі Беларусі» (1995), энцыклапедыі «Вялікае Княства Літоўскае» (у 2 тамах; 2005–2006) і інш.

## РАЗВІЦЦЁ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА Ў ПЕРЫЯД НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1991–2025)*

З набыццём рэспублікай у канцы XX ст. суверэнітэту пачаўся якасна новы этап развіцця беларускай юрыдычнай навукі, які праявіўся ва ўсіх яе галінах і кірунках. Аб гэтым сведчаць шматлікія публікацыі супрацоўнікаў юрыдычнага факультэта БДУ (манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і інш.), якія адлюстравалі новыя тэндэнцыі ў айчыннай прававой навуцы і былі скіраваны на выпрацоўку тэарэтычных падстаў прававой рэформы і пошук найбольш эфектыўных сродкаў рэфармавання грамадскіх адносін для забеспячэння суверэннага і паступальнага развіцця Рэспублікі Беларусь. У працах тэарэтыкаў права А. М. Абрамовіча, С. Р. Драбязкі, С. А. Калініна, Д. А. Лагуна, А. М. Фіронава, А. Г. Цікавенкі і іншых значная ўвага адведзена праблемам удасканалення дзяржаўнага апарату шляхам пабудовы ў Рэспубліцы Беларусь дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы. Гісторыкі права А. І. Арлоўская, Л. Л. Голубева, Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, І. А. Юхо і іншыя даследавалі пытанні айчыннай і замежнай дзяржаўна-прававой гісторыі.

* Аўтары: А. В. Шыдлоўскі, С. А. Балашэнка, Т. І. Доўнар і Л. Л. Голубева.

Пад кіраўніцтвам Р. А. Васілевіча, які выдаў шмат манаграфій і падручнікаў, навукоўцы кафедры канстытуцыйнага права (А. М. Крамнік, Н. М. Кандратовіч, Т. С. Маслоўская, Л. А. Прыходзька, А. В. Шаўцова і інш.) праводзілі даследаванні ў сферы канстытуцыйнага і адміністрацыйнага права.

Праблемы грамадзянскага і сямейнага права актыўна распрацоўвалі В. М. Гадуноў, М. П. Караткевіч, М. В. Мяшчанава, У. А. Раманенка, А. М. Рамановіч, С. П. Сакалоў, І. П. Траццякова, І. М. Шчамялёва і інш.

У публікацыях В. С. Курылёвай, Х. Т. Мялешкі, Т. М. Петачэнкі, Г. Б. Шышко і іншых вучоных разглядаліся пытанні працоўнага права. Праблемы грамадзянска-працэсуальнага права адлюстраваны ў даследаваннях Т. А. Бяловай, І. М. Калядкі, І. М. Казей, В. М. Раманавай, В. В. Ціхановіча, В. Г. Ціхіні, М. Р. Юркевіча і інш.

Актуальныя пытанні крымінальнага права і крымінальнага працэсу даследаваны ў шматлікіх працах А. У. Баркова, М. А. Бабія, В. М. Бібілы, І. А. Грунтова, А. А. Данілевіча, Л. Л. Зайцавай, І. І. Марціновіч, В. І. Самарына, У. М. Хоміча, А. В. Шыдлоўскага і інш. Праблемы крыміналістыкі вывучалі І. Р. Вярэнчыкаў, А. Я. Гучок, А. В. Дулаў, А. В. Лапін, А. С. Рубіс, А. М. Хлус, Р. А. Шумак і інш.

Пад навуковым кіраўніцтвам В. С. Камянкова вывучаліся пытанні фінансавага, падатковага і банкаўскага права, аб чым сведчыць калектыўная манаграфія В. С. Камянкова, А. А. Піліпенкі і Я. І. Функа.

Новым кірункам юрыдычнай навукі Беларусі сталі навуковыя даследаванні ў сферы экалагічнага права і аховы навакольнага асяроддзя (С. А. Балашэнка, Н. А. Карповіч, В. Я. Лізгара, Т. І. Макарава, І. С. Шахрай, Н. А. Шынгель і інш.).

Актыўныя даследаванні ў сферы палітычных навук праводзяць навукоўцы пад кіраўніцтвам прафесараў С. В. Рашэтнікава і Н. А. Антановіч. Вынікам іх працы стала выданне шэрага навуковых артыкулаў і калектыўных манаграфій. Так, былі надрукаваны калектыўная манаграфія «Государственная политика и управление в Республике Беларусь» (2010), манаграфія А. П. Мельнікава «Политическая культура на постсоветском пространстве» (2014) і інш. Падручнік «Политология», падрыхтаваны калектывам выкладчыкаў кафедры пад рэдакцыяй С. В. Рашэтнікава, з 1999 па 2013 г. атрымаў восем выданняў. У 2022 г. выйшаў адноўлены дапаможнік «Политология» пад навуковай рэдакцыяй прафесара Н. А. Антановіч.

У 2005 г. у жыцці юрыдычнага факультэта адбылася знакавая падзея – пераезд у новы будынак па адрасе вул. Ленінградская, 8.



Сучасны вучэбны корпус юрыдычнага факультэта БДУ,
вул. Ленінградская, 8



Урачыстая цырымонія адкрыцця новага будынка юрыдычнага факультэта БДУ. 31 жніўня 2005 г.

Важным кірункам дзейнасці юрыдычнага факультэта стаў удзел яго супрацоўнікаў у навуковым каменціраванні кодэксаў, законаў і іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, а таксама ў распрацоўцы і навуковай экспертызе праектаў нарматыўных прававых актаў.






Президент
Республики Беларусь

Профессорско-преподавательскому коллективу
и сотрудникам юридического факультета
Белорусского государственного университета

Дорогие друзья!

Поздравляю вас с важным событием в жизни всего правового сообщества Беларуси – 90-летием со дня создания юридического факультета Белорусского государственного университета.

За время своего существования факультет подготовил порядка 25 тысяч квалифицированных юристов, которые всегда были и будут востребованными в судебной системе, правоохранительных органах, адвокатуре, нотариате, юридической науке, на предприятиях нашей страны.

Среди выпускников факультета – министры, депутаты, послы, руководители Конституционного и Верховного судов, Генеральной прокуратуры и других органов в сфере юстиции.

Вы – кузница юридических кадров Беларуси.

Сохранение и уважение правовых традиций в сочетании с современными методами обучения юристов, преданностью делу профессорско-преподавательского коллектива делает этот факультет гордостью не только БГУ, но и всей образовательной системы нашей страны.

Ваши знания и опыт позволяют подготавливать юристов, способных решать сложные задачи, помня древнюю мудрость: Jus est ars boni et aequi – право есть искусство добра и справедливости.

Желаю всем здоровья, трудовых успехов, счастья и благополучия!

Александр Лукашенко

19 октября 2015 года

Віншавальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі прафесарска-выкладчыцкаму калектыву і супрацоўнікам юрыдычнага факультэта БДУ з нагоды 90-годдзя з дня заснавання. 19 кастрычніка 2015 г.



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падчас уручэння дыплома доктара юрыдычных навук намесніку дэкана юрыдычнага факультэта БДУ (2010–2015) В. І. Чупрыс. 2012 г.



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падчас уручэння атэстата прафесара дэкану юрыдычнага факультэта БДУ (2002–2020) С. А. Балашэнку. 29 студзеня 2008 г.



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падчас уручэння Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь намесніку дэкана юрыдычнага факультэта БДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце (2006–2020) А. В. Шыдлоўскаму. 18 чэрвеня 2019 г.



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падчас уручэння Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь загадчыку кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (2008–2021) С. А. Калініну. 26 чэрвеня 2015 г.



Кіраўніцтва, выкладчыкі і студэнты юрыдычнага факультэта БДУ на сустрэчы са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь І. П. Сергяенкам (*у цэнтры*). 2025 г.



Рэктар БДУ А. Д. Кароль (*злева*), прарэктар па навуковай рабоце БДУ А. В. Блахін (*справа*) і дэкан юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскі (*у цэнтры*) падчас правядзення ўрачыстай лінейкі, прысвечанай Дню ведаў. 1 верасня 2023 г.



Урачыстая лінейка БДУ, прысвечаная Дню ведаў. 1 верасня 2023 г.



Выступленне Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь Я. І. Каваленка на ўрачыстай лінейцы першакурснікаў, прысвечанай Дню ведаў. 1 верасня 2025 г.


















Сустрэча рэктара БДУ А. Д. Караля са студэнтамі юрыдычнага факультэта. 19 лютага 2024 г.




Адкрыты дыялог дэкана юрыдычнага факультэта БДУ
А. В. Шыдлоўскага са студэнтамі. 20 снежня 2024 г.



Дарожная карта супрацоўніцтва юрыдычнага факультэта БДУ
і Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў
пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ. 18 верасня 2023 г.




Агульнарэспубліканскі ўрок «Эстафета пакаленняў:
зберагаючы мінулае, ствараем будучыню» для першакурснікаў
юрыдычнага факультэта. 1 верасня 2025 г.














Юрыдычны факультэт на Беларускім юрыдычным форуме
«Право в современном мире». 28–29 лістапада 2024 г.





Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
галоўны рэдактар часопіса «Право.by» В. І. Чупрыс падчас узнагароды
прадстаўнікоў юрыдычнага факультэта з нагоды 15-годдзя часопіса






Прадстаўнікі юрыдычнага факультэта на конкурсе
«Вяршыня права» Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь:
у намінацыі «Навука і права» прызам конкурсу за манаграфію
«Дифференциация и индивидуализация лишения свободы:
правовое и криминологическое обеспечение» ўзнагароджаны А. В. Шыдлоўскі;
у намінацыі «Суд» – аўтарскі калектыў кнігі «Белорусское правосудие:
исторический опыт и современность» (пад рэд. Л. Л. Голубевай)



Удзельнікі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
«Белорусское правосудие: исторический опыт и современность»,
прысвечанай 100-годдзю Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.
15 лютага 2023 г.




Калектыў аўтараў кнігі
«100 лет Верховному Суду Беларуси:
Право. Закон. Справедливость»



Дыялогавая пляцоўка «Обеспечение мира и гражданского согласия – конституционная цель общества и государства» з удзелам суддзі Канстытуцыйнага Суда С. А. Любецкай. 19 верасня 2025 г.

Традыцыйнымі на факультэце сталі штогадовыя навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі, на якіх абмяркоўваюцца важнейшыя праблемы юрыдычнай навукі і адбываецца абмен вопытам з вучонымі іншых краін.

Важнай традыцыяй факультэта стала ўшанаванне тых навукоўцаў старэйшага пакалення, якія ўнеслі самы значны ўклад у развіццё айчыннай прававой навукі. На факультэце штогод праводзяцца міжнародныя канференцыі ў гонар гэтых выдатных беларускіх навукоўцаў. Так, адбыліся канферэнцыі, прысвечаныя юбілеям прафесараў С. Р. Драбязкі (2012), В. Ф. Чыгіра (2014, 2024), А. В. Дулава (2014), І. І. Марціновіч (2017), Т. І. Доўнар (2024), Р. А. Васілевіча (2025).



Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя,
прысвечаная 70-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара,
члена-карэспандэнта НАН Беларусі, заслужанага юрыста
Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіча. 13 сакавіка 2025 г.



Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь С. Р. Драбязкі (*справа*). 11 кастрычніка 2012 г.




Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь І. І. Марціновіч. 9–12 лістапада 2017 г.



Віншаванне з нагоды 90-годдзя доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь В. Ф. Чыгіра (*стаіць у цэнтры*). 4–5 лістапада 2014 г.



Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь В. Ф. Чыгіра (*у першым радзе чацвёрты справа*). 4–5 лістапада 2014 г.







Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь В. Ф. Чыгіра. 24 верасня 2024 г.





Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь А. В. Дулава. 31 кастрычніка – 1 лістапада 2014 г.




Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя,
прысвечаная 80-годдзю доктара юрыдычных навук
прафесара Т. І. Доўнар. 17 кастрычніка 2024 г.

Прайшлі міжнародныя канферэнцыі, прысвечаныя памяці прафесараў І. А. Юхо (2011, 2021), М. В. Сторажава (2014), М. Р. Юркевіча (2018), А. М. Абрамовіча (2019, 2024), А. В. Дулава (2019, 2024), С. В. Курылёва (2019), І. С. Цішкевіча (2019), С. Р. Драбязкі (2022) і інш. Былі выдадзены працы гэтых навукоўцаў.













Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя,
прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук,
прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь А. М. Абрамовіча.
24–25 мая 2024 г.









Круглы стол з міжнародным удзелам, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь А. В. Дулава. 25 кастрычніка 2024 г.



Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя,
арганізаваная Інстытутам перападрыхтоўкі і павышэння
кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў
і ўстаноў юстыцыі БДУ сумесна з юрыдычным факультэтам БДУ
і Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых
даследаванняў Рэспублікі Беларусь. 12–13 верасня 2019 г.

Не толькі ў БДУ, але і ва ўсёй Беларусі юрыдычны факультэт з'яўляецца флагманам у сферы падрыхтоўкі юрыдычных і навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Вядучыя вучоныя факультэта кіруюць аспірантамі і саіскальнікамі навуковых ступеняў, прымаюць удзел у экспертызе і апаніраванні па дысертацыйных даследаваннях і інш. Пры БДУ актыўна дзейнічаюць доктарскія саветы па абароне дысертацый па прававых навуках, а таксама савет па палітычных навуках. Толькі за апошняе дзесяцігоддзе выкладчыкамі факультэта, аспірантамі і саіскальнікамі навуковых ступеняў было абаронена звыш 80 кандыдацкіх і 5 доктарскіх дысертацый.

Аб поспехах у навуковых даследаваннях на юрыдычным факультэце сведчаць не толькі фарміраванне шэрага навуковых школ і абарона шматлікіх дысертацый, але і распрацоўка падручнікаў і дапаможнікаў (толькі за апошнія гады пабачылі свет звыш 20 падручнікаў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь), выпуск шматлікіх вучэбна-метадычных комплексаў, навукова-практычных каментарыяў, практыкумаў, разнастайных даведнікаў па прававых пытаннях, «Белорусской юридической энциклопедии» (у 4 тамах; 2007–2014), калектыўных навуковых прац. Неаднойчы выданні супрацоўнікаў юрыдычнага факультэта БДУ станавіліся лаўрэатамі нацыянальных і міжнародных прэмій.

Многія прадстаўнікі факультэта ў розны час актыўна ўдзельнічалі ў працы розных дзяржаўных камісій, рабочых груп і інш. Напрыклад, А. А. Галаўко і С. Р. Драбязка ўваходзілі ў склад рабочых груп па падрыхтоўцы праектаў трох канстытуцый – СССР 1977 г., БССР 1978 г. і Рэспублікі Беларусь 1994 г. Р. А. Васілевіч на працягу некалькіх гадоў удзельнічаў у працы рабочых груп па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. У перыяд сваёй дзейнасці ў Вярхоўным Савеце з 1986 па 1994 г. ён распрацаваў амаль 400 законапраектаў. В. Ф. Чыгір і В. М. Гадуноў таксама былі членамі Канстытуцыйнай камісіі па распрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. А. М. Абрамовіч з'яўляўся адным з галоўных распрацоўшчыкаў прынцыповых змяненняў новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1996 г. У 1922 г. у складзе Канстытуцыйнай камісіі працавалі загадчык кафедры канстытуцыйнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт

НАН Беларусі, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіч, а таксама дацэнт кафедры канстытуцыйнага права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Т. С. Маслоўская.

С. В. Курылёў прымаў актыўны ўдзел у працы па кадыфікацыі заканадаўства БССР у 1960-я гг., з'яўляўся членам Грамадскага савета па прававых пытаннях пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР. Ён разам з групай распрацоўшчыкаў, у склад якой уваходзіў таксама І. А. Юхо, прымаў удзел у падрыхтоўцы Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса БССР 1964 г.

І. І. Марціновіч і В. С. Камянкоў былі распрацоўшчыкамі Канцэпцыі судова-прававой рэформы (1992). А. М. Абрамовіч выступаў адным з галоўных ініцыятараў шырокай кадыфікацыі і сістэматызацыі нацыянальнага заканадаўства ў 1990-я гг. В. Ф. Чыгір з'яўляўся адным з распрацоўшчыкаў мадэльнага Грамадзянскага кодэкса для краін – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД), а В. С. Камянкоў – адным з распрацоўшчыкаў мадэльных Грамадзянскага кодэкса і Закона «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)». В. М. Гадуноў, В. С. Камянкоў, В. Ф. Чыгір і Я. І. Функ уваходзілі ў састаў рабочых груп па падрыхтоўцы праектаў Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1998 г. і іншых заканадаўчых актаў. Т. А. Бялова, І. М. Калядка, В. С. Камянкоў, Я. І. Функ і М. Р. Юркевіч удзельнічалі ў распрацоўцы Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1998 г. А. А. Данілевіч узначальваў рабочую групу па падрыхтоўцы Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1999 г.

В. І. Чуприс прымала ўдзел у распрацоўцы заканадаўства ў сферы дзяржаўнай службы, адміністрацыйных правапарушэнняў. С. А. Балашэнка, Т. І. Макарава, В. Я. Лізгара, І. П. Кузьміч і І. С. Шахрай былі членамі рабочых груп па падрыхтоўцы змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб ахове навакольнага асяроддзя», а таксама Ляснога кодэкса Рэспублікі Беларусь, законаў «Аб сельскагаспадарчых кааператывах», «Аб асабістых падсобных гаспадарках грамадзян» і інш.

Многія выкладчыкі факультэта маюць вопыт практычнай юрыдычнай працы. Так, І. А. Юхо займаў пасаду намесніка старшыні юрыдычнай камісіі пры Савеце Міністраў БССР. С. Р. Драбязка на працягу 12 гадоў уваходзіў у склад Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, з'яўляўся Старшынёй Навукова-кансультатыўнага савета пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь. А. М. Абрамовіч займаў пасады намесніка кіраўніка Камітэта канстытуцыйнага нагляду СССР, Старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, Намесніка Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Р. А. Васілевіч займаў пасады Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь. М. Р. Юркевіч узначальваў Міжнародны арбітражны суд пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце. В. Ф. Чыгір быў членам прэзідыума і арбітрам Міжнароднага арбітражнага суда пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце. В. М. Гадуноў, У. П. Мароз і А. Ф. Храпуцкі з'яўляліся арбітрамі гэтага ж суда. М. В. Мяшчанава выступала членам прэзідыума і арбітрам Міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда «Палата арбітраў пры Саюзе юрыстаў». В. М. Гадуноў таксама быў арбітрам гэтага суда. З 1996 па 2011 г. ён з'яўляўся Намеснікам Старшыні і членам Прававога Кансультатыўнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, а таксама членам навукова-кансультатыўных саветаў пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, Вярхоўным Судзе

Рэспублікі Беларусь і Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь. Арбітрамі Міжнароднага арбітражнага суда былі Т. А. Бялова, І. М. Калядка, І. І. Верхаводка, Ц. В. Сысуеў і У. П. Скобелеў, а Т. А. Бялова з'яўлялася членам Прэзідыума гэтага суда. Яна была членам Прававога кансультатыўнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, а І. М. Калядка – членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь. Членамі Навукова-кансультатыўнага савета пры Вышэйшым Гаспадарчым Судзе Рэспублікі Беларусь выступалі І. М. Калядка, І. І. Верхаводка, Ц. В. Сысуеў і Г. У. Якаўлева. Т. А. Бялова з'яўлялася членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь і членам кваліфікацыйнай камісіі па натарыяльнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь. В. М. Бібіла ўваходзіць у склад навукова-кансультатыўных саветаў пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Супрацоўнікі кафедры крымінальнага права і кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду з'яўляюцца членамі навукова-кансультатыўных саветаў пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь, а таксама пры Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і інш. І. А. Грунтоў выступае членам Савета па пытаннях прававой і судовай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Прадстаўнікі кафедры аказваюць актыўную дапамогу Вярхоўнаму Суду Рэспублікі Беларусь у абагульненні судовай практыкі па ўжыванні крымінальнага і крымінальна-выканаўчага заканадаўства, у падрыхтоўцы праектаў пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда. А. В. Шыдлоўскі ўваходзіць у склад Вышэйшай кваліфікацыйнай калегіі суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

На сучасным этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці выкладчыкі юрыдычнага факультэта працягваюць навуковую распрацоўку праблемных праектаў новых нарматыўных актаў, займаюцца падрыхтоўкай маладой змены і інш. У цэнтры іх увагі пастаянна знаходзяцца актуальныя пытанні тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага, адміністрацыйнага, фінансавага, грамадзянскага, экалагічнага, зямельнага, крымінальнага, працэсуальнага і іншых галін права. Актыўна даследуюцца пытанні беларуска-расійскай інтэграцыі, суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і гарантый яго забеспячэння ў прававой, эканамічнай, сацыяльнай і іншых сферах.

Вучоныя-юрысты ўносяць вялікі ўклад у працэс удасканалення арганізацыі і дзейнасці дзяржаўнага апарату, кадыфікацыю заканадаўства, распрацоўку новых форм і сродкаў забеспячэння законнасці як неабходнай умовы фарміравання грамадзянскай супольнасці і сацыяльнай прававой дзяржавы. Юрыдычны факультэт на працягу апошніх дзесяцігоддзяў актыўна ўдзельнічае ў выкананні дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, у сумесных міжнародных даследчых праектах. На наступныя пяць гадоў запланавана кіраўніцтва шасцю рэспубліканскімі праграмамі навуковых даследаванняў.

Факультэт спалучае гістарычныя традыцыі класічнай юрыдычнай адукацыі і інавацыйныя падыходы ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях. Сярод новых напрамкаў можна адзначыць альтэрнатыўныя спосабы вырашэння канфліктаў, інфармацыйнае, медыцынскае, спартыўнае і іншае права.

На юрыдычным факультэце праводзіцца шэраг дыялогавых пляцовак з вышэйшымі службовымі асобамі Рэспублікі Беларусь.

Факультэт ушаноўвае памяць выдатных навукоўцаў і таленавітых педагогаў. У межах праекта «Наследие права» выдаюцца іх навуковыя працы.


А.М. АБРАМОВИЧ
ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

БЕЛОРУССКИЕ МЫСЛИТЕЛИ XVI–XVII вв.
ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

А.А. ГОЛОВКО
ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

С.Г. Дробязко
ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

И.И. МАРТИНОВИЧ
ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ

Н.Г. ЮРКЕВИЧ
ИЗБРАННЫЕ ТРУДЫ






Дыялогавая пляцоўка на юрыдычным факультэце па абмеркаванні
праекта Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь
з удзелам Намесніка Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь,
генерал-маёра юстыцыі, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь
А. А. Рахманава і начальніка інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення
Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь
А. Л. Банькоўскага. 15 верасня 2023 г.





Дыялогавая пляцоўка «Права вачыма бацькоў: падтрымка дзяржавай інстытута
сям’і», прысвечаная святкаванню Дня бацькі на юрыдычным факультэце
з удзелам Першага намесніка Главы Адміністрацыі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь (2016–2024) Міністра замежных спраў
Рэспублікі Беларусь (з 2024 г.) М. У. Рыжанкова. 21 кастрычніка 2022 г.




Дыялогавая пляцоўка «Электаральная кампанія:
ад прававой асветы да актыўнай грамадзянскай пазіцыі»
з удзелам кіраўніцтва РГА «Патрыёты Беларусі». 4 снежня 2024 г.







Дыялогавая пляцоўка «Аб дзейнасці Міністэрства юстыцыі
Рэспублікі Беларусь і патрыятычным выхаванні моладзі»
з удзелам Першага намесніка Міністра юстыцыі
Рэспублікі Беларусь Н. М. Філіпавай. 28 лютага 2024 г.



Дыялогавая пляцоўка «Захаванне законнасці
ў маладзёжным асяроддзі» з удзелам Намесніка Міністра
ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь – начальніка
крымінальнай міліцыі генерал-маёра міліцыі Г. А. Казакевіча
напярэдадні адзінага дня галасавання. 6 лютага 2024 г.



Юрыдычны факультэт у Белтэлерадыёкампаніі
напярэдадні Дня народнага адзінства. 16 верасня 2024 г.



Прадстаўнікі кіраўніцтва і студэнты юрыдычнага факультэта БДУ
на ўрачыстай лінейцы, прысвечанай Дню народнага адзінства.
17 верасня 2024 г.



Зборніку навуковых прац «Права і дэмакратыя» 25 гадоў.
Прэзентацыя юбілейнага выпуску на чале з галоўным рэдактарам зборніка прафесарам В. М. Бібілай



Дактары юрыдычных навук прафесары (*злева направа*)
А. М. Абрамовіч, Т. І. Доўнар і Р. А. Васілевіч на прэзентацыі навуковых выданняў юрыдычнага факультэта БДУ



Студэнты юрыдычнага факультэта БДУ падчас віншавання загадчыка кафедры канстытуцыйнага права Р. А. Васілевіча з юбілеем. 13 лютага 2025 г.



Святкаванне Новага года на юрыдычным факультэце. Снежань 2021 г.



Святкаванне 8 Сакавіка на юрыдычным факультэце. 7 сакавіка 2025 г.




Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскі
падчас уручэння дыпломаў выпускнікам. 2025 г.





Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь І. П. Сергяенка падчас уручэння дыпломаў
выпускнікам юрыдычнага факультэта. 2025 г.











Уручэнне дыпломаў выпускнікам юрыдычнага факультэта. 2025 г.





Выпускны баль. 2023 г.

У 2025 г. на факультэце навучаецца 2580 студэнтаў, з іх 2410 – на першай ступені атрымання адукацыі (у тым ліку больш за 100 прадстаўнікоў замежных дзяржаў) і 62 – на другой ступені. Дысертацыі рыхтуюць да абароны 100 аспірантаў і 41 дактарант. Падрыхтоўка на першай ступені атрымання вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца па трох спецыяльнасцях і васьмі спецыялізацыях, а на другой (у магістратуры) – па дзвюх спецыяльнасцях і васьмі прафілізацыях.

Сярод вышэйшых дзяржаўных службовых асоб, якія скончылі юрыдычны факультэт БДУ, мы можам адзначыць В. М. Герасімава (Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь), П. П. Міклашэвіча (Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь), В. А. Сукалу (Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь), А. І. Шведа (Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь). У сферы юрыспрудэнцыі, дзяржаўнай службы і палітыкі мы можам адзначыць слаўныя імёны такіх асоб, як Ю. Г. Амбразевіч, Н. У. Барысенка, Д. Ю. Баскаў, Р. А. Васілевіч, А. А. Гаеў, А. Я. Гучок, В. Д. Іпатаў, В. С. Камянкоў, В. Л. Калінковіч, С. В. Кандрацьеў, А. У. Канюк, Н. А. Карповіч, Ю. В. Кобец, М. С. Маркаў, В. В. Міцкевіч, А. М. Мяцеліца, Г. П. Падразёнак, Н. У. Пяткевіч, А. А. Рахманаў, М. У. Рыжанкоў, С. М. Сівец, А. К. Стук, І. У. Тылец, Н. М. Філіпава, Я. І. Функ, В. І. Чупрыс, А. С. Шандаровіч, А. І. Швакаў і многіх іншых. Выпускнікамі нашага факультэта ганарыцца ўся юрыдычная супольнасць Беларусі і па-за яе межамі. Кожны з іх мае заслужаны аўтарытэт у грамадстве.



Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь
заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь В. А. Сукала
падчас дарэння Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнку
эксклюзіўнага экзэмпляра спецыяльнага выдання,
прысвечанага гісторыі беларускага правасуддзя. 14 красавіка 2023 г.







Сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь Н. І. Качанавай са студэнтамі Беларускага
дзяржаўнага ўніверсітэта ў рамках моладзевага патрыятычнага праекта
«Школа маладога выбаршчыка». 23 снежня 2024 г.




Сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. Качанавай са студэнцкай моладдзю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у тым ліку студэнтамі першага курса юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 16 лютага 2024 г.



Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь П. П. Міклашэвіч і Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь В. І. Чупрыс на прэзентацыі Навукова-практычнага каментарыя да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. 13 сакавіка 2024 г.



Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь В. М. Герасімаў на сумесным пасяджэнні палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. 23 красавіка 2024 г.



Удзел Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнага саветніка юстыцыі 2-га класа, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь А. І. Шведа ў прынясенні прысягі маладымі пракурорскімі работнікамі ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 2 снежня 2022 г.



Урачыстае адкрыццё класа «Юны пракурор» у мінскай гімназіі № 38 імя Н. А. Шугаева з удзелам Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнага саветніка юстыцыі 2-га класа, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь А. І. Шведа (*другі справа*) і дэкана юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскага (*першы злева*). 5 верасня 2024 г.



Сустрэча Намесніка Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь (2022–2025) Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі пры Святым Прастоле (з 2025 г.) Ю. Г. Амбразевіча са студэнтамі і выкладчыкамі БДУ. 25 кастрычніка 2024 г.



Удзел старшыні Беларускай натарыяльнай палаты Н. У. Барысенка ва ўрачыстай лінейцы першакурснікаў. 30 жніўня 2024 г.



Дырэктар Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных дадзеных, намеснік старшыні Беларускага рэспубліканскага саюза юрыстаў, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь А. А. Гаеў на Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіядзе – 2025 на юрыдычным факультэце БДУ. 19 сакавіка 2025 г.



Старшыня ВАК Рэспублікі Беларусь А. Я. Гучок падчас уручэння магістранту юрыдычнага факультэта БДУ выкладчыку кафедры грамадзянскага права (з 2022 г.) К. А. Мацвеевай узнагароды на ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання лаўрэатаў XXVIII Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў. 23 чэрвеня 2022 г.



Удзел Намесніка Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь В. Д. Іпатава (*стаіць*) у міжнародным навукова-практычным круглым стале на юрыдычным факультэце БДУ. 19 красавіка 2022 г.



Удзел Начальніка Сакратарыята Усебеларускага народнага сходу, старшыні ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў», заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь В. В. Міцкевіча (*у першым радзе па цэнтры*) у прэзентацыі кнігі прафесара кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права М. Р. Юркевіча «Избранные труды» ў рамках выдавецкага і асветніцкага праекта «Наследие права». 16 чэрвеня 2015 г.




Першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь В. Л. Калінковіч на пасяджэнні савета БДУ падчас уручэння Ганаровай граматы дэкану юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскаму, падзякі Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь намесніку дэкана па навуковай рабоце С. А. Калініну і падзякі Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь загадчыку кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Л. Л. Голубевай. 29 мая 2023 г.



Урачысты прыём з удзелам рэктара БДУ А. Д. Караля (*шосты справа*) і дэкана юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскага (*першы злева*) у гонар выпускнікоў універсітэта з ліку прадстаўнікоў дыпламатычнага корпуса Беларусі, сярод якіх ганаровы выпускнік юрыдычнага факультэта Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Арменія (2020–2025) А. У. Канюк (*шосты злева*). 31 ліпеня 2023 г.



Першы намеснік Главы Адміністрацыі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2024–2025)
Намеснік Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь
(з 2025 г.) Н. У. Пяткевіч падчас урачыстай цырымоніі
ўручэння пашпартоў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь
у рамках усебеларускай акцыі «Мы – грамадзяне Беларусі!».
14 сакавіка 2025 г.



Дыялогавая пляцоўка
з удзелам Намесніка Старшыні
Канстытуцыйнага Суда
Рэспублікі Беларусь заслужанага
юрыста Рэспублікі Беларусь
Н. А. Карповіч напярэдадні
Дня Канстытуцыі Рэспублікі
Беларусь. 14 сакавіка 2024 г.



Даклад Старшыні Пастаяннай камісіі Палаты
прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі
Беларусь па заканадаўстве (2019–2024),
суддзі Канстытуцыйнага Суда
Рэспублікі Беларусь (з 2024 г.), заслужанага
юрыста Рэспублікі Беларусь С. А. Любецкай
у рамках круглага стала на юрыдычным
факультэце БДУ. 10 сакавіка 2023 г.



Старшыня ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў»,
Начальнік Сакратарыяту Усебеларускага народнага сходу (з 2024 г.),
заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь В. В. Міцкевіч падчас уручэння
вышэйшай юрыдычнай прэміі «Феміда» загадчыку кафедры крыміналістыкі
юрыдычнага факультэта БДУ В. Б. Шабанаву. 1 снежня 2023 г.



Намеснік Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь А. А. Рахманаў на 20-годдзі Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды на юрыдычным факультэце БДУ. 20 сакавіка 2024 г.



Першы намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2016–2024) Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь (з 2024 г.) М. У. Рыжанкоў падчас дыялогавай пляцоўкі «Права вачыма бацькоў: падтрымка дзяржавай інстытута сям'і», прымеркаванай да святкавання Дня бацькі на юрыдычным факультэце БДУ. 21 кастрычніка 2022 г.



Удзел старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці С. М. Сіўца ва ўрачыстай лінейцы «Віват, першакурснік!» на юрыдычным факультэце, прысвечанай Дню ведаў. 31 жніўня 2022 г.



Удзел першага намесніка Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь Н. М. Філіпавай ва ўрачыстай лінейцы для першакурснікаў юрыдычнага факультэта, прысвечанай Дню ведаў. 30 жніўня 2024 г.





Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь В. І. Чупрыс на прэзентацыі Навукова-практычнага каментарыя да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пад агульнай рэдакцыяй Старшыні Канстытуцыйнага Суда П. П. Міклашэвіча, Намесніка Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь В. І. Чупрыс і загадчыка кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ Р. А. Васілевіча. 13 сакавіка 2024 г.



Першы намеснік Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А. Г. Бахановіч (*справа*) падчас узнагароджання Старшыні Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў А. І. Швакава Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. 20 сакавіка 2024 г.





Сустрэча дэкана юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскага
і студэнтаў, якія навучаюцца па мэтавым накіраванні
Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, з Першым намеснікам
Старшыні Следчага камітэта А. С. Шандаровічам
і следчымі ў цэнтральным апараце Следчага камітэта
Рэспублікі Беларусь. 26 кастрычніка 2022 г.

Сёння ў структуру факультэта ўваходзяць 12 кафедр і лабараторыя крыміналістыкі. У 2020 г. створаны Цэнтр адукацыйных інавацый. На факультэце працуюць 246 выкладчыкаў, у тым ліку і практыкуючыя юрысты: 1 член-карэспандэнт НАН Беларусі, 143 кандыдаты і 23 дактары навук, сярод якіх 21 прафесар і 117 дацэнтаў. Падрыхтоўку ажыццяўляюць заслужаныя дзеячы адукацыі, юстыцыі, вядомыя прафесары і дацэнты, найлепшыя тэарэтыкі і практыкі ў сферы юрыспрудэнцыі. Факультэт наладдзіў цесныя сувязі з дзяржаўнымі органамі, юрыдычнымі кампаніямі, юрыдычнымі падраздзяленнямі іншых вышэйшых навучальных устаноў краіны, а таксама навуковымі ўстановамі Беларусі і замежных дзяржаў.

Юрыдычная навука і адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь прайшла доўгі шлях развіцця, на працягу якога роля і значэнне юрыдычнага факультэта БДУ – пачынальніка і вядучага цэнтра вышэйшай юрыдычнай адукацыі і навуковых даследаванняў

у галіне права – пастаянна ўзрастала. Юрыдычны факультэт БДУ застаецца флагманам айчыннай вышэйшай юрыдычнай адукацыі і беларускай прававой навукі.

Цікавасць выклікаюць архіўныя звесткі.

Пасля аднаўлення дзейнасці Мінскага юрыдычнага інстытута ў 1944 г. дыпломы аб яго заканчэнні з 1946 па 1954 г. атрымалі 1369 выпускнікоў.

З 1946 па 1954 г. на базе Мінскага юрыдычнага інстытута працаваў Мінскі філіял Усесаюзнага юрыдычнага завочнага інстытута, які за гэты перыяд закончыў 621 выпускнік.

З 1964 па 1990 г. на юрыдычным факультэце БДУ існавала вячэрняе аддзяленне. За 26 гадоў яго выпускнікамі сталі 770 студэнтаў:

| | | |
|---|---|---|
| 1964 г. – 0; | 1973 г. – 32; | 1982 г. – 34; |
| 1965 г. – 26; | 1974 г. – 34; | 1983 г. – 31; |
| 1966 г. – 17; | 1975 г. – 33; | 1984 г. – 28; |
| 1967 г. – 20; | 1976 г. – 31; | 1985 г. – 20; |
| 1968 г. – 25; | 1977 г. – 26; | 1986 г. – 23; |
| 1969 г. – 28; | 1978 г. – 29; | 1987 г. – 29; |
| 1970 г. – 29; | 1979 г. – 33; | 1988 г. – 37; |
| 1971 г. – 32; | 1980 г. – 36; | 1989 г. – 44; |
| 1972 г. – 28; | 1981 г. – 29; | 1990 г. – 36. |

За 70 гадоў – з 1955 па 2025 г. – дзённую форму навучання на юрыдычным факультэце закончылі 15 449 студэнтаў (у 1956 г. выпуску не было ў сувязі з пераходам на пяцігадовы тэрмін навучання):

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1955 г. – 244; | 1972 г. – 102; | 1990 г. – 154; | 2008 г. – 268; |
| 1956 г. – выпуску не было; | 1973 г. – 126; | 1991 г. – 171; | 2009 г. – 271; |
| | 1974 г. – 129; | 1992 г. – 183; | 2010 г. – 384; |
| 1957 г. – 82; | 1975 г. – 149; | 1993 г. – 248; | 2011 г. – 351; |
| 1958 г. – 73; | 1976 г. – 164; | 1994 г. – 179; | 2012 г. – 345; |
| 1959 г. – 90; | 1977 г. – 144; | 1995 г. – 183; | 2013 г. – 334; |
| 1960 г. – 43; | 1978 г. – 146; | 1996 г. – 153; | 2014 г. – 373; |
| 1961 г. – 59; | 1979 г. – 141; | 1997 г. – 220; | 2015 г. – 347; |
| 1962 г. – 50; | 1980 г. – 144; | 1998 г. – 216; | 2016 г. – 336; |
| 1963 г. – 73; | 1981 г. – 145; | 1999 г. – 210; | 2017 г. – 581; |
| 1964 г. – 58; | 1982 г. – 144; | 2000 г. – 252; | 2018 г. – 286; |
| 1965 г. – 36; | 1983 г. – 129; | 2001 г. – 263; | 2019 г. – 306; |
| 1966 г. – 55; | 1984 г. – 148; | 2002 г. – 278; | 2020 г. – 317; |
| 1967 г. – 32; | 1985 г. – 155; | 2003 г. – 291; | 2021 г. – 310; |
| 1968 г. – 48; | 1986 г. – 149; | 2004 г. – 206; | 2022 г. – 307; |
| 1969 г. – 68; | 1987 г. – 150; | 2005 г. – 203; | 2023 г. – 325; |
| 1970 г. – 70; | 1988 г. – 133; | 2006 г. – 227; | 2024 г. – 309; |
| 1971 г. – 85; | 1989 г. – 119; | 2007 г. – 210; | 2025 г. – 296. |

Першы выпуск студэнтаў завочнай формы навучання на юрыдычным факультэце адбыўся ў 1955 г. За 70 гадоў – з 1955 па 2025 г. – яго выпускнікамі сталі 13 713 студэнтаў:

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1955 г. – 153; | 1973 г. – 124; | 1991 г. – 145; | 2009 г. – 179; |
| 1956 г. – 183; | 1974 г. – 132; | 1992 г. – 144; | 2010 г. – 238; |
| 1957 г. – 6; | 1975 г. – 124; | 1993 г. – 202; | 2011 г. – 320; |
| 1958 г. – 98; | 1976 г. – 161; | 1994 г. – 184; | 2012 г. – 274; |
| 1959 г. – 119; | 1977 г. – 178; | 1995 г. – 364; | 2013 г. – 377; |
| 1960 г. – 155; | 1978 г. – 176; | 1996 г. – 402; | 2014 г. – 227; |
| 1961 г. – 103; | 1979 г. – 189; | 1997 г. – 424; | 2015 г. – 289; |
| 1962 г. – 102; | 1980 г. – 131; | 1998 г. – 325; | 2016 г. – 290; |
| 1963 г. – 94; | 1981 г. – 138; | 1999 г. – 400; | 2017 г. – 258; |
| 1964 г. – 99; | 1982 г. – 166; | 2000 г. – 239; | 2018 г. – 321; |
| 1965 г. – 84; | 1983 г. – 171; | 2001 г. – 256; | 2019 г. – 224; |
| 1966 г. – 111; | 1984 г. – 138; | 2002 г. – 158; | 2020 г. – 235; |
| 1967 г. – 112; | 1985 г. – 119; | 2003 г. – 117; | 2021 г. – 261; |
| 1968 г. – 92; | 1986 г. – 125; | 2004 г. – 128; | 2022 г. – 239; |
| 1969 г. – 87; | 1987 г. – 119; | 2005 г. – 80; | 2023 г. – 147; |
| 1970 г. – 94; | 1988 г. – 113; | 2006 г. – 106; | 2024 г. – 170; |
| 1971 г. – 99; | 1989 г. – 130; | 2007 г. – 110; | 2025 г. – 230. |
| 1972 г. – 126; | 1990 г. – 129; | 2008 г. – 96; | |

Агульная колькасць выпускнікоў юрыдычнага факультэта БДУ за ўсю гісторыю яго дзейнасці налічвае больш за 35 000 чалавек.

# ЗНАКАМІТЫЯ ВЫПУСКНІКІ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

## Вядомыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы



**Абрамовіч Аляксандр Міхайлавіч**

(1944–2018)

Член Камітэта канстытуцыйнага нагляду СССР (1991–1992).

Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь (Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь) (1992–1996).

Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (1996–2004).

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2004–2008).

Загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ (1988–2008).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1998).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1973 г.

**Абушкевіч Карп Мікалаевіч**

(1902–?)

Старшыня Вярхоўнага Суда БССР (1938).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1940 г.



**Аземша Сяргей Якаўлевіч**

Намеснік Старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь (з 2016 г. па цяперашні час).

Генерал-маёр юстыцыі.

Выпускнік аспірантуры юрыдычнага факультэта БДУ 1999 г.



**Амбразевіч Юрый Георгіевіч**

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь пры Святым Прастоле (з 2025 г. па цяперашні час).

Намеснік Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь (2022–2025).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1997 г.



**Андрэеў Ігар Сцяпанавіч**

(1951–2007)

Дырэктар Навукова-даследчага інстытута праблем крыміналогіі, крыміналістыкі і судовай экспертызы (1987–1994).

Першы намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь (1995–1997).

Дырэктар Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (1997–2005).

Першы намеснік адказнага сакратара Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі (з 2005 г.).

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2002).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1974 г.





**Андрэйчык Наталля Іосіфаўна**

Старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў (1993–2011).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2002).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1966 г.



**Бажэлка Алег Аляксандравіч**

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь (1996–2000).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1978 г.



**Барысенка Наталля Уладзіміраўна**

Старшыня Беларускай натарыяльнай палаты (з 2011 г. па цяперашні час).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1990 г.



**Баскаў Дзмітрый Юр'евіч**

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці (з 2024 г. па цяперашні час).

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага і восьмага скліканняў (з 2021 г. па цяперашні час).

Галоўны трэнер хакейнай каманды А. Р. Лукашэнкі.

Старшыня Федэрацыі хакея Рэспублікі Беларусь (2020–2021).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 2002 г.

**Бодак Ала Мікалаеўна**



Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2019 г. па цяперашні час).

Намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь (да 2016 г.).

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве (2016–2019).

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1989 г.

**Бойка Таццяна Сямёнаўна**



Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 1997 г. па цяперашні час).

Удзельніца Алімпійскіх гульняў (Манрэаль, Канада, 1976).

Майстар спорту міжнароднага класу.

Выкладчык, дацэнт юрыдычнага факультэта БДУ (1983–1997).

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1981 г.

**Бойка Уладзімір Васільевіч**



(1939–2022)

Галоўны дзяржаўны арбітр БССР (1989–1991).

Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь (1991–2001).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1994).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1972 г.

**Болдыраў Яўгеній Філіпавіч**



(1897–1964)

Старшыня Вярхоўнага Суда БССР (1945–1957).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1939 г.

**Бондар Аляксей Георгіевіч**



(1908–1994)

Старшыня Вярхоўнага Суда БССР (1944–1945; 1967–1984).

Пракурор БССР (1949–1967).

Заслужаны юрыст БССР (1968).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1935 г.



**Варановіч Тадэвуш Валянцінавіч**

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2009 г. па цяперашні час).

Кандыдат юрыдычных навук.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2014).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1981 г.



**Варанцоў Генадзь Мікалаевіч**

(1948–2023)

Міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусь (1997–2001).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1976 г.



**Васілевіч Рыгор Аляксеевіч**

Загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ (з 1998 г. па цяперашні час).

Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (1997–2008).

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь (2008–2011).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2017).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1994).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1980 г.



**Гаеў Андрэй Анатольевіч**

Дырэктар Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных дадзеных Рэспублікі Беларусь (з 2021 г. па цяперашні час).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1999 г.



**Галаванаў Віктар Рыгоравіч**

Міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусь (2001–2011).

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1979 г.

**Герасімаў Васіль Мікалаевіч**

Старшыня Камітэта Дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь (з 2021 г. па цяперашні час).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1997 г.



**Гучок Аляксандр Яўгенавіч**

Старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (з 2018 г. па цяперашні час).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1997 г.



**Дашук Леанід Андрэевіч**

Міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусь (1990–1992).

Старшыня Эканамічнага Суда Садружнасці Незалежных Дзяржаў (1994–1997).

Заслужаны юрыст БССР.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1964 г.



**Жыновіч Іосіф Іосіфавіч**

(1907–1974)

Кампазітар. Прафесар.

Народны артыст СССР.

Выпускнік прававога аддзялення БДУ.



**Здановіч Аляксандр Аляксандравіч**

(1927–1997)

Міністр юстыцыі БССР (1970–1984).

Старшыня Вярхоўнага Суда БССР (1984–1988).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1951 г.





**Зноска Андрэй Часлававіч**
Біскуп Пінскай дыяцэзіі (з 2024 г. па цяперашні час).
Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 2012 г.



**Ігнатовіч Мікалай Іванавіч**
(1940–1992)
Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь (1991–1992).
Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1968 г.



**Іпатаў Вадзім Дзмітрыевіч**
Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (з 2024 г. па цяперашні час).
Дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь (2009–2023).
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).
Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1995 г.



**Ісайчаў Уладзімір Мікалаевіч**
Галоўны дзяржаўны арбітр Дзяржарбітражу БССР (1981–1989).
Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1969 г.



**Калінковіч Валерый Леанідавіч**
Першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2015 г. па цяперашні час).
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2019).
Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1992 г.

**Камянкова Людміла Эдуардаўна**

Старшыня Эканамічнага Суда Садружнасці Незалежных Дзяржаў (2011–2023).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1980 г.



**Камянкоў Віктар Сяргеевіч**

Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь (2001–2013).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1994).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1978 г.



**Кандрацьеў Сяргей Вадзімавіч**

Намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – Старшыня судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2020 г. па цяперашні час).

Старшыня Мінскага міжгарнізоннага ваеннага суда (2007–2012).

Намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (2012–2014).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1993 г.



**Канюк Аляксандр Уладзіміравіч**

Намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – Старшыня ваеннай калегіі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (2009–2011).

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь (2011–2020).

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Арменія (2020–2025).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1982 г.



**Капітан Васіль Сцяпанавіч**

(1952–2020)

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь (1996).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1976 г.





**Каравай Уладзімір Сяргеевіч**

Міністр юстыцыі БССР (1986–1988).

Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (1988–1997).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1996).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1964 г.



**Карповіч Наталля Аляксандраўна**

Намеснік Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2017 г. па цяперашні час).

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2014 г. па цяперашні час).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Мае шэраг дзяржаўных узнагарод.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1989 г.



**Кобец Юрый Віктаравіч**

Намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – Старшыня судовай калегіі па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2018 г. па цяперашні час).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1997 г.



**Козырава Лілія Рыгораўна**

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2008 г. па цяперашні час).

Суддзя Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь (1995–2001).

Намеснік Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь (2001–2008).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2002).

Узнагароджана медалём «За бездакорную службу» III ступені.

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1977 г.

**Кот Алег Мікалаевіч**

Намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь (з 2022 г. па цяперашні час).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1997 г.



**Леснік Іосіф Якаўлевіч**

(1901–?)

Галоўны арбітр Дзяржарбітражу БССР (1945–1970).

Выпускнік факультэта грамадскіх навук БДУ 1925 г.



**Любецкая Святлана Анатольеўна**

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2024 г. па цяперашні час).

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве сёмага склікання Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2019–2024).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1998 г.



**Магільніцкі Адам Іванавіч**

(1930–2011)

Пракурор БССР (1973–1984).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1953 г.



**Макараў Віктар Рыгоравіч**

Пракурор БССР (1984–1986).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1957 г.





**Максімаў Леў Георгіевіч**
(1929–1999)
Пракурор БССР (1967).
Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1952 г.



**Маркаў Марат Сяргеевіч**

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь (з 2024 г. па цяперашні час).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1998 г.



**Міклашэвіч Пётр Пятровіч**

Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2008 г. па цяперашні час).

Першы намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь (1998–1999).

Першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (1999–2004).

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь (2004–2008).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2003).

Узнагароджаны ордэнам Пашаны.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1981 г.



**Міцкевіч Валерый Вацлававіч**

Начальнік Сакратарыяту Усебеларускага народнага сходу (з 2024 г. па цяперашні час).

Старшыня ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў» (з 2017 г. па цяперашні час).

Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2009–2019).

Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2019–2024).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1989 г.

**Мяцеліца Андрэй Мікалаевіч**

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Ісламскай Рэспубліцы Пакістан (з 2020 г. па цяперашні час).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1998 г.



**Нячаеў Уладзімір Віктаравіч**

(1920–?)

Галоўны арбітр Дзяржарбітражу БССР (1970–1981).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1952 г.



**Новік Самуіл Якаўлевіч**

(1905–?)

Пракурор БССР (1937–1939).

Выпускнік БДУ 1931 г.



**Падута Іван Андрэевіч**

(1901–?)

Міністр юстыцыі БССР (1940–1953).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута.



**Пастрэвіч Іван Пракоф'евіч**

(1913–1978)

Пракурор БССР (1967–1973).

Заслужаны юрыст БССР.

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1938 г.





**Пяткевіч Наталля Уладзіміраўна**

Намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (з 2025 г. па цяперашні час).

Прэс-сакратар Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001–2004).

Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2004–2009).

Першы намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2009–2010).

Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2011–2014).

Першы намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2024–2025).

Кандыдат юрыдычных навук.

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1994 г.



**Пярлоў Ілля Давыдавіч**

(1910–1971)

Міністр юстыцыі РСФСР (1946–1952).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Заслужаны дзеяч навукі РСФСР.

Выпускнік факультэта савецкага будаўніцтва і права БДУ 1930 г.



**Рабцаў Віктар Мікалаевіч**

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2016 г. па цяперашні час).

Намеснік Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь (да 2014 г.).

Суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2014 г.).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1994 г.



**Рабцаў Леанід Міхайлавіч**

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2007 г. па цяперашні час).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Мае шэраг дзяржаўных узнагарод.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2024).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1982 г.

**Рахманаў Аляксандр Аляксандравіч**



Намеснік Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь (з 2019 г. па цяперашні час).

Генерал-маёр юстыцыі.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2021).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1998 г.

**Рыжанкоў Максім Уладзіміравіч**



Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь (з 2024 г. па цяперашні час).

Першы намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2016–2024).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1994 г.

**Саркісава Эліса Андрэеўна**



(1936–2017)

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 1997 г.).

Загадчык кафедры крымінальнага права і крыміналогіі Акадэміі міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь (з 1991 г.).

Кандыдат юрыдычных навук, прафесар.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1999).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1958 г.

**Сегаль Маісей Абрамавіч**



(1891–?)

Народны камісар юстыцыі і Пракурор БССР (1925–1928).

Намеснік дэкана факультэта права і гаспадаркі БДУ (1927–1928).

**Сівец Сяргей Міхайлавіч**



Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці(з 2024 г. па цяперашні час).

Член Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу Рэспублікі Беларусь (з 2024 г. па цяперашні час).

Намеснік дырэктара – кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь (2008–2019).

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве (2019–2024).

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1995 г.



**Сліжэўскі Алег Леанідавіч**

Міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусь (2011–2021).

Выпускнік аспірантуры юрыдычнага факультэта БДУ 2005 г.



**Сташэўскі-Стасевіч Аляксандр Восіпавіч**
(1889–1938)

Старшыня Вярхоўнага Суда БССР (1923–1924).

Пракурор БССР (1928–1931).

Загадчык рабочага факультэта БДУ (1931–1937).



**Стук Аляксей Канстанцінавіч**

Намеснік Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь (з 2008 г. па цяперашні час).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2016).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1981 г.



**Сукала Валянцін Алегавіч**

Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 1997 г. па цяперашні час).

Міністр юстыцыі БССР (1988–1989).

Першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда СССР (1989–1992).

Першы намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь (1992–1994).

Міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусь (1994–1997).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2000).

Мае ордэн Айчыны III ступені і іншыя дзяржаўныя ўзнагароды.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1968 г.

**Тылец Ірына Уладзіміраўна**

Старшыня Рэспубліканскага савета суддзяў (з 2023 г. па цяперашні час).

Сакратар Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2018 г. па цяперашні час).

Член Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу Рэспублікі Беларусь (з 2024 г. па цяперашні час).

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі».

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1992 г.



**Філіпава Наталля Мікалаеўна**

Першы намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь (з 2021 г. па цяперашні час).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 2001 г.



**Функ Ян Іосіфавіч**

Старшыня Міжнароднага арбітражнага суда пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце (з 2005 г. па цяперашні час).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1991 г.



**Хвалей Уладзімір Уладзіміравіч**

Віцэ-прэзідэнт Міжнароднага арбітражнага суда пры Міжнароднай гандлёвай палаце (ICC) (Парыж, Францыя).

Доктар юрыдычных навук.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1992 г.





**Цікавенка Анатоль Герасімавіч**

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 1997 г. па цяперашні час).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2002).

Мае шэраг дзяржаўных узнагарод.

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1977 г.



**Ціхіня Валерый Гур'евіч**

Міністр юстыцыі БССР (1989–1990).

Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (1995–1996).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Член-карэспандэнт АН Беларусі (1994).

Заслужаны юрыст БССР (1990).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1963 г.



**Чайчыц Віктар Іванавіч**

Старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў (2011–2022).

Намеснік Старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве (2022–2024).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1989 г.



**Чаргінец Мікалай Іванавіч**

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы (1997–2008).

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі (2005–2022).

Генерал-лейтэнант унутранай службы.

Кандыдат юрыдычных навук.

Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1969 г.



**Чканікаў Яўген Аркадзьевіч**

Міністр юстыцыі БССР (1984–1986).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1953 г.

**Чупрыс Вольга Іванаўна**



Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (з 2019 г. па цяперашні час).

Загадчык кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ (2015–2018).

Прарэктар БДУ (2018–2019).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1992 г.

**Шаеў Валянцін Пятровіч**



Старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь (2012–2015).

Член Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь (2012–2016).

Генерал-маёр юстыцыі.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1991 г.

**Шаладонаў Васіль Іванавіч**



Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь (1992–1995).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1994).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1972 г.

**Шандаровіч Алег Станіслававіч**



Першы намеснік Старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь (з 2020 г. па цяперашні час).

Генерал-маёр юстыцыі.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1995 г.

**Шардыка Сяргей Цярэнцьевіч**



(1912–?)

Старшыня Вярхоўнага Суда БССР (1957–1967).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1935 г.



**Швакаў Аляксей Іванавіч**

Старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў (з 2022 г. па цяперашні час).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1989 г.



**Швед Андрэй Іванавіч**

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь (з 2020 г. па цяперашні час).

Старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь (2013–2020).

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2024).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1996 г.



**Шкурдзюк Жанна Барысаўна**

Намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – Старшыня судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (з 2003 г. па цяперашні час).

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2013).

Выпускніца юрыдычнага факультэта БДУ 1985 г.

## Заслужаныя дзеячы навукі і работнікі адукацыі Рэспублікі Беларусь



**Гадуноў Валерый Мікалаевіч**

(1954–2022)

Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1989–2002).

Загадчык кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ (1993–2017).

Дырэктар Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ (1998–2022).

Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017).

Заснавальнік навуковай школы прыватнага права.

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1976 г.

**Дулаў Андрэй Васільевіч**

(1924–2018)

Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (2000).

Загадчык кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ (1972–1990).

Заснавальнік беларускай навуковай крыміналістычнай школы.



**Рашэтнікаў Сяргей Васільевіч**

Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2020).

Загадчык кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ (1993–2019).

Заснавальнік нацыянальнай навуковай школы паліталогіі.



**Савенок Анатоль Леанідавіч**

Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2019).

Загадчык кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ (з 2020 г. па цяперашні час).



**Семянкоў Віктар Іванавіч**

(1925–2015)

Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (1996).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1954 г.



**Шабайлаў Віктар Іванавіч**

(1931–2018)

Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (1994).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1959 г.



## Члены-карэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі



**Васілевіч Рыгор Аляксеевіч**

Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2017).

Загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ (з 1998 г. па цяперашні час).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1980 г.



**Семянкоў Віктар Іванавіч**

(1925–2015)

Член-карэспандэнт АН БССР (1980).

Выпускнік Мінскага юрыдычнага інстытута 1954 г.



**Сторажаў Мікалай Васільевіч**

(1934–2004)

Член-карэспандэнт АН БССР (1989).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1980 г.



**Ціхіня Валерый Гур'евіч**

Член-карэспандэнт АН Беларусі (1994).

Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1963 г.

**Шабайлаў Віктар Іванавіч**
(1925–2015)
Член-карэспандэнт АН БССР (1986).
Выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ 1959 г.



## Заслужаныя юрысты Беларусі

Абрамовіч Аляксандр Міхайлавіч (1998)
Аземша Якаў Кірылавіч (1990)
Аленчык Іван Паўлавіч (1994)
Андрэеў Ігар Сцяпанавіч (2002)
Андрэйчык Наталля Іосіфаўна (2002)
Ардзяка Міхаіл Міхайлавіч (1999)
Багуслаўскі Віктар Валерыянавіч (2005)
Бакіноўская Леаніда Іосіфаўна (2002)
Балашэнка Сяргей Аляксандравіч (2021)
Баркоў Аляксандр Уладзіміравіч (2000)
Бойка Уладзімір Васільевіч (1994)
Бондар Аляксей Георгіевіч (1968)
Васілевіч Рыгор Аляксеевіч (1994)
Варабей Георгій Аляксандравіч (2003)
Варабей Зора Антонаўна (1995)
Вараб'ёў Марат Максімавіч (1992)
Варановіч Тадэвуш Валянцінавіч (2014)
Галаўко Анатоль Аляксандравіч (1990)
Герменчук Мікалай Іванавіч (2003)
Грамовіч Гарольд Іванавіч (1997)
Грунтоў Ігар Алегавіч (2020)
Грыб Мечыслаў Іванавіч (1994)
Данілевіч Анатоль Аляксандравіч (2000)
Данчанка Мікалай Анатольевіч (2002)
Дашук Леанід Андрэевіч
Дземідовіч Васіль Мікалаевіч (2017)
Драбязка Сцяпан Рыгоравіч (1996)
Дубаў Аляксандр Васільевіч (2019)
Забара Андрэй Аляксандравіч (2022)
Іпатаў Вадзім Дзмітрыевіч (2022)
Калінковіч Валерый Леанідавіч (2019)
Камянкоў Віктар Сяргеевіч (1994)
Каравай Уладзімір Сяргеевіч (1996)
Карповіч Наталля Аляксандраўна (2022)
Каршунова Вольга Аляксандраўна (1997)

Касцюкевіч Валерый Яўгенавіч (2007)
Кенік Ксенія Іванаўна (1999)
Кітаева Тамара Баляславаўна (2005)
Кліменкова Маіна Афанасьеўна (2002)
Козырава Лілія Рыгораўна (2002)
Красуцкі Анатоль Віктаравіч (1999)
Краўчук Ніна Андрэеўна (1994)
Кулік Валянціна Генадзьеўна (2023)
Купрыянаў Мікалай Міхайлавіч (2005)
Лазавік Мікалай Іванавіч (2016)
Ліннік Таісія Мікалаеўна (1994)
Лісоўскі Павел Аляксандравіч (1994)
Любецкая Святлана Анатольеўна (2022)
Маркоўскі Рыгор Рыгоравіч (1997)
Марціновіч Ізабэла Іванаўна (2016)
Марыскін Аляксандр Уладзіміравіч (1997)
Міклашэвіч Пётр Пятровіч (2003)
Міранічэнка Іван Аляксеевіч (1997)
Міхалькова Людміла Сцяпанаўна (2016)
Міцкевіч Валерый Вацлававіч (2022)
Нячаеў Уладзімір Віктаравіч (1994)
Нічыпаровіч Аляксандр Аляксандравіч (1995)
Нічыпарэнка Нэла Пракоф’еўна (1991)
Падгруша Валянціна Васільеўна (1992)
Пазычук Мікалай Андрэевіч (2005)
Пастрэвіч Іван Пракоф’евіч
Проніна Марыя Георгіеўна (2006)
Рабцаў Леанід Міхайлавіч (2024)
Рахманаў Аляксандр Аляксандравіч (2021)
Смірноў Яўгеній Аляксандравіч (2003)
Саркісава Эліса Андрэеўна (1999)
Скаруліс Сямён Уладзіміравіч (1992)
Сторажаў Мікалай Васільевіч (2000)
Стук Аляксей Канстанцінавіч (2016)
Сукала Валянцін Алегавіч (2000)
Федарцоў Аляксандр Адамавіч (2012)
Філіпчык Рыма Іванаўна (2002)
Хоміч Уладзімір Міхайлавіч (2011)
Ціхіня Валерый Гур’евіч (1990)
Цікавенка Анатоль Герасімавіч (2002)
Цішкевіч Іван Станіслававіч (1971)
Шаладонаў Васіль Іванавіч (1994)
Швед Андрэй Іванавіч (2024)
Шкурдзюк Жанна Барысаўна (2013)
Шышко Георгій Барысавіч (2004)
Чубкавец Фёдар Іванавіч (2007)
Чупрыс Вольга Іванаўна (2022)
Чыгір Васіль Фёдаравіч (1971)
Юркевіч Мікалай Рыгоравіч (1996)

# ПРАФЕСАРЫ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

Абрамовіч Аляксандр Міхайлавіч (1944–2018) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Авакаў Мірза Масэсавіч (1925–1987) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны дзеяч навукі РСФСР.

Антановіч Ніна Арсеньеўна – прафесар, доктар палітычных навук, заслужаны работнік БДУ.

Архіпаў К. А. (1889–1963) – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Аўчыннікаў Віктар Андрэевіч (1880–1962) – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Бабылёў Анатоль Іванавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Расійскай Федэрацыі.

Байчораў Аляксандр Мухтаравіч – прафесар, доктар філасофскіх навук.

Балашэнка Сяргей Аляксандравіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Бандарэнка Наталля Леанідаўна – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ.

Баркоў Аляксандр Уладзіміравіч – прафесар, кандыдат юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Барысаў Барыс Лазаравіч – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Беляковіч Надзея Мікалаеўна – прафесар, доктар сацыялагічных навук.

Бібіла Валянціна Мікалаеўна – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Броўка Юрый Пятровіч (1936–2019) – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Васілевіч Рыгор Аляксеевіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Віхараў Сямён Раманавіч (1920–1976) – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Волкаў Мікалай Андрэевіч (1892–1980) – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Гадуноў Валерый Мікалаевіч (1954–2022) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Галанза Пётр Мікалаевіч (1893–1982) – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Галаўко Анатоль Аляксандравіч (1925–2014) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Гарбуноў Аляксандр Уладзіміравіч (1895–1978) – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Гарэлік Іосіф Ісаакавіч (1921–2008) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.



Прафесары, якія працавалі на юрыдычным факультэце БДУ

Гаўзэ Файфель Ісаакавіч (1897–1990) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Гельфер Мірон Абрамавіч (1909–1989) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст РСФСР, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Гофман Станіслаў Маркавіч (1892–1974) – прафесар, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Грунтоў Ігар Алегавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Гучок Аляксандр Яўгенавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Грэдзінгер Міхаіл Восіпавіч (1867–1936) – прафесар, доктар юрыдычных навук, акадэмік АН БССР, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Данілевіч Анатоль Аляксандравіч – прафесар, кандыдат юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Дземічаў Дзмітрый Міхайлавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Доўнар Таісія Іванаўна – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Доўнар-Запольскі Мітрафан Віктаравіч (1867–1934) – прафесар, доктар гістарычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Драбязка Сцяпан Рыгоравіч (1922–2019) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Дулаў Андрэй Васільевіч (1924–2018) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Дурдзянеўскі Усевалад Мікалаевіч (1889–1963) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны дзеяч навукі РСФСР, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Жарынаў Дзмітрый Аляксеевіч (1889–1963) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Здрок Аксана Мікалаеўна – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Землякоў Леанід Яўгенавіч – прафесар, доктар палітычных навук.

Камянкоў Віктар Сяргеевіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Канаплін Мікалай Аляксандравіч (1890–1955) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Карповіч Наталля Аляксандраўна – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Кроль Міхаіл Барысавіч (1879–1939) – прафесар, доктар медыцынскіх навук, акадэмік АН БССР, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Круглова Галіна Анатольеўна – прафесар, доктар філасофскіх навук.

Курылёў Сяргей Васільевіч (1919–1968) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Левін Рыгор Аронавіч (1908–1974) – прафесар, доктар філасофскіх навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Лейзераў Аркадзь Цевелевіч (1922–2007) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Макарава Тамара Іванаўна – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ.

Маркаў Г. М. – прафесар.

Марціновіч Ізабэла Іванаўна (1927–2021) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік БДУ, заслужаны работнік вышэйшай школы БССР, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Мацвіенка Яўген Аляксандравіч (1925–1998) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Мяшчанава Марыя Валянцінаўна – дацэнт, доктар юрыдычных навук.

Новік Юрый Іосіфавіч (1946–1999) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Пічэта Уладзімір Іванавіч (1878–1947) – прафесар, доктар гістарычных навук, акадэмік АН БССР, акадэмік АН СССР, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Рашэтнікаў Сяргей Васільевіч – прафесар, доктар палітычных навук, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Рубіс Аляксандр Сяргеевіч – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Савенок Анатоль Леанідавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Сільчанка Мікалай Уладзіміравіч (1954–2022) – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Сторажаў Мікалай Васільевіч (1934–2004) – прафесар, доктар юрыдычных навук, член-карэспандэнт АН БССР, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Сярэбранікаў Уладзімір Паўлавіч (1937–1990) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Талочка Вольга Мікалаеўна – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Фралова Яўгенія Яўгеньеўна – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Расійскай Федэрацыі, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Функ Ян Іосіфавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Хоміч Уладзімір Міхайлавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Цернавая Галіна Гаўрылаўна (1928–1990) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Цікавенка Анатоль Герасімавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Ціхіня Валерый Гур'евіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, член-карэспандэнт АН Беларусі, заслужаны юрыст БССР, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Цішкевіч Іван Станіслававіч (1919–2001) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст БССР, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Чрэдзін Барыс Васільевіч (1885–1930) – прафесар, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.



Чудакоў Міхаіл Піліпавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Чупрыс Вольга Іванаўна – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Чыгір Васіль Фёдаравіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст БССР, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Шабанаў Вячаслаў Барысавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук.

Шахрай Ірына Сяргееўна – дацэнт, доктар юрыдычных навук.

Швед Андрэй Іванавіч – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Шпілёў Веніямін Мікалаевіч (1914–1985) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Шыраеў Валерыян Мікалаевіч (1872–1937) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ. Шышко Рыгор Барысавіч (1935–2021) – прафесар, кандыдат юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Юркевіч Мікалай Рыгоравіч (1928–2017) – прафесар, доктар юрыдычных навук, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Юхо Язэп (Іосіф) Аляксандравіч (1921–2004) – прафесар, доктар юрыдычных навук, ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

## ДЭКАНЫ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

**Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч**
(1881–1931)
Дэкан факультэта грамадскіх навук (1921–1922).
Доктар гістарычных навук, прафесар.
Акадэмік БАН.
Першы прэзідэнт БАН (1929–1930).



**Кацэнбоген Саламон Захаравіч**
(1889–1946)
Дэкан факультэта грамадскіх навук (1922–1923).
Прафесар.





Дэканы юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Грэдзінгер Міхаіл Восіпавіч**
(1868–1936)
Дэкан факультэта грамадскіх навук (1923–1925).
Доктар юрыдычных навук, прафесар.



**Вольфсан Сямён Якаўлевіч**
(1894–1941)
Дэкан факультэта права і гаспадаркі (1925–1930).
Прафесар.
Акадэмік АН БССР.



**Юрашкевіч А. Н.**

Дырэктар Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута (1937–1938).

Дацэнт.

**Цвяткоў Міхаіл Н.**

Дырэктар Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута (1938).

Дацэнт.



**Штэйнгарт А. М.**

Дырэктар Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута (1938–1941).

Прафесар.

**Андрэйчык Іосіф Сямёнавіч**
(1900–1945)
Дырэктар Мінскага юрыдычнага інстытута (1944–1945).
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.





**Павецьеў Гаўрыла Аляксеевіч**
(1909–1971)
Дырэктар Мінскага юрыдычнага інстытута (1945–1954).
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.



**Семярыхін Яўген Міхайлавіч**
(1914–1963)
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1954–1955; 1958–1959).
Дырэктар Мінскага філіяла Усесаюзнага юрыдычнага завочнага інстытута (1954–1955).
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.



**Меркушаў Мадэст Мікалаевіч**
(1906–1979)
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1957–1958).
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.



**Дарогін Васіль Аляксандравіч**
(1912–1995)
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1956–1957; 1959–1964).
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.



**Ігнаценка Іларыён Мяфодзьевіч**
(1919–2002)
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1964–1965).
Доктар гістарычных навук, прафесар.

**Шкурко Васіль Адамавіч**
(1919–1998)
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1965–1972).
Кандыдат юрыдычных навук, прафесар.



**Чыгір Васіль Фёдаравіч**
(1924–2024)
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1973–1983).
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Заслужаны юрыст БССР (1971).



**Ціхіня Валерый Гур'евіч**
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1983–1989).
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Член-карэспандэнт АН Беларусі (1994).
Заслужаны юрыст БССР (1990).



**Гадуноў Валерый Мікалаевіч**
(1954–2022)
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (1989–2002).
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017).



**Балашэнка Сяргей Аляксандравіч**
Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (2002–2020).
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2021).





**Міхалёва Таццяна Мікалаеўна**

Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (2020–2021).

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.



**Шыдлоўскі Андрэй Віктаравіч**

Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (з 2021 г. па цяперашні час).

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.



# ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА СЁННЯ: ЮРЫДЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ І НАВУКА

## АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС НА ЮРЫДЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ. ДЭКАНАТ

Юрыдычны факультэт БДУ сёння – гэта вядучы вучэбны і навуковы цэнтр падрыхтоўкі прафесіянальных кадраў юрыстаў, здольных паспяхова вырашаць юрыдычныя задачы дзяржавы і грамадства і працаваць на карысць сваёй краіны.




Адміністрацыя юрыдычнага факультэта БДУ (*злева направа*):
начальнік цэнтра адукацыйных інавацый Ю. А. Скарына, намеснік дэкана па навуковай рабоце С. А. Калінін, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях В. Я. Пабярэжная, дэкан юрыдычнага факультэта А. В. Шыдлоўскі, намеснік дэкана па міжнародным супрацоўніцтве і інтэрнацыяналізацыі адукацыі В. В. Емельяновіч, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыных інвацыях (завочная форма адукацыі) У. П. Скобелеў, намеснік дэкана па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце В. П. Сухапараў

Выпускнікі факультэта задзейнічаны ва ўсіх сферах: у заканадаўчых і выканаўчых органах улады, судовай сістэме дзяржавы, праваахоўных органах, адвакатуры, натарыяце, на прадпрыемствах усіх форм уласнасці. За гады існавання факультэт падрыхтаваў не адно пакаленне юрыстаў з вышэйшай адукацыяй і вучоных-прававедаў.

Адукацыйны працэс спалучае класічную форму выкладання з новымі адукацыйнымі тэхналогіямі і сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання. Прафесійныя навыкі студэнты набываюць на лекцыях, семінарскіх занятках, вучэбных і вытворчых практыках, якія праводзяць высокапрафесійныя спецыялісты-практыкі і вядомыя навукоўцы: кандыдаты і дактары юрыдычных навук.

Дэканат і кафедры юрыдычнага факультэта забяспечваюць вучэбны працэс на высокім узроўні. Навучанне ажыццяўляецца ў дзвюх формах: дзённай і завочнай (у тым ліку завочнай форме атрымання другой вышэйшай адукацыі).

Супрацоўнікамі дэканата дзённага аддзялення з'яўляюцца вядучыя спецыялісты дэканата І. Л. Іваненка і І. Я. Каленік, а таксама метадыст Т. Т. Наважэн.


І. Л. Іваненка


Т. Т. Наважэн


І. Я. Каленік

Супрацоўнікамі дэканата завочнага аддзялення з'яўляюцца вядучы спецыяліст дэканата (другая вышэйшая адукацыя) М. І. Жорава і метадыст (першая вышэйшая адукацыя) Т. А. Брылеўская.


М. І. Жорава


Т. А. Брылеўская



Пасяджэнне савета юрыдычнага факультэта БДУ. 2025 г.

Падрыхтоўка спецыялістаў на юрыдычным факультэце ажыццяўляецца па наступных спецыяльнасцях:

6-05-0421-01 «Правазнаўства» – выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «юрыст»;

6-05-0421-03 «Эканамічнае права» – выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «юрыст»;

6-05-0312-01 «Паліталогія» – выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «палітолаг».

Вучэбныя праграмы шырока ўлічваюць практыкаарыентаванасць у галіне юрыдычнай адукацыі, прадугледжваюць неабходнасць выканання творчых заданняў.

У прафесарска-выкладчыцкі састаў юрыдычнага факультэта ўваходзяць 23 дактары навук прафесары, 143 кандыдаты навук дацэнты і больш за 80 выкладчыкаў.

На юрыдычным факультэце налічваецца 12 кафедр: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, дзяржаўнага кіравання, грамадзянскага права, гаспадарчага права, права інтэлектуальнай уласнасці, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, экалагічнага і аграрнага права, крыміналістыкі, паліталогіі.

У структуру юрыдычнага факультэта ўваходзіць Цэнтр адукацыйных інавацый, аддзел «Юрыдычная клініка», лабараторыя крыміналістыкі і крыміналістычны палігон.

*Перавагі навучання на юрыдычным факультэце:*

– адукацыйны працэс ажыццяўляюць вядучыя спецыялісты юрыдычнай навукі і практыкі;

– большасць выкладчыкаў маюць вучоную ступень і званне, праводзяць навуковыя даследаванні; шэраг з іх займае вядучыя пасады ў дзяржаўных органах і арганізацыях, з’яўляюцца прадстаўнікамі найбольш паспяховых юрыдычных кампаній;

– пастаянна развіваецца студэнцкая навука;

– дзейнічаюць шматлікія спартыўныя секцыі і творчыя калектывы, а таксама студэнцкія органы самакіравання.

На юрыдычным факультэце навучаецца каля 3 тысяч студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў.

Студэнты маюць магчымасць праходзіць практыку ў судах, пракуратуры, органах следства, органах унутраных спраў, на прадпрыемствах, у юрыдычных кампаніях, банках, арганізацыях і ва ўстановах.

Асноўнымі дысцыплінамі, якія вывучаюцца на юрыдычным факультэце, з'яўляюцца: агульная тэорыя права, адміністрацыйнае права, гаспадарчае права, гісторыя дзяржавы і права Беларусі, гісторыя дзяржавы і права замежных краін, гісторыя палітычных і прававых вучэнняў, грамадзянскае права, грамадзянскі працэс, інфармацыйнае права, канстытуцыйнае права, крыміналістыка, крымінальнае права, крымінальна-выканаўчае права, крымінальны працэс, міжнароднае прыватнае права, міжнароднае публічнае права, працоўнае права, спартыўнае права, фінансавае права, экалагічнае права і інш. Выкладаюцца розныя спецкурсы і факультатыўныя вучэбныя дысцыпліны.

Пры падрыхтоўцы да заняткаў, іспытаў або залікаў студэнты маюць унікальную магчымасць працаваць у сучасных камп'ютарных класах, атрымліваць на кафедрах па кожнай вучэбнай дысцыпліне поўную прафесійную, заканадаўчую і даведачную інфармацыю.

Метадычныя матэрыялы, размешчаныя на сайце юрыдычнага факультэта, даступны з любога камп'ютара факультэта, а таксама з дамашніх камп'ютараў і асабістых гаджэтаў.

Практычныя навыкі студэнты набываюць таксама ў Юрыдычнай клініцы, створанай пры факультэце, дзе яны аказваюць юрыдычную дапамогу малазабяспечаным грамадзянам.

Фонд бібліятэкі юрыдычнага факультэта налічвае больш за 170 тысяч экземпляраў выданняў, у тым ліку ўнікальных (XIX – пачатак XX ст.), напісаных выдатнымі юрыстамі.

На факультэце створаны ўсе ўмовы для вучэбнай, навуковай і творчай дзейнасці студэнтаў. На кафедрах працуюць 20 студэнцкіх навуковых гурткоў, праходзяць алімпіяды, віктарыны, навуковыя канферэнцыі, конкурсы навуковых прац.









Пасяджэнні навуковых гурткоў на юрыдычным факультэце БДУ

На працягу вучобы студэнты навучаюцца па васьмі спецыялізацыях (прафілізацыях) . У канцы другога курса яны павінны выбраць адну з прапанаваных спецыялізацый.

*Спецыяльнасць «правазнаўства» (форма навучання – дзённая)*

Спецыялізацыі:

– арганізацыя і дзейнасць дзяржаўных органаў;

– гаспадарчае права;

– судова-пракурорска-следчая дзейнасць;

– адвакатура і натарыят;

– падатковае і банкаўскае права.

*Спецыяльнасць «эканамічнае права» (форма навучання – дзённая)*

Спецыялізацыі:

– прававое забеспячэнне камерцыйнай дзейнасці;

– прававое рэгуляванне фінансаў і крэдыту.

*Спецыяльнасць «паліталогія» (палітыка-юрыдычная дзейнасць) (форма навучання – дзённая)*

Спецыялізацыя: палітыка-юрыдычная дзейнасць і дзяржаўнае кіраванне.

Пасля заканчэння навучання на чацвёртым курсе студэнты маюць магчымасць атрымаць ступень магістра. Атрыманне паглыбленай вышэйшай адукацыі (магістратура) ажыццяўляецца па дзвюх спецыяльнасцях: 7-06-0421-01 «Юрыспрудэнцыя» і 7-06-0312-01 «Паліталогія».

Навучацца па магістарскіх праграмах на юрыдычным факультэце могуць як грамадзяне Рэспублікі Беларусь, так і замежныя грамадзяне. Мэтамі навучання ў магістратуры юрыдычнага факультэта з'яўляецца паглыбленая тэарэтычная падрыхтоўка юрыстаў і палітолагаў, атрыманне ведаў, фарміраванне ўменняў і навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне права або паліталогіі, паглыбленая прафесійная падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў у напрамках, запатрабаваных юрыдычнай практыкай, для працы ў дзяржаўных органах і арганізацыях, судах і адвакатуры, а таксама іншых установах і арганізацыях.

Сёння на юрыдычным факультэце на спецыяльнасці «юрыспрудэнцыя» паглыбленай вышэйшай адукацыі (магістратуры) з навучаннем на рускай мове можна вылучыць наступныя прафілізацыі:

– пракурорска-следчая дзейнасць;

– судова-экспертная дзейнасць;

– прававое забеспячэнне нацыянальнай эканамічнай і экалагічнай бяспекі;

– прававое рэгуляванне высокатэхналагічнага сектара нацыянальнай эканомікі; права інтэлектуальнай уласнасці;

– прыватнае права і цывілістычны працэс;

– прававое рэгуляванне інфармацыйнай прасторы і абарона персанальных дадзеных.

Для замежных грамадзян з навучаннем на англійскай мове рэалізуюцца прафілізацыі:

– міжнароднае камерцыйнае права / international commercial law;

– прававое забеспячэнне цыфравізацыі сучаснага грамадства / legal regulation of modern society digitalization;

– прававое забеспячэнне бяспекі і ўстойлівага развіцця грамадства / legal regulation of security and sustainable development of society.

У рамках спецыяльнасці «паліталогія» студэнты навучаюцца па прафілізацыі «публічная палітыка».



Урачыстая лінейка з удзелам дзяржаўных службовых асоб
Рэспублікі Беларусь. 1 верасня 2025 г.
*Злева направа:* А. У. Удовікаў, А. У. Канюк, Н. А. Карповіч,
В. Л. Калінковіч, А. В. Шыдлоўскі, Я. І. Каваленка,
М. А. Алешчанка (магістрантка), Н. У. Барысенка, Р. А. Васілевіч




Арганізатары II Рэспубліканскага прававога турніру
для старшакласнікаў «Сіла закона». 21 снежня 2022 г.



Вітальнае слова дэкана юрыдычнага факультэта БДУ
А. В. Шыдлоўскага на фінале III Рэспубліканскага прававога турніру
для старшакласнікаў «Сіла закона». 21 снежня 2023 г.



Прарэктар па вучэбнай рабоце
і адукацыйных інавацыях БДУ А. Г. Прахарэнка,
дэкан юрыдычнага факультэта А. В. Шыдлоўскі,
партнёр юрыдычнай фірмы Anischenko Laptev А. І. Анішчанка
на цырымоніі закрыцця IV Рэспубліканскага прававога турніру
для старшакласнікаў «Сіла закона». 28 лістапада 2024 г.



IV Рэспубліканскі прававы турнір
для старшакласнікаў
«Сіла закона».
28 лістапада 2024 г.



Пераможца IV Рэспубліканскага
прававога турніру «Сіла закона»
сярод дзесяцікласнікаў і дэкан
юрыдычнага факультэта БДУ
А. В. Шыдлоўскі. 28 лістапада 2024 г.



Першы сакратар Цэнтральнага камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі
саюз моладзі» А. С. Лук'янаў (*пяты справа*) падчас узнагароды
пераможцаў IV Рэспубліканскага прававога турніру
для старшакласнікаў «Сіла закона». 28 лістапада 2024 г.

На факультэце функцыянуюць навуковыя цэнтры: Міжнародны навукова-адукацыйны цэнтр медыяцыі, прымірэння і трацейскіх працэдур, Цэнтр дзяржаўна-прававой палітыкі і кіравання, а таксама Цэнтр устойлівага развіцця.

Юрыдычны факультэт з'яўляецца асноўнай часткай утворанай у БДУ сістэмы неразрыўнай падрыхтоўкі юрыдычных кадраў, якая забяспечвае атрыманне сярэдняй спецыяльнай юрыдычнай адукацыі ў Юрыдычным каледжы БДУ, вышэйшай юрыдычнай адукацыі на базе юрыдычнага факультэта БДУ, а таксама павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку юрыдычных кадраў на базе Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ.

Такім чынам, дыплом юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з'яўляецца гарантыяй паспяховай кар'еры і максімальнай самарэалізацыі!

## НАВУКОВЫЯ ШКОЛЫ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА. БЕЛАРУСКАЯ СТУДЭНЦКАЯ ЮРЫДЫЧНАЯ АЛІМПІЯДА

На юрыдычным факультэце пад кіраўніцтвам аўтарытэтных дактароў юрыдычных навук, прафесараў паступова сфарміраваўся шэраг навуковых школ:

1) «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі». Створана ў 1963 г. Заснавальнік – Я. А. Юхо, доктар юрыдычных навук, прафесар. Навуковы кіраўнік – Т. І. Доўнар, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, доктар юрыдычных навук, прафесар;

2) «Канцэптуальна-тэарэтычныя заканамернасці развіцця і функцыянавання дзяржавы і права; прававое заканадаўства і заканамернасці яго ўдасканалення». Створана ў 1972 г. Заснавальнікі – А. М. Абрамовіч, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, і С. Р. Драбязка, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь. Навуковы кіраўнік – С. А. Калінін, намеснік дэкана па навуковай рабоце, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт;

3) «Тэорыя і практыка развіцця прававой дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавы». Створана ў 2000 г. Заснавальнік і навуковы кіраўнік – Р. А. Васілевіч, загадчык кафедры канстытуцыйнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь;

4) «Навуковая школа прыватнага права». Створана ў 1983 г. Заснавальнікі – В. М. Гадуноў, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, і В. Ф. Чыгір, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь. Навуковы кіраўнік – М. В. Мяшчанава, загадчык кафедры грамадзянскага права, доктар юрыдычных навук, дацэнт;

5) «Асновы і перспектывы прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Створана ў 2004 г. Заснавальнік – В. С. Камянкоў, навуковы кансультант кафедры гаспадарчага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь. Навуковы кіраўнік – Н. Л. Бандарэнка, загадчык кафедры гаспадарчага права, доктар юрыдычных навук, прафесар;

6) «Тэарэтычныя асновы судовых форм абароны права (грамадзянска-працэсуальны аспект)». Створана ў 1974 г. Заснавальнікі – В. Г. Ціхіня, доктар юры-

дычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, і М. Р. Юркевіч доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь. Навуковы кіраўнік – І. М. Калядка, прафесар кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт;

7) «Навуковая школа крымінальнага права Беларусі». Створана ў 1965 г. Заснавальнікі – І. І. Гарэлік, доктар юрыдычных навук, прафесар, І. С. Цішкевіч, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст БССР, і В. А. Шкурко, кандыдат юрыдычных навук, прафесар. Навуковы кіраўнік – І. А. Грунтоў, навуковы кансультант кафедры крымінальнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь;

8. «Экалагічнае, прыродарэсурснае і аграрнае права». Створана ў 1991 г. Заснавальнік – М. В. Сторажаў, доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН БССР, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь. Навуковыя кіраўнікі – С. А. Балашэнка, прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, і Т. І. Макарава, загадчык кафедры экалагічнага і аграрнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар;

9) «Фарміраванне і ўдасканаленне арганізацыі, стратэгіі і метадалогіі барацьбы са злачыннасцю». Створана ў 1965 г. Заснавальнік – А. В. Дулаў, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Навуковы кіраўнік – В. Б. Шабанаў, загадчык кафедры крыміналістыкі, доктар юрыдычных навук, прафесар;

10) «Паліталогія. Дзяржаўная палітыка і кіраванне». Створана ў 1990 г. Заснавальнікі – А. М. Байчораў, доктар філасофскіх навук, прафесар, і С. В. Рашэтнікаў, прафесар кафедры паліталогіі, доктар палітычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Навуковыя кіраўнікі – Н. А. Антановіч, загадчык кафедры паліталогіі, доктар палітычных навук, прафесар і С. В. Рашэтнікаў, прафесар кафедры паліталогіі, доктар палітычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Даследаванні праблемных і актуальных пытанняў у сферы юрыспрудэнцыі прадстаўнікі навуковых школ праводзяць у цесным узаемадзеянні з усімі айчыннымі навуковымі арганізацыямі і міжнародным навуковым супольніцтвам, аб чым сведчаць сумесныя праекты навуковых даследаванняў і калектыўныя публікацыі. Дзейнасць айчынных навуковых школ накіравана на ўдасканаленне дзяржаўнасці і прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь.

У цесным узаемадзеянні з навуковымі школамі на юрыдычным факультэце функцыянуюць навуковыя гурткі. На кафедрах працуе больш за 20 студэнцкіх навуковых гурткоў. Навучэнцы з захапленнем займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю, аб чым сведчыць іх актыўны ўдзел у міжнародных студэнцкіх навуковых канферэнцыях, якія штогод праходзяць на юрыдычным факультэце, і іншых рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, а таксама шматлікія навуковыя публікацыі ў рэспубліканскіх і замежных выданнях.

Развіццё вышэйшай юрыдычнай адукацыі і навукі немагчыма без ініцыятыўных студэнтаў. Правядзенне Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь штогадавой Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды з'яўляецца практычнай інавацыйнай пляцоўкай для рэалізацыі студэнцкіх магчымасцей.

Першая Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда была арганізавана на базе юрыдычнага факультэта БДУ ў 2005 г.



Удзельнікі Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды – 2005



А. В. Шыдлоўскі і С. А. Калінін у складзе арганізацыйнага камітэта Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды – 2005







Журы і пераможцы Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды – 2015



Урачыстая цырымонія адкрыцця XX Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды. Сакавік 2024 г.







Урачыстая цырымонія закрыцця XX Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды – 2023 (пераможцы, журы, арганізацыйны камітэт)













Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіядзе – 20 гадоў

У 2007 г. алімпіяда набыла статус рэспубліканскай і стала праводзіцца пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У ёй прынялі ўдзел студэнты-юрысты з усіх устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі.

За больш чым 20 гадоў алімпіяда стала знакавай падзеяй для студэнтаў і выкладчыкаў усіх устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі, дзяржаўных органаў улады і кіравання, органаў судовай і праваахоўнай сістэмы, юрыдычных арганізацый, а таксама вядомых прадпрыемстваў і ўстаноў.




Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда – 2025

Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда дазваляе мадэрнізаваць навучальны працэс і актывізаваць самастойную навукова-даследчую работу студэнтаў. Яна павялічвае цікавасць навучэнцаў да будучай прафесіі, выяўляе таленавітых студэнтаў-юрыстаў і стварае ўмовы для далейшага працаўладкавання. Алімпіяда дапамагае кожнаму ўдзельніку зрабіць свой упэўнены крок у будучыню.

Штогод *афіцыйнымі партнёрамі алімпіяды* з’яўляюцца: Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, Генеральная пракуратура Рэспулікі Беларусь, Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр абароны персанальных дадзеных Рэспублікі Беларусь, Беларуская натарыяльная палата, Беларуская рэспубліканская калегія адвакатаў, Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў.

*Пастаяннымі партнёрамі алімпіяды* з'яўляюцца: УП «Кока-Кола Бэўрыджыз Беларусія», ТАА «ЮрСпектр», ТАА «Адвакацкае бюро ЕПАМ», ТАА «Ревера Лігал», ТАА «ГРАТА Інтэрнэшнл БіЎай», ТАА «Гарэцкі і партнёры ГіП», ТАА «Эс Бі Эйч Ло Офісіс», Мінская гарадская калегія адвакатаў, Мінская абласная калегія адвакатаў, СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы».

*Інфармацыйнымі партнёрамі алімпіяды* выступаюць:

– «Pravo.by» – нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь;

– Беларускае тэлеграфнае агенцтва (БелТА);

– «Судовы веснік» – афіцыйнае выданне Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

– «Законность и правопорядок» – прававы навукова-практычны часопіс, заснаваны Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь;

– «Предварительное расследование» – навукова-практычны часопіс Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь;

– «Юстиция Беларуси» – афіцыйнае выданне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь;

– часопіс «Союз криминалистов и криминологов» (Масква, Расія).

*Інфармацыйна-прававымі рэсурсамі* алімпіяды з'яўляюцца:

– інфармацыйна-пошукавая сістэма «Эталон»;

– інфармацыйна-пошукавая сістэма ilex.by кампаніі «ЮрСпектр».

Алімпіяда праходзіць у форме каманднага і індывідуальнага залікаў, якія складаюцца з завочнага адборачнага і вочнага фінальнага тураў.

Па выніках правядзення завочнага адборачнага тура вызначаюцца 40 пераможцаў у індывідуальным заліку і 12 каманд-пераможцаў – у камандным, якія запрашаюцца да ўдзелу ў вочным фінальным туры. Гэты тур праводзіцца ў выглядзе конкурсаў, зацверджаных аргкамітэтам і суарганізатарамі алімпіяды, з мэтай вызначэння пераможцаў па агульным рэйтынгу.

Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда ўключае наступныя спецыялізаваныя конкурсы:

– конкурс Беларускай натарыяльнай палаты;

– конкурс Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь;

– конкурс па юрыдычнай клінічнай адукацыі;

– конкурс на веданне прафесійнай англійскай лексікі;

– конкурс, прысвечаны абароне персанальных дадзеных;

– конкурс Эканамічнага суда СНД.

Партнёры алімпіяды маюць магчымасць па ўзгадненні з аргкамітэтам прапанаваць правядзенне спецыялізаваных конкурсаў.

Журы алімпіяды ўзначальвае Першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь В. Л. Калінковіч. Сустаршынёй калегіі журы з'яўляецца першы намеснік генеральнага дырэктара УП «Кока-Кола Бэўрыджыз Беларусія» А. В. Рашчупкін.

Калегія журы фарміруецца ў дачыненні да кожнага конкурсу і ўключае ў свой склад прадстаўнікоў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, а таксама прадстаўнікоў арганізацый-партнёраў алімпіяды.

*Арганізацыйную падтрымку на працягу многіх гадоў забяспечваюць кіраўнікі дзяржаўных органаў і грамадскіх аб'яднанняў:* В. А. Абрамаў, С. Я. Аземша, І. У. Арлоўская, В. Г. Арэшка, Т. У. Бачарава, А. У. Білейчык, А. А. Волкаў, А. А. Гаеў, Д. Ю. Гара, В. В. Дземідовіч, В. Д. Іпатаў, Я. І. Каваленка, В. Л. Калінковіч,

В. С. Камянкоў, А. У. Канюк, А. А. Ліпа, К. С. Лук'янава, А. Ф. Мацельскі, В. В. Міцкевіч, В. С. Пазняк, А. К. Стук, В. А. Сукала, А. В. Сямашка, Н. М. Філіпава, В. І. Чупрыс, А. І. Швакаў, А. І. Швед і інш.

*Актыўны ўдзел у журы алімпіяды прымаюць кіраўнікі і партнёры юрыдычных арганізацый і вытворчых прадпрыемстваў:* Н. У. Барысенка, Д. М. Вільтоўскі, А. Т. Гарэцкі, А. В. Рашчупкін, Д. В. Рымша, А. У. Сламенец, Ц. В. Сысуеў, Д. В. Туравец, Д. П. Ходас.

Пераможцы алімпіяды ўключаюцца ў спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

## ІДЭАЛАГІЧНАЯ І ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА НА ЮРЫДЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ*

Юрыдычны факультэт БДУ мае багаты гістарычны падмурак для захоўвання і развіцця адметнай сістэмы выхаваўчай і ідэалагічнай работы са сваімі асаблівасцямі і традыцыямі.

Сёння выхаваўчая работа на юрыдычным факультэце праводзіцца па пяці галоўных кірунках: 1) мерапрыемствы вучэбна-выхаваўчага, патрыятычнага і ідэалагічнага характару; 2) мерапрыемствы па пытаннях прафесійнага, сямейнага, маральна-этычнага і інфармацыйнага выхавання, а таксама прафілактыкі правапарушэнняў; 3) мерапрыемствы сацыяльна-бытавога характару; 4) фізкультурна-аздараўленчыя, спартыўныя і экскурсійна-турыстычныя мерапрыемствы; 5) студэнцкае самакіраванне і моладзевыя грамадскія аб'яднанні.

Да *мерапрыемстваў вучэбна-выхаваўчага, патрыятычнага і ідэалагічнага характару* адносяцца:

– інфармацыйныя і куратарскія гадзіны ў акадэмічных групах першага – чацвёртага курсаў, індывідуальная работа куратараў са студэнтамі на працягу вучэбнага года;

– правядзенне штомесяц Адзінага дня інфармавання па актуальных пытаннях грамадскага і палітычнага жыцця дзяржавы;

– дыялогавыя пляцоўкі, сустрэчы студэнтаў з кіраўнікамі органаў дзяржаўнага кіравання, дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу, прадстаўнікамі органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, работнікамі праваахоўных органаў, службовымі асобамі і прадстаўнікамі органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

– тэматычныя пляцоўкі, прысвечаныя Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, Дню Перамогі, Дню Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі), Дню ведаў, Дню народнага адзінства, Дню юрыста, Дню беларускай навукі, Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Дню жанчын, тыдню сям'і і бацькоў;

– мерапрыемствы, накіраваныя на патрыятычнае, гісторыка-культурнае, духоўнае, эстэтычнае выхаванне, а таксама выхаванне беражлівага стаўлення да прыроды (сустрэчы з ветэранамі вайны і працы; экскурсіі ў музеях гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і сучаснай беларускай дзяржаўнасці, Нацыянальным мастацкім музеі, Музеі юрыдычнага факультэта БДУ, Музеі гісторыі БДУ; навед-



* Аўтары: А. В. Шыдлоўскі і В. П. Сухапараў.

ванне тэатраў, выставак, а таксама храмаў; удзел у рэспубліканскіх і гарадскіх суботніках, тыднях лесу і інш.);

– рэалізацыя праектаў і семінараў, накіраваных на прафарыентацыйнае, грамадзянскае і ідэалагічнае выхаванне студэнтаў і моладзі (Фестываль факультэтаў БДУ, «Кірмаш вакансій», праект БДУ і РГА «Белая Русь» «Кадравая лесвіца», універсітэцкая «Школа маладога выбаршчыка» і інш.).



Рэктар БДУ А. Д. Кароль і прарэктары са Старшынёй Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі У. С. Каранікам на адкрыцці Міжнароднага патрыятычнага моладзевага форуму «Святло Вялікай Перамогі». 5 мая 2025 г.





Урачыстая лінейка на юрыдычным факультэце, прысвечаная віншаванню першакурснікаў. 2024 г.



Дыялогавая пляцоўка на тэму значнасці ўдзелу моладзі ў выбарах Прэзідэнта і ўрачыстае ўручэнне членскіх білетаў РГА «Патрыёты Беларусі» студэнтам юрыдычнага факультэта



Рэктар БДУ (2008–2017) акадэмік С. У. Абламейка падчас уручэння прафесару С. Р. Драбязку юбілейнага медаля «70 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». 2014 г.



Рэктар БДУ (2008–2017) акадэмік С. У. Абламейка падчас уручэння прафесару А. В. Дулаву юбілейнага медаля «70 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (1941–1945)». 2015 г.





Конкурс творчых нумароў студэнтаў БДУ,
прысвечаны 80-годдзю з Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне



Кадр з відэакліпа на песню Б. Акуджавы «Бяры шынель, пайшлі дамоў» да святкавання Дня Перамогі (2024) і 80-годдзя вызваленння Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў





Удзел студэнцкага актыву юрыдычнага факультэта БДУ ў відэамарафоне песень ваенных гадоў, прымеркаваным да 80-годдзя вызвалення Беларусі



Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскі са студэнцкім актывам на ўрачыстай лінейцы БДУ. 9 мая 2024 г.



Студэнты юрыдычнага факультэта на ўрачыстай лінейцы БДУ, прысвечанай Дню народнага адзінства. 17 верасня 2025 г.



Студэнты юрыдычнага факультэта ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 2024 г.






Інтэрнат № 11 комплексу «Студэнцкая вёска», прасп. Дзяржынскага, 87



Студэнты і магістранты юрыдычнага факультэта на ўрачыстым мерапрыемстве па ўручэнні пасведчанняў спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. 2024 г.




Удзел выкладчыкаў і студэнтаў юрыдычнага факультэта ў мерапрыемствах, прысвечаных Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. 15 сакавіка 2024 г.



Правядзенне начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама В. М. Чамаданавай дыялогавай пляцоўкі, прысвечанай Дню народнага адзінства. Верасень 2023 г.




Наведванне Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь адміністрацыяй і студэнтамі юрыдычнага факультэта. 2023 г.




Мерапрыемства «Віват, студэнт!». 2022 г.


БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

100 гадоў

ПАДЗЯКА
ДЭКАНА

*Кісялеву*
*Максіму Паўлавічу*

за актыўную грамадскую дзейнасць
і значны ўклад у развіцці студэнцкага самакіравання
і ў сувязі са 100-годдзем юрыдычнага факультэта БДУ

Дэкан А.В. Шыдлоўскі

Падзяка дэкана





Выкладчыкі і студэнты юрыдычнага факультэта на паказе нацыянальнага фільма «На другом берегу» (рэжысёр Андрэй Хрулёў). 2023 г.

Навучэнцы юрыдычнага факультэта БДУ прымаюць актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці нашай дзяржавы: аказваюць арганізацыйную дапамогу ў правядзенні шэрага рэспубліканскіх мерапрыемстваў (з'яўляюцца членамі ўчастковых выбарчых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама дэпутатаў, удзельнічаюць у святочных парадах і інш.).

З 2022 г. на юрыдычным факультэце быў адкрыты мэтавы набор студэнтаў на ўмовах падрыхтоўкі кадраў у дзяржаўныя органы і арганізацыі. Значную ролю ў патрыятычным і ідэалагічным выхаванні студэнтаў акадэмічных груп мэтавага набору выконваюць падраздзяленні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, якія прыцягваюць навучэнцаў да актыўнага ўдзелу ў прафесійных мерапрыемствах, сумеснага святкавання значных дзяржаўных падзей, праводзяць актыўную прафарыентацыйную работу.

Важная роля ў выхаваўчай рабоце належыць Музею юрыдычнага факультэта БДУ. Менавіта з яго наведвання ў першакурснікаў пачынаецца жыццё на факультэце. На базе музея дзейнічае гісторыка-патрыятычны цэнтр «Памяць». Сустрэча з мінулым дае магчымасць кожнаму дакрануцца да слаўнага летапісу факультэта, яго гісторыі і добрых традыцый.

Супрацоўнікі і студэнты сумесна фарміруюць электронны музей – «Лічбавы музей юрыдычнага факультэта БДУ». На першым паверсе корпуса факультэта размешчана фотагалерэя значных падзей у адукацыйным, навуковым і грамадскім жыцці студэнтаў і выкладчыкаў.

Першы вопыт юрыдычнай практыкі студэнты набываюць у Юрыдычнай клініцы БДУ, якая прадуктыўна працуе на працягу 25 гадоў. Вялікая роля ў навуковым жыцці належыць студэнцкаму савету па якасці адукацыі і навуцы факультэта і студэнцкім навуковым гурткам, якія дзейнічаюць пры кафедрах.

На юрыдычным факультэце штогод ствараюцца савет па прафілактыцы правапарушэнняў і савет па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх. Саветы разглядаюць студэнцкія парушэнні Правіл унутранага распарадку і Этычнага кодэкса БДУ, уносяць рэкамендацыі кіраўніцтву ўніверсітэта па прыцягненні вінаватых асоб да мер дысцыплінарнай адказнасці, выпрацоўваюць прапановы па папярэджанні і прафілактыцы правапарушэнняў сярод студэнтаў, а таксама забяспечваюць іх рэалізацыю.

*Мерапрыемствы па пытаннях прафесійнага, сямейнага, маральна-этычнага і інфармацыйнага выхавання, а таксама прафілактыкі правапарушэнняў:*

– адкрытыя лекцыі заслужанага юрыста Расійскай Федэрацыі, ганаровага работніка вышэйшай прафесійнай адукацыі Расійскай Федэрацыі, ганаровага

работніка навукі і высокіх тэхналогій Расійскай Федэрацыі, доктара юрыдычных навук, прафесара Я. Я. Фраловай;

– дыялогавая пляцоўка з удзелам выпускніка юрыдычнага факультэта БДУ 1994 г., Першага намесніка Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь М. У. Рыжанкова, арганізаваная студэнцкім саветам юрыдычнага факультэта БДУ, старшынёй якога з’яўляецца Г. І. Сергяенка, 21 кастрычніка 2022 г.;

– дыялогавыя пляцоўкі, круглыя сталы, семінары, арганізаваныя юрыдычным факультэтам сумесна з грамадскім аб’яднаннем «Гильдия отцов»;

– мерапрыемствы, прысвечаныя Міжнароднаму жаночаму дню, «Мы говорим спасибо нашим мамам!»;

– выстаўка навуковых работ жанчын – прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага саставу юрыдычнага факультэта.



Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь,
дзяржаўны саветнік юстыцыі 2-га класа,
заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь А. І. Швед




Выкладчыкі і студэнты юрыдычнага факультэта
на месцы расследавання Генеральнай пракуратурай Рэспублікі
Беларусь крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа
ў гады Вялікай Айчыннай вайны
і пасляваенны перыяд. 2023 г.



Сустрэча студэнтаў юрыдычнага факультэта з суддзёй
Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь С. П. Чыгрынавым



Наведванне загадчыкам кафедры канстытуцыйнага права
Р. А. Васілевічам і студэнтамі юрыдычнага факультэта
Суда Еўразійскага эканамічнага саюза



Дыялогавая пляцоўка, прысвечаная навэлам
працоўнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь,
з удзелам прадстаўнікоў органаў заканадаўчай, выканаўчай
і судовай улады, а таксама РГА «Патрыёты Беларусі»



Урачыстае мерапрыемства куратараў і студэнтаў юрыдычнага факультэта, якія навучаюцца на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, з удзелам прадстаўнікоў упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Мінскай вобласці. 10 чэрвеня 2024 г.



Круглы стол з удзелам старшыні Беларускай натарыяльнай палаты Н. У. Барысенка і прадстаўнікоў ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў», прысвечаны Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. 15 сакавіка 2023 г.




Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскі са студэнтамі на Беларускім юрыдычным форуме



Наведванне прадстаўнікамі ГА «Гільдыя бацькоў»
юрыдычнага факультэта ў тыдзень сямейнай любові. Кастрычнік 2023 г.

*Мерапрыемствы сацыяльна-бытавога характару* ўключаюць:

– арганізацыю засялення іншагародніх студэнтаў і магістрантаў, а таксама замежных навучэнцаў у інтэрнат (кожны год на факультэце ствараецца грамадская камісія па пытаннях жылля студэнтаў);

– азнаямленне першакурснікаў з Правіламі ўнутранага распарадку БДУ, Правіламі пражывання ў інтэрнаце БДУ і Этычным кодэксам БДУ;

– правядзенне арганізацыйных сходаў са старастамі курсаў, акадэмічных груп, лідарамі органаў студэнцкага самакіравання і першасных арганізацый факультэта;

– устанаўленне студэнтам, якія маюць вучэбна-навуковыя і спартыўныя дасягненні або ўносяць значны ўклад у грамадскае жыццё факультэта, надбавак да стыпендый, назначэнне спецыяльных, у тым ліку імянных, стыпендый;

– арганізацыю аказання дапамогі, у тым ліку матэрыяльнай, малазабяспечаным студэнтам і інш.

Да *фізкультурна-аздараўленчых, спартыўных і экскурсійна-турыстычных мерапрыемстваў* адносяцца:

– арганізацыя санаторна-курортнага аздараўлення студэнтаў;

– правядзенне лекцый, дыскусій і сустрэч са спецыялістамі па прапагандзе здаровага ладу жыцця і папярэджанні наркаманіі і курэння;

– арганізацыя ўдзелу студэнтаў і выкладчыкаў факультэта ў рэспубліканскіх і гарадскіх спартыўна-масавых мерапрыемствах, круглагадовай агульнаўніверсітэцкай спартакіядзе, міжфакультэцкіх спартыўных мерапрыемствах «Годныя наследнікі Перамогі», «Падрыхтаваны да працы і абароны», спартыўных спаборніцтвах БДУ і інш.;

– правядзенне факультэцкіх спаборніцтваў па розных відах спорту і інш.

На юрыдычным факультэце БДУ выкладаюць і вучацца больш за 50 майстроў спорту, якія з'яўляюцца пераможцамі і прызёрамі ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных спартыўных спаборніцтваў.

Юрыдычны факультэт замацаваў за сабой статус лідара сярод іншых факультэтаў і інстытутаў БДУ ў галоўным агульнаўніверсітэцкім спартыўным спаборніцтве – круглагадовай спартакіядзе.



Каманда юрыдычнага факультэта БДУ – пераможца турніру па міні-футболе, прысвечанага Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. 2025 г.





Жаночая каманда юрыдычнага факультэта – пераможца ўніверсітэцкай спартакіяды па міні-футболе. 2024 г.






Мужчынская зборная юрыдычнага факультэта па футболе – пераможца фінальных гульняў універсітэцкіх спартакіяд. 2024–2025 гг.



Спартыўныя каманды юрыдычнага факультэта – прызёры круглагадовай студэнцкай спартакіяды БДУ. 2024 г.



Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ А. В. Шыдлоўскі (*у цэнтры*), заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь М. М. Прусаў (*першы справа*), студэнт першага курса юрыдычнага факультэта Абубакар Хаслаханаў (*другі справа*) – першы ў гісторыі Беларусі пераможца чэмпіянату свету па грэка-рымскай барацьбе ва ўзросце да 20 гадоў – і студэнт другога курса Ілля Мялешчык (*першы злева*) – бронзавы прызёр чэмпіянату свету па грэка-рымскай барацьбе. 31 жніўня 2023 г.



Спартыўна-парыятычны злёт студэнцкага актыву і выкладчыкаў юрыдычнага факультэта на базе САК БДУ «Брыганціна», прысвечаны святкаванню Вялікай Перамогі




Урачыстая цырымонія ўзнагароджання найлепшых выкладчыкаў і студэнтаў у Дзень юрыдычнага факультэта БДУ. 2014 г.



Святкаванне Дня юрыдычнага факультэта БДУ. 2023 г.



Сход кіраўнікоў органаў студэнцкага самакіравання



Пасяджэнне студэнцкага савета юрыдычнага факультэта. 2024 г.



Сумеснае пасяджэнне кіраўнікоў студэнцкіх арганізацый (Каардынацыйная група студэнцкага актыву) юрыдычнага факультэта. 2015 г.



Студэнцкі актыў юрыдычнага факультэта. 2022 г.



Найлепшыя студэнты юрыдычнага факультэта на ўрачыстым святкаванні Рэспубліканскага навагодняга балю. Снежань 2022 і 2023 гг.




Рэктарскі баль. 2024 г.







Рэктарскі баль. Узнагароджанне найлепшых студэнтаў-выпускнікоў. 2025 г.

Актыўная роля ў выхаваўчым працэсе факультэта належыць *органам студэнцкага самакіравання* (студэнцкі савет, савет старастаў, студэнцкая куратарская служба, студэнцкі савет па якасці адукацыі і навуцы, служба пратакола дэкана) і *арганізацыям моладзевых грамадскіх аб'яднанняў* («Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», прафсаюзная арганізацыя студэнтаў, моладзевы сектар «Беларускага рэспубліканскага саюза юрыстаў»).

Грамадзянская пазіцыя выкладчыкаў і студэнтаў выражаеца праз арганізацыю мерапрыемстваў у складзе грамадскіх аб'яднанняў «Белая Русь», «Патрыёты Беларусі», «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў», «Беларускі саюз жанчын», а таксама прафсаюзных арганізацый студэнтаў БДУ, работнікаў навукі і адукацыі.

У 2023 г. па даручэнні Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на факультэце была створана Студэнцкая мабільная інфармацыйная група (СМІГ) па прававой адукацыі студэнцкай моладзі і навучэнцаў сярэдніх, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установ. Кірункамі дзейнасці СМІГ з'яўляюцца:

– папярэджанне злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці;

– папярэджанне незаконнага абароту наркотыкаў і кібермахлярства, карупцыі, інтэрнэт-правапарушэнняў і інш.;

– прававая адукацыя студэнцкай моладзі па пытаннях выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь і адказнасці грамадзян за парушэнні пры арганізацыі і правядзенні выбараў.

Да *асноўных мерапрыемстваў, якія штогадова арганізуюцца і праводзяцца на юрыдычным факультэце БДУ,* адносяцца:

– міжнародныя навуковыя канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў;

– Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда;

– рэспубліканскі прававы турнір «Сіла закона» (праводзіцца сумесна з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»);

– Дзень юрыдычнага факультэта БДУ;

– дні прававой асветы;

– адкрыты дыялог дэкана факультэта з першакурснікамі;

– дні адчыненых дзвярэй на юрыдычным факультэце;

– конкурсы «Пасвячэнне ў першакурснікі», «Міс Феміда» і «Містар юрфак», «Клуб вясёлых і знаходлівых» і інш.;

– справаздачна-выбарчыя канферэнцыі першасных арганізацый «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» і Прафбюро студэнтаў;

– святочнае ўручэнне дыпломаў выпускнікам;

– выданне малатыражнай студэнцкай газеты «Востраў ЮФ»;

– студэнцкія фотавыстаўкі Рэспублікі Беларусь і інш.

Юрыдычны факультэт выпусціў больш за 100 студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, якія ўключаны ў спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, а таксама ў спецыяльны фонд Прэзідента Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Асноўныя формы дзейнасці студэнцкай мабільнай групы – гэта лекцыі, дыскусіі, інтэлектуальныя гульні з навучэнцамі, прэс-канференцыі, інтэрв'ю, дыялогавыя пляцоўкі. Усе мерапрыемствы праводзяцца з удзелам суддзяў, прадстаўнікоў органаў Пракуратуры Рэспублікі Беларусь і Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, а таксама адвакатаў.







Дыялогавая пляцоўка з удзелам кіраўніка ваенна-патрыятычнага цэнтра спецыяльнай падрыхтоўкі дапрызыўнай моладзі «Скіф» г. Рэчыцы У. В. Габрава «Гістарычная памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. Ваенная бяспека Рэспублікі Беларусь сёння». 2025 г.



Студэнцкая куратарская служба юрыдычнага факультэта БДУ. 2014 г.










Студэнцкая газета юрыдычнага факультэта БДУ

Кіраўніцтва факультэта, выкладчыкі, куратары і органы студэнцкага самакіравання рэгулярна праводзяць мерапрыемствы, якія развіваюць у студэнтаў пачуцці патрыятызму, гонару за абраную прафесію, асабістай адказнасці за вынікі вучобы, навуковыя і грамадскія дасягненні, а таксама выклікаюць жаданне працягваць і памнажаць слаўныя традыцыі роднага факультэта.

## СПОРТ ВЫСОКІХ ДАСЯГНЕННЯЎ

На працягу ўсяго перыяду існавання БДУ студэнты і выпускнікі юрыдычнага факультэта паказвалі высокія дасягненні.

Паспяховае спалучэнне вучэбна-прафесійнай дзейнасці з актыўнымі заняткамі спортам пацверджана выдатнымі спартыўнымі дасягненнямі студэнтаў на розных спартыўных спаборніцтвах. Яны з'яўляюцца ўдзельнікамі, пераможцамі і прызёрамі чэмпіянатаў Еўропы і свету, Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў і тым самым уносяць значны ўклад у спартыўную гісторыю не толькі факультэта і ўніверсітэта, але і ўсёй Беларусі.

За высокія дасягненні найлепшымі спартсменамі беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў алімпійскіх і неалімпійскіх відах спорту былі прызнаны студэнты і выпускнікі юрыдычнага факультэта:

Алена Амялюсік – веласпорт (2016);
Ігар Бокі – плаванне (2012, 2016, 2020, 2024);
Джавід Гамзатаў – грэка-рымская барацьба (2013, 2016);
Сяргей Карповіч – гіравы спорт (2015);
Аляксандр Кікінеў – грэка-рымская барацьба (2009, 2010);
Мікіта Клімовіч – грэка-рымская барацьба (2017);
Ксенія Санковіч – мастацкая гімнастыка (2010, 2011, 2012);
Віктар Сасуноўскі – грэка-рымская барацьба (2015).

Наступныя студэнты былі ўзнагароджаны ***медалямі Алімпійскіх гульняў***:

*– залатым:*
Камандар Маджыдаў – XXIV Алімпійскія гульні 1988 г. (Сеул, Карэя);
*– сярэбраным:*
Сяргей Ліштван – XXVI Алімпійскія гульні 1996 г. (Атланта, ЗША);
Дар'я Навумава – XXXI Алімпійскія гульні 2016 г. (Рыа-дэ-Жанейра, Бразілія);
Ксенія Санковіч – XXX Алімпійскія гульні 2012 г. (Лондан, Вялікабрытанія);
*– бронзавым:*
Джавід Гамзатаў – XXXI Алімпійскія гульні 2016 г. (Рыа-дэ-Жанейра, Бразілія);
Сяргей Дзсмяшкевіч – XXV Алімпійскія гульні 1992 г. (Барселона, Іспанія);
Андрэй Міхневіч – XXIX Алімпійскія гульні 2008 г. (Пекін, Кітай);
Ксенія Санковіч – XXIX Алімпійскія гульні 2008 г. (Пекін, Кітай).

Наступныя студэнты былі ўзнагароджаны ***медалямі чэмпіянатаў свету***:

*– залатым:*
Алена Амялюсік – веласпорт;
Марына Арзамасава – лёгкая атлетыка;
Ігар Бокі – плаванне;
Сяргей Дземяшкевіч – грэка-рымская барацьба;
Камандар Маджыдаў – грэка-рымская барацьба;

– *сярэбраным:*
Наталля Бардзіян – кікбоксінг;
Ігар Бокі – плаванне;
Камандар Маджыдаў – грэка-рымская барацьба;
Андрэй Міхневіч – лёгкая атлетыка;
Дар'я Навумава – цяжкая атлетыка;
Ксенія Санковіч – мастацкая гімнастыка;
Віктар Сасуноўскі – грэка-рымская барацьба;
– *бронзавым:*
Джавід Гамзатаў – грэка-рымская барацьба;
Дзмітрый Давыдзік – гіравы спорт;
Сяргей Дземяшкевіч – грэка-рымская барацьба;
Мікіта Клімовіч – грэка-рымская барацьба;
Аляксандра Прывалава – настольны тэніс;
Ганна Савеня – армрэстлінг;
Ксенія Санковіч – мастацкая гімнастыка.
Наступныя студэнты былі ўзнагароджаны ***медалямі чэмпіянатаў Еўропы***:
– *залатым:*
Марына Арзамасава – лёгкая атлетыка;
Ігар Бокі – плаванне;
Сяргей Дземяшкевіч – грэка-рымская барацьба;
Аляксандр Кікінеў – грэка-рымская барацьба;
Сяргей Ліштван – грэка-рымская барацьба;
Дар'я Навумава – цяжкая атлетыка;
Ксенія Санковіч – мастацкая гімнастыка;
– *сярэбраным:*
Наталля Бардзіян – кікбоксінг;
Дзмітрый Давыдзік – гіравы спорт;
Аляксандр Кікінеў – грэка-рымская барацьба;
Мікіта Клімовіч – грэка-рымская барацьба;
Аляксандра Прывалава – настольны тэніс;
Ксенія Санковіч – мастацкая гімнастыка;
Алег Шапчыц – дзюдо;
Руслан Шарапаў – дзюдо;
Сяргей Шундзікаў – дзюдо;
– *бронзавым:*
Цімур Бярдыеў – грэка-рымская барацьба;
Віктар Жук – грэка-рымская барацьба;
Аляксандр Кікінеў – грэка-рымская барацьба;
Сяргей Ліштван – грэка-рымская барацьба;
Ганна Савеня – вольная барацьба;
Аляксей Шамараў – вольная барацьба;
Руслан Шарапаў – дзюдо.
Наступныя студэнты былі ўзнагароджаны ***медалямі Сусветных універсіяд***:
– *сярэбраным:*
Наталля Сафронава – лёгкая атлетыка;
– *бронзавым:*
Джавід Гамзатаў – грэка-рымская барацьба.



Ігар Бокі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь
міжнароднага класа, 21-разовы паралімпійскі чэмпіён,
шматразовы чэмпіён свету і Еўропы па плаванні



Дзмітрый Лазоўскі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа,
абладальнік 1-га месца на юніёрскім чэмпіянаце свету 2019 г. па біятлоне
і 1-га месца ў спрынце на Кубку Садружнасці 2022 г.,
удзельнік XXIV Алімпійскіх гульняў 2022 г. (Пекін, Кітай)



Дар'я Навумава – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа
па цяжкай атлетыцы, сярэбраны прызёр XXXI Алімпійскіх гульняў 2016 г.
(Рыа-дэ-Жанейра, Бразілія), прызёр чэмпіянату свету 2018 г., чэмпіёнка
Еўропы 2019 г., удзельніца XXXII Алімпійскіх гульняў 2020 г. (Токіа, Японія)




Ксенія Санковіч – заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь, бронзавы прызёр XXIX Алімпійскіх гульняў 2008 г. (Пекін, Кітай), сярэбраны прызёр XXX Алімпійскіх гульняў 2012 г. (Лондан, Вялікабрытанія), чэмпіёнка Еўропы 2012 г., трохразовы сярэбраны і трохразовы бронзавы прызёр чэмпіянату свету, пяціразовы сярэбраны і трохразовы сярэбраны прызёр Кубка свету па мастацкай гімнастыцы





Абубакар Хаслаханаў – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, двухразовы пераможца чэмпіянату свету, уладальнік залатых узнагарод II Гульняў краін СНД і чэмпіянату Беларусі 2023 г., бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы 2024 г., удзельнік Алімпійскіх гульняў 2024 г. (Парыж, Францыя), сярэбраны прызёр чэмпіянату свету 2024 г. па грэка-рымскай барацьбе



Алена Амялюсік – чэмпіёнка першых Еўрапейскіх гульняў 2015 г. (Баку, Азербайджан) па веласпорце





Віктар Сасуноўскі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, сярэбраны прызёр Гран-пры імя Івана Паддубнага, пераможца і бронзавы прызёр міжнародных турніраў Гран-пры, сярэбраны прызёр міжнароднага турніру памяці Уладзіслава Пытлясінскага, сярэбраны прызёр чэмпіянату свету па грэка-рымскай барацьбе







Іосіф Чугашвілі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, бронзавы прызёр Гран-пры памяці Гейдара Аліева, пераможца Гран-пры імя Івана Паддубнага, пераможца міжнароднага турніру памяці Алега Караваева, пераможца міжнароднага турніру Гран-пры па грэка-рымскай барацьбе






Марына Арзамасава – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, чэмпіёнка свету і Алімпійскіх гульняў 2008, 2012, 2016 гг. па лёгкай атлетыцы ў бегу на 800 метраў, прызёр чэмпіянату і Кубка Еўропы, чэмпіёнка Еўропы 2015 г.



Камандар Бафаліевіч (Бафалы-аглы) Маджыдаў –
савецкі і беларускі барэц грэка-рымскага стылю,
заслужаны майстар спорту СССР,
заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь,
алімпійскі чэмпіён, прызёр чэмпіянату СССР
і пераможца моладзевага першынства СССР 1983 г.,
пераможца чэмпіянату Еўропы ў складзе зборнай СССР

## Найлепшыя спартсмены – студэнты і выпускнікі юрыдычнага факультэта

### Лёгкая атлетыка

Марына Арзамасава – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, прызёр чэмпіянату і Кубка Еўропы, чэмпіёнка свету і Алімпійскіх гульняў 2008, 2012, 2016 гг., чэмпіёнка Еўропы 2015 г.

Наталля Вяткіна – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, удзельніца чэмпіянату свету 2013 г.

Вольга Кошалева – майстар спорту міжнароднага класа, удзельніца XVI Алімпійскіх гульняў 1956 г.

Ганна Мазгунова – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, удзельніца XXIX Алімпійскіх гульняў 2008 г.

Андрэй Міхневіч – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, неаднаразовы прызёр Кубка Еўропы і неаднаразовы чэмпіён Рэспублікі Беларусь, чэмпіён свету 2003 г., чэмпіён Сусветнай універсіяды 2003 г.

Андрэй Санковіч – майстар спорту СССР міжнароднага класа, пераможца міжнародных турніраў, неаднаразовы прызёр Кубка Еўропы.

Наталля Сафронава – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, удзельніца XXVII Алімпійскіх гульняў 2000 г., сярэбраны прызёр Кубка Еўропы 2001 г. і Сусветнай універсіяды 2001 г.

Таццяна Шляхто-Бойка – майстар спорту міжнароднага класа, удзельніца XXI Алімпійскіх гульняў 1976 г.

### Гіравы спорт

Дзмітрый Давыдзік – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, уладальнік бронзавага медаля на чэмпіянаце свету.

Сяргей Карповіч – двухразовы чэмпіён свету.

## Грэка-рымская барацьба

Цімур Бярдыеў – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы для спартсменаў да 23 гадоў, пераможца Міжнароднага турніру памяці Алега Караваева.

Джавід Гамзатаў – заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, бронзавы прызёр Сусветнай універсіяды 2013 г. і XXXI Алімпійскіх гульняў 2016 г., бронзавы прызёр чэмпіянату свету.

Сяргей Жардзецкі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, чэмпіён свету сярод юніёраў.

Віталь Жук – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, чэмпіён свету 1998 г.

Аляксандр Кікінеў – заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь, бронзавы прызёр чэмпіянату свету 2009 г., чэмпіён Еўропы 2010 г.

Мікіта Клімовіч – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў, бронзавы прызёр чэмпіянату свету сярод юніёраў, пераможца міжнароднага турніру памяці Алега Караваева.

Віктар Сасуноўскі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, сярэбраны прызёр Гран-пры імя Івана Паддубнага, пераможца і бронзавы прызёр міжнародных турніраў Гран-пры, сярэбраны прызёр чэмпіянату свету і міжнароднага турніру памяці Уладзіслава Пытлясінскага.

Абубакар Хаслаханаў – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, пераможца чэмпіянату свету 2021 і 2023 гг., уладальнік залатых узнагарод II Гульняў краін СНД і Чэмпіянату Беларусі 2023 г., бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы 2024 г., удзельнік XXXIII Алімпійскіх гульняў 2024 г.

Андрэй Чахоўскі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь, бронзавы прызёр чэмпіянату свету сярод ваеннаслужачых.

Іосіф Чугашвілі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, бронзавы прызёр Гран-пры памяці Гейдара Аліева, пераможца Гран-пры імя Івана Паддубнага, міжнароднага турніру памяці Алега Караваева і міжнароднага турніру Гран-пры.

## Дзюдо і самба

Аляксандр Вахавяк – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, пераможца Кубка свету.

Сяргей Ждан – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў, неаднаразовы чэмпіён Рэспублікі Беларусь.

Сяргей Сахадзэ – майстар спорту СССР, неаднаразовы чэмпіён БССР.

Алег Шапчыц – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы, бронзавы прызёр СССР, неаднаразовы прызёр Рэспублікі Беларусь.

Сяргей Шундзікаў – заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь па дзюдо, майстар спорту Рэспублікі Беларусь па самба, прызёр чэмпіянату свету сярод юніёраў, неаднаразовы прызёр чэмпіянату Еўропы, неаднаразовы чэмпіён Рэспублікі Беларусь.

### Вольная барацьба

Барыс Грынкевіч – майстар спорту Рэспублікі Беларусь, неаднаразовы ўдзельнік і прызёр міжнародных спаборніцтваў, бронзавы прызёр першынства Еўропы 2000 г., неаднаразовы чэмпіён Рэспублікі Беларусь.

Ганна Савеня – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы.

### Валейбол

Вольга Карпава – майстар спорту Рэспублікі Беларусь, член зборнай каманды Рэспублікі Беларусь, чэмпіёнка і ўладальніца Кубка Беларусі 1999–2001 гг.

Алёна Глацанюк, Алёна Гуркова, Марына Тумас – студэнткі ўніверсітэта, члены зборнай каманды Рэспублікі Беларусь, прызёры чэмпіянату Еўропы 2001–2002 гг. сярод юніёраў.

### Веласіпедны спорт

Алена Амялюсік – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, пераможца Еўрапейскіх гульняў, чэмпіёнка свету, удзельніца XXXI Алімпійскіх гульняў 2016 г.

### Плаванне

Ігар Бокі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, пяціразовы чэмпіён і сярэбраны прызёр Паралімпійскіх гульняў 2012 г., пяціразовы чэмпіён свету 2013 г., шасціразовы чэмпіён і бронзавы прызёр Паралімпійскіх гульняў 2016 г., уладальнік 3 нацыянальных і 5 сусветных рэкордаў 2017 г., сяміразовы чэмпіён свету 2017 г., пяціразовы чэмпіён Паралімпійскіх гульняў 2021 г. і Паралімпійскіх гульняў 2024 г.

Дзяніс Гадзяцкі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь, удзельнік міжнародных спаборніцтваў, неаднаразовы пераможца і прызёр першынстваў і Кубка Рэспублікі Беларусь.

Павел Лагун – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, удзельнік XXVIII Алімпійскіх гульняў 2004 г., прызёр этапаў Кубка свету, неаднаразовы рэкардсмен Рэспублікі Беларусь, пераможца міжнародных турніраў.

Станіслаў Невяроўскі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, удзельнік XXIX Алімпійскіх гульняў 2008 г.

Яўген Сізікаў – майстар спорту Рэспублікі Беларусь, бронзавы прызёр Еўрапейскіх юнацкіх алімпійскіх гульняў 1997 г., двухразовы сярэбраны прызёр Сусветных юнацкіх гульняў 1998 г., неаднаразовы пераможца і прызёр першынстваў і Кубка Рэспублікі Беларусь.

### Настольны тэніс

Аляксандра Прывалава – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, бронзавы прызёр камандных спаборніцтваў чэмпіянату свету 2006 г. і камандных спаборніцтваў чэмпіянату Еўропы 2010 г., удзельніца Алімпійскіх гульняў 2008 і 2012 гг.

**Мастацкая гімнастыка**

Ксенія Санковіч – заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь, бронзавы прызёр XXIX Алімпійскіх гульняў 2008 г., сярэбраны прызёр XXX Алімпійскіх гульняў 2012 г., трохразовы сярэбраны (2009 (двойчы), 2010) і трохразовы бронзавы прызёр (2007, 2009, 2010) чэмпіянатаў свету, пяціразовы сярэбраны (2008 (двойчы), 2010, 2012 (двойчы) і трохразовы сярэбраны прызёр Кубка свету (2012), чэмпіёнка Еўропы 2012 г.

Узнагароджана ордэнам Пашаны.

**Біятлон**

Дзмітрый Лазоўскі – майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа, чэмпіён свету сярод юніёраў 2019 г., абладальнік 1-га месца ў спрынце на Кубку Садружнасці 2022 г., удзельнік XXIV Алімпійскіх гульняў 2022 г.

## МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА. ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫІ*

Міжнароднае супрацоўніцтва з'яўляецца адной з прыярытэтных задач юрыдычнага факультэта БДУ. Даўнія трывалыя партнёрскія адносіны з замежнымі юрыдычнымі ўстановамі вышэйшай адукацыі, навукова-даследчымі інстытутамі і міжнароднымі арганізацыямі даюць магчымасць праводзіць сумесныя навуковыя мерапрыемствы, рэалізоўваць адукацыйныя праекты, што садзейнічае атрыманню студэнтамі і супрацоўнікамі факультэта новых ведаў і кампетэнцый, а таксама развіццю міжнароднага абмену.

Юрыдычны факультэт падтрымлівае цесныя сувязі з Акадэміяй права і кіравання Федэральнай службы выканання пакаранняў Расіі, Балтыйскім федэральным універсітэтам імя І. Канта, Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. В. Ламаносава, Маскоўскім дзяржаўным юрыдычным універсітэтам імя А. Я. Кутафіна, Пецярбургскім дзяржаўным універсітэтам, Расійскім універсітэтам дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы (РУДН), Нацыянальным даследчым універсітэтам «Вышэйшая школа эканомікі», Уральскім дзяржаўным юрыдычным універсітэтам імя В. Ф. Якаўлева, Расійска-Армянскім універсітэтам, Кастанайскай акадэміяй Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Казахстан імя Ш. Кабылбаева, Кітайскім універсітэтам палітычных навук і права, а таксама з іншымі вядучымі ўніверсітэтамі.

Юрыдычны факультэт прымае ўдзел у дзейнасці шэрага міжнародных арганізацый і інтэграцыйных аб'яднанняў (напрыклад, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Саюзная дзяржава, Еўразійскі эканамічны саюз, Еўразійская патэнтная арганізацыя, Саюз крыміналістаў і крыміналагаў), адукацыйных, навуковых і профільных устаноў (Інстытут дзяржавы і права Расійскай акадэміі навук,

* Аўтары: А. В. Шыдлоўскі, Л. Л. Голубева і В. В. Емельяновіч.

Інстытут заканадаўства і параўнальнага правазнаўства пры Урадзе Расійскай Федэрацыі, Даследчы цэнтр прыватнага права імя С. С. Аляксеева пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі і інш.).

Дэкан юрыдычнага факультэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт А. В. Шыдлоўскі з'яўляецца кіраўніком беларускага прадстаўніцтва міжнароднай грамадскай арганізацыі «Саюз крыміналістаў і крымінолагаў», адкрыццё якога адбылося ў 2015 г. з удзелам прэзідэнта арганізацыі, заслужанага дзеяча навукі Расійскай Федэрацыі, доктара юрыдычных навук, прафесара І. М. Мацкевіча.



Рэктар Універсітэта пракуратуры Расійскай Федэрацыі прэзідэнт Саюза крыміналістаў і крымінолагаў І. М. Мацкевіч



Прэзідэнт Міжнароднага Саюза крыміналістаў і крымінолагаў І. М. Мацкевіч уручае Пасведчанне Старшыні Беларускага прадстаўніцтва А. В. Шыдлоўскаму



Урачыстая цырымонія адкрыцця Беларускага прадстаўніцтва Саюза крыміналістаў і крымінолагаў у г. Нясвіжы (замак Радзівілаў). 2015 г.

На юрыдычным факультэце актыўна праводзяцца даследаванні дзейнасці Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, распаўсюджваюцца праекты ў галіне ўдзелу Беларусі ў БРІКС.

На юрыдычным факультэце БДУ атрымліваюць адукацыю грамадзяне з Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Турцыі, Узбекістана і іншых дзяржаў.

Студэнты з замежных краін знаёмяцца з гісторыка-культурным жыццём БДУ і Беларусі. Ім прапануецца наведванне Музея юрыдычнага факультэта, Музея гісторыі БДУ, крыміналістычнага палігона імя прафесара А. В. Дулава, удзел у экскурсіях па студэнцкім гарадку БДУ, а таксама ў мерапрыемствах, арганізаваных студэнцкім актывам юрыдычнага факультэта і ўніверсітэта. Пад кіраўніцтвам прадстаўнікоў адміністрацыі і выкладчыкаў факультэта студэнты наведваюць Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Вялікі тэатр Беларусі і іншыя гісторыка-культурныя ўстановы.

Юрыдычны факультэт паспяхова рэалізуе *магістарскія праграмы*.

Па ініцыятыве і пры непасрэднай падтрымцы Я. Я. Фраловай, доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Расійскай Федэрацыі, загадчыка кафедры грамадзянскага права і працэсу і міжнароднага прыватнага права Юрыдычнага інстытута РУДН, арганізавана міжнародная сумесная адукацыйная праграма «Грамадзянскае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права», якая ажыццяўляецца юрыдычным факультэтам БДУ сумесна з Юрыдычным інстытутам РУДН.

У рамках сумеснай адукацыйнай праграмы праводзяцца заняткі па навучальных дысцыплінах «Калізійнае рэгуляванне ў міжнароднай камерцыйнай дзейнасці», «Прыватнае права ў кантэксце сучасных інтэграцыйных працэсаў», «Грамадзянска-прававыя спосабы абароны праў на аб’екты інтэлектуальнай уласнасці» і інш. Пасля заканчэння двухгадовага навучання выпускнікі атрымліваюць двайны дыплом магістра па спецыяльнасці «юрыспрудэнцыя».




Адкрытая лекцыя загадчыка кафедры грамадзянскага права
і працэсу і міжнароднага прыватнага права Юрыдычнага інстытута РУДН,
навуковага кансультанта кафедры грамадзянскага права
юрыдычнага факультэта БДУ, заслужанага юрыста Расійскай Федэрацыі
Я. Я. Фраловай на тэму «Цифровизация и зеленое финансирование:
новые тренды правового регулирования экономических отношений
XXI в.» на юрыдычным факультэце БДУ. 12 снежня 2023 г.

Прафесар Я. Я. Фралова актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы сумесных навуковых і вучэбных выданняў, выступае экспертам па дысертацыях. Акрамя таго, яна з’яўляецца членам савета БДУ і савета па абароне дысертацый пры БДУ, а таксама навуковым кансультантам кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта. Я. Я. Фралова перадала ў фонд бібліятэкі юрыдычнага факультэта

больш за 1000 экзэмпляраў выданняў па юрыдычнай тэматыцы і патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі.

Прафесар Я. Я. Фралова прымала ўдзел у круглым стале «Роля жанчын-навукоўцаў Саюзнай дзяржавы ў сучасным свеце», прысвечаным 25-годдзю падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, які праводзіўся 19 лістапада 2024 г. у БДУ. Яўгенія Яўгенаўна выступіла з дакладам «І жаночая справа таксама», расказаўшы пра ролю і значны ўклад у развіццё шматлікіх сфер жыцця грамадства жанчын-навукоўцаў розных эпох.



Уручэнне рэктарам БДУ А. Д. Каралём
нагруднага знака «100 гадоў БДУ» і Падзякі
рэктара БДУ загадчыку кафедры грамадзянскага
права і працэсу і міжнароднага прыватнага права
Юрыдычнага інстытута РУДН,
навуковаму кансультанту кафедры грамадзянскага права
юрыдычнага факультэта БДУ, заслужанаму юрысту
Расійскай Федэрацыі Я. Я. Фраловай.
13 верасня 2024 г.



Міжнародны круглы стол,
прысвечаны 95-годдзю
прафесара заслужанага
юрыста БССР В. Ф. Чыгіра.
5 лістапада 2019 г.



Міжнародная навукова-практычная
канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю
кафедры грамадзянскага права і
працэсу юрыдычнага факультэта БДУ.
19 кастрычніка 2022 г.



Кнігі ў дар юрыдычнаму факультэту БДУ
ад прафесара Я. Я. Фраловай



Круглы стол з міжнародным удзелам
«Роль женщин-ученых Союзного государства
в современном мире». 19 лістапада 2024 г.



Удзел жанчын-прафесароў юрыдычнага факультэта БДУ
ў круглым стале «Роль женщин-ученых Союзного государства
в современном мире». 19 лістапада 2024 г.





Круглы стол з удзелам дырэктара Інстытута
дзяржавы і права РАН, члена-карэспандэнта РАН,
заслужанага юрыста Расійскай Федэрацыі
А. М. Савенкова. 21 мая 2024 г.

Юрыдычны факультэт таксама рэалізуе *магістарскія праграмы для замежных грамадзян на англійскай мове*. Факультэтам арганізаваны адукацыйныя праграмы паглыбленай вышэйшай адукацыі (магістратура) па спецыяльнасці «юрыспрудэнцыя» на англійскай мове па наступных прафілізацыях: «міжнароднае камерцыйнае права», «прававое забеспячэнне бяспекі і ўстойлівага развіцця грамадства» і «прававое забеспячэнне лічбавізацыі сучаснага грамадства». Названыя магістарскія праграмы карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод навучэнцаў Кітайскай Народнай Рэспублікі. Па выніках навучання асобы, якія паспяхова асвоілі адукацыйную праграму магістратуры і абаранілі магістарскія дысертацыі, атрымліваюць ступень магістра па спецыяльнасці «юрыспрудэнцыя».

На пастаяннай аснове адбываецца *супрацоўніцтва юрыдычнага факультэта БДУ з універсітэтамі-партнёрамі*. Яго дэлегацыі наведваюць гэтыя ўстановы для ўсталявання больш цеснага ўзаемадзеяння па ўдасканаленні адукацыйнага працэсу.

Адносна *акадэмічнай мабільнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу* можна адзначыць, што юрыдычны факультэт рэгулярна ўзаемадзейнічае з вядучымі замежнымі вучонымі і практыкамі ў галіне права, якія чытаюць лекцыі, праводзяць практычныя заняткі, у тым ліку з выкарыстаннем сучасных сродкаў інфармацыйна-тэхналагічнай сувязі, а таксама ўдзельнічаюць у круглых сталах і канферэнцыях.





Рабочы візіт у Рэспубліку Арменія дэлегацыі
юрыдычнага факультэта БДУ. 27–29 мая 2024 г.

Штогод прафесарска-выкладчыцкі састаў праходзіць *стажыроўкі* ва ўстановах вышэйшай адукацыі Расіі, Казахстана і іншых дзяржаў. У сваю чаргу, на юрыдычным факультэце праводзяцца стажыроўкі для выкладчыкаў універсітэтаў-партнёраў.

На юрыдычным факультэце рэгулярна арганізуюцца *навуковыя канферэнцыі*, *круглыя сталы*, *тэматычныя семінары з міжнародным удзелам*.

Юрыдычны факультэт праводзіць *летнія і зімовыя школы ў галіне права і палілогіі*. У 2024 г. была праведзена І летняя анлайн-школа на англійскай мове для студэнтаў Кітайскага ўніверсітэта палітычных навук і права (Пекін, Кітай) па тэме «Беларуска-кітайскае супрацоўніцтва: новыя падыходы, накіраваныя на ўмацаванне партнёрства і дзяржаўнага кіравання».



Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя,
прымеркаваная да 30-годдзя Канстытуцыі
Рэспублікі Беларусь. 5 сакавіка 2024 г.





Загадчык кафедры грамадзянскага права і працэсу
і міжнароднага прыватнага права Юрыдычнага інстытута РУДН, навуковы
кансультант кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ,
заслужаны юрыст Расійскай Федэрацыі Я. Я. Фралова выступае з дакладам
на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю
кафедры грамадзянскага права і працэсу юрыдычнага факультэта БДУ.
19 кастрычніка 2022 г.







Кіраўніцтва і прафесарска-выкладчыцкі састаў
устаноў вышэйшай адукцыі Кітайскай народнай рэспублікі
на юрыдычным факультэце БДУ. 2024 г.

Вялікая ўвага надаецца рэалізацыі такой формы міжнароднага супрацоўніцтва, як *удзел навучэнцаў у акадэмічных абменах*. У рамках акадэмічнай мабільнасці на юрыдычным факультэце навучаліся студэнты з Валгаградскага і Цюменскага дзяржаўных універсітэтаў, Уральскага дзяржаўнага юрыдычнага ўніверсітэта імя У. Ф. Якаўлева і інш.




Уручэнне дыпломаў магістрантам –
грамадзянам Кітайскай Народнай Рэспублікі. 2024 г.



Уручэнне дыпломаў замежным выпускнікам
юрыдычнага факультэта

Юрыдычны факультэт БДУ ўзаемадзейнічае з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Расійскай Федэрацыі: Акадэміяй права і кіравання Федэральнай службы выканання пакаранняў Расіі, Балтыйскім федэральным універсітэтам імя І. Канта, Кастанайскай акадэміяй Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Казахстан імя Ш. Кабылбаева, Кітайскім універсітэтам палітычных навук і права, Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. В. Ламаносава, Маскоўскім дзяржаўным інстытутам міжнародных адносін (універсітэтам) Міністэрства замежных спраў Расійскай Федэрацыі, Маскоўскім дзяржаўным юрыдычным універсітэтам імя А. Я. Кутафіна, Нацыянальным даследчым універсітэтам «Вышэйшая школа эканомікі», Пецярбургскім дзяржаўным універсітэтам, Расійска-Армянскім універсітэтам, Расійскім універсітэтам дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы, Уральскім дзяржаўным юрыдычным універсітэтам імя В. Ф. Якаўлева, Фінансавым універсітэтам пры Урадзе Расійскай Федэрацыі і інш.



Адкрытую лекцыю студэнтам юрыдычнага факультэта БДУ
чытае прафесар міжнародна-прававога факультэта Маскоўскага дзяржаўнага
інстытута міжнародных адносін (універсітэта) Міністэрства замежных спраў
Расійскай Федэрацыі. 14 лютага 2025 г.

Міжнародныя сувязі спрыяюць развіццю адукацыйнага і навуковага патэнцыялу студэнтаў і выкладчыкаў.



# КАФЕДРЫ І ПАДРАЗДЗЯЛЕННІ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

## КАФЕДРЫ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

### Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права была заснавана ў 1921 г. і з'яўляецца адной са старэйшых у БДУ. Яе традыцыі і навуковыя школы фарміраваліся заснавальнікамі кафедры агульнай тэорыі права – прафесарам К. А. Архіпавым і дацэнтам С. М. Гохманам, кафедры гісторыі права – прафесарамі У. І. Пічэтам і Д. А. Жарынавым, а таксама кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права – прафесарам П. М. Галанза.

З 1921 па 1924 г. загадчыкам кафедры агульнай тэорыі права з'яўляўся доктар юрыдычных навук, прафесар **К. А. Архіпаў** (1889–1963).

На працягу ўсяго перыяду існавання кафедры яе ўзначальвалі У. І. Пічэта, С. М. Гофман, Д. А. Жарынаў, П. М. Галанза, Б. Я. Бабіцкі, В. А. Дарогін, І. М. Ігнаценка, І. А. Юхо, С. Р. Драбязка, А. М. Абрамовіч і С. А. Калінін.



**Пічэта Уладзімір Іванавіч**
(1889–1963)
Доктар гістарычных навук, прафесар.
Акадэмік АН БССР. Акадэмік АН СССР.
З 1921 па 1923 і з 1925 па 1930 г. – загадчык кафедры гісторыі права.

### Гофман Станіслаў Маркавіч



(1889–1963)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

З 1925 па 1930 г. – загадчык кафедры агульнай тэорыі права.

### Жарынаў Дзмітрый Аляксеевіч



(1889–1963)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 1923 па 1924 г. – загадчык кафедры гісторыі права.

### Галанза Пётр Мікалаевіч



(1893–1982)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 1931 па 1939 г. – загадчык кафедры гісторыі дзяржавы і права.

### Бабіцкі Барыс Яўсеевіч



(1908–1963)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

З 1944 па 1948 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

З 1948 па 1950 г. – загадчык кафедры гісторыі дзяржавы і права.

### Дарогін Васіль Аляксандравіч



(1912–1995)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

З 1948 па 1950 г. – загадчык кафедры тэорыі дзяржавы і права.

З 1950 па 1965 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

З 1965 па 1973 г. – загадчык кафедры тэорыі дзяржавы і права.



**Ігнаценка Іларыён Мяфодзьевіч**

(1919–2002)

Доктар гістарычных навук, прафесар.

Член-карэспандэнт АН БССР. Акадэмік АН БССР.

З 1965 па 1966 г. – загадчык кафедры гісторыі дзяржавы і права.



**Юхо Іосіф (Язэп) Аляксандравіч**

(1921–2004)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 1966 па 1974 г. – загадчык кафедры гісторыі дзяржавы і права.



**Драбязка Сцяпан Рыгоравіч**

(1922–2019)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 1973 па 1974 г. – загадчык кафедры тэорыі дзяржавы і права.

З 1974 па 1988 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1996).



**Абрамовіч Аляксандр Міхайлавіч**

(1944–2018)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 1988 па 2008 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1998).



**Калінін Сяргей Артуравіч**

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

З 2008 па 2021 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

Заслужаны работнік БДУ.



Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. 2002 г.



Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. 2003 г.

Значны ўклад у развіццё кафедры ўнеслі прафесары М. М. Авакаў, В. А. Аўчыннікаў, Ю. П. Броўка, Т. І. Доўнар, Г. Г. Цернавая, А. Г. Цікавенка, дацэнты А. І. Арлоўская, Б. Я. Бабіцкі, В. С. Бранавец, У. М. Дубавіцкі, М. К. Казлоў, Д. А. Лагун, Л. В. Паўлава, М. Р. Петачэнка, В. В. Сарокіна і У. М. Сатолін.

**Авакаў Мірза Масэсавіч**
(1925–1987)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Працаваў на кафедры з 1956 па 1973 г.
Аўтар звыш 25 навуковых прац.





**Арлоўская Алена Іванаўна**

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Працуе на кафедры з 1994 г.

Аўтар звыш 150 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій, 4 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

Заслужаны работнік БДУ.



**Бранавец Валянціна Сцяпанаўна**

(1939–2008)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Працавала на кафедры з 1977 па 2008 г.



**Броўка Юрый Пятровіч**

(1936–2019)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Працаваў на кафедры з 1965 па 1992 г.



**Доўнар Таісія Іванаўна**

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Працуе на кафедры з 1977 г.

Аўтар звыш 400 навуковых прац, у тым ліку 11 манаграфій.

Аўтар першага ў Рэспубліцы Беларусь падручніка «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2014, 2021, 2023).

Узнагароджана медалём Францыска Скарыны.

Заслужаны работнік БДУ.

Ганаровы прафесар БДУ.



**Дубавіцкі Уладзімір Мікалаевіч**

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Працаваў на кафедры з 1997 па 2018 г.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.

**Казлоў Міхаіл Кандратавіч**
(1936–2022)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1973 па 2019 г.
З 1980 па 1997 г. займаў пасаду намесніка дэкана юрыдычнага факультэта БДУ па вучэбнай рабоце.



**Лагун Дзмітрый Анатольевіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працуе на кафедры з 2002 г.



**Паўлава Людміла Васільеўна**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працавала на кафедры з 1967 па 1992 г.



**Петачэнка Міхаіл Рыгоравіч**
(1928–2006)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1973 па 2006 г.
З 1973 па 1980 г. займаў пасаду намесніка дэкана юрыдычнага факультэта БДУ па вучэбнай рабоце.



**Сарокіна Валянціна Васільеўна**
(1923–?)
Кандыдат гістарычных навук, дацэнт.
Працавала на кафедры з 1959 г. Чытала курс гісторыі дзяржавы і права.
Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі і некалькімі медалямі.





**Сатолін Уладзімір Мікалаевіч**

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Працуе на кафедры с 1987 г.

З 1998 па 2019 г. працаваў намеснікам дэкана юрыдычнага факультэта БДУ па вучэбнай рабоце.



**Цернавая Галіна Гаўрылаўна**

(1928–1990)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Працавала на кафедры з 1960 па 1976 г.

Аўтар 40 навуковых прац.



**Цікавенка Анатоль Герасімавіч**

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 1997 г. займае пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Аўтар звыш 160 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій і 10 навучальных дапаможнікаў.

У 1999 г. аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2002).

У розныя гады на кафедры працавалі І. Л. Вяршок, П. М. Галанза, В. І. Ермаловіч, Э. А. Калініна, А. Я. Ляскоў, І. А. Рубіс, В. У. Сажына, А. А. Сакалова, М. У. Сільчанка, Т. А. Чарвякова, В. Н. Ухванаў, Н. М. Хаткевіч, А. Ю. Шырынскі і інш.

З 2022 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з'яўляецца Л. Л. Голубева.



**Голубева Людміла Леанідаўна**

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Заслужаны работнік БДУ.

Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права забяспечвае выкладанне асноўных вучэбных дысцыплін для студэнтаў юрыдычнага факультэта (спецыяльнасці «правазнаўства», «эканамічнае права», «паліталогія»): «Агульная тэорыя права», «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», «Гісторыя дзяржавы і права замежных краін», «Гісторыя палітычных і прававых вучэнняў», «Гісторыя дзяржавы і права», «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (для замежных студэнтаў), «Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі», «Сацыялогія права»; факультэта міжнародных адносін – «Агульная тэорыя права»; эканамічнага факультэта і факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – «Асновы права», а таксама выкладанне вучэбных дысцыплін магістратуры (спецыяльнасць «юрыспрудэнцыя»): «Актуальныя праблемы рэгулявання і рэалізацыі публічна-прававых адносін», «Дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі», «Сучасныя праблемы і метадалогія юрыдычнай навукі», «Тэарэтычныя праблемы прававога рэгулявання адносін лічбавай эканомікі». Для студэнтаў юрыдычнага факультэта, якія навучаюцца па спецыяльнасці «паліталогія», выкладчыкі кафедры чытаюць факультатыўную вучэбную дысцыпліну «Прававыя сістэмы сучаснасці».

Навукова-даследчая работа кафедры ажыццяўляецца па навуковай спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя вучэнняў аб праве і дзяржаве». Навуковыя працы членаў кафедры накіраваны на ўдасканаленне заканадаўства і прававой сістэмы Рэспублікі Беларусь, вывучэнне актуальных праблем гісторыі і тэорыі дзяржавы і права.

Выкладчыкі кафедры супрацоўнічаюць з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы праектаў нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Загадчык кафедры Л. Л. Голубева, намеснік дэкана юрыдычнага факультэта па навуковай рабоце С. А. Калінін, дацэнт Д. А. Лагун і аспірант А. А. Корабава ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы прапаноў аб практыцы прымянення і ўдасканалення законаў Рэспублікі Беларусь «Об основах государственной научно-технической политики» ад 19 студзеня 1993 г. № 2105-XII, «О научной деятельности» ад 21 кастрычніка 1996 г. № 708-XIII, «О государственной инновационной политике и инновационной деятельности в Республике Беларусь» ад 10 ліпеня 2012 г. № 425-З, прапаноў па пытанні ўзгаднення ўвядзення ведамаснай справаздачнасці ў сферы інтэлектуальнай уласнасці, прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства па пытаннях рэкламы, а таксама ў распрацоўцы штогадовага плана падрыхтоўкі праектаў заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь.

Вучоныя кафедры паспяхова сумяшчаюць выкладчыцкую і навукова-даследчую работу з юрыдычнай практыкай. Загадчык кафедры Л. Л. Голубева з'яўляецца членам навукова-метадычнага савета па групе спецыяльнасцей «права» вучэбна-метадычнага аб'яднання ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі, членам арганізацыйнага камітэта канферэнцый і круглых сталоў, якія арганізоўвае кафедра і юрыдычны факультэт, членам (старшынёй) рэдакцыйных калегій зборнікаў і юбілейных выданняў кафедры і юрыдычнага факультэта, а таксама навуковым кансультантам па пытаннях гісторыі дзяржавы і права Беларусі пры Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. Прафесар кафедры Т. І. Доўнар з'яўляецца членам рэдакцыйных саветаў часопісаў Беларусі. Намеснік дэкана С. А. Калінін выступае экспертам у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, членам Навукова-

кова-кансультатыўнага савета пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі, членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Выкладчыкі кафедры штогод друкуюць дзясяткі навуковых прац. Яе члены прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы законапраектаў. Яны падтрымліваюць цесныя навуковыя сувязі з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы, Алтайскім дзяржаўным універсітэтам, Інстытутам дзяржавы і права Расійскай акадэміі навук, Маскоўскім дзяржаўным інстытутам міжнародных адносін (універсітэтам) Міністэрства замежных спраў Расійскай Федэрацыі, Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. В. Ламаносава, Маскоўскім дзяржаўным юрыдычным універсітэтам імя А. Е. Кутафіна, Расійскім універсітэтам дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы (РУДН), Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэтам, Уральскім дзяржаўным універсітэтам імя А. М. Горкага і іншымі ўстановамі вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.



Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* намеснік дэкана па навуковай рабоце дацэнт С. А. Калінін, прафесар Т. І. Доўнар, загадчык кафедры дацэнт Л. Л. Голубева, дацэнт У. М. Сатолін, дацэнт Д. А. Лагун.
*Другі рад (злева направа):* дацэнт Д. В. Шчэрбік, старшы выкладчык С. А. Казлова, старшы выкладчык В. Ю. Вячорка, выкладчык Г. А. Праневіч, выкладчык В. Л. Важнік, аспірант С. Б. Антоненка.
*Трэці рад (злева направа):* дацэнт В. Н. Матарас, вядучы спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу Т. У. Іванова, старшы выкладчык Д. А. Праневіч, дацэнт А. М. Фіронаў, выкладчык А. А. Рашчупкін, аспірант Г. А. Корабава

Пры кафедры паспяхова функцыянуюць студэнцкія навуковыя гурткі па гісторыі дзяржавы і права Беларусі пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры Л. Л. Голубевай і прафесара кафедры Т. І. Доўнар; гісторыі дзяржавы і права замежных краін пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры У. М. Сатоліна; гісторыі палітычных і прававых вучэнняў пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры Д. В. Шчэрбіка; агульнай

тэорыі права пад кіраўніцтвам намесніка дэкана С. А. Калініна. Студэнты і магістранты – удзельнікі навуковых гурткоў выступаюць з паведамленнямі і дакладамі на міжнародных і рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях, прымаюць удзел у Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў і магістрантаў.

Кафедра штогод удзельнічае ў падрыхтоўцы і правядзенні Беларускай юрыдычнай студэнцкай алімпіяды. С. А. Калінін з'яўляецца намеснікам старшыні арганізацыйнага камітэта Беларускай юрыдычнай студэнцкай алімпіяды.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў супрацоўнікі кафедры выступаюць выканаўцамі заданняў у рамках дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў. Кафедра рэалізуе навукова-даследчую работу па тэме «Беларуская дзяржаўнасць і права ва ўмовах глабальнай неакрэсленасці і трансфармацыі: канцэптуальна-метадалагічныя, тэарэтычныя і гістарычныя заканамернасці і перадумовы паспяховага функцыянавання».

На кафедры працуюць дактары юрыдычных навук прафесары Т. І. Доўнар і А. Г. Цікавенка; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты А. І. Арлоўская, Л. Л. Голубева, С. А. Калінін, Д. А. Лагун, В. Н. Матарас і Д. В. Шчэрбік; кандыдаты юрыдычных навук У. М. Сатолін і А. М. Фіронаў; старшыя выкладчыкі І. В. Грынёў, В. Ю. Вячорка і Д. А. Праневіч, а таксама выкладчыкі В. Л. Важнік, Г. А. Корабава і А. А. Праневіч. Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ, працягваючы традыцыі вядучых навукоўцаў і прафесароў, імкнецца да выканання сваёй асноўнай задачы – падрыхтоўкі высокакваліфікаваных юрыстаў.

## Кафедра канстытуцыйнага права

Кафедра канстытуцыйнага права была створана ў 1921 г., адначасова з адкрыццём універсітэта.

Першым загадчыкам кафедры з'яўляўся прафесар У. М. Дурдзянеўскі. Затым кафедру ўзначальвалі М. А. Канаплін і Л. А. Рудзіцкі.

**Дурдзянеўскі Усевалад Мікалаевіч**
(1889–1963)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.



У 1926/1927 навучальным годзе чытаў дысцыпліны «Дзяржаўнае права СССР», «Дзяржаўнае права БССР»[1].

[1] Ф. 205. Воп. 1. Адз. сховішча 1143.



**Канаплін Мікалай Аляксандравіч**
(1890–1955)
Прафесар.
З 1921 па 1937 г. – загадчык кафедры.



**Рудзіцкі Лазар Абрамавіч**
(1901–?)
Дацэнт.
З 1938 па 1941 і з 1945 па 1954 гг. – загадчык кафедры.

З 1954 па 1964 г. дзяржаўна-прававыя вучэбныя дысцыпліны выкладаліся на кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, загадчыкам якой з'яўляўся кандыдат юрыдычных навук дацэнт **Васіль Аляксандравіч Дарогін** (1912–1995).

З 1965 па 1990 г. кафедра называлася кафедрай дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва. Яе ўзначальваў А. А. Галаўко.



**Галаўко Анатоль Аляксандравіч**
(1925–2014)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 1965 па 1990 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны юрыст БССР (1990).

У 1991 г. кафедра была перайменавана ў кафедру канстытуцыйнага права, якую ўзначаліў А. М. Крамнік.



**Крамнік Аляксандр Мікалаевіч**
(1933–2018)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
З 1991 па 1998 г. – загадчык кафедры.

Значны ўклад у развіццё кафедры ўнеслі дацэнты Г. А. Варабей, Я. М. Тагуноў, Л. А. Прыходзька, а таксама прафесары А. Ц. Лейзераў, М. П. Чудакоў і Г. Б. Шышко.

**Варабей Георгій Аляксандравіч**
(1934–2012)
Кандыдат юрыдычных навук, прафесар.
У 1965 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.
Аўтар звыш 100 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій, 1 падручніка і 2 навучальных дапаможнікаў.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2003).



**Лейзераў Аркадзь Цевелевіч**
(1922–2007)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
У 1949 г. скончыў Ваенную юрыдычную акадэмію Савецкай арміі, а ў 1953 г. – Ваенны інстытут замежных моў.
Працаваў на кафедры з 1963 па 2005 г.
З 1993 па 1994 г. з’яўляўся членам Канстытуцыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.
Аўтар каля 300 навуковых прац.



**Тагуноў Яўген Мікалаевіч**
(1925–2012)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
У 1950 г. скончыў Казанскі юрыдычны інстытут.
Працаваў на кафедры з 1966 па 1997 г.
Аўтар 80 навуковых прац.



**Прыходзька Людміла Аляксееўна**
(1928–2017)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
У 1950 г. скончыла Мінскі юрыдычны інстытут.
Аўтар звыш 80 навуковых прац.
Заслужаны работнік БДУ.



**Чудакоў Міхаіл Піліпавіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
У 1972 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.
Працаваў на кафедры з 1984 па 1996 і з 2022 па 2023 гг.
З 1990 па 1994 г. з’яўляўся членам Канстытуцыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.
Аўтар звыш 200 навуковых прац.





**Шышко Георгій Барысавіч**
(1935–2021)
Кандыдат юрыдычных навук, прафесар.
У 1966 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.
Працаваў на кафедры з 2014 па 2021 г.
Аўтар звыш 400 навуковых прац, у тым ліку 12 манаграфій, 40 падручнікаў і 8 вучэбных дапаможнікаў.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2004).

На кафедры працавалі вядомыя вучоныя і таленавітыя педагогі П. Я. Грынкін, П. К. Еўдакімаў, Н. А. Кудзінаў і інш.



Кафедра дзяржаўнага права
і савецкага будаўніцтва БДУ імя У. І. Леніна. 1987 г.

З 1998 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з'яўляецца Р. А. Васілевіч.



**Васілевіч Рыгор Аляксеевіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Член-карэспандэнт НАН Беларусі.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1994).

Кафедра канстытуцыйнага права забяспечвае выкладанне асноўных дысцыплін для студэнтаў юрыдычнага (спецыяльнасці «правазнаўства», «эканамічнае права», «паліталогія») і гістарычнага факультэтаў: «Канстытуцыйнае права Рэспублікі Беларусь», «Канстытуцыйнае права замежных краін», «Адміністрацыйна-дэліктнае і працэсуальна-выканаўчае права», «Інфармацыйнае

права», а таксама выкладанне дысцыплін магістратуры: «Адміністрацыйная адказнасць за правапарушэнні ў галіне сувязі і інфарматызацыі ў Рэспубліцы Беларусь», «Адміністрацыйная адказнасць у сферы дзяржаўнага кіравання і правасуддзя», «Актуальныя праблемы рэгулявання і рэалізацыі публічна-прававых адносін», «Актуальныя пытанні прававога рэгулявання адносін у сетцы Інтэрнэт і абароны персанальных дадзеных», «Арганізацыйна-прававое забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі», «Інстытуцыйнае права Саюзнай дзяржавы, ЕАЭС і СНД», «Інфармацыйны суверэнітэт дзяржавы ў кантэксце глабалізацыі і інтэграцыйных працэсаў», «Лічбавізацыя права», «Прававое забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій у дзейнасці дзяржаўных органаў», «Прававое забеспячэнне развіцця электроннай дзяржавы», «Прававыя асновы інавацыйнай дзейнасці», «Праватворчасць органаў прадстаўнічай, выканаўчай і судовай улады», «Юрыдычная адказнасць у сферы эканомікі».

Выкладчыкі кафедры чытаюць спецкурсы: «Канстытуцыйнае правасуддзе», «Канстытуцыйна-прававая адказнасць у Рэспубліцы Беларусь і замежных краінах», «Мясцовае самакіраванне ў Рэспубліцы Беларусь і замежных краінах», «Права правоў чалавека», «Юрыдычная служба арганізацый».

Навукова-даследчая работа кафедры ажыццяўляецца па навуковых спецыяльнасцях: «канстытуцыйнае права, канстытуцыйны працэс, муніцыпальнае права», «інфармацыйнае права», «адміністрацыйнае права, адміністрацыйна-дэліктнае права, адміністрацыйны працэс». Навуковыя працы членаў кафедры накіраваны на ўдасканаленне заканадаўства аб палітычнай сістэме Рэспублікі Беларусь, правах, свабодах і абавязках грамадзян і практыцы яго прымянення. Сярод іх можна адзначыць працы прафесара Р. А. Васілевіча ў галіне забеспячэння канстытуцыйных правоў і свабод, арганізацыі і дзейнасці органаў дзяржаўнай улады. Р. А. Васілевіч з'яўляецца аўтарам шэрага манаграфічных даследаванняў, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў: «Нормативные правовые акты государственных органов Республики Беларусь» (1999), «Конституция Республики Беларусь. Научно-практический комментарий» (2000, 2001, 2005), «Комментарий к Закону Республики Беларусь "О нормативных правовых актах Республики Беларусь"» (2003, 2006), «Источники белорусского права: принципы, нормативные акты, обычаи, прецеденты, доктрина» (2005, 2007), «Белорусское государство на рубеже веков» (2006, 2007), «Контрольная деятельность Парламента и местных Советов депутатов» (2008), «Конституционное правосудие» (у суаўтарстве; 2014, 2019), «Проекты Конституции Республики Беларусь: поиск оптимальной модели» (2014), «Актуальные направления противодействия коррупции в Республике Беларусь на современном этапе» (2020), «Правовые основы нормотворческой деятельности органов исполнительной власти» (2021), «Конституционное право Республики Беларусь» (2023), «Научно-практический комментарий к Конституции Республики Беларусь» (у суаўтарстве; 2024)) і інш.

Выкладчыкі кафедры прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы законапраектаў. На працягу некалькіх гадоў Р. А. Васілевіч уваходзіў у склад рабочых груп па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. У перыяд дзейнасці ў Вярхоўным Савеце з 1986 па 1994 г. ён прымаў удзел у распрацоўцы амаль 400 законапраектаў. У 2021–2022 гг. прафесар Р. А. Васілевіч і дацэнт

Т. С. Маслоўская ўваходзілі ў склад Канстытуцыйнай камісіі. Усе члены кафедры прымаюць удзел у абмеркаванні законапраектаў на пасяджэннях.

Вучоныя паспяхова сумяшчаюць выкладчыцкую і навукова-даследчыцкую работу з юрыдычнай практыкай: Р. А. Васілевіч з’яўляецца членам Савета па пытаннях прававой і судовай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, а таксама рэдакцыйных саветаў часопісаў Беларусі і замежных краін.

Выкладчыкі кафедры штогод друкуюць дзясяткі навуковых прац. Супрацоўнікі прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы законапраектаў. Яны падтрымліваюць цесныя навуковыя сувязі з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Інстытутам заканадаўства і параўнальнага правазнаўства пры Урадзе Расійскай Федэрацыі, роднаснымі кафедрамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава, Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта і іншых вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь і замежжа.



Кафедра канстытуцыйнага права. 2023 г.

Пры кафедры паспяхова функцыянуюць студэнцкія навуковыя гурткі па канстытуцыйным, адміністрацыйна-дэліктным і працэсуальна-выканаўчым праве, муніцыпальным праве, правах чалавека. Удзельнікі гурткоў выступаюць з паведамленнямі і дакладамі на ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, прымаюць удзел у конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

На кафедры працуюць доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіч; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты М. С. Абламейка, А. М. Багалейка, Н. М. Кандратовіч, Т. М. Кісялёва, Т. С. Маслоўская, Г. М. Сініцына, У. Ю. Чэшка, В. А. Шаршун і А. В. Шаўцова; старшыя выкладчыкі С. Ю. Арцем’еў і В. Я. Петухова; выкладчык О. У. Шаро, сумяшчальнікі – кандыдаты юрыдычных навук дацэнты Г. С. Бакун, А. М. Бодак і В. К. Ладуцька, а таксама старшыя выкладчыкі Т. М. Пяхота, Т. М. Сакалоўская, і В. П. Сухапараў.



Кафедра канстытуцыйнага права. 2025 г.
*Злева направа:* дацэнт А. М. Багалейка,
старшы выкладчык С. Ю. Арцем'еў, дацэнт Т. С. Маслоўская,
старшы выкладчык Т. М. Сакалоўская, дацэнт М. С. Абламейка,
намеснік дэкана па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце В. П. Сухапараў,
дацэнт А. В. Шаўцова, старшы выкладчык В. Я. Петухова,
загадчык кафедры прафесар Р. А. Васілевіч, дацэнт Н. М. Кандратовіч,
спецыяліст I катэгорыі па забеспячэнні вучэбнага працэсу І. М. Боднар,
дацэнт В. А. Шаршун, выкладчык О. У. Шаро, выкладчык К. І. Стаякоў

## Кафедра дзяржаўнага кіравання

Кафедра дзяржаўнага кіравання як самастойнае падраздзяленне юрыдычнага факультэта БДУ створана ў 2015 г. Заснавальнікам і першым загадчыкам кафедры з'яўляецца В. І. Чупрыс, якая ўнесла значны ўклад у яе развіццё. Затым кафедру ўзначальвала Т. А. Чарвякова.



**Чупрыс Вольга Іванаўна**

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 2010 па 2015 г. – намеснік дэкана юрыдычнага факультэта БДУ.

З 2015 па 2018 г. – першы загадчык кафедры дзяржаўнага кіравання.

З 2018 па 2019 г. – прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях БДУ.

З 2019 г. – Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).



**Чарвякова Таццяна Анатольеўна**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
З 2018 па 2022 г. – загадчык кафедры.



Пасяджэнне кафедры дзяржаўнага кіравання.
18 чэрвеня 2015 г.

З моманту заснавання на кафедры працавалі доктар юрыдычных навук прафесар А. Ф. Доўгань; кандытаты юрыдычных навук дацэнты М. С. Абламейка, В. А. Антонава, Т. М. Міхалёва, Н. А. Мароз, В. З. Рыбаключава, А. В. Сямашка, А. Г. Станкевіч, А. М. Старавойтаў, Т. В. Целяціцкая, І. Л. Фядчук, А. Ю. Чарналеўскі і Л. П. Ярмош; кандытат філасофскіх навук дацэнт С. І. Сіманоускі; старшыя выкладчыкі А. І. Анішчанка, Г. Г. Куневіч, Д. А. Кучугурны і В. Я. Петухова; выкладчыкі Л. І. Гасан, М. А. Кавалёнак, В. Р. Качэрга і С. А. Мініч, а таксама спецыялісты Т. М. Крукава і І. Ю. Мамайка.

З 2022 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з’яўляецца В. С. Міхайлоўскі.



**Міхайлоўскі Вадзім Сяргеевіч**
Доктар палітычных навук, дацэнт.



Кафедра дзяржаўнага кіравання. 2020 г.

Сёння на кафедры працуюць доктар юрыдычных навук прафесар В. М. Талочка; кандытаты юрыдычных навук дацэнты Н. В. Валюшка-Орса, Л. А. Краснабаева, Н. А. Лопуць, К. М. Мазанік, С. А. Міхалёнак, А. Я. Орса, А. А. Піліпенка, Н. А. Рамазанава і В. А. Хацько; кандытаты юрыдычных навук В. В. Емельяновіч і А. У. Карамышаў; старшыя выкладчыкі З. А. Кавалей, А. М. Корсак і Н. М. Шэўко; выкладчыкі В. Г. Нікіценка і М. У. Хашкоўскі, а таксама выкладчык-стажор В. А. Каляда.



Кафедра дзяржаўнага кіравання. 2025 г.
*Першы (рад злева направа):* дацэнт А. А. Піліпенка,
дацэнт В. А. Хацько, загадчык кафедры дацэнт В. С. Міхайлоўскі,
намеснік дэкана па міжнародным супрацоўніцтве
і інтэрнацыяналізацыі адукацыі В. В. Емельяновіч, дацэнт Л. А. Краснабаева.
*Другі рад злева направа:* старшы выкладчык Н. М. Шэўко,
старшы выкладчык З. А. Кавалей, дацэнт Н. В. Валюшка-Орса,
прафесар В. М. Талочка, дацэнт А. У. Карамышаў

Кафедра забяспечвае выкладанне вучэбных дысцыплін для студэнтаў юрыдычнага факультэта, факультэта міжнародных адносін, а таксама гістарычнага, эканамічнага і біялагічнага факультэтаў: «Адміністрацыйнае права», «Дзяржаўная служба», «Міжнароднае публічнае права», «Падаткавае права» (з 2021 г.), «Фінансавае права» (з 2021 г.) і інш. Шэраг дысцыплін выкладаецца ў магістратуры юрыдычнага факультэта, у тым ліку на англійскай мове.

У 2022 г. у магістратуры юрыдычнага факультэта кафедрай адкрыта сумесная прафілізацыя «дзяржаўнае кіраванне інфармацыйнай прасторай; прававое рэгуляванне адносін у сетцы Інтэрнэт і абароны персанальных дадзеных».

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі ў аспірантуры і дактарантуры ажыццяўляецца па спецыяльнасцях: «фінансавае права, падатковае права, бюджэтнае права», «міжнароднае права, права рэгіянальнай інтэграцыі», «адміністрацыйнае права, адміністрацыйна-дэліктнае права, адміністрацыйны працэс».

З 2022 па 2026 г. на кафедры ажыццяўляецца навукова-даследчая работа па тэме «Дзяржаўнае кіраванне грамадскім развіццём: нацыянальны і міжнародна-прававы аспекты». Выкладчыкі прымаюць удзел у навуковых даследаваннях па дзяржаўнай праграме «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг. Вынікі навукова-даследчай працы выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе, пры падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

## Кафедра грамадзянскага права

Кафедра грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ з’яўляецца найбуйнейшай кафедрай такога профілю ў краіне. Момант яе заснавання звязаны з датай адкрыцця самога ўніверсітэта і ўтварэння ў ім факультэта грамадскіх навук. У рамках прававога аддзялення гэтага факультэта пачала зараджацца кафедра грамадзянскага права, а 31 жніўня 1922 г. на ім быў створаны кабінет грамадзянскага права, на падставе якога стала развівацца дадзеная кафедра.

З моманту стварэння і да 1937 г. кафедра грамадзянскага права захоўвала сваю сучасную назву, аднак у рамках яе дзейнасці выкладаўся цэлы шэраг іншых дысцыплін, у тым ліку сямейнае права і грамадзянскі працэс. Беларуская юрыдычная школа ўмацоўвалася, з’яўляліся выдатныя навукоўцы, якія развівалі як матэрыяльнае грамадзянскае права, так і працэсуальны кірунак. Пачынаючы з 1937 г. падраздзяленне мела назву грамадзянскага права і працэсу. У 1974 г. было прынята рашэнне стварыць дзве самастойныя кафедры: кафедру грамадзянскага і сямейнага права і кафедру грамадзянскага працэсу і працоўнага права. Дыферэнцыяцыя кірункаў юрыдычнай навукі і адпаведных галін права

прывяла да канчатковага структурнага размежавання грамадзянскага матэрыяльнага і грамадзянскага працэсуальнага права ў рамках юрыдычнага факультэта БДУ. Акрамя таго, у назве кафедры з’явілася ўказанне на сямейнае права, што было абумоўлена развіццём дадзенай галіны, а таксама прыняццем Вярхоўным Саветам БССР 13 чэрвеня 1969 г. Кодэкса аб шлюбе і сям’і БССР. Аднак у 1991 г. яна атрымала сваю першапачатковую назву – «кафедра грамадзянскага права». З гэтага моманту і па цяперашні час прадмет адукацыйнай і навуковай дзейнасці кафедры трактуецца шырока, уключаючы не толькі непасрэдна грамадзянскае права, але і іншыя дысцыпліны прыватна-прававога блока, у тым ліку сямейнае і міжнароднае прыватнае права.

Першым загадчыкам кафедры з’яўляўся прафесар **Г. М. Маркаў**.

На працягу перыяду існавання кафедры яе ўзначальвалі М. В. Грэдзінгер, І. С. Андрэйчык, Ф. І. Гаўзэ, Г. А. Павецьеў, В. Ф. Чыгір і В. М. Гадуноў. З 1937 па 1941 г. загадчыкам кафедры з’яўляўся кандыдат юрыдычных навук дацэнт **А. Н. Юрашкевіч**.



**Грэдзінгер Міхаіл Восіпавіч**

(1867–1936)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Акадэмік АН БССР.

З 1923 па 1936 г. – загадчык кафедры.

Кіраваў прававой прадметнай камісіяй. У 1925/1926 навучальным годзе ўзначальваў юрыдычную секцыю навуковага таварыства БДУ, быў абраны членам Бюро юрысконсультаў пры Вышэйшым савеце народнай гаспадаркі БССР.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.



**Андрэйчык Іосіф Сямёнавіч**

(1901–1945)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Да Вялікай Айчыннай вайны скончыў Мінскі юрыдычны інстытут.

Выкладаў грамадзянскае права ў Мінскім юрыдычным інстытуце.

З 1944 па 1945 г. – загадчык кафедры.



**Гаўзэ Файфель Ісакавіч**

(1897–1990)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 1945 па 1950 г. – загадчык кафедры.



**Павецьеў Гаўрыіл Аляксеевіч**
(1909–1971)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
З 1950 па 1971 г. – загадчык кафедры.
Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», шэрагам медалёў, Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.
Аўтар звыш 25 навуковых прац.



**Чыгір Васіль Фёдаравіч**
(1924–2024)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 1971 па 1993 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны юрыст БССР (1971).



**Гадуноў Валерый Мікалаевіч**
(1954–2022)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 1993 па 2017 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017).

Большасць загадчыкаў кафедры грамадзянскага права ўзначальвалі таксама Мінскі юрыдычны інстытут (дацэнты А. Н. Юрашкевіч, І. С. Андрэйчык, Г. А. Павецьеў), а потым юрыдычны факультэт БДУ (прафесары В. Ф. Чыгір, В. М. Гадуноў).

З імёнамі В. Ф. Чыгіра і В. М. Гадунова звязана стварэнне і станаўленне навуковай школы «Юрыдычныя асобы і грамадзяне як суб'екты грамадзянска-прававых адносін: праблемы тэорыі і практыкі». Афіцыйнай датай заснавання навуковай школы лічыцца 1983 г., аднак яна пачала фарміравацца значна раней, з моманту ўтварэння кафедры грамадзянскага права БДУ. У 2022 г. навуковая школа атрымала назву «Навуковая школа прыватнага права».

Значны ўклад у развіццё кафедры ўнеслі доктар юрыдычных навук, прафесар, акадэмік АН БССР М. В. Грэдзінгер, прафесар Б. В. Чрэдзін, а таксама вядучыя спецыялісты ў сферы прыватна прававых навук, кандыдаты юрыдычных навук, дацэнты К. А. Барзова, В. В. Левы, Г. А. Павецьеў, У. А. Раманенка, А. М. Рамановіч, С. П. Сакалоў, І. М. Шчамялёва.

У розныя гады на кафедры працавалі і прымалі ўдзел у яе развіцці дацэнты С. М. Ананіч, Я. П. Андрэеў, Р. С. Драбязка, С. Л. Ермаковіч, Д. У. Іванова, Д. Д. Ландо, У. П. Мароз, Н. М. Мяшкова, А. А. Салей і інш.

**Барзова Клара Аляксееўна**

(1925–?)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1946 г. скончыла Маскоўскі юрыдычны інстытут. У 1952 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Салідарныя абавязацельствы ў савецкім грамадзянскім праве».

Працавала на кафедры з 1954 па 1991 г.



**Левы Васіль Васільевіч**

(1927–2005)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1959 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ. У 1964 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дагавор падраду па абслугоўванні бытавых патрэб грамадзян (па матэрыялах Беларускай ССР)».

Працаваў на кафедры з 1972 г.

Узнагароджаны некалькімі медалямі.



**Раманенка Уладзімір Андрэевіч**

(1938–2022)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1961 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ. У 1971 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дагавор падраду на капітальнае будаўніцтва ў калгасах (па матэрыялах БССР)».

Працаваў на кафедры з 1968 па 2015 г.



**Рамановіч Ала Мікалаеўна**

(1931–2007)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1953 г. скончыла Мінскі юрыдычны інстытут. У 1963 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Грамадзянская адказнасць за невыкананне абавязацельстваў, заснаваных на дзяржаўным плане перавозкі грузаў па чыгунцы».

Працавала на кафедры з 1972 па 2007 г.



**Сакалоў Сяргей Паўлавіч**

(1937–2022)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1975 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ. У 1987 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Змяненне жыллёвых праваадносін».

Працаваў на кафедры з 1975 г.





**Чрэдзін Барыс Васільевіч**

(1885–1930)

Прафесар.

З 1923 па 1930 г. – прафесар прававога аддзялення факультэта грамадскіх навук БДУ. Першы выкладчык гісторыі інстытутаў прыватнага права, рымскага і гандлёва-прамысловага права на факультэце грамадскіх навук і факультэце права і гаспадаркі БДУ. Сумесна з прафесарам М. В. Грэдзінгерам распрацаваў першую праграму для аспірантаў на кафедры грамадзянскага права. З'яўляўся членам Навуковага таварыства пры БДУ.



**Шчамялёва Ірына Мікалаеўна**

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1981 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ. У 1987 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Новая кадыфікацыя жыллёвага заканадаўства БССР».

З'яўлялася членам рабочай групы па падрыхтоўцы праекта Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Працавала на кафедры з 1987 па 2021 г.

Аўтар звыш 100 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфій.



Кафедра грамадзянскага і сямейнага права. 1987 г.



Кафедра грамадзянскага права. 2002 г.



Кафедра грамадзянскага права. 2009 г.



Кафедра грамадзянскага права. 2019 г.

З 2017 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з'яўляецца М. В. Мяшчанава.

**Мяшчанава Марыя Валянцінаўна**
Доктар юрыдычных навук, дацэнт.



Сёння на кафедры працуюць кандыдаты юрыдычных навук дацэнты М. П. Караткевіч, І. В. Папова, С. П. Пратасавіцкі і А. А. Свадкоўская, М. А. Семяніхін, М. С. Стрыжак, І. П. Траццякова, В. У. Цагельнік і А. А. Ядрэўскі; старшыя выкладчыкі С. М. Белаус, У. С. Галуза, А. І. Касьянчык, В. В. Максімянюк, Т. У. Навумовіч, А. А. Рэуцкая, Т. М. Русенчык, К. В. Сінкевіч, А. В. Уржынская і В. А. Яўменчыкава; выкладчыкі К. А. Мацвеева і В. А. Паўлоўскі.



Кафедра грамадзянскага права. 2023 г.

Кафедра забяспечвае выкладанне асноўных вучэбных дысцыплін: «Грамадзянскае права, частка першая», «Грамадзянскае права, частка другая», «Грамадзянскае права» (для аддзялення «Паліталогія»), «Міжнароднае прыватнае права», «Рымскае прыватнае права», «Сямейнае права», а таксама дысцыплін спецыялізацыі «гаспадарчае права»: «Грамадзянскае і гандлёвае права замежных краін», «Дагавор у грамадзянскім праве», «Жыллёвае права», «Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы», «Прававы рэжым нерухомасці». Значная частка работы кафедры заснавана на выкладанні дысцыплін у магістратуры: «Калізійнае рэгуляванне ў міжнароднай камерцыйнай дзейнасці», «Калізійныя і матэрыяльныя аспекты вырашэння спрэчак з міжнародных кантрактаў», «Прыватнае права ў кантэксце сучасных інтэграцыйных працэсаў», «Актуальныя праблемы сямейнага права», «Актуальныя праблемы прававога рэжыму аб’ектаў грамадзянскіх праў», «Прававое рэгуляванне інвестыцыйнай дзейнасці», «Асаблівасці прававога регулявання грамадзянскага і гандлёвага права замежных краін», «Актуальныя праблемы грамадзянска-прававой абароны маёмасных і асабістых немаёмасных праў». Выкладчыкі вядуць заняткі на гістарычным факультэце БДУ па вучэбнай дысцыпліне «Грамадзянскае права Рэспублікі Беларусь».

На працягу многіх дзесяцігоддзяў супрацоўнікі кафедры грамадзянскага права з’яўляюцца выканаўцамі заданняў у рамках дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў. Кафедра рэалізуе навукова-даследчую работу па тэме «Праблемы сацыяльна-эканамічнай эфектыўнасці прыватна-прававога рэгулявання грамадскіх адносін ва ўмовах лічбавізацыі і інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў» у рамках задання «Забеспячэнне сацыяльна-эканамічнай эфектыўнасці прыватна-прававога рэгулявання грамадскіх адносін і абароны грамадзянскіх праў ва ўмовах лічбавізацыі і рэгіянальнай інтэграцыі» падпраграмы «Права» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг.

Супрацоўнікі кафедры першымі ў Рэспубліцы Беларусь удзельнічалі ў фундаментальных даследаваннях уплыву працэсаў скразной лічбавізацыі на раз-

віццё грамадскіх адносін і іх прававое рэгуляванне. У 2020–2022 гг. кафедра рэалізоўвала сумесны грант БРФФД – РФФД «Скразныя лічбавыя тэхналогіі ў забеспячэнні фінансавай стабільнасці і сацыяльна-эканамічнай устойлівасці расійска-беларускіх адносін у XXI стагоддзі». Высновы даследаванняў знайшлі развіццё ў 18 навуковых публікацыях, у тым ліку 3 артыкулах у выданнях з індэксацыяй у міжнародных навукаметрычных базах.

Універсітэт з'яўляецца месцам, дзе знікае грань паміж адукацыяй і навукай. Менавіта таму кафедра грамадзянскага права заўсёды імкнулася ўкараняць перадавыя метады навучання ў адукацыйны працэс і знаёміць студэнтаў з прагрэсіўнымі навуковымі падыходамі да вырашэння найважнейшых практычных праблем.

Калектывам кафедры падрыхтаваны першыя ў Рэспубліцы Беларусь падручнікі і навучальныя дапаможнікі па грамадзянскім, жыллёвым і сямейным праве, першы каментарый да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Са шматлікіх выданняў гэтага стагоддзя асабліва трэба вылучыць падручнік «Гражданское право» (у 3 тамах; 2008, 2010, 2011), «Комментарий к Гражданскому кодексу Республики Беларусь (постатейный)» (у 3 тамах; 2003), паартыкульны «Комментарий к Гражданскому кодексу Республики Беларусь с приложением актов законодательства и судебной практики» (у 3 кнігах; 2007), а таксама выданні «Семейное право. Практикум» (2020), «Семейное право» (2024).

Штогод супрацоўнікі кафедры публікуюць больш за 100 навуковых і вучэбна-метадычных прац, у тым ліку манаграфіі і артыкулы, якія індэксуюцца ў міжнародных навукаметрычных базах.

Кафедра грамадзянскага права мае багатыя традыцыі аб'яднання студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і выпускнікоў юрыдычнага факультэта ў навуковыя гурткі. У рамках іх работы ажыццяўляецца падрыхтоўка навучэнцаў да ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях і конкурсах, праводзяцца круглыя сталы, запрашаюцца практыкі з мэтай абмеркавання актуальных пытанняў правапрымянення.

Сёння на кафедры працуюць навуковы студэнцкі навуковы гурток па сямейным праве і гурток «Сучасная цывілістыка». Мэтай дзейнасці гуртка па сямейным праве, які функцыянуе з 2018 г., з'яўляецца навуковае даследаванне актуальных праблем сямейнага права і пошук шляхоў іх вырашэння. У рамках студэнцкага гуртка «Сучасная цывілістыка», які дзейнічае з 2023 г., ажыццяўляецца паглыбленае вывучэнне праблематыкі грамадзянскага права.

Да наватарскіх дасягненняў кафедры належыць рэалізацыя міжнароднай сумеснай адукацыйнай праграмы «Грамадзянскае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права» з выдачай двух дыпломаў магістра – РУДН і БДУ. У 2023 г. адбыўся першы выпуск сумеснай магістратуры.

Кафедра грамадзянскага права заўсёды прымала актыўны ўдзел у законапраектнай дзейнасці і іншых формах супрацоўніцтва з дзяржаўнымі органамі Рэспублікі Беларусь. Так, прафесар В. Ф. Чыгір уваходзіў у склад рабочай групы па падрыхтоўцы праекта мадэльнага Грамадзянскага кодэкса для краін СНД. Вядучыя навукоўцы кафедры – прафесары В. Ф. Чыгір і В. М. Гадуноў, дацэнты В. В. Левы, У. А. Раманенка, А. М. Рамановіч, С. П. Сакалоў і І. М. Шчамялёва – з'яўляліся членамі рабочай групы па падрыхтоўцы праекта Грамадзянскага

кодэкса Рэспублікі Беларусь 1998 г. У 2018 г. пры абмеркаванні значных змяненняў Грамадзянскага кодэкса ў склад рабочай групы былі ўключаны дацэнты М. В. Мяшчанава і А. А. Салей.

Кафедра прымае актыўны ўдзел у навукова-кансультатыўных і экспертных саветах, падрыхтоўцы заключэнняў аб мэтазгоднасці ўнясення змяненняў у заканадаўства, а таксама ў праектах па распрацоўцы нарматыўных прававых актаў. Многія выкладчыкі маюць значны практычны вопыт і сувязь з практыкай праваприымянення.

Загадчык кафедры М. В. Мяшчанава з'яўляецца членам савета па абароне дысертацый пры БДУ.

Кафедра грамадзянскага права, працягваючы традыцыі і падтрымліваючы пераемнасць пакаленняў, імкнецца да выканання сваёй асноўнай задачы – падрыхтоўкі высокакваліфікаваных юрыстаў, якія стануць апорай і абаронцамі праў і законных інтарэсаў краіны і кожнага яе грамадзяніна.



Кафедра грамадзянскага права. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* дацэнт І. В. Папова, дацэнт М. С. Стрыжак, дацэнт І. П. Траццякова, загадчык кафедры дацэнт М. В. Мяшчанава, старшы выкладчык С. М. Белаус, дацэнт М. П. Караткевіч, спецыяліст І катэгорыі па забеспячэнні вучэбнага працэсу М. І. Азоўцава.
*Другі рад (злева направа):* старшы выкладчык Я. С. Кастрова, дацэнт С. П. Пратасавіцкі, старшы выкладчык А. В. Уржынская, старшы выкладчык Т. У. Навумовіч, дацэнт А. А. Ядрэўскі, старшы выкладчык Т. М. Русенчык, старшы выкладчык В. В. Максімянюк, старшы выкладчык В. А. Яўменчыкава, выкладчык К. А. Мацвеева, старшы выкладчык В. А. Паўлоўскі

# Кафедра гаспадарчага права

Кафедра фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці юрыдычнага факультэта БДУ заснавана ў 2004 г. У 2022 г. кафедра была перайменавана ў кафедру гаспадарчага права.



Кафедра фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці. 2004 г.

Ініцыятарам утварэння і першым загадчыкам кафедры з'яўляецца В. С. Камянкоў, які заклаў асновы навуковай школы гаспадарчага і фінансавага права. Маючы вялікі досвед практычнай работы (у органах пракуратуры (памочнік пракурора, намеснік пракурора раёна, старшы памочнік пракурора вобласці, начальнік аддзела Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь), у Вышэйшым Гаспадарчым Судзе Рэспублікі Беларусь (Намеснік Старшыні, Першы намеснік Старшыні, Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь)), В. С. Камянкоў заўсёды арыентаваў навуковыя даследаванні сваіх вучняў і калег на актуальныя праблемы гаспадарчага права і патрабаванні правапрымяняльнай практыкі. Затым кафедру ўзначальваў А. А. Піліпенка, які працягнуў яе традыцыі.

**Камянкоў Віктар Сяргеевіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 2004 па 2020 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1994).



**Піліпенка Аляксандр Анатольевіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
З 2020 па 2021 г. – загадчык кафедры.



Значны ўклад у развіццё кафедры ўнеслі дактары юрыдычных навук прафесары В. С. Камянкоў, Я. І. Функ і Н. Л. Бандарэнка; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты Т. С. Бойка і А. А. Піліпенка.



**Бойка Таццяна Сямёнаўна**

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

З 1983 па 2011 г. – выкладчык, дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, кафедры канстытуцыйнага права, кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве).

З 1997 г. – суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.



**Функ Ян Іосіфавіч**

Доктар юрыдычных навук, прафесар

З 2004 г. – прафесар кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры гаспадарчага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве).

З 2005 г. – старшыня Міжнароднага арбітражнага суда пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце.

Некаторыя з членаў кафедры пасля яе рэарганізацыі ў 2022 г. працягнулі працаваць на іншых кафедрах юрыдычнага факультэта або выбралі шлях практыкуючых юрыстаў (кандыдаты юрыдычных навук дацэнты А. Ю. Кадурын, А. Ю. Корачкін, Д. М. Севярын і інш.).



Кафедра фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці. 2020 г.

З 2021 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з’яўляецца Н. Л. Бандарэнка.



**Бандарэнка Наталля Леанідаўна**

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Узначальвае навуковую школу гаспадарчага права БДУ, работа якой сканцэнтравана на вырашэнні задач удасканалення ўжо існуючай дактрынальнай асновы навукі гаспадарчага права і вызначэння тэарэтычнай асновы новых і перспектыўных напрамкаў гаспадарча-прававога рэгулявання, а таксама фарміравання актуальных для грамадства і дзяржавы напрамкаў навуковых ведаў, выпрацоўкі практычных прапаноў па ўдасканаленні гаспадарчага, фіскальнага, інвестыцыйнага і прудэнцыйнага права Рэспублікі Беларусь.

Сёння на кафедры працуюць: дактары юрыдычных навук прафесары Н. Л. Бандарэнка, В. С. Камянкоў, Я. І. Функ; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты Е. М. Гладкая, А. А. Гур’ева, В. М. Куніцкая, М. І. Рудовіч, Ю. Л. Сівакоў, Р. Р. Тамковіч і Т. М. Халецкая; кандыдат юрыдычных навук Ю. Р. Кананевіч; старшыя выкладчыкі А. У. Гаўрыленка, В. А. Казлоўская, Е. У. Максіменка, Н. А. Мяшкова і У. В. Сташкевіч і інш.



Кафедра гаспадарчага права. 2023 г.

Кафедра забяспечвае выкладанне прадметаў гаспадарча-прававой накіраванасці. Асноўнымі дысцыплінамі з’яўляюцца «Гаспадарчае права», «Банкаўскае права» і «Спартыўнае права». Значнае месца адводзіцца і спецыяльным дысцыплінам, у тым ліку: «Асновы прадпрымальніцкай дзейнасці», «Асаблівасці разгляду і вырашэння спраў аб банкруцтве», «Конкурснае права», «Прававое рэгуляванне інвестыцыйнай дзейнасці», «Права нацыянальнай эканамічнай бяспекі», «Прававое рэгуляванне лічбавых тэхналогій у гаспадарчай дзейнасці», «Карпаратыўнае права», «Канкурэнтнае права», «Антыманапольнае права», «Манетарнае і банкаўскае права», «Прафесійная камунікацыя юрыста», «Эканамічны аналіз права», «Прававая аснова эканамічных рызыкаў», «Прававое рэгуляванне знешнеэканамічнай дзейнасці», «Публічна-прыватнае партнёрства», «Краінавы маркетынг», «Арганізацыйна-прававыя асновы лічбавай эканомікі», «Фіскалістыка», «Інавацыйнае права», «Юрыдычная адказнасць у сферы эканомікі», «Прававы рэжым інвестыцый у чалавечы капітал», «Альтэрнатыўныя спосабы вырашэння спрэчак», «Камунікатыўныя тэхнікі ў практыцы вядзення перамоў» і інш. Шэраг курсаў выкладаецца на англійскай мове для магістрантаў з Кітайскай Народнай Рэспублікі.

На кафедры актыўна вядуцца навуковыя даследаванні ў межах работы навуковай школы гаспадарчага права, якая сканцэнтравана на ўдасканаленні навукі гаспадарчага права і юрыдычнай адукацыі.

Удасканаленне навукі гаспадарчага права спалучана з фарміраваннем на яе аснове вытворных і актуальных для грамадства і дзяржавы напрамкаў навуковых ведаў – нацыянальнай эканамічнай бяспекі (у тым ліку юрыдычнай кваліметрыі), фіскалістыкі (у тым ліку дзяржаўнага прадпрымальніцтва), працэсаў кіравання аб'ектамі праў, якія складаюць казну, краінавага маркетынгу, легальнай эканамічнай лабістыкі і інш.).

Навуковая школа гаспадарчага права з'яўляецца піянерам у галіне распрацоўкі дактрыны краінавага маркетынгу, заснаванай на прынцыпах міждысцыплінарнасці. У супрацоўніцтве з прадстаўнікамі прафесійнай супольнасці ў галіне маркетынгу і легальнай эканамічнай лабістыкі навуковая школа гаспадарчага права арганізавала падрыхтоўку і паспяхова правяла першы ў нашай краіне круглы стол, прысвечаны праблемам краінавага маркетынгу як спецыфічнай метадалогіі мяккай сілы пры прасоўванні нацыянальных эканамічных інтарэсаў. Гэта дазволіла сумясціць практыку з тэорыяй і сфарміраваць аўтарскі калектыў, які падрыхтаваў першую ў Рэспубліцы Беларусь калектыўную манаграфію «Страновой маркетинг» (2022).




Манаграфія
«Страновой маркетинг».
2022 г.

Навуковая школа гаспадарчага права актыўна ўкараняе атрыманыя навуковыя вынікі ў адукацыйны працэс. Шэраг новых дысцыплін, якія выкладаюцца студэнтам і магістрантам юрыдычнага факультэта БДУ, з'явіліся вынікам праведзеных навуковых даследаванняў, у прыватнасці такія дысцыпліны, як «Краінавы маркетынг», «Публічна-прыватнае партнёрства», «Фіскалістыка», «Інавацыйнае права», «Прававы рэжым інвестыцый у чалавечы капітал» і інш.

Вялікая ўвага надаецца падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У якасці тэм дысертацыйных даследаванняў аспіранты і саіскальнікі кафедры выбіраюць найменш вывучаныя, але ў той жа час найбольш актуальныя і практычна значныя для нашай краіны праблемы гаспадарчага права. Усяго за нядоўгую гісторыю існавання кафедры гаспадарчага права падрыхтаваны і паспяхова абаронены больш за 15 дысертацый на саісканне вучонай ступені кандыдата юрыдычных навук і 3 – на саісканне вучонай ступені доктара юрыдычных навук.

Штогод супрацоўнікі кафедры рыхтуюць і выдаюць значную колькасць навуковых і навукова-практычных артыкулаў, прысвечаных праблемам гаспадарчага, інвестыцыйнага, карпаратыўнага, банкаўскага, антыманапольнага, прудэнцыйнага, кандыцыйнага, фіскальнага, энергетычнага і гандлёвага права.

Кафедрай выконваецца навукова-даследчая работа па заданнях падпраграмы «Права» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг., у рамках якой распрацоўваюцца тэмы «Трансфармацыя арганізацыйна-прававога механізма кіравання дзяржаўнай уласнасцю ў Рэспубліцы Беларусь» і «Прававыя пра-

блемы рэалізацыі маёмасных праў удзельнікаў інвестыцыйных праваадносін і забеспячэння абароны дзяржаўных і прыватных інтарэсаў з улікам сучасных тэндэнцый сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства і дзяржавы». Выкладчыкі кафедры таксама прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце на тэму «Навуковы маніторынг экалагічнага, аграрнага і гаспадарчага заканадаўства» (2022–2026 гг.), якая выконваецца ў межах асноўнага працоўнага часу (сумесна з кафедрай экалагічнага і аграрнага права).

Пры правядзенні навуковых даследаванняў выкладчыкі кафедры імкнуцца да таго, каб атрыманыя вынікі мелі для Рэспублікі Беларусь не толькі навуковую каштоўнасць, але і практычную значнасць.

За перыяд існавання кафедры яе выкладчыкі прымалі ўдзел у падрыхтоўцы шэрага кодэксаў Рэспублікі Беларусь (Грамадзянскага, Банкаўскага, Грамадзянскага працэсуальнага, Гаспадарчага працэсуальнага кодэксаў, а таксама Кодэкса аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці), законаў («Аб эканамічнай неплацёжаздольнасці (банкруцтве)», «Аб аўдытарскай дзейнасці», «Аб судаўладкаванні і статусе суддзяў», «Аб медыяцыі», «Аб трацейскіх судах», «Аб фізічнай культуры і спорце» і інш.), шматлікіх праектаў дэкрэтаў і ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, пленумаў Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь і Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Кафедра гаспадарчага права надае вялікае значэнне міжнароднаму супрацоўніцтву. Яе прадстаўнікі прымаюць удзел у шэрагу міжнародных канферэнцый, семінараў, мерапрыемстваў і сустрэч па розных кірунках. Кафедра мае цесныя сувязі з адпаведнымі кафедрамі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Маскоўскага дзяржаўнага юрыдычнага ўніверсітэта імя А. Е. Кутафіна, Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Саратаўскай дзяржаўнай юрыдычнай акадэміі, Казанскага, Пермскага, Новасібірскага дзяржаўных ўніверсітэтаў, Маскоўскай акадэміі права, Уральскай юрыдычнай акадэміі і інш.

У Беларусі найбольш плённыя кантакты кафедры наладжаны з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам, Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам, Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Кафедра актыўна супрацоўнічае з Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці, Нацыянальным цэнтрам абароны персанальных дадзеных, Інстытутам эканомікі НАН Беларусі і інш.

Штогод на кафедры праводзяцца міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі і круглыя сталы з актыўным удзелам прадстаўнікоў дзяржавы і суб’ектаў гаспадарчай дзейнасці: міжнародны навукова-практычны круглы стол «Тэарэтычныя і практычныя праблемы прававога рэгулявання нацыянальнай эканомікі» і Цывілістычныя чытанні памяці прафесара М. Г. Пронінай. Супрацоўнікі кафедры актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных канферэнцыях, геаграфія якіх дастаткова шырокая.

Дацэнтамі кафедры падрыхтавана і выдадзена больш за 25 падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і электронных вучэбна-метадычных комплексаў.

Вядзецца актыўная работа са студэнтамі. Адным з яе кірункаў з’яўляецца дзейнасць факультатываў і гурткоў. Плённа працуе гурток Law&ITHub.

Найбольшую цікавасць у студэнтаў выклікае Зімовая школа па праве інфармацыйных тэхналогій (IT-права).



Удзельнікі міжнароднага навукова-практычнага круглага стала «Теоретические и практические проблемы правового регулирования национальной экономики». 13 лістапада 2024 г.

Выкладчыкі кафедры выкарыстоўваюць інавацыйныя методыкі выкладання, дыстанцыйныя і інтэрактыўныя спосабы ўзаемадзеяння са студэнтамі, а таксама новыя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.



Кафедра гаспадарчага права. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* прафесар Я. І. Функ, загадчык кафедры прафесар Н. Л. Бандарэнка, навуковы кансультант кафедры прафесар В. С. Камянкоў.
*Другі рад (злева направа):* дацэнт Ю. Р. Кананевіч, вядучы спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу С. М. Шэрман, дацэнт Т. М. Халецкая, старшы выкладчык А. У. Максіменка, вядучы спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу Г. У. Кузьмянкова, старшы выкладчык Г. Л. Талалаева, старшы выкладчык У. В. Сташкевіч, дацэнт В. М. Куніцкая, старшы выкладчык Ю. А. Лысакоўская, старшы выкладчык А. У. Гаўрыленка, дацэнт Н. В. Панцялеева.
*Трэці рад (злева направа):* старшы выкладчык В. А. Казлоўская, дацэнт К. М. Гладкая, аспірант М. С. Бандарэнка, старшы выкладчык Н. А. Мяшкова, аспірант А. А. Прыбытка, выкладчык-стажор П. У. Пяткевіч

# Кафедра права інтэлектуальнай уласнасці

Кафедра права інтэлектуальнай уласнасці як самастойнае падраздзяленне юрыдычнага факультэта БДУ ўтворана ў 2021 г.

Першым загадчыкам кафедры з'яўлялася Д. У. Іванова.

**Іванова Дзіяна Уладзіміраўна**

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

З 2021 па 2022 г. – загадчык кафедры.



Кафедра выступае першым у Рэспубліцы Беларусь спецыялізаваным структурным падраздзяленнем, якое забяспечвае ажыццяўленне адукацыйнай і навуковай дзейнасці, а таксама вучэбна-метадычнай работы ў сферы права інтэлектуальнай уласнасці.

На кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта выкладанне самастойнай вучэбнай дысцыпліны «Права інтэлектуальнай уласнасці» пачаў В. Ф. Чыгір.

**Чыгір Васіль Фёдаравіч**

(1924–2024)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Заслужаны юрыст БССР (1971).



Аўтар значнай колькасці навуковых публікацый у сферы інтэлектуальнай уласнасці.

Пад яго навуковым кіраўніцтвам былі падрыхтаваны і абаронены кандыдацкія дысертацыі Д. У. Івановай «Вынаходства як аб'ект прамысловай уласнасці», Г. А. Чыкілёвай «Вынікі генетычнай інжынерыі як аб'екты права інтэлектуальнай уласнасці».

Значны ўклад у станаўленне і развіццё кафедры ўнёс В. М. Гадуноў.

**Гадуноў Валерый Мікалаевіч**

(1954–2022)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017).



З 2022 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з'яўляецца А. А. Свадкоўская.



**Свадкоўская Алена Аляксандраўна**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

На юрыдычным факультэце прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры права інтэлектуальнай уласнасці выкладае наступныя дысцыпліны: «Дагаворы аб перадачы праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці», «Права інтэлектуальнай уласнасці», «Выключныя правы на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці як разнавіднасць абсалютных праў», «Лічбавыя правы ў грамадзянскім абароце».

Для студэнтаў магістратуры выкладаюцца дысцыпліны: «Аўтарскае права і сумежныя правы», «Права прамысловай уласнасці», «Перадача маёмасных праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці», «Грамадзянска-прававыя спосабы абароны праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці», «Вырашэнне спрэчак у сферы інтэлектуальнай уласнасці».

Сёння на кафедры працуюць доктар юрыдычных навук прафесар Я. І. Функ; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты А. А. Свадкоўская, В. К. Сідарчук, К. К. Уржынскі і А. А. Ядрэўскі; кандыдаты юрыдычных навук А. Ю. Кадурын, Р. А. Лысакоўскі; кандыдат хімічных навук Ю. В. Нечапурэнка; старшыя выкладчыкі А. П. Заяц, А. А. Мазанік, В. В. Нікіфарава і Ю. В. Урбановіч; выкладчыкі А. І. Надольская і А. І. Шаванда, а таксама выкладчыкі-стажоры А. С. Мазоль, Я. Д. Сядзельнік і А. А. Ткач.

Кафедра забяспечвае выкладанне дысцыпліны «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю» для студэнтаў 11 факультэтаў БДУ: біялагічнага, гістарычнага, механіка-матэматычнага, філалагічнага і хімічнага, а таксама факультэтаў геаграфіі і геаінфарматыкі, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, журналістыкі, філасофіі і сацыяльных навук, сацыякультурных камунікацый.

Сярод выкладчыкаў асабістае месца займаюць Р. В. Казарэзава і К. М. Харытанюк.



**Казарэзава Раіса Віктараўна**
Суддзя судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Харытанюк Канстанцін Мікалаевіч**

Суддзя судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.



Значная ўвага на кафедры надаецца падрыхтоўцы навуковай і вучэбнай літаратуры ў сферы права інтэлектуальнай уласнасці: распрацоўваюцца вучэбныя праграмы па курсах, якія выкладаюцца кафедрай, ідзе праца над вучэбнымі дапаможнікамі.

Супрацоўнікі кафедры паспяхова выкарыстоўваюць у адукацыйным працэсе інавацыйныя метады навучання і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, у тым ліку распрацоўваюць, размяшчаюць і абнаўляюць змест курсаў на адукацыйным партале БДУ, а таксама звяртаюцца да іншых сродкаў электроннага навучання.

На кафедры вядуцца навуковыя даследаванні. Іх вынікі друкуюцца ў розных навуковых выданнях, у тым ліку манаграфіях і навукова-практычным часопісе «Інтэлектуальная ўласнасць у Беларусі». На кафедры паспяхова працуе студэнцкі навуковы гурток «Права інтэлектуальнай уласнасці».

У рамках Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці і БДУ ажыццяўляюцца папулярызацыя і распаўсюджанне ведаў у сферы інтэлектуальнай уласнасці, адбываецца абмен вопытам і імплементацыя найлепшых практык па пытаннях навучання праву інтэлектуальнай уласнасці, праводзяцца сумесныя навукова-практычныя мерапрыемствы.



Кафедра права інтэлектуальнай уласнасці. 2023 г.

Выкладчыкі кафедры актыўна працуюць над удасканаленнем заканадаўства ў галіне аўтарскага права і сумежных праў, права прамысловай уласнасці. Яны цесна супрацоўнічаюць з Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай улас-

насці Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. А. А. Свадкоўская, Д. У. Іванова і Д. Д. Ландо з'яўляліся членамі рабочых груп па распрацоўцы і ўнясенні змяненняў у нарматыўныя прававыя акты, у тым ліку Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах», а таксама па распрацоўцы Палітыкі ў галіне інтэлектуальнай уласнасці для вышэйшых навучальных устаноў і навукова-даследчых арганізацый Рэспублікі Беларусь.

У рамках міжнароднага супрацоўніцтва выкладчыкі кафедры чытаюць лекцыі ва ўніверсітэтах Расійскай Федэрацыі і Кітайскай Народнай Рэспублікі, рэцэнзуюць работы па інтэлектуальнай уласнасці, запрашаюцца ў якасці экспертаў Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, а таксама ўдзельнічаюць у міжнародных форумах, канферэнцыях і семінарах.



Кафедра права інтэлектуальнай уласнасці. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* загадчык кафедры А. А. Свадкоўская, дацэнт А. Ю. Кадурын, старшы выкладчык Ю. В. Урбановіч.
*Другі рад (злева направа):* дацэнт Р. А. Лысакоўскі, суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Р. В. Казарэзава.
*Трэці рад (злева направа):* дацэнт А. А. Ядрэўскі, выкладчык А. І. Шаванда, выкладчык-стажор А. А. Ткач, суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь К. М. Харытанюк.
*Чацвёрты рад (злева направа):* выкладчык-стажор А. С. Мазоль, дацэнт Ю. В. Нечапурэнка

## Кафедра грамадзянскага працэсу і працоўнага права

Кафедра грамадзянскага працэсу і працоўнага права існуе як самастойнае падраздзяленне юрыдычнага факультэта БДУ з 1974 г. – пасля раздзялення кафедры грамадзянскага права і працэсу, якая была заснавана ў 1921 г.

Да выдзялення дадзенай кафедры ў самастойнае структурнае падраздзяленне ў розныя часы яе загадчыкамі былі: з 1921 па 1922 г. – прафесар Г. М. Маркаў; з 1923 па 1936 г. – доктар юрыдычных навук, прафесар, акадэмік АН БССР М. В. Грэдзінгер; з 1937 па 1941 г. – кандыдат юрыдычных навук А. Н. Юрашкевіч; з 1944 па 1945 г. – кандыдат юрыдычных навук І. С. Андрэйчык; з 1945 па 1950 г. – доктар юрыдычных навук прафесар Ф. І. Гаўзэ; з 1950 па 1971 г. – кандыдат юрыдычных навук дацэнт Г. А. Павецьеў; з 1971 па 1974 г. – доктар юрыдычных навук прафесар В. Ф. Чыгір.

Пасля таго як у 1974 г. былі створаны дзве самастойныя кафедры – кафедра грамадзянскага і сямейнага права і кафедра грамадзянскага працэсу і працоўнага права, – апошнюю ўзначальвалі знакамітыя вучоныя М. Р. Юркевіч, А. А. Шынгель, І. М. Калядка і А. М. Здрок.

**Юркевіч Мікалай Рыгоравіч**
(1928–2017)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 1974 па 1978 і з 1981 па 1994 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1996).



**Шынгель Адам Адамавіч**
(1928–2009)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
З 1978 па 1981 г. – загадчык кафедры.



**Калядка Іван Мікалаевіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
З 1994 па 2016 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны работнік БДУ.





**Здрок Аксана Мікалаеўна**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 2016 па 2019 г. – загадчык кафедры.

На кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права, а да 1974 г. у складзе кафедры грамадзянскага права і працэсу працавалі знакамітыя вучоныя і педагогі, якія ўнеслі значны ўклад у яе развіццё. Сярод іх вядучыя працэсуалісты Беларусі: акадэмік АН БССР М. В. Грэдзінгер, доктар юрыдычных навук прафесар С. В. Курылёў, доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН Беларусі В. Г. Ціхіня і кандыдаты юрыдычных навук дацэнты Т. А. Бялова, І. І. Верхаводка, І. М. Казей, В. С. Курылёва, В. В. Ціхановіч, Г. У. Якаўлева, а таксама вядучыя спецыялісты працоўнага права: кандыдаты юрыдычных навук дацэнты А. А. Войцік, В. П. Дуюн, Э. В. Зайчык, Г. А. Павецьеў і Х. Т. Мялешка.



**Бялова Тамара Аляксееўна**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працавала на кафедры з 1974 па 2023 г.
Падрыхтавала чатырох кандыдатаў юрыдычных навук.
Мае вышэйшую юрыдычную ўзнагароду «Феміда» ў намінацыі «Юрыдычныя навукі» Беларускага рэспубліканскага саюза юрыстаў.
Заслужаны работнік БДУ.



**Верхаводка Ігар Іванавіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1991 па 2017 г.



**Войцік Анатоль Аляксандравіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1990 па 2015 г.
З 2002 па 2010 г. займаў пасаду намесніка дэкана юрыдычнага факультэта БДУ па завочным навучанні.
Адзін з заснавальнікаў Юрыдычнай клінікі БДУ.

**Грэдзінгер Міхаіл Восіпавіч**
(1867–1936)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Акадэмік АН БССР.
З 1923 па 1936 г. – загадчык кафедры грамадзянскага права і грамадзянскага працэсу факультэта грамадскіх навук БДУ.
У 1925/26 навучальным годзе ўзначальваў юрыдычную секцыю навуковага таварыства БДУ, быў абраны членам Бюро юрысконсультаў пры Вышэйшым Савеце народнай гаспадаркі БССР.



**Дуюн Васіль Пятровіч**
(1926–1995)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1960 па 1994 г.



**Зайчык Эля Вульфавіч**
(1904–1946)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
У 1925 г. скончыў прававое аддзяленне факультэта грамадскіх навук БДУ. Працаваў на кафедры з 1932 па 1940 г.
Першым у беларускай гісторыі атрымаў вучоную ступень кандыдата юрыдычных навук па працоўным праве (15 чэрвеня 1940 г.). Дысертацыя «Скасаванне працоўнага дагавора» была абаронена ў Маскоўскім юрыдычным інстытуце.



**Казей Ірына Міхайлаўна**
(1958–2021)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працавала на кафедры з 1994 па 2021 г.



**Курылёва Вольга Сяргееўна**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працавала на кафедры з 1990 па 2020 г.





**Курылёў Сяргей Васільевіч**
(1919–1968)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Працаваў на кафедры з 1961 па 1968 г.
Актыўны ўдзельнік рабочай групы па падрыхтоўцы Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса БССР 1964 г. Заклаў асновы беларускай школы грамадзянскага працэсу.



**Мялешка Хэлена Тамашаўна**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працавала на кафедры з 1977 па 2018 г.
Падрыхтавала трох кандыдатаў юрыдычных навук.



**Ціхановіч Віктар Віктаравіч**
(1939–1991)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1968 па 1991 г.



**Ціхіня Валерый Гур'евіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Член-карэспандэнт АН Беларусі.
Працаваў на кафедры з 1974 па 1989 г.
Падрыхтаваў 31 кандыдата юрыдычных навук.
Заслужаны юрыст БССР (1990).



**Якаўлева Галіна Уладзіміраўна**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працавала на кафедры з 1978 па 2015 г.
Ганаровы работнік гаспадарчага суда Рэспублікі Беларусь.

З іменем прафесара С. В. Курылёва звязана стварэнне беларускай школы грамадзянскага працэсу, а з імёнамі прафесараў В. Г. Ціхіні і М. Р. Юркевіча – яе станаўленне. Пад іх рэдакцыяй у 1980-я гг. былі выдадзены вучэбны дапаможнік і практыкум па грамадзянскім працэсе, а таксама навукова-практычны каментарый да Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса 1964 г. Развіццё навуковай школы адбылося ў 1990-я гг. Прафесар М. Р. Юркевіч, дацэнты Т. А. Бялова і І. М. Калядка распрацавалі праект Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Беларусі. Пад іх рэдакцыяй і з удзелам дацэнтаў Г. У. Якаўлевай, І. М. Казей, А. М. Здрок, І. І. Верхаводкі, В. М. Раманавай, Ц. В. Сысуева і старшага выкладчыка А. А. Унуковіч быў апублікаваны першы ў Беларусі падручнік «Гражданский процесс» («Общая часть» (2000, 2006, 2020) і «Особенная часть» (2002, 2007, 2022)), а таксама практыкум (2000, 2018); выдадзены навукова-практычны каментарый да Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1998 г. (2005), падрыхтаваны сумесна з суддзямі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Выкладчыкі кафедры прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы новага Гаспадарчага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і каментарыяў да яго (1999, 2006), а таксама «Практикума по хозяйственному процессу» (2000, 2002).



Кафедра грамадзянскага працэсу і працоўнага права (2010)

Вучоныя і педагогі кафедры ў галіне працоўнага права з'яўляліся аўтарамі падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, практыкумаў, каментарыя да Кодэкса законаў аб працы Рэспублікі Беларусь. Пасля новай кадыфікацыі працоўнага заканадаўства дацэнты і выкладчыкі кафедры А. А. Войцік, А. П. Дубавец, В. С. Курылёва, Х. Т. Мялешка, Т. М. Петачэнка, К. Л. Тамашэўскі і В. У. Часаліна прынялі ўдзел у выданні «Постатейного комментария к Трудовому кодексу Республики Беларусь» пад агульнай рэдакцыяй прафесара Р. А. Васілевіча (2000; быў перавыдадзены ў 2003, 2005, 2008, 2014, 2020 гг.). Члены кафедры таксама ўдзельнічалі ў напісанні падручніка «Трудовое право» (2002, 2006, 2011, 2016), вучэбных дапаможнікаў «Курс трудового права. Общая часть» (2010), «Курс трудового права. Особенная часть» (2014), «Индивидуальное трудовое право» (у 3 тамах; 2014) і «Трудовое право» (2019). Былі выдадзены практыкумы па працоўным праве (у 2008 г. – пад рэдакцыяй А. П. Дубаўца, В. С. Курылёвай і К. Л. Тамашэўскага; у 2019 г. – пад рэдакцыяй В. С. Курылёвай, Я. У. Моцінай і Т. М. Петачэнка). Дацэнтам Т. А. Паставалавай падрыхтаваны навучальныя дапаможнікі па праве сацыяльнага забеспячэння, асноўныя з якіх – «Курс права социального обеспе-

чения Республики Беларусь» (2008), «Трудовое и социальное право зарубежных стран» (2010), «Право социального обеспечения Республики Беларусь» (2013).

У розныя гады на кафедры працавалі кандыдаты юрыдычных навук дацэнты Л. Я. Астроўскі, А. А. Міхасёва, В. У. Часаліна, старшыя выкладчыкі Я. М. Ануфрыеў, А. П. Дубавец.

З 2020 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з'яўляецца В. М. Раманава.



**Раманава Вольга Мікалаеўна**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

На кафедры працуюць 1 доктар і 11 кандыдатаў юрыдычных навук. Яна забяспечвае выкладанне вучэбных дысцыплін для студэнтаў юрыдычнага факультэта: «Грамадзянскі працэс», «Гаспадарчы працэс», «Працоўнае права», «Права сацыяльнага забеспячэння», а таксама спецкурсаў: «Натарыяльнае права», «Міжнародны грамадзянскі працэс», «Адвакат у грамадзянскім працэсе», «Міжнародны камерцыйны арбітраж», «Асаблівасці разгляду эканамічных спраў у судах», «Асаблівасці разгляду грамадзянскіх спраў у судах», «Параўнальнае працоўнае права», «Выканаўчае вядзенне» і інш.

Склалася наступная навукова-педагагічная спецыялізацыя: прафесары Т. А. Бялова, А. М. Здрок, І. М. Калядка, Т. С. Таранава, дацэнты Н. М. Ніканава, В. М. Раманава, У. П. Скобелеў, старшыя выкладчыкі А. А. Унуковіч, В. В. Дзелібазоглава, выкладчыкі Ю. Х. Рапян, Е. В. Сінюк – грамадзянскі працэс; дацэнт Ц. В. Сысуеў, старшы выкладчык А. А. Унуковіч, выкладчык Ю. Х. Рапян – гаспадарчы працэс; дацэнты Т. М. Петачэнка, Т. А. Паставалава, Я. У. Моціна, Т. Э. Шпілеўская, С. Л. Жвірыдоўская, Т. К. Брытава, старшыя выкладчыкі В. Л. Ніхайчык, Ю. М. Саўкіна – працоўнае права; дацэнты Т. К. Брытава, П. А. Гуцко, Т. А. Паставалава – права сацыяльнага забеспячэння, прававое рэгуляванне сацыяльнай працы; прафесар Т. С. Таранава, дацэнт В. М. Раманава – міжнародны грамадзянскі працэс; дацэнты У. П. Скобелеў, Ц. В. Сысуеў – міжнародны камерцыйны арбітраж; дацэнт Н. М. Ніканава, старшы выкладчык В. В. Дзелібазоглава – выканаўчае вядзенне; дацэнт Я. У. Моціна – параўнальнае працоўнае права. На кафедры працуе С. А. Любецкая.



**Любецкая Святлана Анатольеўна**
Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).

Выкладчыкі кафедры маюць значны практычны вопыт і сувязь з практыкай правапрымянення. Прафесар М. Р. Юркевіч узначальваў Міжнародны арбітражны суд пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце (1994–2005 гг.). Арбітрамі Міжнароднага арбітражнага суда былі Т. А. Бялова і І. І. Верхаводка, а ў цяперашні час – І. М. Калядка, Ц. В. Сысуеў (член Прэзідыума гэтага суда) і У. П. Скобелеў. І. М. Калядка выступае членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь. Членамі Навукова-кансультатыўнага савета пры Вышэйшым Гаспадарчым Судзе Рэспублікі Беларусь былі І. М. Калядка, І. І. Верхаводка, Ц. В. Сысуеў і Г. У. Якаўлева. Членамі Навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь з'яўляліся В. С. Курылёва, Г. У. Якаўлева і Т. А. Бялова, а ў цяперашні час – І. М. Калядка і А. М. Здрок. І. М. Калядка – член камісіі па ліцэнзаванні паслуг юрыстаў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

І. М. Калядка, Т. С. Таранава, Т. А. Паставалава і Т. М. Петачэнка ўваходзяць у групу экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая створана па распараджэнні Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2017 г. Супрацоўнікі кафедры (Я. У. Моціна, Т. А. Паставалава, Т. М. Петачэнка, В. М. Раманава) з'яўляюцца членамі Навукова-кансультатыўнага савета пры Эканамічным Судзе СНД.

Дацэнт Т. М. Петачэнка – член савета па абароне дысертацый па спецыяльнасцях «канстытуцыйнае права; канстытуцыйны працэс; муніцыпальнае права», «працоўнае права; права сацыяльнага забеспячэння», «інфармацыйнае права» пры Нацыянальным цэнтры заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

І. М. Калядка, Я. У. Моціна і Т. М. Петачэнка ўваходзяць у склад рэдакцыйных саветаў (калегій) навуковых і навукова-практычных часопісаў і навуковых зборнікаў па праве.



Кафедра грамадзянскага працэсу і працоўнага права. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* дацэнт Н. М. Ніканава, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях дацэнт У. П. Скобелеў, загадчык кафедры дацэнт В. М. Раманава, прафесар І. М. Калядка, дацэнт Я. У. Моціна.
*Другі рад (злева направа):* дацэнт Ц. В. Сысуеў, старшы выкладчык В. Л. Ніхайчык, старшы выкладчык В. В. Дзелібазоглава, дацэнт Т. М. Петачэнка, вядучы спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу М. В. Бровікава, выкладчык Ю. Х. Рапян, старшы выкладчык А. А. Унуковіч, дацэнт Т. А. Паставалава

Пры кафедры працуюць студэнцкія навуковыя гурткі па грамадзянскім (гаспадарчым) працэсе, працоўным праве.

Я. У. Моціна з’яўляецца аўтарам тэксту і музыкі песні «Краіна шчырых людзей» («Белыя крылы»), якую выконвае Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», а таксама тэксту песні «Летуценні», што выконвае спявачка Стасья Корсак.

На кафедры праводзіцца падрыхтоўка аспірантаў, саіскальнікаў і дактарантаў. За 50 гадоў падрыхтаваны 5 доктарскіх і 33 кандыдацкія дысертацыі.

У рамках праекта «Наследие права» выдадзены выбраныя працы М. В. Грэдзінгера, С. В. Курылёва, В. І. Семянкова, В. Г. Ціхіні, М. Р. Юркевіча.

## Кафедра крымінальнага права

Згодна з гістарычнымі звесткамі і архіўнымі матэрыяламі, кафедра крымінальнага права існавала ўжо ў 1921 г.[1] Адначасова ў БДУ, у тым ліку на факультэце грамадскіх навук, працавалі прадметныя камісіі[2].

Паступова фарміраваўся навуковы склад кафедры. Так, 10 лістапада 1923 г. у пратаколе № 2 было зафіксавана, што на «пасяджэнні прадметнай камісіі прававога аддзялення факультэта грамадскіх навук БДУ (старшыня – прафесар У. І. Пічэта, сакратар – асістэнт Гуткоўскі) пастанавілі выбраць А. К. Пігулеўскага навуковым супрацоўнікам па кафедры крымінальнага права і працэсу і даручыць яму вядзенне практычных заняткаў па гэтых прадметах»[3].

У пратаколе № 3 ад 24 лістапада 1923 г. пасяджэння юрыдычнай прадметнай камісіі факультэта грамадскіх навук БДУ было адзначана, што прафесар В. М. Шыраеў выказаўся «аб неабходнасці ў інтарэсах пастаноўкі на належную вышыню практычных заняткаў па крымінальнаму праву і працэсу запрасіць двух асістэнтаў. У інтарэсах пастаноўкі на належную вышыню практычных заняткаў па крымінальным праве і працэсе пастанавілі запрасіць двух асістэнтаў Л. Г. Спдлярэўскага і Капшна»[4].

У пратаколе № 5 ад 8 лютага 1924 г. пасяджэння прадметнай камісіі прававога аддзялення факультэта грамадскіх навук БДУ было зафіксавана наступнае: «Слухалі аб кандыдатуры юрысконсульта А. К. Пігулеўскага на пасаду асістэнта на кафедру крымінальнага права». Заслухаўшы паведамленне рэктара У. І. Пічэты і прафесара В. М. Шыраева аб перамовах з А. К. Пігулеўскім, пастанавілі «лічыць магчымым абмеркаванне яго кандыдатуры на пасаду асістэнта пры

[1] Ф. 205. Воп 1. № 1143.
[2] Там жа.
[3] Там жа.
[4] Там жа.

ўмове прадстаўлення Пігулеўскім пісьмовых работ па крымінальным праве на тэмы, прапанаваныя прафесарам Шыраевым»[1].

Першым загадчыкам кафедры з'яўляўся прафесар С. М. Гофман.

На момант пераўтварэння ў 1954 г. Мінскага юрыдычнага інстытута ў юрыдычны факультэт БДУ кафедра працавала пад агульнай назвай «кафедра крымінальнага права, крымінальнага працэсу і крыміналістыкі».

Кафедра крымінальнага права БДУ была канчаткова вылучана ў самастойнае падраздзяленне 5 сакавіка 1965 г. у выніку рэарганізацыі кафедры крымінальнага права і працэсу. Традыцыі кафедры і навуковая школа фарміраваліся яе заснавальнікамі: А. Г. Бондарам, І. І. Гарэлікам, С. М. Гофманам, І. С. Цішкевічам, В. А. Шкурко, В. М. Шыраевым, М. М. Меркушавым.

На працягу ўсяго перыяду гісторыі развіцця кафедры яе ўзначальвалі С. М. Гофман, А. Г. Бондар, М. М. Меркушаў, І. І. Гарэлік, І. С. Цішкевіч, А. У. Баркоў, І. А. Грунтоў.



**Гофман Станіслаў Маркавіч**

(1892–1974)

Прафесар.

З 1932 па 1941 г. – загадчык кафедры крымінальнага права[2].

У якасці Намесніка Народнага камісара юстыцыі БССР выступаў на сесіі ЦВК БССР VIII склікання 21 верасня 1928 г. з дакладам «Аб праекце Крымінальнага кодэкса Беларускай ССР».

Выкладаў курс крымінальнага права.



**Бондар Аляксей Георгіевіч**

(1908–1994)

З 1945 па 1948 г. – загадчык кафедры[3] крымінальнага права.

Заслужаны юрыст БССР (1968).



**Меркушаў Мадэст Мікалаевіч**

(1906–1979)

Дацэнт.

З 1949 па 1965 г. – загадчык кафедры[4] крымінальнага права.

Прымаў актыўны ўдзел у рэфармаванні крымінальнага заканадаўства СССР і БССР у канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг.

---

[1] Ф. 205. Воп. 1. № 1143.

[2] Ф. 701. Воп. 1. № 25.

[3] Ф. 1110. Воп. 1. Спр. 18.

[4] Ф. 205. Воп. 6. Спр. 87, 195, 373.

34

ПРОТОКОЛ № 6

ЗАСЕДАНИЯ КАФЕДРЫ УГОЛОВНОГО ПРАВА И ПРОЦЕССА
МИНСКОГО ЮРИДИЧЕСКОГО ИНСТИТУТА

от 17 января 1948 года.

ПРИСУТСТВОВАЛИ: т.т. БОНДАРЬ, ГОРЕЛИК, МОГИЛЬНИЦКАЯ, ЧЕРНЯЕВА и 23 чел. СТУДЕНТОВ.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Обсуждение вопросов, возникших у студентов на производственной практике по уголовному праву и процессу.

ВЫСКАЗАЛИСЬ:

Тов. ГОНЧАРИК: Мы присутствовали в Минском областном суде при рассмотрении уголовного дела по обвинению Ковнеркевич по 803 ст. УК. Я считаю, что преступление надо было квалифицировать по ст. 318 УК БССР.

Тов. ОНУФРИЕВ: В связи с тем, что шофер не нарушил правил уличного движения, в его действиях совсем нет состава преступления.

Тов. НАЙДЕНКО: Суд правильно квалифицировал преступление по 803 ст. УК. Меру наказания можно было избрать более легкую.

Тов. ГУРМАН: Квалификация преступления обв. Ковнеркевича по 803 ст. неправильная в данном случае нет состава преступления.

Тов. БУР[illegible]: Преступление по 803 ст. и приговор обоснован.

Тов. [illegible]МАНОВИЧ: Я считаю, что квалификация преступления по ст. 803 УК правильная, так как шофер видел человека впереди машины и зная, что дорога узкая, он не должен был перегонять.

Тов. АНДРЕЕВ: Шофер говорил, что впереди себя машины он не видел увидя повозку он дал сигнал и только в момент зажжения света он заметил человека, метнувшегося впереди машины. Нарушения правил уличного движения со стороны шофера не было и приговор вынесен, по моему, неправильно.

35

2.-

Тов. ОНУФРИЕВ: Если шофер видел повозку, то он не должен был обгонять её, а лишь повернуть немного в сторону.

Тов. [illegible]: Если можно видеть на 30 м., то шофер, давая сигнал, мог видеть машину.

Тов. ГОРЕЛИК: 1. Указывает-ли суд на нарушение правил уличного движения и в чем оно выражалось в приговоре.
2. Участвовал ли шофер со встречной машиной.
3. Какие еще есть доказательства виновности шофера.

Тов. МОГИЛЬНИЦКАЯ: Какие были данные о том, что шофер действительно не затормозил машину своевременно.

Тов. ГОРЕЛИК: Я сомневаюсь в источниках, так как вы даете разные показания. Но на основе этих материалов я считаю, что вопрос об ответственности должен быть решен следующим образом. Здесь выдвинуто 3 стороны:

1. Лихачество.
2. Неосторожное убийство.
3. Бандитизм.

Лихачество исключается.

О неосторожном убийстве говорится и тогда, когда нарушены правила уличного движения, но постольку поскольку нет достаточных фактов нарушения правил уличного движения, то дело нужно отправить на доследование.

Если же все факты есть, то нужно квалифицировать преступление по ст. 80-3 УК.

Тов. БОНДАРЬ: Я считаю необходимым проследить движение этого дела до Верховного Суда СССР.

Тов. ГУРМАН: Поступило дело гр-н К. и Н. Сбыли две фальшивые сторублевые купюры. Из материалов предварительного следствия видно, что они в этот же день на рынке купили масло и часы за те же фальшивые деньги. Обвиняемый доказывает, что в г. Дзержинске он продал брюки за 300 рублей и только приехав домой он узнал о их фальшивости и поэтому решил их немедленно сбыть. Ст. 85 "ПТА". Если обвиняемый только сбывал деньги, то можно ли квалифицировать преступление по ст. 250. Если имела место подделка и сбыт, то квалифицировать нужно по ст. 250.

Тов. [illegible]: Молодой парень ушел с авторемонтного завода и поступил учиться в школу ФЗО обувщиков. Могут ли его привлекать к уголовной ответственности по Указу, как за самовольный уход с работы.

36.

Тов. ГОРЕЛИК: Привлекать к уголовной ответственности нецелесообразно.

Тов. ГУРМАН: Если на заводе об'явлен выходной день, а директор вывесил приказ об отмене выходного дня. Будет ли привлечен к уголовной ответственности работник, не вышедший на работу.

Если рабочего перевели на низшую должность, после чего он вовсе не пришел на работу, будет ли он привлечен к уголовной ответственности.

Тов. БОНДАРЬ: Нет.

Тов. ГУРМАН: 15 декабря после об'явления постановления о проведении денежной реформы один гр-н купил в магазине 30 литров водки. Как квалифицировать его действие. Он ведь не мог ее получить без участия зав. магазином.

Тов. БОНДАРЬ: Так как водка ненормированный продукт, зав. магу не было дано указаний по этому вопросу и не установлено фактов перепродажи водки, то нет основания привлекать к ответственности.

Товарищи. В дальнейшем по всем вопросам, возникающим в практической работе, надо обращаться не только непосредственно к прикрепленным преподавателям, а и на кафедры и мы постараемся дать исчерпывающие ответы.

И.о. ЗАВЕДУЮЩЕГО КАФЕДРОЙ [подпись] /А. БОНДАРЬ/

Пратакол пасяджэння кафедры крымінальнага права. 17 студзеня 1948 г.

40

ПРОТОКОЛ № 8

ЗАСЕДАНИЯ КАФЕДРЫ УГОЛОВНОГО ПРАВА И ПРОЦЕССА
МИНСКОГО ЮРИДИЧЕСКОГО ИНСТИТУТА

от 23 апреля 1948 года.

ПРИСУТСТВОВАЛИ: т.т. БОНДАРЬ, ГОРЕЛИК, ФАРФЕЛЬ.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Обсуждение письменных работ представленных студентами 2-го курса на конкурс.

СЛУШАЛИ: Информацию тов.ГОРЕЛИКА, который отметил, что письменная работа т.т.ОСТРОВСКОГО и МИНЬКО заслуживают внимания и могут быть представлены комиссии. Работа тов.СКИР не удовлетворяет требованиям, причем после моих замечаний о необходимости внести поправки и изменения, тов.СКИР по существу ничего не сделал. При таком состоянии работы я считаю невозможным рекомендовать её на конкурс.

ВЫСКАЗАЛИСЬ: тов.БОНДАРЬ – Я согласен с мнением тов.ГОРЕЛИКА о том, что работы студентов Островского и Минько можно рекомендовать комиссии. Что касается работы студента Скир, так она не удовлетворяет требованиям конкурса. В работе много путаницы по принципиальным вопросам. Не видно в работе мыслей автора, а только переписано из учебника.

Считаю, что рекомендовать работы в таком виде в качестве пособий для студентов не следует. Это можно будет сделать только после исправления недостатков и еще более тщательного просмотра их.

Тов.ФАРФЕЛЬ: Я согласен с заключением тов.Горелика и замечаниями тов.Бондаря.

ПОСТАНОВИЛИ: Представить конкурсной комиссии института письменные работы студентов:

ОСТРОВСКОГО – "Уголовно-правовые воззрения Радищева".
МИНЬКО – "Уголовно-правовые воззрения Мора".

Что касается рекомендации этих работ студентам в качестве пособия, так этот вопрос решить после отпечатания их на машинке

41
2.-

и внесения некоторых изменений и поправок.

Работа студента Скир на тему "Стадия развития преступной деятельности", как неудовлетворяющая требованиям, рекомендована быть не может.

И.о.ЗАВЕДУЮЩЕГО КАФЕДРОЙ [подпись] /А.БОНДАРЬ/

42.

ПРОТОКОЛ № 9

ЗАСЕДАНИЯ КАФЕДРЫ УГОЛОВНОГО ПРАВА И ПРОЦЕССА
МИНСКОГО ЮРИДИЧЕСКОГО ИНСТИТУТА

от 2.У1.1948 г. и 9.У1.1948 г.

ПРИСУТСТВОВАЛИ: т.т.БОНДАРЬ,ГОРЕЛИК, ФАРФЕЛЬ.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О мероприятиях по обеспечению подготовки студентов Ш и 1У курсов к экзаменам.
2. Утверждение вопросов к госэкзамену для 1У курса и к экзаменам для Ш-го курса по уголовному праву и процессу.

1. СЛУШАЛИ: Информацию тов.БОНДАРЬ о мероприятиях по обеспечению подготовки к экзаменам студентов Ш и 1У-го курсов по уголовному праву и процессу.

ПОСТАНОВИЛИ: Принять к сведению заявления т.т.Горелика и Фарфеля, что ими прочитаны обзорные лекции по наиболее сложным темам и вопросам текущего законодательства, а также заявление тов.Бондарь о том, что программами по уголовному процессу студенты обеспечены.

Поручить тов.тов.Бондарь, Горелику и Фарфель обеспечить проведение консультаций по группам в период подготовки студентов к экзаменам.

Обязать Зав.кабинетом уголовного права тов.________ пополнить кабинет учебной литературой по указанию преподавателей.

2. СЛУШАЛИ: Информацию тов.Бондарь, Горелика и Фарфеля о вопросах, включенных в билеты для экзаменов.

ПОСТАНОВИЛИ: Утвердить вопросы по уголовному праву и процессу для госэкзаменов на 1У курсе и экзаменов на Ш курсе с учетом замечаний.

Список вопросов по уголовному праву и процессу прилагается.

И.о.ЗАВЕДУЮЩЕГО КАФЕДРОЙ [подпись] /А.БОНДАРЬ/

Пратаколы пасяджэння кафедры. 17 красавіка, 2 і 9 чэрвеня 1948 г.



ПРОТОКОЛ № 8

заседания кафедры уголовного права и процесса от 8 окт.1956 г.

Присутствовали: Горелик, Новоселова, Матусевич, Матвиенко, Тишкевич, Мартинович, Бекенко.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1.Утверждение избранных студентами тем дипломных работ и назначение научных руководителей.
2.Обсуждение по просьбе Министерства юстиции БССР нового издания УК БССР.
3.Обсуждение по просьбе Президиума Верховного Совета БССР проекта Указа о внесении изменений в законодательство об ответственности за хищения соц.собственности, за кражу и разбой.
4.О кружке уголовного права, процесса и криминалистики.
5.разное.

По первому вопросу Горелик зачитал список студентов, избравших для дипломных работ темы по дисциплинам кафедры, наименование каждой темы и предложения о научных руководителях.

После обмена мнений постановили: 1.темы дипломных работ, избранные студентами со [illegible] утвердить. 2.руководителями от кафедры назначить Меркушева(15 чел.), Горелика(10 чел), Ветрова(3 чел.), Матвиенко(2 чел), Новоселову(2 чел)(список прилагается к настоящему протоколу). 3.Решение кафедры об утверждении тем и руководителей вывесить в кабинете угол.права.

По второму вопросу с замечаниями в новое издание УК БССР выступили: Горелик, Тишкевич, Матусевич.

После обсуждения представленных ими замечаний постановили: 1.Поручить Горелику обобщить все замечания, 2.направить замечания Министру юстиции(Замечания прилагаются к протоколу)

По третьему вопросу в обсуждении проекта УКАЗА все приняли участие: Тишкевич, Матусевич, Горелик, Матвиенко, Бекенко.

Постановили: 1.представление Министра юстиции и приведенные в нем аргументы о необходимости изменения УКАЗОВ от 4 июня 1947 г. признать правильными и обоснованными. 2.Поручить Тишкевичу и Матусевичу обобщить замечания на проект Указа, учитывая при этом высказанные при обсуждении мнения и направить их в Президиум Верховного совета БССР. (Замечания прилагаются к протоколу)



По четвертому вопросу было обсуждено предложение об организации единого кружка по уголовному праву, процессу и [illegible] Горелик [illegible] при разработке студентами тех или иных тем желательно привлекать данные других дисциплин. Т.е., доклад [illegible] уголовному праву должен содержать и вопросы процесса, наско[illegible] это возможно. Выделить руководителя кружка для оргработы. [illegible] должны руководить все работники кафедры. Каждый работник [illegible] будет руководить несколькими желающими заниматься в кру[illegible] Эти предложения были приняты. Постановили: 1.руководителем кру[illegible] назначить Бекенко. После возвращения студентов с колхозов про[illegible] организац.заседание кружка, где рассказать о предстоящей [illegible] и методах работы. 2.Каждому научному работнику обеспечить [illegible] водство студентами, желающими работать в кружке.

и.о.зав.кафедрой (Горелик)



ПРОТОКОЛ [illegible]

заседания кафедры уголовного права и процесса юридического факультета Белгосуниверситета им.Ленина от 19/IX-1956 г.

Присутствовали: [illegible]

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1.Обсуждение тематического плана по спецкурсу и спецсеминару по криминалистике.
2.О плане работы кафедры на 1-й семестр.
3.Обсуждение проекта нового Положения о Министерстве юстиции БССР.

По первому вопросу

СЛУШАЛИ: Новоселову Н.А. о тематическом плане спецсеминара и спецкурса по криминалистике.

ПОСТАНОВИЛИ: Представленную тематику утвердить/прилагается/. Поручить чтение лекций тов.Новоселовой/12 час./ и т.Штейнгаузу/4 часа/, поручить ведение спецсеминара по криминалистике тов.Штейнгаузу/2 подгруппы/ и тов.[illegible]/2 подгруппы/. Практические занятия по спецкурсу начать после 20 сентября.

По второму вопросу

СЛУШАЛИ: т.Горелика И.И. – о плане работы на 1-й семестр 1956/57 уч.года.

ПОСТАНОВИЛИ: План работы кафедры с [illegible] утвердить. /План прилагается/.

По третьему вопросу – о проекте нового Положения о Министерстве юстиции БССР–

СЛУШАЛИ: тов.Мартинович И.И., которая подвергла анализу письменные замечания работников юридического факультета на упомянутый Проект, после чего предложила свой проект Положения и объяснительную к нему записку.

ПОСТАНОВИЛИ: Поручить т.т.Мартинович И.И. и Горелику И.И. внести в составленный вариант проекта [illegible] Положения результаты обсуждения и в окончательно отредактированном виде направить в Министерство юстиции БССР.

И.О.Зав.кафедрой уголовного права и процесса, доцент /Горелик/

Пратаколы пасяджэння кафедры. 8 кастрычніка і 19 верасня 1956 г.



[illegible] заседания кафедры уголовного права и процесса
от 3 сентября 1949 года.

Присутствовали: т.т. Меркушев, Зорфель, [illegible], [illegible], [illegible], [illegible], [illegible], [illegible], Дробязко.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Утверждение отчета работы кафедры за истекший учебный год.
2. Утверждение тематических планов по курсам: уголовного права, уголовного процесса, криминалистики, судебной статистики.
3. Утверждение тематического плана научного кружка и [illegible] руководителя кружка.
4. Утверждение тематического плана спецсеминаров по уголовному праву и процессу.

СЛУШАЛИ: Отчет т. [illegible] о работе кафедр уголовного права и процесса за истекший учебный год.

ПОСТАНОВИЛИ: Отчет т. Зорфеля о работе кафедры уголовного права и процесса утвердить.

СЛУШАЛИ: Тематические планы лекций и семинарских занятий по курсам: уголовного права, уголовного процесса, криминалистики и судебной статистики.

ПОСТАНОВИЛИ: Тематические планы лекций и семинарских занятий по указанным дисциплинам утвердить.

[illegible]: Научный кружок, организованный нами работал в прошлом учебном году не плохо. Видно, что работа эта интересовала студентов. На научном кружке [illegible] наиболее интересные и сложные темы. Доклады вызывали обсуждения со стороны студентов. Я думаю, что и в этом году целесообразно создать такой же научный кружок.

[illegible]: Работа в кружке привлекла значительный круг студентов ин-та. Я думаю, что нам следует в этом году вновь организовать научный кружок ставя на обсуждение не только вопросы уголовного права, но и уголовного процесса и криминалистики. Создавать же два кружка по праву и процессу я считаю не целесообразным, т.к. разработка одних вопросов может [illegible]. Кроме того такой кружок привлечет большее количество студентов, а не распылит их, как это может случиться когда будет два кружка.

Выступившие по этому вопросу Новоселов и Зорфель поддержали мнение т. Меркушева. Были предложены темы для научного кружка.

ПОСТАНОВИЛИ:
1. Организовать научный кружок уголовного права и процесса.
2. Руководство научным кружком поручить т. Меркушеву.
3. Утвердить темы для научного кружка.



\- 2 -

СЛУШАЛИ: Тематические планы спецсеминаров по уголовному праву и процессу.

ПОСТАНОВИЛИ: Тематические планы спецсеминаров утвердить.

Зав. кафедрой уголовного права
доцент /[illegible]/

Зав. кафедрой уголовного процесса
доцент /[illegible]/

Секретарь /[illegible]/

Пратакол пасяджэння кафедры. 3 верасня 1949 г.



**Гарэлік Іосіф Ісаакавіч**

(1921–2008)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

Выконваў абавязкі загадчыка кафедры[1].



**Цішкевіч Іван Станіслававіч**

(1919–2001)

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 1965 па 1988 г. – першы загадчык кафедры крымінальнага права пасля раздзялення кафедры крымінальнага права, крымінальнага працэсу і крыміналістыкі.

Заслужаны юрыст БССР (1971).



**Баркоў Аляксандр Уладзіміравіч**

Кандыдат юрыдычных навук, прафесар.

З 1988 па 2005 г. – загадчык кафедры крымінальнага права.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2000).



**Грунтоў Ігар Алегавіч**

Доктар юрыдычных навук, прафесар.

З 2006 по 2019 г. – загадчык кафедры крымінальнага права.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2020).

Значны ўклад у развіццё ўніверсітэцкай навуковай школы крымінальнага права ўнеслі дацэнты М. А. Бабій, П. А. Дубавец, В. С. Швяцоў і В. В. Цімошчанка, прафесары В. В. Марчук, У. М. Хоміч і В. М. Шыраеў.



[1]Ф. 205. Воп. 6. Спр. 87, 154, 195.

**Бабій Мікалай Аляксеевіч**



Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1981 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

Працаваў на кафедры з 1984 па 2008 г.

З 2020 г. – вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь (сёння – Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававой інфармацыі).

Член Навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Аўтар звыш 300 навуковых прац.

**Дубавец Пётр Азаравіч**



(1931–2013)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1955 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

Працаваў на кафедры з 1963 па 2013 г.

Узнагароджаны медалём «Ветэран працы».

**Марчук Васіль Васільевіч**



Доктар юрыдычных навук, прафесар.

У 1990 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

Працаваў на кафедры з 1990 па 2015 г.

У 2022 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Методологические основы квалификации преступления».

Падрыхтаваў трох кандыдатаў юрыдычных навук.

**Хоміч Уладзімір Міхайлавіч**



Доктар юрыдычных навук, прафесар.

У 1973 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

Працаваў на кафедры з 1975 па 2001 г. З 1990 па 2000 г. займаў пасаду намесніка дэкана па навуковай рабоце юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1997 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Теоретические проблемы уголовной ответственности (концепция и юридическая модель института уголовной ответственности)».

Падрыхтаваў 14 кандыдатаў і 3 дактароў юрыдычных навук.

Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2011).



**Цімошчанка Васіль Васільевіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
У 1975 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.
Працаваў на кафедры з 1975 па 2005 г.
Аўтар звыш 70 навуковых прац.



**Швяцоў Васіль Сцяпанавіч**
(1919–1988)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1972 г.
У 1967 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па праблемах прававога рэгулявання пакарання ў выглядзе накіравання ў дысцыплінарны батальён.



**Шыраеў Валерыян Мікалаевіч**
(1872–1937)
Прафесар.
Першы выкладчык крымінальнага права на факультэце грамадскіх навук і факультэце права і гаспадаркі БДУ.
З 1923 па 1930 г. – прафесар кафедры крымінальнага права факультэта грамадскіх навук.
Узначальваў секцыю крымінальнай сацыялогіі Беларускага кабінета па вывучэнні злачынцы і злачыннасці, які быў адкрыты з яго удзелам 30 кастрычніка 1926 г. пры факультэце права і гаспадаркі БДУ.

У розныя гады на кафедры працавалі і ўнеслі значны ўклад ў яе развіццё, а таксама развіццё адукацыйнага працэсу факультэта М. Ф. Ахраменка, К. С. Захілько, К. В. Кічыгіна, К. В. Новікава, В. Л. Пруднічэнка, А. А. Пухаў, А. І. Сахарчук і інш.

З 2020 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з'яўляецца А. Л. Савенок.



**Савенок Анатоль Леанідавіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2019).

Сёння на кафедры працуюць прафесары кафедры С. Я. Аземша, А. У. Канюк; кандыдат юрыдычных навук прафесар А. У. Баркоў; доктар юрыдычных навук прафесар І. А. Грунтоў; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты М. А. Гарадзецкая, А. І. Дабрадзей, М. А. Дубко, С. В. Казак, В. З. Рыбаключава, М. К. Чупрыс, Д. В. Шаблінская, Ю. Л. Шаўцоў і А. В. Шыдлоўскі; старшыя выкладчыкі І. І. Верхаводка, М. Г. Галавенчык, А. М. Крывы, А. Р. Леановіч, М. Г. Макеева, Д. А. Плецянёва, А. І. Федаровіч і І. В. Шэпелеў.



Пасяджэнне кафедры крымінальнага права. 1977 г.



Пасяджэнне кафедры крымінальнага права. 1993 г.



Пасяджэнне кафедры крымінальнага права. 2000 г.

На працягу гісторыі існавання кафедра крымінальнага права адрознівалася творчай і плённай працай па ўдасканаленні навучальнага працэсу і методыкі выкладання крымінальнага права, крыміналогіі і крымінальна-выканаўчага права. Першы нацыянальны падручнік у галіне беларускага крымінальнага права быў падрыхтаваны і апублікаваны калектывам кафедры. Гэта было двухтомнае выданне «Уголовное право БССР» (1978). Кафедры належыць першынства і ў апублікаванні навучальнага дапаможніка па крымінальным праве на беларускай мове «Крымінальнае права Беларусі (закон, злачынства, адказнасць)» (1997). Акрамя таго, выдадзены шматлікія навучальныя дапаможнікі па крымінальным і папраўча-працоўным праве. У 2002 г. апублікаваны падручнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Уголовное право. Общая часть» і вучэбны дапаможнік «Уголовное право. Особенная часть». Калектывам кафедры падрыхтаваны шэраг каментарыяў да Крымінальнага кодэкса БССР 1960 г. і Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1999 г. У 2014 г. выдадзены падручнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Крымінальнае права. Агульная частка». З 2017 г. выйшлі тры тамы пяцітомнага выдання «Курс уголовного права»

пад навуковай рэдакцыяй І. А. Грунтова і А. В. Шыдлоўскага. У 2021 і 2023 гг. былі выдадзены манаграфіі «Уголовная политика Беларуси в сфере пенализации» і «Охранительная функция уголовного права» пад агульнай рэдакцыяй А. В. Шыдлоўскага. У 2023 г. быў надрукаваны вучэбны дапаможнік «Уголовное право».

У цяперашні час на кафедры выкладаюцца дысцыпліны: «Крымінальнае права», «Крымінальнае права замежных дзяржаў», «Крымінальна-выканаўчае права», «Крыміналогія». Акрамя таго, яна забяспечвае выкладанне шэрага спецкурсаў, у тым ліку ў магістратуры: «Актуальныя праблемы прымянення мер крымінальнай адказнасці», «Крымінальна-прававая ахова інфармацыйнай бяспекі і электронныя доказы», «Пракурорска-судовая практыка па справах аб злачынствах супраць інтарэсаў службы», «Крымінальна-прававая ахова праў і свабод чалавека», «Праблемы крымінальна-прававога забеспячэння прымянення пакарання».

Шырока вядомы навуковыя дасягненні кафедры. Значным укладам у тэорыю і практыку крымінальнага права сталі доктарскія дысертацыі І. І. Гарэліка «Злачынствы, небяспечныя для жыцця і здароўя» (1964) і І. С. Цішкевіча «Абарона ад грамадскага небяспечнага замаху і меры па затрыманні злачынцы» (1969). Доктарскія дысертацыі І. А. Грунтова «Прынцып асабістай вінаватай адказнасці ў крымінальным заканадаўстве» (2015) і У. М. Хоміча «Тэарэтычныя праблемы крымінальнай адказнасці (канцэпцыя і юрыдычная мадэль інстытута крымінальнай адказнасці)» (1997) стварылі навуковую аснову для распрацоўкі дзеючага крымінальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Многія працы вучоных кафедры былі наватарскімі: упершыню ў тэорыі крымінальнага права раскрывалася тая ці іншая праблема. Такімі, напрыклад, з'яўляюцца кандыдацкія дысертацыі В. А. Шкурко «Барацьба са службовай халатнасцю па савецкім крымінальным праве» (1953), П. А. Дубаўца «Адказнасць за цялесныя пашкоджанні па савецкім крымінальным праве» (1962), К. В. Кічыгінай «Крымінальная адказнасць за парушэнне правіл бяспекі руху і эксплуатацыі аўтамототранспарту ці гарадскога электратранспарту» (1962), В. С. Швяцова «Пакаранне ў выглядзе накіравання ў дысцыплінарны батальён» (1967), А. У. Баркова «Крымінальна-прававыя сродкі, стымулюючыя раскрыццё злачынстваў» (1977), В. В. Цімошчанкі «Крымінальная адказнасць за неаказанне матэрыяльнай дапамогі» (1982), М. А. Бабія «Крымінальная адказнасць за спайванне непаўналетніх» (1984), І. А. Грунтова «Крымінальна-прававыя нормы з адміністрацыйнай прэюдыцыяй» (1985), Ю. Л. Шаўцова «Крымінальна-прававая барацьба з вымагальніцтвам маёмасці (па матэрыялах Рэспублікі Беларусь)» (1992), М. Ф. Ахраменка «Праблемы крыміналізацыі грамадска небяспечных паводзін з выкарыстаннем інфармацыйна-вылічальных сістэм» (1996), В. В. Марчука «Крымінальна-прававыя сродкі забеспячэння выканання абвінаваўчага прыгавору» (1996), К. В. Новікавай «Асуджэнне з умоўным непрымяненнем пакарання як форма рэалізацыі крымінальнай адказнасці» (1999), А. В. Шыдлоўскага «Інстытут прызначэння пакарання ў крымінальным праве Рэспублікі Беларусь: сістэмна-функцыянальны аналіз» (2002), А. І. Сахарчука «Крымінальна-прававая ахова бяспекі дарожнага руху або эксплуатацыі аўтадарожных транспартных сродкаў» (2010), А. А. Пухава «Крымінальна-прававая ахова ветэрынарна-санітарнай бяспекі» (2015), К. С. Захілько «Крымінальна-прававыя меры процідзеяння крымінальнаму банкруцтву» (2020). Усе навуковыя даследаванні на кафедры вядуцца ў цесным супрацоўніцтве з суб'ектамі заканатворчасці, судамі і праваахоўнымі органамі. Большасць навуковых распрацовак знайшла ўвасабленне ў заканадаўстве і практыцы правапрымянення. Гэтаму спрыялі, у прыватнасці, выданні каментарыяў да Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.



Кафедра крымінальнага права. 2024 г.

Вучоныя кафедры падтрымліваюць цесную сувязь з практыкай: з'яўляюцца членамі навукова-кансультатыўных саветаў пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь (А. У. Баркоў, І. А. Грунтоў, А. Л. Савенок), Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь (А. В. Шыдлоўскі), Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь (А. У. Баркоў, І. А. Грунтоў, А. В. Шыдлоўскі), Вышэйшай кваліфікацыйнай калегіі суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (А. В. Шыдлоўскі).

Кафедра на пастаяннай аснове аказвае экспертную дапамогу ў галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у распрацоўцы і ацэнцы законапраектаў Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, а таксама праектаў пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.



Кафедра крымінальнага права. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* прафесар А. У. Баркоў,
прафесар А. У. Канюк, дэкан юрыдычнага факультэта дацэнт А. В. Шыдлоўскі,
загадчык кафедры прафесар А. Л. Савенок, прафесар І. А. Грунтоў.
*Другі рад (злева направа):* старшы выкладчык І. В. Шэпелеў,
старшы выкладчык М. Г. Макеева, старшы выкладчык Д. А. Плецянева,
дацэнт Н. І. Казялецкая, дацэнт С. В. Казак, дацэнт Д. В. Шаблінская,
вядучы спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу І. В. Тарасава.
*Трэцці рад (злева направа):* старшы выкладчык Я. В. Лайша,
старшы выкладчык М. Г. Галавенчык, старшы выкладчык А. І. Федаровіч,
старшы выкладчык А. Р. Леановіч

Члены кафедры супрацоўнічаюць з рэдакцыйнымі саветамі часопісаў «Журнал Белорусского государственного университета. Право», «Законность и правопорядок», «Предварительное расследование», «Право.by», «Юстиция Беларуси» і інш.

Кафедра супрацоўнічае з вядучымі замежнымі вучонымі. Даўнія, традыцыйныя сувязі падтрымліваюцца з найбуйнейшымі цэнтрамі замежнай вузаўскай юрыдычнай навукі. Члены кафедры ўдзельнічаюць у шматлікіх міжнародных навукова-практычных кангрэсах, канферэнцыях, круглых сталах і іншых праектах.

Кафедра крымінальнага права актыўна прыцягвае ў навукова-даследчую дзейнасць студэнтаў, выпускнікоў і практычных работнікаў юрыдычнага факультэта. Удзельнікі студэнцкага навуковага гуртка выступаюць на міжнародных навуковых канферэнцыях, публікуюць свае даклады ў навуковых зборніках.

## Кафедра крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду

Кафедра крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду вядзе сваё летазлічэнне з 1921 г., калі на факультэце грамадскіх навук БДУ была створана кафедра крымінальнага права і працэсу. У 1965 г. яна была раздзелена на дзве кафедры: крымінальнага права і крымінальнага працэсу і крыміналістыкі. У выніку рэарганізацыі апошняй у 1972 г. у якасці асобнага структурнага падраздзялення юрыдычнага факультэта была створана кафедра крымінальнага працэсу, а 31 ліпеня 1989 г. яна была перайменавана ў кафедру крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду.

На працягу ўсяго перыяду існавання кафедры яе ўзначальвалі Я. А. Мацвіенка, С. П. Бякешка і С. В. Далгарукаў.



**Мацвіенка Яўген Аляксандравіч**

(1925–1998)

Кандыдат юрыдычных навук, прафесар.

З 1965 па 1968 г. – загадчык кафедры крымінальнага працэсу і крыміналістыкі. З 1974 па 1988 г. – загадчык кафедры крымінальнага працэсу.

**Бякешка Сяргей Пятровіч**



(1923–2001)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

З 1968 па 1973 г. – загадчык кафедры крымінальнага працэсу і крыміналістыкі.

**Далгарукаў Сяргей Валер'евіч**



Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

З 1988 па 1993 г. – загадчык кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду.

У развіццё кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду значны ўклад унеслі знакамітыя вучоныя і педагогі, а таксама былыя супрацоўнікі праваахоўных органаў, якія ў час працы на кафедры сталі вядомымі вучонымі і кваліфікаванымі педагогамі.

**Астрога Яўген Канстанцінавіч**



(1935–2006)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1958 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

Працаваў на кафедры з 1995 па 2006 г.

**Бохан Уладзімір Фёдаравіч**



(1939–2018)

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

У 1961 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

Працаваў на кафедры з 1970 па 1974 г.



**Дзяргай Барыс Іванавіч**
(1927–1994)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
У 1949 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут.
Працаваў на кафедры з 1989 па 1994 г.



**Марціновіч Ізабэла Іванаўна**
(1927–2021)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
У 1949 г. скончыла Мінскі юрыдычны інстытут.
Працавала на кафедры з 1952 па 2019 г.
Першая ў Беларусі жанчына, якая абараніла доктарскую дысертацыю (1969).
Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2016).



**Плюта Яўхім Фядотавіч**
(1902–1988)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1960 па 1985 г.



**Шпілёў Веньямін Мікалаевіч**
(1914–1985)
Доктар юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1963 па 1985 г.

Значны ўклад у развіццё юрыдычнай навукі ўнеслі доктарскія дысертацыі В. М. Бібілы «Социально-правовые основы правосудия по уголовным делам» (1996), І. І. Марціновіч «Развитие суда и уголовно-процессуальных форм судебной деятельности в Белорусской ССР (1917–1967 гг.)» (1969), В. М. Шпілёва «Сущность, содержание и формы советского уголовного судопроизводства» (1984).



Кафедра крымінальнага працэсу
і пракурорскага нагляду. 1985 г.

У розныя гады на кафедры працавалі кандыдаты юрыдычных навук дацэнты Я. У. Дубровін, Б. І. Дзяргай, В. С. Жыгуліч, В. Д. Савіч, А. С. Сенько, В. В. Шпак, С. І. Журомскі, А. Г. Яцкевіч, старшыя выкладчыкі У. П. Лагойскі, У. М. Мялешка і інш.



Кафедра крымінальнага працэсу
і пракурорскага нагляду. 2012 г.

У пачатку XXI ст. у беларускай юрыдычнай навуцы абазначыліся новыя кірункі, звязаныя з умацаваннем праў чалавека, павышэннем эфектыўнасці крымінальнага працэсу, міжнародным супрацоўніцтвам дзяржаў у барацьбе са злачыннасцю. Гэта знайшло адлюстраванне ў кандыдацкіх дысертацыях В. В. Шпака «Ускоренное производство в уголовном процессе», В. В. Пятровай «Защита прав и свобод личности в уголовном процессе Республики Беларусь» (2003), А. С. Сянько «Защита прав и законных интересов граждан средствами общего надзора прокуратуры» (2004), В. І. Самарына «Взаимодействие органов Республики Беларусь, ведущих уголовный процесс, с учреждениями юстиции

иностранных государств по уголовным делам» (2006), В. Д. Савіч «Право на юридическую помощь в уголовном процессе» (2006), Я. У. Дубровіна «Судейская независимость и ее организационно-правовые гарантии» (2009), Л. Г. Арлоўскай «Производство по уголовным делам по вновь открывшимся обстоятельствам» (2016).

Пасля абароны кандыдацкіх дысертацый В. В. Шпак, В. В. Пятрова і В. І. Самарын у суаўтарстве са сваім навуковым кіраўніком – кандыдатам юрыдычных навук, прафесарам, заслужаным юрыстам Рэспублікі Беларусь А. А. Данілевічам – надрукавалі шэраг манаграфій.

З 1994 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з'яўляецца А. А. Данілевіч.



**Данілевіч Анатоль Аляксандравіч**
Кандыдат юрыдычных навук, прафесар.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2000).

Сёння на кафедры працуюць доктар юрыдычных навук прафесар В. М. Біла; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты Л. Г. Арлоўская, С. В. Далгарукаў, В. В. Пятрова, С. В. Рыбак, А. У. Салтановіч і В. І. Самарын; старшыя выкладчыкі Р. В. Бурак, Д. М. Вашкель, а таксама выкладчык А. І. Пірштук. У якасці сумяшчальнікаў працуюць кандыдаты юрыдычных навук дацэнты Л. Л. Зайцава і Т. А. Саўчук.

Калектыў кафедры вядзе актыўную навуковую, вучэбную, вучэбна-метадычную і грамадскую дзейнасць.

У аспірантуры БДУ па спецыяльнасцях кафедры праходзяць навучанне выпускнікі іншых устаноў адукацыі. Так, доктар юрыдычных навук прафесар В. М. Біла падрыхтавала двух кандыдатаў юрыдычных навук для Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта (Я. В. Багданаў, С. Л. Емельянаў) і аднаго – для Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (А. М. Ярмоц).

Навуковыя дасягненні кафедры адлюстраваны ў манаграфіях і навуковых артыкулах. У манаграфіях Я. А. Мацвіенкі «Приговор суда и его исполнение» (1968), «Всесторонность, полнота и объективность предварительного расследования» (у суаўтарстве; 1969), «Подозреваемый в советском уголовном процессе» (у суаўтарстве; 1969) закрануты фундаментальныя палажэнні крымінальна-працэсуальнага права, якія вызначаюць тып крымінальнага працэсу. Манаграфіі В. М. Шпілёва «Участники уголовного процесса» (1970) і «Содержание и формы уголовного судопроизводства» (1974) унеслі значны ўклад у развіццё юрыдычнай навукі.

Прафесар І. І. Марціновіч заснавала школу айчыннага судаўладкавання. Асабліва шырокую вядомасць атрымалі яе манаграфіі «Принцип гласности в уголовном судопроизводстве» (1968), «Общественные суды в БССР» (1978) і «Адвокатура в Беларуси: история и современность» (2002).

У сферу навуковых інтарэсаў прафесара В. М. Бібілы ўваходзяць праблемы легітымнасці дзяржаўнай улады, рэалізацыі прынцыпаў правасуддзя, выканання прыгавору. Яна распрацоўвае новы навуковы кірунак – сацыяльнае рэгуляванне правасуддзя. Манаграфіі В. М. Бібілы «Конституционные принципы правосудия и их реализация в стадии исполнения приговора» (1986), «Судебная власть в уголовном судопроизводстве» (2001), «Приговор в уголовном процессе» (2021) і «Уголовно-процессуальное регулирование стадии исполнения приговора» (2022) атрымалі вядомасць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. В. М. Бібіла падрыхтавала зборнік нарматыўных прававых актаў па гісторыі праваахоўных органаў «Белорусское законодательство о суде, прокуратуре, адвокатуре и органах охраны общественного порядка (1919–1991)», які быў выдадзены ў 2011 г. Выданне вядома не толькі юрыстам, але і шырокай аўдыторыі.

Супрацоўнікі кафедры публікавалі артыкулы ў штогадовым зборніку навуковых прац «Право и демократия» (галоўны рэдактар В. М. Бібіла), у перыядычных выданнях Беларусі «Журнал Белорусского государственного университета. Право», «Судовы веснік», «Законность и правопорядок», «Юстиция Беларуси», «Право.by», а таксама ў выданнях іншых краін.



Кафедра крымінальнага працэсу
і пракурорскага нагляду. 2020 г.

Кафедра забяспечвае выкладанне асноўных дысцыплін «Крымінальны працэс», «Судаўладкаванне», «Пракурорскі нагляд», а таксама спецыяльных дысцыплін «Адвакат у крымінальным працэсе», «Судовая прамова», «Практыкум па крымінальным працэсе». Для студэнтаў магістратуры выкладаюцца вучэбныя дысцыпліны «Даказванне і доказы ў крымінальным працэсе», «Падтрыманне дзяржаўнага абвінавачання ў судзе», «Альтэрнатыўныя спосабы ўрэгулявання крымінальна-прававых канфліктаў», «Перамовы і пасрэдніцтва па крымінальных справах», «Міжнародная прававая дапамога па крымінальных справах».

Для забеспячэння пералічаных дысцыплін вучэбнай літаратурай выкладчыкі кафедры надрукавалі шэраг кніг. Так, С. П. Бякешка выдаў вучэбны дапаможнік «Уголовный процесс БССР» (1974); І. І. Марціновіч і Я. Ф. Плюта – «Суд и правосудие в БССР» (1977); С. П. Бякешка і Я. А. Мацвіенка – вучэбны дапаможнік

«Практикум по уголовному процессу» (1980); В. М. Бібіла – «Судоустройство в Республике Беларусь» (2000), падручнік «Судоустройство» (2001) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, «Белорусское судоустройство» (2018); А. А. Данілевіч і У. П. Лагойскі – «Уголовный процесс» з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2003, 2010, 2015).

На кафедры існуе вопыт выдання вучэбнай літаратуры аўтарскімі калектывамі. У 1979 г. апублікаваны вучэбны дапаможнік з грыфам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР «Уголовный процесс БССР» пад рэдакцыяй Я. А. Мацвіенкі, у 2002 і 2010 гг. – падручнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Судоустройство» пад рэдакцыяй А. А. Данілевіча і І. І. Марціновіч, у 2015 г. – вучэбна-метадычны дапаможнік «Альтернативное разрешение споров в уголовном процессе» пад рэдакцыяй Л. Л. Зайцавай, у 2016 і 2021 гг. – вучэбна-метадычны дапаможнік «Уголовный процесс», аўтарамі якога з'яўляюцца А. А. Данілевіч, В. В. Пятрова і В. І. Самарын. Для студэнтаў магістратуры ў 2022 г. выдадзены навучальныя дапаможнікі з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Международная правовая помощь по уголовным делам», «Переговоры и посредничество по уголовным делам», «Уголовно-правовая охрана информационной безопасности и электронные доказательства». У 2023 г. калектыў кафедры падрыхтаваў фундаментальны навучальны дапаможнік «Уголовный процесс» з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Агульныя пытанні тэхналогіі атрымання вышэйшай юрыдычнай адукацыі разглядаюцца ў вучэбным дапаможніку В. М. Бібілы «Организация обучения студентов в юридических высших учебных заведениях» (1998).

Кафедра прымае ўдзел у падрыхтоўцы і абмеркаванні нарматыўных прававых актаў і іншых афіцыйных дакументаў, падтрымлівае навукова-практычныя сувязі з праваахоўнымі органамі. Так, І. І. Марціновіч з'яўлялася адным з распрацоўшчыкаў Канцэпцыі судова-прававой рэформы, прынятай парламентам у 1992 г., а таксама шэрага законаў, у тым ліку Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятай 15 сакавіка 1994 г. А. А. Данілевіч узначальваў працоўную групу па падрыхтоўцы Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1999 г., а зараз выступае членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Генеральным пракуроры Рэспублікі Беларусь. В. М. Бібіла ўваходзіць у склад Навукова-кансультатыўнага савета, які дзейнічае пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь. Вучоныя кафедры перыядычна выступаюць з лекцыямі перад суддзямі, пракурорамі і адвакатамі Рэспублікі Беларусь.

Прафесар В. М. Бібіла ўваходзіць у склад саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

На кафедры існуе навуковы гурток па праблемах крымінальнага працэсу.

Навукова-педагагічны калектыў кафедры перыядычна праходзіць стажыроўкі і павышэнне кваліфікацыі ў юрыдычных і адукацыйных установах Беларусі, а таксама за яе межамі.

У рамках праекта «Наследие права» ў 2016 г. выдадзены «Избранные труды» доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь І. І. Марціновіч. Супрацоўнікі кафедры ўшаноўваюць памяць сваіх настаўнікаў, удзячны ім за перададзеныя веды і навыкі, а таксама свята захоўваюць традыцыі кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду.



Кафедра крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* выкладчык А. І. Пірштук,
прафесар В. М. Бібіла, загадчык кафедры прафесар А. А. Данілевіч,
прафесар Л. Л. Зайцава, вядучы спецыяліст па забеспячэнні
вучэбнага працэсу Н. А. Урублеўская.
*Другі рад (злева направа):* старшы выкладчык Д. М. Вашкель,
дацэнт С. В. Рыбак, дацэнт А. У. Салтановіч,
дацэнт С. В. Далгарукаў, дацэнт В. В. Пятрова,
старшы выкладчык Р. В. Бурак, дацэнт В. І. Самарын,
дацэнт Л. Г. Арлоўская

## Кафедра экалагічнага і аграрнага права

Кафедра экалагічнага і аграрнага права як самастойнае падраздзяленне юрыдычнага факультэта створана ў 1991 г. Яе першым загадчыкам з'яўляўся А. І. Бабылёў.



**Бабылёў Анатоль Іванавіч**
(1939–2010)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 1991 па 1993 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны юрыст Расійскай Федэрацыі (1999).

У розныя гады кафедру ўзначальвалі М. В. Сторажаў і С. А. Балашэнка.



**Сторажаў Мікалай Васільевіч**
(1934–2004)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Член-карэспандэнт АН БССР.
З 1993 па 2004 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2000).



**Балашэнка Сяргей Аляксандравіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 2004 па 2017 г. – загадчык кафедры.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2021).

Значны ўклад у развіццё кафедры ўнёс А. А. Шынгель.



**Шынгель Адам Адамавіч**
(1928–2009)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
У 1959 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.
Працаваў на кафедры з 1991 па 1999 г.



Кафедра экалагічнага і аграрнага права. 1993 г.

На кафедры працавалі такія вядомыя вучоныя і таленавітыя педагогі, як доктар юрыдычных навук прафесар Д. М. Дземічаў і інш.



Кафедра экалагічнага і аграрнага права. 2000 г.

З 2017 г. і па цяперашні час кафедру ўзначальвае Т. І. Макарава.

**Макарава Тамара Іванаўна**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Узнагароджана медалём Ф. Скарыны.
Выдатнік адукацыі.
Заслужаны работнік БДУ.



Кафедра з'яўляецца адзіным у краіне спецыялізаваным структурным падраздзяленнем, якое забяспечвае ажыццяўленне адукацыйнай і навуковай дзейнасці, а таксама вучэбна-метадычнай работы ў галіне экалагічнага, зямельнага, прыродарэсурснага і аграрнага права.

Сёння на кафедры працуюць доктар юрыдычных навук прафесар С. А. Балашэнка; доктар юрыдычных навук дацэнт І. С. Шахрай; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты А. А. Жлоба, В. Я. Лізгара, І. П. Кузьміч, Н. В. Макарава, А. В. Мароз і В. В. Саскевіч. У якасці сумяшчальнікаў працуюць Намеснік Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук, прафесар Н. А. Карповіч, кандыдат юрыдычных навук М. П. Курыловіч, а таксама выкладчыкі А. І. Міхнюк і С. А. Шастоўская.

Кафедра забяспечвае выкладанне асноўных вучэбных дысцыплін «Экалагічнае права», «Прыродарэсурснае права», «Зямельнае права», «Прававы рэжым прыродных рэсурсаў», «Аграрнае права», «Прававыя асновы дзяржаўнай аграрнай палітыкі і прыродакарыстання» для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях «правазнаўства», «эканамічнае права» і «паліталогія» на юрыдычным факультэце, і дысцыпліны «Экалагічнае права» – на біялагічным факультэце

БДУ, а таксама спецкурсаў «Міжнароднае права навакольнага асяроддзя», «Прававое рэгуляванне знешнеэканамічнай дзейнасці ў сферы аграпрамысловай вытворчасці», «Прававыя асновы дзяржаўнай аграрнай палітыкі і прыродакарыстання».

Для студэнтаў магістратуры кафедрай падрыхтаваны і выкладаюцца дысцыпліны «Устойлівае развіццё і бяспека чалавека», «Міжнародныя і рэгіянальныя працэсы ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця», «Энергетычнае і транспартнае права ў Еўразійскім эканамічным саюзе», «Прававое забеспячэнне харчовай бяспекі», «Вырашэнне зямельных спрэчак», «Эканоміка-прававы механізм аховы навакольнага асяроддзя», «Эколага-прававое суправаджэнне гаспадарчай дзейнасці», «Аграрнае права ў Еўразійскім эканамічным саюзе», «Эколага-экспертная дзейнасць».

Навуковыя даследаванні кафедры ажыццяўляюцца па навуковай спецыяльнасці «зямельнае права; прыродарэсурснае права; экалагічнае права; аграрнае права».

Супрацоўнікамі кафедры падрыхтаваны шэраг манаграфій, у тым ліку: «Государственное управление в области охраны окружающей среды» С. А. Балашэнкі (2000), «Эколого-правовой статус граждан Республики Беларусь» Т. І. Макаравай (2004), «Экологическая функция государства» Н. А. Карповіч (2011), «Правовые механизмы охраны окружающей среды и обеспечения экологической безопасности» Т. І. Макаравай, С. А. Балашэнкі, В. Я. Лізгара і А. В. Мароза (2016), «Теоретико-правовые аспекты развития аграрного законодательства Республики Беларусь в области растениеводства и животноводства» калектыву аўтараў (2017), «Право специального лесопользования» (2006) і «Проблемы реализации субъективного права природопользования» (2022) І. С. Шахрай; «Проблемы эффективности аграрного и экологического права в условиях интеграционных процессов» (2021) і «Правовые проблемы устойчивого пространственного развития государств – участников СНГ» (2022) калектываў аўтараў.

Супрацоўнікі кафедры актыўна працуюць над удасканаленнем дзеючага экалагічнага, зямельнага, прыродарэсурснага, аграрнага заканадаўства, цесна ўзаемадзейнічаюць з Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікі кафедры з’яўляліся членамі рабочых груп па падрыхтоўцы змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь, у тым ліку законы «Аб ахове навакольнага асяроддзя», «Аб сельскагаспадарчых кааператывах», «Аб асабістых падсобных гаспадарках грамадзян», а таксама ў Лясны кодэкс Рэспублікі Беларусь. Яны прымалі ўдзел у падрыхтоўцы законаў Рэспублікі Беларусь «Аб раслінным свеце», «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе», «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы», Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі, канцэпцыі праекта Экалагічнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і інш.

Адным з напрамкаў навукова-даследчай работы кафедры з’яўляецца тлумачэнне дзеючага заканадаўства: выдадзены навукова-практычныя каментарыі да законаў Рэспублікі Беларусь «Аб ахове навакольнага асяроддзя» (2005),

«Аб асабістых падсобных гаспадарках грамадзян» (2008), «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы» (2007), а таксама да Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі (2009) і Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях (2017).

Выкладчыкі надаюць увагу ўдасканаленню вучэбнага працэсу і распрацоўцы вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры. Кафедры належыць першынства ў Беларусі па выданні вучэбных дапаможнікаў па экалагічным і прыродарэсурсным праве. Апублікаваны такія падручнікі, як «Международно-правовая охрана окружающей среды и права человека» С. А. Балашэнкі і Т. І. Макаравай (1999), «Аграрное право» М. В. Сторажава і І. П. Кузьміч (2003), «Земельное право Республики Беларусь. Общая часть» (2004), «Правовой режим земель в Республике Беларусь» Н. А. Шынгель (2006), «Экологическое право» калектыву аўтараў (2008, 2009, 2013), «Экологическое право» С. А. Балашэнкі, Т. І. Макаравай і В. Я. Лізгара (2016, 2021), «Правовое обеспечение безопасности на территориях радиоактивного загрязнения» калектыву аўтараў (2017), «Природоресурсное право» Н. А. Шынгель і І. С. Шахрай (2017). Распрацаваны вучэбныя праграмы для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Супрацоўнікі кафедры паспяхова выкарыстоўваюць у вучэбным працэсе інавацыйныя метады навучання і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, у тым ліку ствараюць, размяшчаюць і абнаўляюць электронны адукацыйны кантэнт, задзейнічаюць адукацыйны партал БДУ і электронныя сродкі навучання, суправаджаюць лекцыі мультымедыйнымі прэзентацыямі.

Кафедра экалагічнага і аграрнага права сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і іншымі органамі дзяржаўнага кіравання паспяхова ўдзельнічае ў міжнародных і нацыянальных праграмах і праектах у галіне аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця, такіх як «Падрыхтоўка Стратэгічнай праграмы дзеянняў для басейна Дняпра і распрацоўка механізмаў яе рэалізацыі», Праграма па ўзмацненні інстытуцыянальнага развіцця Рэспублікі Беларусь, «Распрацоўка канцэпцыі аптымізацыі Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь», «Развіццё механізмаў рэгулявання пытанняў пакрыцця экалагічнай шкоды і доступу да экалагічнай інфармацыі», «Стварэнне ўмоў для ўстойлівага функцыянавання сістэмы ахоўных водна-балотных угоддзяў у Беларускім Палессі», «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні», «Садзейнічанне развіццю ўсёабдымнай структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь» і інш.

На кафедры створана арыгінальная беларуская навуковая школа экалагічнага і аграрнага права, якая аказвае свой уплыў на развіццё адпаведных галін юрыдычнай навукі ў Беларусі і за мяжой. Вядзецца работа па падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. За час існавання кафедры падрыхтаваны 21 кандыдат і 4 дактары юрыдычных навук, уключаючы 1 замежнага грамадзяніна (Рэспубліка Казахстан).

Калектыў кафедры актыўна ўдзельнічае ў міжнародным навуковым абмене. Выкладчыкі ажыццяўляюць сумесныя навуковыя даследаванні, чытаюць лекцыі ва ўніверсітэтах за мяжой, ацэньваюць вынікі дысертацыйных даследаванняў замежных калег, выступаюць афіцыйнымі апанентамі па кандыдацкіх і доктар-

скіх дысертацыях. Арганізоўваюцца стажыроўкі замежных вучоных на юрыдычным факультэце БДУ і супрацоўнікаў кафедры ў навуковых установах за мяжой.

У 2013 г. быў створаны філіял кафедры на базе рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскае гарадское агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры».

На кафедры паспяхова функцыянуе студэнцкі навуковы гурток па экалагічным, аграрным, прыродарэсурсным і зямельным праве, удзельнікі якога выступаюць з дакладамі на ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, паспяхова развіваюць уласныя навуковыя праекты і прымаюць удзел у конкурсах студэнцкіх навуковых работ.



Кафедра экалагічнага і аграрнага права. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* дацэнт І. П. Кузьміч, прафесар С. А. Балашэнка, прафесар Н. А. Карповіч, загадчык кафедры прафесар Т. І. Макарава, прафесар І. С. Шахрай, дацэнт В. Я. Лізгара, дацэнт В. В. Саскевіч.
*Другі рад (злева направа):* выкладчык В. Г. Красуцкі, вядучы спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу Л. В. Бяляева, дацэнт А. А. Жлоба, старшы выкладчык А. І. Міхнюк, дацэнт Н. У. Макарава, дацэнт М. П. Курыловіч, выкладчык К. А. Кобаса, выкладчык І. С. Міхалкевіч, старшы выкладчык С. А. Шастоўская, спецыяліст I катэгорыі па забеспячэнні вучэбнага працэсу У. В. Шычко, дацэнт А. В. Мароз

## Кафедра паліталогіі

Вытокі кафедры паліталогіі ляжаць у аснове дзейнасці кафедры навуковага камунізму БДУ. У адпаведнасці з пастановай вучонага савета БДУ адбылася рэарганізацыя кафедры навуковага камунізму ў кафедру сацыяльна-палітычных тэорый і паліталогіі, якая ў 1992 г. была пераўтворана ў кафедру паліталогіі.

Традыцыі і навуковая школа кафедры фарміраваліся вядомымі навукоўцамі: доктарам філасофскіх навук прафесарам А. М. Байчоравым, дактарамі палітычных навук прафесарамі С. В. Рашэтнікавым, Н. А. Антановіч і Л. Я. Земляковым, доктарам філасофскіх навук прафесарам Г. А. Кругловай, а таксама кандыдатамі філасофскіх навук дацэнтамі А. Ф. Грэчневай, Н. П. Дзенісюк, А. П. Мельнікавым, Л. У. Старавойтавай, С. І. Сіманоўскім, Т. Г. Салавей, старшым выкладчыкам У. А. Курганавым і шэрагам іншых вучоных і выкладчыкаў.

Першым загадчыкам кафедры з'яўляўся А. М. Байчораў. Затым яе ўзначальваў С. В. Рашэтнікаў.



**Байчораў Аляксандр Мухтаравіч**

Доктар філасофскіх навук, прафесар.

З 1991 па 1993 г. – загадчык кафедры.

Ініцыяваў адкрыццё спецыяльнасці «паліталогія». Меў вопыт дыпламатычнай службы ў Дэпартаменце па палітычных пытаннях і справах Савета Бяспекі Сакратарыята Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.



**Рашэтнікаў Сяргей Васільевіч**

Доктар палітычных навук, прафесар.

Рэалізаваў ідэю адкрыцця ўнікальнай паліталагічнай кваліфікацыі «палітолаг-юрыст».

З 1993 па 2019 г. – загадчык кафедры.

У 1994 г. кафедра і спецыяльнасць «паліталогія» па ініцыятыве С. В. Рашэтнікава пераведзены на юрыдычны факультэт.

Значны ўклад у развіццё кафедры ўнеслі супрацоўнікі кафедры.



**Грэчнева Алена Фёдараўна**

(1956–2019)

Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

У 1979 г. з адзнакай скончыла гістарычны факультэт БДУ.

Працавала на кафедры з 1987 па 2019 г.



**Мельнікаў Адам Пятровіч**

Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

У 1965 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ.

Працаваў на кафедры з 1991 па 2020 г.

Падрыхтаваў 13 кандыдатаў філасофскіх навук.

Аўтар звыш 300 навуковых прац, у тым ліку 19 манаграфій і навучальных дапаможнікаў.



**Салавей Таццяна Генадзьеўна**

Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

У 1974 г. з адзнакай скончыла гістарычны факультэт БДУ.

Працавала на кафедры з 1978 па 2020 г.

Падрыхтавала аднаго кандыдата палітычных навук.

Аўтар звыш 90 навуковых прац.



**Старавойтава Людміла Уладзіміраўна**

(1951–2020)

Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

У 1973 г. скончыла гістарычны факультэт БДУ.

Працавала на кафедры з 1983 па 2020 г.

Падрыхтавала чатырох кандыдатаў палітычных навук.

Аўтар звыш 60 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі і 10 навучальных дапаможнікаў (у суаўтарстве).

У розныя гады на кафедры працавалі доктар сацыялагічных навук прафесар Н. М. Беляковіч, а таксама кандыдаты навук дацэнты В. В. Бянькоўскі, В. І. Гамаў, С. П. Карэйша, І. А. Кузняцова, Н. В. Ляховіч-Петракова, У. В. Роўда, А. Л. Саслоўская, В. Ф. Шалькевіч і У. У. Шымаў.

З 2020 г. па цяперашні час загадчыкам кафедры з'яўляецца Н. А. Антановіч.



**Антановіч Ніна Арсеньеўна**

Доктар палітычных навук, прафесар.

Яе доктарская дысертацыя па выніках конкурсу на найлепшую дысертацыю прызнана пераможцам у намінацыі «Гуманітарныя навукі».

Заслужаны работнік БДУ.

Сёння на кафедры працуюць кандыдаты палітычных навук дацэнты А. Г. Абраменка, Д. У. Бяляўцава, А. М. Ільіна, В. С. Міхайлоўскі, В. Я. Пабярэжная, С. Г. Парэчына, А. С. Пісарчык; кандыдат гістарычных навук дацэнт Л. У. Слуцкая; старшыя выкладчыкі Г. А. Астрога, С. А. Казлова, М. С. Мамекін; выкладчыкі Д. В. Драгун, А. С. Рыжы, а таксама вядучы спецыяліст А. П. Ермаловіч і спецыяліст І катэгорыі К. М. Прымакова.

Супрацоўнікі кафедры паліталогіі праводзяць навуковыя даследаванні па наступных кірунках: выяўленне механізмаў фарміравання і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі і кіравання, развіццё ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, палітычнай сістэмы, ідэалагічнае забеспячэнне дзейнасці дзяржавы, а таксама вывучэнне і параўнальны аналіз механізмаў фарміравання і функцыянавання палітычных інстытутаў і іх палітыка-прававога рэгулявання, улік палітычнай дынамікі ў заканатворчых працэсах, аналітычнае забеспячэнне работы органаў дзяржаўнага кіравання, распрацоўка метадалогіі і методыкі сучасных палітычных даследаванняў, арганізацыя адносін органаў дзяржаўнай улады з суб’ектамі грамадзянскай супольнасці і прадпрымальніцкім сектарам, сістэмны аналіз праблем глабальнага і рэгіянальнага развіцця.



Кафедра паліталогіі. 2015 г.

На сучасным этапе кафедра паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ з’яўляецца вядучай кафедрай у Рэспубліцы Беларусь, якая спецыялізуецца на сферы палітычнай навукі. Яна рэалізуе двухадзіную задачу: прафесійная падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці «паліталогія» і кваліфікацыі «палітолаг», а таксама выкладанне паліталогіі і дысцыплін паліталагічнага профілю на розных факультэтах БДУ. Калектыў кафедры забяспечвае выкладанне больш за 50 навучальных дысцыплін з іх штогадовым абнаўленнем.

За перыяд з 1992 па 2023 г. было падрыхтавана больш за 730 спецыялістаў з кваліфікацыяй «палітолаг-юрыст», у ліку якіх уладальнікі стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, лаўрэаты рэспубліканскіх конкурсаў навуковых работ студэнтаў, пераможцы конкурсу грантаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Калектывам кафедры падрыхтаваны падручнік «Политология» пад рэдакцыяй С. В. Рашэтнікава, які з 1999 па 2013 г. вытрымаў 8 выданняў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 2022 г. быў апублікаваны адноўлены дапаможнік «Политология» пад навуковай рэдакцыяй прафесара Н. А. Ан-

тановіч, у якім адлюстраваны дасягненні сусветнай і беларускай паліталогіі з акцэнтам на беларускай праблематыцы. Адзін з першых у нашай рэспубліцы навучальны дапаможнік «Политология» (1994) быў выдадзены Г. А. Кругловай.

Выкладчыкі кафедры прынялі ўдзел у падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў «Грамадазнаўства» (2010, 2020, 2021) для 10-х і 11-х класаў агульнаадукацыйных устаноў.

Калектывам кафедры была рэалізавана навукова-даследчая работа (НДР) па наступных тэмах: «Метадалогія палітычнага аналізу працэсаў трансфармацыі інфармацыйнага грамадства» (2010), «Дзяржаўныя працэсы і інстытуты ў Рэспубліцы Беларусь і сучасным свеце» (2015), «Канцэптуальныя асновы і тэндэнцыі развіцця палітычнай прасторы ва ўмовах трансфармацыі» (2020). У перыяд з 2021 па 2025 г. праводзіцца НДР па тэме «Канцэптуальныя напрамкі развіцця тэорыі палітыкі ў сучасным свеце і ў Рэспубліцы Беларусь».

Супрацоўнікі кафедры прымалі ўдзел у выкананні шэрага НДР па грантах БРФФД, у прыватнасці «Тэарэтычныя перадумовы выкарыстання высокіх тэхналогій у сферы дзяржаўнага кіравання» (2003–2004), «Палітычны аналіз як тэорыя і метадалогія дзяржаўнага кіравання ў пераходных грамадствах» (2006–2007), «Дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай прасторай: паліталагічныя аспекты» (2015–2017), «Дынаміка і перспектывы развіцця палітычнай навукі як кірунка фундаментальных даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь» (2008–2010), а таксама НДР у рамках дзяржаўнай праграмы даследаванняў «Матэрыя працэсаў функцыянавання грамадска-дзяржаўнай палітыкі і кіравання ў палітычнай прасторы Рэспублікі Беларусь» (2016–2020).

Кафедра паліталогіі забяспечвае падрыхтоўку дактарантаў і аспірантаў па наступных спецыяльнасцях: «тэорыя і філасофія палітыкі, гісторыя і метадалогія палітычнай навукі», «палітычныя інстытуты, працэсы і тэхналогіі», «палітычныя праблемы міжнародных адносін і глабальнага і рэгіянальнага развіцця», «палітычная рэгіяналістыка; этнапалітыка».

Першы савет па абароне дысертацый па палітычных навуках быў створаны на базе кафедры паліталогіі БДУ у 1992 г. З таго часу ён рэгулярна абнаўляецца і стабільна функцыянуе. У перыяд з 1992 па 2023 г. уключна ў савеце пры БДУ абаронена больш за 60 кандыдацкіх і 14 доктарскіх дысертацый па палітычных навуках.

Загадчык кафедры Н. А. Антановіч з 2022 г. з’яўляецца старшынёй экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па сацыялагічных, палітычных і філасофскіх навуках.

Супрацоўнікі кафедры выступаюць членамі рэдкалегій часопісаў: прафесар Н. А. Антановіч – European and Asian Law Review, «Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія», «Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія», «Труд. Профсоюзы. Общество» і інш.; прафесар Г. А. Круглова – «Вестник Ленинградского государственного университета. Серия: Философия» і інш.; прафесар С. В. Рашэтнікаў – «Праблемы кіравання», «Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія», «Труд. Профсоюзы. Общество» і інш.

Філіял кафедры функцыянуе пры Інстытуце філасофіі НАН Беларусі. Ажыццяўляецца ўзаемадзеянне з Інстытутам сацыялогіі і Інстытутам эканомікі НАН Беларусі.

Сярод выпускнікоў спецыяльнасці «паліталогія» юрыдычнага факультэта БДУ – дзяржаўныя служачыя рэспубліканскіх і мясцовых органаў кіравання, работнікі сферы адукацыі і навукі, супрацоўнікі НАН Беларусі, аналітыкі дзяржаўных навукова-даследчых і аналітычных цэнтраў, работнікі праваахоўных органаў і органаў бяспекі Рэспублікі Беларусь. Яны ўнеслі вялікі ўклад у станаўленне і работу Інстытута сацыяльна-палітычных даследаванняў (1997–2006), Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2006–2019), якія папярэднічалі стварэнню Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў. Нашы выпускнікі прымаюць непасрэдны ўдзел у дзяржаўным будаўніцтве Рэспублікі Беларусь.



Кафедра паліталогіі. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* дацэнт Л. У. Слуцкая, дацэнт К. С. Разуванава, намеснік дэкана юрыдычнага факультэта дацэнт В. Я. Пабярэжная, загадчык кафедры прафесар Н. А. Антановіч, дацэнт А. Г. Абраменка, выкладчык А. П. Ермаловіч, дацэнт А. М. Ільіна.
*Другі рад (злева направа):* выкладчык П. В. Юсупаў, выкладчык М. В. Каролік, выкладчык Л. А. Глушакова, старшы выкладчык С. А. Казлова, прафесар Г. А. Круглова, дацэнт М. М. Ляўчук, прафесар С. В. Рашэтнікаў.
*Трэці рад (злева направа):* дацэнт І. С. Турлай, дацэнт Д. А. Мігун, выкладчык У. А. Казлоўскі, выкладчык Д. В. Драгун, прафесар Л. Я. Землякоў, дацэнт Д. У. Бяляўцава, выкладчык А. Д. Мілачоў, дацэнт С. І. Сіманоўскі, выкладчык А. А. Марчык, дацэнт В. С. Міхайлоўскі, старшы выкладчык М. С. Мамекін, дацэнт С. В. Зенчанка

# Кафедра крыміналістыкі

Кафедра крыміналістыкі ў якасці самастойнага структурнага падраздзялення юрыдычнага факультэта ўтворана ў 1972 г. Яна з’яўляецца вядучым профільным вучэбным і навуковым крыміналістычным цэнтрам рэспублікі. Намаганнямі вучоных кафедры створана арыгінальная беларуская крыміналістычная навуковая школа, якая ўплывае на іншыя вучэбныя і навуковыя ўстановы Рэспублікі Беларусь.

Станаўленне і развіццё кафедры звязаны з імем вядомага вучонага-крыміналіста А. В. Дулава.



**Дулаў Андрэй Васільевіч**
(1924–2018)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
З 1972 па 1990 г. – загадчык кафедры.
Заснаваў нацыянальную школу крыміналістыкі, якая стала добра вядомай у сусветнай прасторы.
Падрыхтаваў звыш 50 кандыдатаў і дактароў юрыдычных навук.
Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (2000). Заслужаны работнік БДУ. Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты.
Аўтар каля 600 навуковых прац.



Кафедра крыміналістыкі. 1989 г.

Кафедру таксама ўзначальваў Р. А. Шумак.



**Шумак Рыгор Аляксандравіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
З 1990 па 2016 г. – загадчык кафедры.
Падрыхтаваў аднаго кандыдата юрыдычных навук.
Выдатнік адукацыі. Заслужаны работнік БДУ.
Аўтар звыш 125 навуковых прац.

Значны ўклад у развіццё кафедры ўнеслі вядомыя вучоныя і кваліфікаваныя педагогі: А. Я. Гучок, Ю. І. Новік, А. С. Рубіс, В. Ф. Чарвакоў, В. К. Сцешыц, І. С. Андрэеў, І. Р. Вярэнчыкаў А. І. Кастроў, А. В. Лапін, І. А. Мароз, І. А. Матусевіч, Ю. І. Рэўтаў і інш.

**Андрэеў Ігар Сцяпанавіч**
(1951–2007)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1977 г.



**Вярэнчыкаў Ігар Раманавіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
З 1989 г. працуе на кафедры.
Узнагароджаны медалямі Францыска Скарыны, «За працоўную доблесць». Выдатнік адукацыі. Заслужаны работнік БДУ.



**Гучок Аляксандр Яўгенавіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Працаваў на кафедры з 1995 па 2004 г.
З 2018 г. – Старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.
У 2014 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Крыміналістычнае вучэнне аб матэрыяльнай структуры злачынства».



**Кастроў Альберт Іванавіч**
(1935–2011)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1961 г.





**Лапін Аляксандр Васільевіч**
(1949–2007)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1976 па 2007 г.



**Мароз Ігар Анатольевіч**
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1999 па 2023 г.



**Матусевіч Ірына Антонаўна**
(1927–2000)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працавала на кафедры з 1963 г.



**Новік Юрый Іосіфавіч**
(1946–1999)
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Працаваў на кафедры з 1983 па 1999 г.

У 1991 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Псіхалагічныя аспекты прававога рэгулявання».



**Рубіс Аляксандр Сяргеевіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Працаваў на кафедры з 2000 па 2003 г.

У 2007 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Асновы тэорыі крыміналістычнага забеспячэння дзейнасці пракурора ў сферы барацьбы са злачыннасцю».

Аўтар звыш 200 навуковых прац.

**Рэўтаў Юрый Іванавіч**
(1931–2005)
Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.
Працаваў на кафедры з 1965 г.



У розныя годы на кафедры працавалі кандыдаты юрыдычных навук дацэнты М. М. Гапановіч, Н. А. Навасёлава, Ю. У. Панамарэнка, С. Ю. Рэўтава, В. П. Таміліна, А. К. Тарасава, У. В. Шалькевіч, Г. Р. Шыханцоў і інш.



Кафедра крыміналістыкі. 2022 г.

З 2016 г. загадчыкам кафедры з'яўляецца В. Б. Шабанаў.

**Шабанаў Вячаслаў Барысавіч**
Доктар юрыдычных навук, прафесар.



Пад яго кіраўніцтвам створаны крыміналістычны палігон, а таксама абноўлена абсталяванне крыміналістычнай лабараторыі кафедры.

У рамках рэалізацыі ідэі прафесара А. В. Дулава працягвае развіццё арыгінальнай беларускай навуковай школы крыміналістыкі і ўдасканаленне сістэмы практыка-арыентаванага навучання будучых юрыстаў. Арганізаваў філіял кафедры крыміналістыкі на базе цэнтральнага апарата Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Падрыхтаваў 11 кандыдатаў і 1 доктара юрыдычных навук.

Аўтар звыш 400 навуковых прац.

Сёння на кафедры працуюць доктар юрыдычных навук, прафесар, загадчык кафедры В. Б. Шабанаў; кандыдаты юрыдычных навук дацэнты А. А. Абдурахманаў, К. П. Арэхава, І. Р. Вярэнчыкаў, В. Л. Грыгаровіч, У. С. Красікаў, І. А. Лапіна, А. П. Пацкевіч, А. М. Хлус; кандыдат медыцынскіх навук дацэнт Ю. У. Кухаркоў; кандыдат псіхалагічных навук дацэнт Н. К. Плаўнік і старшыя выкладчыкі Н. І. Лагун, І. І. Лузгін, А. Л. Лук'яновіч і У. М. Руткевіч. У якасці сумяшчальнікаў чытаюць лекцыі і праводзяць практыка-арыентаваныя заняткі А. І. Швед і А. М. Паутаў, а таксама начальнік галоўнага ўпраўлення каардынацыі службовай дзейнасці Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь П. У. Бакшанскі.



**Швед Андрэй Іванавіч**
Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь.
Доктар юрыдычных навук, прафесар.
Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2024).



**Паутаў Аляксандр Міхайлавіч**
Суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Калектыў кафедры актыўна вядзе навуковую, навукова-метадычную і вучэбна-метадычную дзейнасць. Манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, артыкулы, вучэбна-метадычныя распрацоўкі і іншыя навуковыя працы вучоных кафедры крыміналістыкі добра вядомы ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі. Так, выданне «Криминалистика» (2019), падрыхтаванае калектывам кафедры пад рэдакцыяй В. Б. Шабанава і В. Л. Грыгаровіча, з'яўляецца асноўным дапаможнікам па курсе крыміналістыкі для студэнтаў. Навучэнцамі і практыкуючымі работнікамі шырока выкарыстоўваюцца такія працы, як «Судебная психология», «Тактические операции при расследовании преступлений» і «Основы расследования преступлений, совершенных должностными лицами» А. В. Дулава, «Криминалистика» пад рэдакцыяй А. В. Дулава, «Бухгалтерский анализ как метод расследования преступлений» Р. А. Шумака, «Судебная экспертиза» А. І. Шведа, «Расследование приписок» А. І. Кастрова, «Психологические проблемы правового регулирования» Ю. І. Новіка, «Основы формирования теории криминалистического доказывания» А. В. Дулава і А. С. Рубіса, «Криминалистическое оружиеведение» А. В. Лапіна, «Основы криминалистического учения о материальной

структуре преступления» і «Модели решения исследовательских задач криминалистики» А. Я. Гучка, «Проверка показаний на месте» А. С. Рубиса, А. К. Тарасавай і А. Я. Гучка, «Криминалистика» пад рэд. Р. А. Шумака, «Осмотр места происшествия» А. Я. Гучка і І. А. Мароза, «Организационные и правовые проблемы предупреждения и раскрытия преступлений в исправительных учреждениях» В. Б. Шабанава, «Теоретические основы уголовно-исполнительного права» пад рэд. В. Б. Шабанава, «Практикум по криминалистике» калектыву аўтараў, «Управление оперативными подразделениями органов, осуществляющих оперативно-розыскную деятельность» калектыву аўтараў, «Особенности противодействия суицидальному поведению в учреждениях уголовно-исполнительной системы» В. Б. Шабанава (у суаўтарстве) і інш.



Кафедра крыміналістыкі. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* дацэнт А. А. Абдурахманаў, дацэнт В. Л. Грыгаровіч, прафесар І. Р. Вярэнчыкаў, загадчык кафедры прафесар В. Б. Шабанаў, дацэнт Р. А. Шумак, дацэнт І. А. Лапіна, спецыяліст І катэгорыі Р. У. Салаўёва, старшы выкладчык У. М. Руткевіч.
*Другі рад (злева направа):* старшы выкладчык А. Л. Лук'яновіч, начальнік упраўлення грамадскіх сувязей Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь П. У. Бакшанскі, дацэнт Н. К. Плаўнік, старшы выкладчык Н. І. Лагун, дацэнт А. М. Хлус.
*Трэці рад (злева направа):* дацэнт Ю. У. Кухаркоў, дацэнт К. П. Арэхава, дацэнт У. С. Красікаў, аспірант А. В. Траццякоў, дацэнт А. П. Пацкевіч, суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь А. М. Паутаў, вядучы спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу Е. У. Санду, дацэнт А. М. Ляпёхін

Сёння кафедра забяспечвае выкладанне такіх дысцыплін, як «Крыміналістыка», «Судовая бухгалтэрыя», «Юрыдычная псіхалогія», «Судовая псіхіятрыя», «Судовая медыцына», «Юрыдычная этыка», «Судова-пракурорская этыка», «Асновы права». Чытаюцца дысцыпліны судова-пракурорска-следчай спецыяліза-

цыі: «Судовая экспертыза», «Методыка расследавання асобных відаў злачынстваў», «Расследаванне злачынстваў у сферы эканамічнай дзейнасці», «Асновы аператыўна-вышуковай дзейнасці», «Медыцынскае права» і інш.

На кафедры дзейнічае студэнцкі навуковы гурток па крыміналістыцы, арганізаваны доктарам юрыдычных навук, прафесарам А. Я. Гучком у 2003 г.

Калектыў кафедры падтрымлівае навуковыя сувязі з вучэбнымі і навукова-даследчымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь, а таксама экспертнымі і праваахоўнымі органамі дзяржавы. Выкладчыкі ўдзельнічаюць у шматлікіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, выступаюць на метадычных семінарах пракурорскіх і следчых работнікаў. Сярод навуковых партнёраў кафедры – адпаведныя падраздзяленні ўніверсітэтаў і акадэмій Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Казахстан.

## Вучэбная лабараторыя крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз кафедры крыміналістыкі

Крыміналістычная лабараторыя БДУ была створана ў 1954 г. пры кафедры крымінальнага права і працэсу. Да 1972 г. яе дзейнасць ажыццяўлялася пры кафедры крымінальнага працэсу і крыміналістыкі. У 1972 г. у выніку ўтварэння кафедры крыміналістыкі лабараторыя стала яе структурным падраздзяленнем, а 19 мая 2015 г. загадам рэктара БДУ крыміналістычная лабараторыя была пераўтворана ў вучэбную лабараторыю крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз кафедры крыміналістыкі.




На розных гістарычных этапах у дадзеным структурным падраздзяленні пачыналі сваю працоўную біяграфію многія цяпер вядомыя і заслужаныя вучоныя Рэспублікі Беларусь: дактары юрыдычных навук прафесары А. Я. Гучок, Т. І. Доўнар, Т. І. Макарава, В. Г. Ціхіня, кандыдаты юрыдычных навук дацэнты І. А. Мароз, У. В. Шалькевіч і інш.

У 2016 г. пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры крыміналістыкі, доктара юрыдычных навук, прафесара В. Б. Шабанава быў створаны крыміналістычны палігон. У 2022 г. яму было прысвоена імя доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь А. В. Дулава.

Лабараторыя крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз кафедры крыміналісты-

кі забяспечвае правядзенне практычных заняткаў па дысцыплінах кафедры і ўключае лабараторыю крыміналістычнай тэхнікі, крыміналістычнай тактыкі і методыкі, лабараторыю дактыласкапіі і крыміналістычны палігон.

Лабараторыяй крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз загадвае І. І. Лузгін.



І. І. Лузгін

Лабараторыя мае сучаснае абсталяванне, стэнды, макеты, вучэбныя дапаможнікі, неабходныя для набыцця студэнтамі навыкаў выяўлення, фіксацыі, зняцця і даследаваня матэрыяльных доказаў, а таксама правядзення следчых дзеянняў. У кожнай з вучэбных аўдыторый ёсць дэманстрацыйнае абсталяванне. Акрамя таго, лабараторыя мае якасную фота- і відэатэхніку, у тым ліку 3D-камеры.

Тэхнічныя сродкі лабараторыі адпавядаюць сучасным патрабаванням і дазваляюць ажыццяўляць шэраг складаных аперацый, якія накіраваны на максімальна эфектыўнае рашэнне надзённых крыміналістычных задач, а таксама павышэнне якасці працэсу навучання.

Крыміналістычны палігон мае спецыяльныя блокі, прызначаныя для мадэлявання абставін месца здарэння, а таксама манекены для імітацыі чалавечых цел, іх фрагментаў і пашкоджанняў на іх.

На палігоне створаны мадэлі месцаў здарэнняў:

– жылы пакой;

– офіс;

– закрытае цеснае памяшканне (напрыклад, камера).

На палігоне ёсць вучэбная аўдыторыя, прысвечаная гісторыі крыміналістыкі. Уключаныя ў яе склад экспазіцыі рарытэтнай крыміналістычнай і экспертнай тэхнікі наглядна дэманструюць ход яе ўдасканалення, адлюстроўваюць гістарычны працэс развіцця крыміналістыкі і яе тэхналогій у адпаведнасці з задачамі, якія стаяць перад праваахоўнымі органамі. У гэтай аўдыторыі студэнты вывучаюць гісторыю тэхніка-крыміналістычных сродкаў.

Лабараторыя крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз мае шмат сучасных тэхніка-крыміналістычных сродкаў для раскрыцця злачынстваў, якія выкарыстоўваюцца з мэтай выпрацоўкі практычных навыкаў у студэнтаў падчас правядзення лабараторных заняткаў. За лабараторыяй замацаваны чатыры аўдыторыі: кабінет дактыласкапічнай рэгістрацыі і выяўлення слядоў рук чалавека, лабараторыя крыміналістычнай тактыкі для вядзення заняткаў па навучанні студэнтаў вытворчасці асобных следчых дзеянняў, кабінет методыкі расследавання злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркатычных рэчываў, а таксама лабараторыя тэхніка-крыміналістычнага даследавання дакументаў і почырку, судова-балістычных, габітаскапічных і біялагічных даследаванняў.

У лабараторыі сабраны розныя вучэбныя калекцыі, а таксама экспазіцыі падробленых дакументаў і грашовых знакаў, прылад узлому і запорных прылад, фальшывых дакументаў і грашовых знакаў, макетаў розных відаў халоднай зброі, а таксама калекцыі тэхніка-крыміналістычных сродкаў.

Сучасныя камп’ютарныя сродкі лабараторыі забяспечваюць дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый і навучальных фільмаў, а таксама магчымасць працаваць з вучэбнымі і крыміналістычнымі праграмамі.



Мадэль для правядзення
агляду месца здарэння
ў жылым пакоі



Мадэль для правядзення
агляду месца здарэння
ў закрытым цесным памяшканні



Мадэль для правядзення агляду
месца здарэння ў офісе





Стэнды, прысвечаныя гісторыі развіцця
тэхніка-крыміналістычных сродкаў

Спецыялізаваныя вучэбныя і дэманстрацыйныя праграмы, устаноўленыя на камп'ютарах лабараторыі, дазваляюць выкладчыкам канструяваць і прымяняць педагагічныя тэхналогіі праектавання як асобных навучальных заняткаў, так і ўсяго навучальнага працэсу па замацаваных за кафедрай дысцыплінах.



Станцыя дактыласкапіравання «Папілон ДС-45М»



Абсталяванне лабараторыі тэхніка-крыміналістычнага даследавання дакументаў і почырку, судова-балістычных, габітаскапічных і біялагічных даследаванняў

У лабараторыі ёсць адпаведны экспертна-крыміналістычны інструментарый, прыстасаванні, рэактывы, рэагенты, расходныя матэрыялы і іншыя неабходныя тэхніка-крыміналістычныя сродкі, якія павышаюць якасць заняткаў і адпавядаюць сучасным патрабаванням па арганізацыі і вядзенні вучэбнага працэсу.



Мікраскоп спектральны люмінесцэнтны «Рэгула-5001МК.01»



Прыбор кантролю сапраўднасці дакументаў «Рэгула-4315»

У вучэбным працэсе актыўна выкарыстоўваюцца каталагізаваная і сістэматызаваная па тэматыцы заняткаў відэатэка, якая складаецца з больш за 500 крыміналістычных фільмаў, і прэзентацыйная база, што ўключае больш за 130 прэзентацый па лекцыях і лабараторных занятках, а таксама база навучальных праграм, крыміналістычнай і судова-экспертнай літаратуры.



Экскурсія па крыміналістычным палігоне. 2022 г.



Экскурсія па крыміналістычным палігоне.
2023 г.

На палігоне праводзяцца экскурсіі для гасцей універсітэта з дэманстрацыяй працэсу падрыхтоўкі студэнтаў – будучых спецыялістаў у галіне юрыспрудэнцыі.

## ЦЭНТР АДУКАЦЫЙНЫХ ІНАВАЦЫЙ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Цэнтр адукацыйных інавацый юрыдычнага факультэта БДУ быў заснаваны ў 2020 г. і аб’яднаў вучэбныя лабараторыі заканадаўства, палітычных тэхналогій, інфарматыкі і тэхнічных сродкаў навучання, інавацыйных тэхналогій навучання і вучэбны аддзел «Юрыдычная клініка». Цэнтр узначальвае Ю. А. Скарына. Яго намеснікамі з’яўляюцца С. А. Казлова, Н. В. Мемус і А. І. Федаровіч.



Ю. А. Скарына



С. А. Казлова



Н. В. Мемус



А. І. Федаровіч

Мэтай работы цэнтра адукацыйных інавацый выступае папулярызацыя БДУ ў рэйтынгу найлепшых універсітэтаў свету, забеспячэнне канкурэнтаздольнасці ўніверсітэта на адукацыйным рынку, а таксама якасная рэалізацыя заказу на адукацыю.

Задачамі цэнтра з’яўляюцца:

– забеспячэнне адукацыйнага працэсу інфармацыйнымі тэхналогіямі і развіццё яго інфарматызацыі;

– забеспячэнне юрыдычнага факультэта паслугамі, тэхнічнай дапамогай, таварамі і абсталяваннем;
– суправаджэнне кадравай работы, справаводства;
– арганізацыйная работа па ўдасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай базы;
– інфармацыйнае камп'ютарнае суправаджэнне вучэбнага працэсу;
– забеспячэнне рэалізацыі вучэбных праграм для магістрантаў з Кітая;
– развіццё практыка-арыентаванага навучання.

У структуру Цэнтра адукацыйных інавацый уваходзяць:
– сектар інфарматыкі і тэхнічных сродкаў навучання;
– сектар матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння юрыдычнага факультэта паслугамі, таварамі і абсталяваннем;
– сектар кадравай работы і справаводства;
– сектар навучальна-метадычнай работы;
– аддзел «Юрыдычная клініка»;
– Музей юрыдычнага факультэта.

Матэрыяльную базу Цэнтра складаюць залы судовых пасяджэнняў (аўд. 214 і 508), а таксама аўд. 104, 215, 407, якія абсталяваны сродкамі для правядзення навуковых мерапрыемстваў і відэаканферэнцый.

На факультэце створана лакальная камп'ютарная сетка, якая аб'ядноўвае каля 125 камп'ютараў. Цэнтр ажыццяўляе яе адміністраванне, мадэрнізацыю і падтрымку ў працоўным стане. Ён вядзе распрацоўку электронных вучэбна-метадычных комплексаў для студэнтаў па юрыдычных і іншых дысцыплінах, а таксама ажыццяўляе ўкараненне і падтрымку сістэмы дыстанцыйнага навучання Moodle.

Супрацоўнікі Цэнтра адукацыйных інавацый абслугоўваюць тэхніку ўсяго факультэта, ажыццяўляюць кансультаванне выкладчыкаў па падрыхтоўцы і афармленні прац на камп'ютары, а таксама арганізуюць інфармацыйнае забеспячэнне супрацоўнікаў факультэта пакетамі прыкладных праграм і інавацыйнымі тэхналогіямі.

Цэнтр уключае тры камп'ютарныя класы з доступам для студэнтаў і лінгафонныя кабінеты. Ён забяспечвае работу абсталявання ў спецыяльных аўдыторыях, дзе праводзяцца навуковыя канферэнцыі, уключаючы канферэнцыі з дыстанцыйным удзелам.

Супрацоўнікі Цэнтра забяспечваюць доступ да агульнаўніверсітэцкай інфармацыйнай сеткі, выхад у інтэрнэт, а таксама размяшчэнне вучэбных матэрыялаў на сайце факультэта. Лакальная кампьютарная сетка дазваляе плённа карыстацца рэсурсамі электронных нарматыўна-правававых баз Рэспублікі Беларусь, іншых краін і міжнароднай супольнасці з усіх камп'ютараў факультэта.

За вядзенне кадравага ўліку і асабістых спраў супрацоўнікаў, а таксама ўліку працоўнага часу і адпачынку адказвае намеснік начальніка Цэнтра С. А. Казлова. Адным з яе абавязкаў з'яўляецца забеспячэнне адпаведнасці ўсіх працэсаў у галіне кадравага ўліку дзеючым нарматыўным прававым актам. У абавязкі С. А. Казловай уваходзіць таксама праца ў якасці тэхнічнага сакратара савета факультэта.

З 2021 г. на юрыдычным факультэце праходзяць навучанне магістранты з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Цэнтр адукацыйных інавацый забяспечвае рэалізацыю вучэбнай праграмы на англійскай мове. Работу з магістрантамі з Кітайскай Народнай Рэспублікі курыруе намеснік начальніка цэнтра Н. В. Мемус.

У 2020 г. у склад Цэнтра ўвайшоў аддзел «Юрыдычная клініка», які забяспечвае практычную падрыхтоўку будучых юрыстаў. Узначальвае яго намеснік начальніка Цэнтра А. І. Федаровіч.

Супрацоўнікі Цэнтра надаюць шмат увагі тэхнічнай дапамозе выкладчыкам у падрыхтоўцы электронных падручнікаў, мультымедыйных дапаможнікаў і прэзентацый лекцый, а таксама кансультуюць студэнтаў і супрацоўнікаў па пытаннях асваення новых форм вучэбнай работы.

Цэнтр прымае ўдзел у арганізацыі ўсіх мерапрыемстваў юрыдычнага факультэта, уключаючы работу прыёмнай камісіі, а таксама ў рэалізацыі розных інавацыйных праектаў.



Цэнтр адукацыйных інавацый. 2024 г.



Цэнтр адукацыйных інавацый. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу I катэгорыі Т. А. Воранава, намеснік начальніка Цэнтра Н. В. Мемус, намеснік начальніка Цэнтра С. А. Казлова, інжынер-праграміст I катэгорыі А. А. Загароўская, інжынер-праграміст I катэгорыі Р. Л. Сантаровіч, вядучы інжынер-праграміст Л. Ю. Васільева, спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу А. І. Пірштук.
*Другі рад (злева направа):* інжынер-праграміст Р. В. Лапуноў, інжынер-электронік I катэгорыі А. В. Старавойтаў, спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу А. А. Марчык, намеснік начальніка Цэнтра – начальнік аддзела «Юрыдычная клініка» А. І. Федаровіч, начальнік Цэнтра Ю. А. Скарына

## Юрыдычная клініка

Юрыдычная клініка БДУ была заснавана ў 2000 г. пры падтрымцы Праграмы развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь і Прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Рэспубліцы Беларусь. Галоўныя мэты праекта – гэта ўдасканаленне адукацыйнага працэсу на юрыдычным факультэце, атрыманне студэнтамі магчымасці прымяніць тэарэтычныя веды і набыць практычныя навыкі аказання юрыдычных паслуг, а таксама аказанне бясплатнай юрыдычнай дапамогі малазабяспечаным катэгорыям грамадзян.

Праз некалькі год дзейнасць Юрыдычнай клінікі была разгледжана на пасяджэнні навуковага савета факультэта, які пастанавіў прасіць рэктара БДУ аб заснаванні на базе праекта «Юрыдычная клініка ў БДУ» арганізацыйнай структуры юрыдычнага факультэта – вучэбнай лабараторыі «Юрыдычная клініка», што і было зроблена загадам рэктара 8 жніўня 2003 г. Першым кіраўніком Юрыдычнай клінікі быў дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт А. А. Войцік. У розныя гады яе ўзначальвалі В. В Ханенка, Л. М. Красніцкая, А. А. Міхасёва, Ю. М. Саўкіна, В. У. Шылко, Т. У. Навумовіч.

У 2020 г. падраздзяленне прайшло рэарганізацыю і стала самастойным аддзелам Цэнтра адукацыйных інавацый юрыдычнага факультэта БДУ.

Зараз намеснікам начальніка Цэнтра – начальнікам аддзела «Юрыдычная клініка» з’яўляецца А. І. Федаровіч, які мае значны практычны вопыт: працаваў у РУП «БелЮрЗабеспячэнне», Беларускай гандлёва-прамысловай палаце і інш.



Начальнік аддзела «Юрыдычная клініка»
А. І. Федаровіч са студэнтамі

Прыняцце студэнтаў у склад Юрыдычнай клінікі ажыццяўляецца па заяве з улікам бягучай паспяховасці, выканання Правіл унутранага распарадку для навучэнцаў БДУ, а таксама грамадзянскай пазіцыі. З мэтай адаптацыі студэнтаў у аснову работы Юрыдычнай клінікі пакладзены механізм настаўніцтва: студэнты старэйшых курсаў навучаюць студэнтаў малодшых курсаў па прынцыпе «роўны вучыць роўнага».

Праца з грамадзянамі ў аддзеле «Юрыдычная клініка» складаецца з вусных і пісьмовых кансультацый, а таксама адказаў на лісты і звароты. Гэта дазваляе

студэнтам атрымаць практычныя навыкі зносін з патэнцыйнымі кліентамі, а таксама складання пісьмовых адказаў. Акрамя таго, праца з грамадзянамі выконвае і сацыяльную функцыю: бясплатнае прававое інфармаванне малазабяспечаных катэгорый грамадзян – інвалідаў, пенсіянераў, навучэнцаў, членаў шматдзетных сямей і інш. – па пытаннях працоўнага, грамадзянскага, сямейнага, жыллёвага, экалагічнага права і права сацыяльнага забеспячэння.



Зала прыёму грамадзян студэнтамі Юрыдычнай клінікі



Студэнты Юрыдычнай клінікі рыхтуюцца да прыёму грамадзян

Значным напрамкам работы аддзела «Юрыдычная клініка» з'яўляецца прафарыентацыйная дзейнасць, якая ўключае правядзенне мерапрыемстваў для патэнцыяльных абітурыентаў, а таксама студэнтаў юрыдычнага факультэта ў мэтах далейшага працаўладкавання (як выязнога характару, так і ў корпусе юрыдычнага факультэта).



Прафарыентацыйнае мерапрыемства для школьнікаў з удзелам студэнтаў Юрыдычнай клінікі

Адным з кірункаў дзейнасці Юрыдычнай клінікі з'яўляецца інфармацыйна-асветніцкая работа. У рамках гэтага напрамку студэнты і супрацоўнікі папулярызуюць прававыя веды (як правіла, з выкарыстаннем інтэрактыўных, гульнявых метадаў) сярод вучняў школ, гімназій, ліцэяў і каледжаў, навучэнцаў устаноў вышэйшай адукацыі, а таксама супрацоўнікаў БДУ і іншых арганізацый.

Навыкі прамоўніцкага майстэрства, уменне кіраваць увагай аўдыторыі, здольнасць растлумачыць складаныя юрыдычныя нормы даступнай мовай – ўсё гэта студэнты-кансультанты могуць выкарыстаць у далейшай практыцы, на навуковых канферэнцыях, пры выступленні ў судзе або кансультаванні грамадзян, якія не маюць юрыдычнай адукацыі.

Студэнты Юрыдычнай клінікі кожны год удзельнічаюць у навуковых канферэнцыях.



Падрыхтоўка пісьмовага адказу грамадзяніну



Пошук нарматыўных прававых актаў для юрыдычнай дапамогі грамадзяніну

Праца ў клініцы дапамагае набыць навыкі, неабходныя сучаснаму юрысту, адчуць адказнасць за свае словы і парады, калі ад іх залежаць лёсы асобных людзей. Аналіз выдуманых спраў не можа параўнацца з працай над рэальнай праблемай чалавека. Такая інавацыйная форма навучання дапамагае студэнтам лепш засвоіць тэарэтычны матэрыял і адчуць значнасць будучай прафесіі.

Па ініцыятыве супрацоўнікаў Юрыдычнай клінікі з 2011 г. у рамках Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды быў створаны спецыялізаваны конкурс па юрыдычнай клінічнай адукацыі, які мае на мэце падрыхтоўку пісьмовага адказу на зварот грамадзяніна. Штогод студэнты – навучэнцы юрыдычных клінік Беларусі маюць магчымасць паспрабаваць свае сілы ў барацьбе за званне найлепшага.



Юрыдычная клініка – суарганізатар пляцоўкі юрыдычнага факультэта на Тыдні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі



Студэнты Юрыдычнай клінікі. 2025 г.

Сёння Юрыдычная клініка – гэта самастойнае падраздзяленне юрыдычнага факультэта БДУ, якое адпавядае ўсім інавацыям сучаснай адукацыі: індывідуальны падыход да кожнага студэнта, практыкаарыентаванасць, паглыбленне ў практычную дзейнасць будучых юрыстаў яшчэ ў час вучобы.

## БІБЛІЯТЭКА ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Гісторыя бібліятэкі юрыдычнага факультэта БДУ бярэ свой пачатак у даваенны час, калі ў 1932 г. Інстытут савецкага будаўніцтва і права быў пераўтвораны ў Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут. Аднак звестак пра гэты перыяд захавалася вельмі мала. Вядома, што багацейшы бібліятэчны фонд Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута забяспечваў інфармацыйныя патрэбы ўсіх юрыдычных навучальных устаноў БССР: у 1941 г. ён налічваў 60 тыс. экзэмпляраў кніг.

У 1941 г. бібліятэку вывезлі ў Германію. Абнаўленне фонду пачалося толькі ў 1944 г. пасля вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і аднаўлення дзейнасці Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута.

З 1 лістапада 1954 г., у адпаведнасці з загадам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР № 1048 «Аб рэарганізацыі Мінскага юрыдычнага інстытута ў юрыдычны факультэт БДУ», бібліятэка юрыдычнага факультэта ўвайшла ў структуру Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.

Сёння бібліятэка юрыдычнага факультэта БДУ не толькі кнігасховішча і пункт выдачы літаратуры, але і сапраўдны сацыякультурны цэнтр. У яе памяшканнях праходзяць шматлікія мерапрыемствы розных узроўняў: ад студэнцкіх пасяджэнняў да міжнародных канферэнцый. Аддзел абслугоўвання юрыдычнага факультэта – адзін са старэйшых у Фундаментальнай бібліятэцы БДУ. Яго супрацоўнікі забяспечваюць вучэбны і навуковы працэсы на юрыдычным факультэце, актыўна ўкараняюць у практыку інавацыйныя тэхналогіі, упэўнена прадстаўляюць сваю дзейнасць у інтэрнэце, ажыццяўляюць інфармацыйную работу з выкладчыкамі і аспірантамі.

Бібліятэчны фонд юрыдычнага факультэта складае больш за 140 тыс. экзэмпляраў выданняў. Акрамя сучасных навуковых, вучэбных, перыядычных і даведачных матэрыялаў, у аддзеле прадстаўлены масівы дарэвалюцыйнай літаратуры. Унікальная калекцыя налічвае больш за 4 тыс. экзэмпляраў выданняў па гісторыі, юрыспрудэнцыі і праве, а таксама мастацкай літаратуры. Яна ахоплівае перыяд з 1772 па 1917 г.

Для чытачоў працуюць абанемент і дзве ўтульныя залы з адкрытым доступам да фонду і магчымасцю працаваць з прававымі базамі дадзеных.

Штогод у бібліятэцы рэгіструюцца больш за 2500 чытачоў, колькасць наведванняў складае каля 27 тыс.

Сёння дзейнасць бібліятэкі юрыдычнага факультэта забяспечваюць сем супрацоўнікаў: І. І. Бойка, Т. У. Вашчонак, А. М. Гагіева, Н. Н. Горбач, В. А. Дубавец, І. У. Забалотная, Л. І. Пархомава. Т. У. Вашчонак і Л. І. Пархомава працуюць у аддзеле больш за 20 гадоў.

У розныя гады бібліятэкай юрыдычнага факультэта кіравалі А. С. Мяркулава (Калабушчанка) і Н. Грыгор'ева.

З 1945 па 1958 г. бібліятэку Мінскага юрыдычнага інстытута і юрыдычнага факультэта БДУ ўзначальвала К. М. Пятосіна. Яна актыўна займалася камплектаваннем бібліятэчнага фонду, які на 15 кастрычніка 1954 г. налічваў 150 833 экзэмпляры.

З 1958 па 1987 г. бібліятэку юрыдычнага факультэта БДУ ўзначальвала В. П. Ананька (Кандрашова). Бібліятэка дасягнула значных поспехаў у павелічэнні асноўных паказчыкаў працы, удасканальваўся даведачна-пошукавы апарат, укараняліся перадавыя метады абслугоўвання чытачоў.

З 1987 па 1998 г. бібліятэку юрыдычнага факультэта ўзначальвала Ф. К. Шарэнда. Яна працавала ў Фундаментальнай бібліятэцы больш за 44 гады. За гэты час адбыліся чатыры пераезды бібліятэкі. Раздзелы сістэматычнага і алфавітнага каталогаў былі пераведзены на табліцы ББК. У 1988 г. быў уведзены адзіны інвентарны нумар для новых кніг фонду бібліятэкі юрыдычнага факультэта і Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.

З 1998 па 2003 г. бібліятэку юрыдычнага факультэта ўзначальвала М. А. Баранава. Актывізавалася інфармацыйная праца аддзела, была наладжана сістэма вывучэння інфармацыйных патрэб факультэта, ажыццяўлялася падрыхтоўка фонду аддзела да пятага пераезду ў новы будынак.

З 2003 па 2019 г. бібліятэку юрыдычнага факультэта ўзначальвала Н. А. Макеева.



К. М. Пятосіна



В. П. Ананька



Ф. К. Шарэнда







М. А. Баранава Н. А. Макеева В. А. Дубавец

У ліпені – жніўні 2005 г. пад кіраўніцтвам Н. А. Макеевай бібліятэка юрыдычнага факультэта ажыццявіла шосты за сваю гісторыю пераезд. Была наладжана работа з дэканатам і кафедрамі юрыдычнага факультэта па розных напрамках дзейнасці, у тым ліку па пытаннях камплектавання кніжнага фонду, ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце са студэнтамі.

З 2019 г. па цяперашні час бібліятэку юрыдычнага факультэта ўзначальвае В. А. Дубавец. Дзейнасць бібліятэкі накіравана на забеспячэнне адукацыйнага працэсу на юрыдычным факультэце, захаванне найлепшых традыцый, пошук інавацыйных форм і метадаў работы, укараненне новых інфармацыйных тэхналогій. З 2020 г. у бібліятэцы пачалося абслугоўванне чытачоў у аўтаматызаваным рэжыме.



Залаты фонд бібліятэкі юрыдычнага факультэта



Зала інфармацыйных рэсурсаў



Абанемент



Калектыў бібліятэкі юрыдычнага факультэта. 2025 г.
*Першы рад (злева направа):* бібліятэкар першай катэгорыі Т. У. Вашчонак,
вядучы бібліятэкар Н. М. Горбач, бібліятэкар першай катэгорыі А. М. Гагіева.
*Другі рад (злева направа):* бібліятэкар другой катэгорыі Л. І. Пархомава,
загадчык аддзела абслугоўвання юрыдычнага факультэта В. А. Дубавец,
вядучы бібліятэкар І. У. Забалотная, бібліятэкар першай катэгорыі І. І. Бойка

## МУЗЕЙ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Музей юрыдычнага факультэта БДУ быў адкрыты 5 мая 1986 г. Гэтай падзеі папярэднічала значная карпатлівая пошукавая праца. Натхняльнікам і арганізатарам стварэння музея стаў доктар юрыдычных навук, прафесар І. І. Гарэлік. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, цяжка паранены ў баях, ён лічыў сваім абавязкам узнавіць імёны выкладчыкаў, студэнтаў і выпускнікоў інстытута, якія загінулі ў ваенныя гады. У гэтай працы актыўна ўдзельнічалі дацэнт кафедры крымінальнага права М. А. Бабій і студэнцкая група «Пошук». Матэрыял збіраўся па крупінках: у архівах, а таксама падчас сустрэч і перапісак з роднымі, блізкімі і знаёмымі герояў. Меў месца і шчаслівы выпадак. Так тэма Вялікай Айчыннай вайны стала першаасновай экспазіцыі музея.

Гісторыя юрыдычнага факультэта непарыўна звязана з лёсам краіны, у якой адбываліся як гераічныя, так і драматычныя падзеі. Гэту гісторыю ў хparty
налагічнай паслядоўнасці раскрываюць стэнды музея.



Экскурсія па музеі юрыдычнага факультэта
на чале з І. І. Гарэлікам



Стэнды ў музеі юрыдычнага факультэта БДУ



Стэнды ў музеі юрыдычнага факультэта БДУ




Стэнд у музеі юрыдычнага факультэта БДУ «Вогненны выпуск»



Стэнды ў музеі юрыдычнага факультэта БДУ



Стэнды ў музеі юрыдычнага факультэта БДУ




Стэнды ў музеі юрыдычнага факультэта БДУ




Стэнды ў музеі юрыдычнага факультэта БДУ

Першы стэнд прысвечаны гісторыі ўзнікнення і пачатку функцыянавання юрыдычнага факультэта ў якасці прававога аддзялення факультэта грамадскіх навук (1921), затым факультэта права і гаспадаркі (1925), факультэта савецкага будаўніцтва і права (1930) і Інстытута савецкага будаўніцтва і права (1931).

На стэндах размешчаны фотаздымкі тых, хто стаяў ля вытокаў юрыдычнага факультэта: першы рэктар БДУ акадэмік У. І. Пічэта, дэкан факультэта грамадскіх навук У. М. Ігнатоўскі, акадэмік М. В. Грэдзінгер, прафесары У. М. Дурдзяеўскі, М. В. Доўнар-Запольскі і інш. На фотаздымках мы бачым старэйшых юрыстаў рэспублікі: прафесараў М. А. Канапліна, Ф. І. Гаўзэ, С. Я. Вольфсана, І. Д. Пярлова, Л. А. Левіна, М. Б. Кроля. З дакументаў даведваемся, што першыя выпускі юрыстаў БДУ адбыліся 21 лютага і 13 ліпеня 1925 г., калі краіна мела патрэбу ў кваліфікаваных кадрах.

Наступны стэнд адлюстроўвае перыяд станаўлення і дзейнасці Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута на працягу 1932–1941 гг. На фотаздымках мы можам бачыць студэнтаў, што скончылі інстытут у 1930-я гг., сярод якіх нарком юстыцыі І. А. Падута – выпускнік 1933 г., Г. А. Церах – галоўны транспартны пракурор СССР, што ўваходзіў у следчую групу па справе Берыі і яго саўдзельнікаў, А. Г. Бондар, што доўгі час працаваў Пракурорам БССР, затым Старшынёй Вярхоўнага Суда БССР, а таксама ўзначальваў кафедру крымінальнага права Мінскага юрыдычнага інстытута. На стэндзе размешчана першае выданне «Ученых записок» Мінскага юрыдычнага інстытута.

Яны змагаліся ў дзеючай арміі. У інстытут не вярнуліся» – такі надпіс мы можам бачыць на наступным стэндзе, а далей прыведзены спіс студэнтаў, якія скончылі інстытут у 1941 г., пад назвай «Вогненны выпуск». Матэрыялы стэнда апавядаюць аб навучэнцах, якія адразу з універсітэцкай аўдыторыі ступілі ў агонь вайны і аддалі жыццё за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы. Прадстаўлены фотаздымкі студэнтаў А. М. Фраловай, М. І. Шафіры, В. Д. Дашкоўскага і іншых, што загінулі смерцю храбрых у гады вайны. Наведвальнікі музея заўсёды затрымліваюцца каля стэнда, дзе змешчаны першыя пісьмы з фронту, напісаныя родным.

Асобны стэнд расказвае аб студэнтах і выкладчыках, якія змагаліся з фашысцкімі акупантамі ў радах народных мсціўцаў. Адным з іх быў легендарны герой-падпольшчык В. С. Жудро. Матэрыялы стэнда апавядаюць таксама аб гераічнай дзейнасці падпольнай арганізацыі выкладчыкаў і студэнтаў юрыдычнага інстытута, у якую ўваходзілі М. Б. Осіпава (выпускніца 1940 г.), выкладчыкі М. Ф. Малаковіч, А. А. Сакалова, студэнты Р. М. Бромберг, М. Сталоў, Н. М. Акуліч і інш.



Мемарыяльны знак у памяць студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Музей валодае матэрыяламі, прысвечанымі дзяржаўным і грамадскім дзеячам, жыццю і дзейнасці выпускнікоў пасляваеннага перыяду, аднаўленню разбураных вучэбных будынкаў, дзейнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Адлюстравана і дзейнасць дэканата, 12 кафедр і лабараторый факультэта.

Менавіта з наведвання музея на юрыдычным факультэце па традыцыі пачынаецца кожны навучальны год. Такая сустрэча з мінулым

дае магчымасць непасрэдна дакрануцца да старонак летапісу факультэта, адчуць дух і атмасферу мінулых гадоў, даведацца аб тых, хто рабіў гэтую гісторыю і пакінуў у ёй свой след. Гэта дае студэнтам дадатковы імпульс, настройвае на сур'ёзныя адказныя адносіны да вучобы і абранай спецыяльнасці, выклікае пачуццё гонару за сваіх папярэднікаў, пачуццё патрыятызму, павагі да сваёй альма-матар, жаданне працягваць і памнажаць добрыя традыцыі і славу факультэта, закладзеныя папярэднімі пакаленнямі студэнтаў і выкладчыкаў.

З часу заснавання музея на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў ім загадвала кандыдат гістарычных навук дацэнт Л. П. Максімава.



Л. П. Максімава падчас экскурсіі для першакурснікаў у Музеі юрыдычнага факультэта. 2012 г.



Л. П. Максімава з кнігай «Огненный выпуск» на святкаванні Дня Перамогі



Віншаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны – выкладчыкаў юрыдычнага факультэта з 65-годдзем Вялікай Перамогі. 2010 г.

Пэўны час у музеі працавала Л. В. Бяляева.

Сёння музей пастаянна папаўняецца звесткамі і камплектуецца новымі матэрыяламі. Тут рэгулярна праходзяць экскурсіі.



# СУЧАСНЫ САСТАЎ ВУЧОНЫХ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА



**Абдурахманаў Аляксандр Амангельдыевіч**

Нарадзіўся 4 чэрвеня 1972 г. у г. Чарджоу (сёння – Туркменабат).

У 1994 г. скончыў Омскую вышэйшую школу міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай Федэрацыі, а ў 1997 г. – дзённую ад'юнктуру Маскоўскага юрыдычнага інстытута названага міністэрства.

З 2016 г. – дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1997 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Административный договор и его использование в деятельности органов внутренних дел».

Узнагароджаны медалямі «За бездакорную службу» II і III ступені.

Аўтар звыш 60 навуковых прац.



**Абламейка Марыя Сяргееўна**

Нарадзілася 11 лютага 1986 г. у г. Мінску.

У 2008 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2011 г. – выкладчык, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2012 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававыя праблемы пабудовы інфармацыйнага грамадства ў Рэспубліцы Беларусь: тэорыя і практыка». Дацэнт (2016).

Узнагароджана Падзякай Універсітэта Бін Дуанг (г. Хашымін, В'етнам, 2018 г.). Праходзіла стажыроўкі ва ўніверсітэтах Кітая, В'етнама.

Адзначана стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам (2020).

Аўтар звыш 100 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій (у суаўтарстве) і 5 вучэбных дапаможнікаў (у суаўтарстве).



**Абраменка Алена Генадзьеўна**

Нарадзілася 13 чэрвеня 1979 г. у г. Клайпедзе.

У 2003 г. скончыла гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

З 2021 г. – дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2010 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Станаўленне і развіццё парламентарызму як палітычнага інстытута ў пераходным грамадстве». Дацэнт (2018).

Аўтар звыш 90 навуковых прац, у тым ліку 2 вучэбных і 7 вучэбна-метадычных дапаможнікаў.



**Антановіч Ніна Арсеньеўна**

Нарадзілася 19 студзеня 1966 г. у г. п. Старобіне Салігорскага раёна Мінскай вобласці.

У 1987 г. з адзнакай скончыла аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэта БДУ.

З 1992 г. працуе на кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ. З 1998 г. займала пасаду дацэнта кафедры паліталогіі, а з 2020 г. – яе загадчыка.

У 1998 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Сістэмны падыход у палітычнай навуцы». Дацэнт (2001). У 2018 г. абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара палітычных навук «Тэорыя і метады аналізу дзяржаўнага кіравання ў палітычнай навуцы». У 2021 г. удастоена гонару ўручэння атэстата прафесара Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам. Падрыхтавала трох кандыдатаў і аднаго доктара палітычных навук.

З 2022 па 2025 г. – старшыня экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па гуманітарных і сацыяльных навуках. З верасня 2025 г. – член Прэзідыума ВАК Рэспублікі Беларусь. Намеснік старшыні навукова-метадычнага савета па палітычных навуках, член рэдакцыйных калегій навуковых часопісаў.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны работнік БДУ. Занесена на Дошку гонару БДУ (2022).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій (2 індывідуальных і 3 у сааўтарстве) і 25 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў (3 – індывідуальных, з якіх 2 прысвоены грыф Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь).



**Арлоўская Алена Іванаўна**

Нарадзілася 6 ліпеня 1957 г. у г. Мінску.

У 1979 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1994 г. – дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1983 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Взаимодействие местных Советов с органами прокуратуры в области обеспечения законности, охраны государственного и общественного порядка, прав граждан». Дацэнт (1994).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджана прызам імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» (2019). Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар звыш 150 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій (у суаўтарстве), 4 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў (у суаўтарстве).

**Арлоўская Людміла Генадзьеўна**



Нарадзілася 24 жніўня 1985 г. у г. Мінску.

У 2008 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2014 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2016 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Производство по уголовным делам по вновь открывшимся обстоятельствам». Дацэнт (2019).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Выказана Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі (2008). Стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (2013). Занесена на Дошку гонару БДУ (2013).

Аўтар звыш 40 навуковых прац.

**Арэхава Кацярына Пятроўна**



Нарадзілася 19 верасня 1983 г. у г. Мазыры Гомельскай вобласці.

У 2006 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2015 г. – дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2014 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Организационно-правовое обеспечение формирования и применения методики экспертного исследования».

Аўтар звыш 70 навуковых прац.

**Багалейка Аліна Міхайлаўна**



Нарадзілася 8 верасня 1982 г.

У 2003 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2006 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2013 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Канстытуцыйна-прававая адказнасць (па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь)». Дацэнт (2016).

Аўтар звыш 50 навуковых прац.



**Бакун Ганна Станіславаўна**

Нарадзілася 31 студзеня 1985 г. у г. Свіслачы Гродзенскай вобласці.

У 2007 г. з адзнакай скончыла Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, а ў 2010 г. – Інстытут журналістыкі БДУ.

З 2007 па 2017 г. – выкладчык-стажор, выкладчык, старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Інстытута кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. З 2019 па 2020 г. – дацэнт кафедры канстытуцыйнага і адміністрацыйнага права названага інстытута.

З 2013 г. – дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве). З 2020 па 2022 г. – намеснік дэкана па вучэбна-выхаваўчай рабоце. З 2022 г. – прарэктар па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце БДУ.

У 2017 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Канстытуцыйна-прававое рэгуляванне забеспячэння рэалізацыі свабоды веравызнання рэлігійнымі арганізацыямі ў Рэспубліцы Беларусь». Дацэнт (2018).

Аўтар звыш 150 навуковых прац.



**Балашэнка Сяргей Аляксандравіч**

Нарадзіўся 15 жніўня 1962 г. у в. Стайкі Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці.

У 1989 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1989 па 1991 г. – выкладчык кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, а з 1991 г. – выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2004 па 2017 г. – загадчык, а з 2017 г. – прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права.

З 1999 па 2002 г. – дэкан факультэта кіравання і сацыяльных тэхналогій, а з 2002 па 2020 г. – дэкан юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1993 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дзяржаўнае кіраванне ў галіне аховы і выкарыстання лясоў», а ў 2001 г. – доктарскую дысертацыю «Дзяржаўнае кіраванне ў галіне аховы навакольнага асяроддзя». Прафесар (2007). Падрыхтаваў сем кандыдатаў і трох дактароў юрыдычных навук.

Старшыня савета па абароне дысертацый пры БДУ. Галоўны рэдактар часопіса «Журнал Белорусского государственного университета. Право».

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2013). Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2021).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 15 кніг, 1 манаграфіі, а таксама 9 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

**Бандарэнка Наталля Леанідаўна**



Нарадзілася 13 лютага 1973 г. у г. Мінску.

У 1994 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1994 па 2010 г. – асістэнт кафедры, старшы выкладчык, дацэнт, намеснік дэкана факультэта права Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. З 2010 па 2012 г. – загадчык кафедры грамадзянскага і працоўнага права Мінскага інстытута кіравання. З 2012 па 2016 г. – прафесар Міжнароднага ўніверсітэта «МИТСО». З 2016 па 2018 г. – прафесар кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці юрыдычнага факультэта БДУ. З 2018 па 2020 г. – прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 2021 па 2022 г. – загадчык кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, а з 2022 г. – загадчык кафедры гаспадарчага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2002 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прынцып свабоды дамовы ў грамадзянскім праве», а ў 2010 г. – доктарскую дысертацыю «Прынцыпы грамадзянскага права Рэспублікі Беларусь, іх рэалізацыя ў нарматворчай і правапрымяняльнай дзейнасці». Прафесар (2012). Падрыхтавала шэсць кандыдатаў юрыдычных навук.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 400 навуковых і вучэбна-метадычных прац, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у тым ліку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Баркоў Аляксандр Уладзіміравіч**



Нарадзіўся 21 сакавіка 1947 г. у п. Леніна (Калодзішчы) Мінскага раёна Мінскай вобласці.

У 1972 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

Працаваў памочнікам пракурора Савецкага, а потым Першамайскага раёна г. Мінска. З 1972 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ, а з 1988 па 2005 г. – яе загадчык. З 2006 па 2018 г. – загадчык кафедры судовай дзейнасці, намеснік дырэктара Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ. З 2019 г. – прафесар кафедры судовай дзейнасці названага інстытута, прафесар кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве).

У 1977 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Крымінальна-прававыя сродкі, якія стымулююць раскрыццё злачынстваў». Прафесар (2005). Падрыхтаваў восем кандыдатаў юрыдычных навук.

Член навукова-кансультатыўных саветаў пры Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве, пры Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь і Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Уваходзіць у групу экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Уваходзіў у склад Прававога кансультатыўнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. З 2005 па 2020 г. – член Камісіі па пытаннях памілавання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

На працягу шматлікіх гадоў з’яўляўся вучоным сакратаром савета па абароне доктарскіх дысертацый пры БДУ. З 2014 па 2016 г. – член экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па юрыдычных навуках.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2000). Заслужаны работнік БДУ. Ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій, 9 падручнікаў і шэрага вучэбных дапаможнікаў. З’яўляецца рэдактарам і аўтарам 5 каментарыяў да Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (1989, 2003, 2007, 2010, 2019).



**Бібіла Валянціна Мікалаеўна**

Нарадзілася 6 жніўня 1949 г. у Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці.

У 1975 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1978 г. – выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду БДУ.

У 1979 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Компетенция суда в стадии исполнения приговора», а ў 1996 г. – доктарскую дысертацыю «Социально-правовые основы правосудия по уголовным делам». Прафесар (2003).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі» (2020). Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар звыш 350 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій, 3 падручнікаў і 5 вучэбных дапаможнікаў.



**Бодак Ала Мікалаеўна**

Нарадзілася 30 жніўня 1967 г. у г. Роўне.

У 1989 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ, а ў 2002 г. – Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 2005 г. – дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

З 1989 па 2016 г. працавала ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь на розных пасадах: ад старшага кансультанта ўпраўлення законапраектных работ да намесніка Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь. З 2016 па 2019 г. – Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.

З 2019 г. – суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

У 2005 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Канстытуцыйна-прававыя праблемы нарматворчай дзейнасці органаў выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2009).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Прысвоены вышэйшы кваліфікацыйны клас суддзі.

Аўтар звыш 50 навуковых прац.

**Брытава Таццяна Канстанцінаўна**



Нарадзілася 6 ліпеня 1962 г. у г. Арэнбургу.

У 1983 г. скончыла Ленінградскі фінансава-эканамічны інстытут імя М. А. Узнясенскага.

З 2022 г. – дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1988 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Правовые проблемы продвижения рабочих и служащих в СССР». Дацэнт (2003).

Аўтар звыш 90 навуковых прац.

**Бяляўцава Дзіна Уладзіміраўна**



Нарадзілася 15 ліпеня 1968 г. у г. Слуцку Мінскай вобласці.

У 1990 г. з адзнакай скончыла гістарычны факультэт БДУ.

З 2019 г. – дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ. З 2024 г. – начальнік Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ.

У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Тэарэтычныя аспекты вывучэння рэгіянальных асаблівасцей палітычнай свядомасці сучаснага беларускага грамадства». Дацэнт (2008). Падрыхтавала аднаго кандыдата палітычных навук.

Аўтар звыш 130 навуковых прац, у тым ліку 2 калектыўных манаграфій і 4 вучэбных дапаможнікаў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Валюшка-Орса Наталля Віктараўна**



Нарадзілася 22 жніўня 1982 г. у г. Мінску.

У 2004 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2010 па 2015 г. – дацэнт кафедры прававых дысцыплін Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ. З 2015 г. – дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2008 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Канстытуцыйна-прававы статус іншаземцаў і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь». Дацэнт (2017).

Аўтар звыш 40 навуковых прац.



**Васілевіч Рыгор Аляксеевіч**

Нарадзіўся 13 лютага 1955 г. у г. Мінску.

Працоўную дзейнасць пачынаў рабочым. Праходзіў тэрміновую службу ў радах Узброеных Сіл СССР.

У 1980 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1983 па 1986 г. – выкладчык юрыдычнага факультэта БДУ. З 1986 г. – намеснік, а з 1989 па 1994 г. – загадчык юрыдычнага аддзела Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. З 1994 г. – суддзя, а з 1996 па 2008 г. – Старшыня Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь. З 2008 па 2011 г. – Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь. Мае класны чын дзяржаўнага саветніка юстыцыі 1-га класа і вышэйшы кваліфікацыйны клас суддзі.

З моманту ўтварэння ў 1990 г. Канстытуцыйнай камісіі і да 1994 г. з'яўляўся яе членам, намеснікам кіраўніка працоўнай групы па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

З 2011 г. працуе на юрыдычным факультэце БДУ.

У 1984 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Працоўны дагавор з працаўнікамі гандлю», а ў 1994 г. – доктарскую дысертацыю «Праблемы заканатворчай дзейнасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь». Прафесар (1998). Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2017). Падрыхтаваў 24 кандыдаты і 3 дактароў юрыдычных навук.

За плённую працу над праектам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і актыўны ўдзел у падрыхтоўцы новага беларускага заканадаўства прысвоена ганаровае званне «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь» (1994). Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты (2012). Ганаровы прафесар Інстытута заканадаўства і параўнальнага правазнаўства пры Урадзе Расійскай Федэрацыі (2016). Ганаровы доктар Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (2017). Працы Р. А. Васілевіча апублікаваны ў Расіі, Турцыі, Балгарыі, Італіі, Францыі, Нідэрландах, Арменіі і іншых краінах. Прэзідэнтам Казахстана ўзнагароджаны юбілейным медалём «Да дзесяцігоддзя Канстытуцыі Рэспублікі Казахстан» (2005). Узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі», нагрудным знакам «Ганаровы пракурор краін СНД» (2016), ордэнам Пашаны (2021). Мае некалькі дзясяткаў ведамасных медалёў, а таксама нагрудных знакаў і ганаровых грамат.

Вядзе актыўную навуковую і грамадскую дзейнасць. Рэгулярна выступае з дакладамі на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях як у Рэспубліцы Беларусь, так і за мяжой.

Міжнародным біяграфічным цэнтрам (Кембрыдж, Велікабрытанія) уключаны ў спіс імён найвыдатнейшых людзей XX і XXI стст.

У 2021–2022 гг. уваходзіў у склад Канстытуцыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

Аўтар звыш 130 кніг і манаграфій, у тым ліку 50 індывідуальных, некалькіх соцень навуковых артыкулаў, больш за 50 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў (усяго больш за 1500 публікацый).

**Васілевіч Сяргей Рыгоравіч**



Нарадзіўся 28 чэрвеня 1984 г. у г. Мінску.

У 2007 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2007 г. – памочнік пракурора Маскоўскага раёна г. Мінска. Затым працаваў у апараце пракуратуры г. Мінска, а да 2024 г. – у Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь. З 2011 па 2024 г. – дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве).

У 2010 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Тэорыя і практыка адміністрацыйных спагнанняў матэрыяльнага характару па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2015). Старшы саветнік юстыцыі.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.

**Вярэнчыкаў Ігар Раманавіч**



Нарадзіўся 23 лютага 1960 г. у г. Гомелі.

У 1986 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1989 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ. Адначасова з 1997 па 2000 г. – намеснік прарэктара па вучэбна-выхаваўчай і сацыяльнай рабоце БДУ, дырэктар студэнцкага гарадка БДУ. З 2000 па 2014 г. – дырэктар Юрыдычнага каледжа БДУ. З 2014 па 2019 г. – старшыня прафсаюзнага камітэта БДУ.

У 1990 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Профилактическая деятельность следователя (криминалистический аспект)». Дацэнт (1999).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, а таксама «За працоўную доблесць». Выдатнік адукацыі. Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар звыш 60 навуковых прац.

**Гадуноў Валерый Мікалаевіч**



(1954–2022)

Нарадзіўся 5 лютага 1954 г. у в. Садовай Клецкага раёна Мінскай вобласці.

У 1976 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1979 па 2022 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры грамадзянскага і сямейнага (з 1991 г. – грамадзянскага) права юрыдычнага факультэта БДУ. Адначасова з 1987 па 1989 г. – намеснік дэкана завочнага факультэта, а з 1989 па 2002 г. – дэкан юрыдычнага факультэта БДУ, а з 1993 па 2017 г. – загадчык кафедры грамадзянскага права.

З 1998 па 2002 г. на грамадскіх пачатках выконваў абавязкі дырэктара Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ, са студзеня 2002 г. з'яўляўся яго дырэктарам.

У 1980 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававыя пытанні арганізацыі пастаўкі прадукцыі па прамых доўгатэрміновых гаспадарчых сувязях»,

а ў 2004 г. – доктарскую дысертацыю «Прававыя сродкі забеспячэння дзяржаўных патрэб у таварах, работах і паслугах». Прафесар (2006). Падрыхтаваў 10 кандыдатаў і 1 доктара юрыдычных навук.

Пры актыўным удзеле В. М. Гадунова ў БДУ быў адкрыты Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі, а таксама Юрыдычны каледж.

Прымаў удзел у падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., праектаў Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь і іншых заканадаўчых актаў. З 1996 па 2011 г. – намеснік старшыні і член Прававога кансультатыўнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. З'яўляўся членам навукова-кансультатыўных саветаў пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь і Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, арбітрам Міжнароднага цэнтра па ўрэгуляванні спрэчак пры Эканамічным Судзе Садружнасці Незалежных Дзяржаў, арбітрам Міжнароднага арбітражнага суда пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце і Міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда «Палата арбітраў пры Саюзе юрыстаў». Уваходзіў у склад Міжведамаснага савета па праблемах дысертацыйных даследаванняў у галіне права. З 2005 па 2013 г. – вучоны сакратар і намеснік старшыні экспертнага савета па юрыдычных навуках ВАК Рэспублікі Беларусь. З 2013 г. быў членам яе Прэзідыума. З'яўляўся старшынёй і членам рэдакцыйных саветаў, калегій шэрага часопісаў і навуковых зборнікаў.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі» (2011).

Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017).

Аўтар звыш 200 навуковых прац.



**Гарадзецкая Марына Аляксандраўна**

Нарадзілася 16 красавіка 1987 г.

У 2009 г. скончыла Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, у 2013 г. – аспірантуру юрыдычнага факультэта БДУ.

З 2023 г. – дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2020 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне спецыяльнага папярэджання злачынстваў у Рэспубліцы Беларусь». Дацэнт (2022).

Аўтар звыш 60 навуковых прац.



**Голубева Людміла Леанідаўна**

Нарадзілася 8 лістапада 1966 г. у в. Княгінін Мядзельскага раёна Мінскай вобласці.

У 1993 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1999 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2005 па 2008 г. – загадчык кафедры агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін Юрыдычнага каледжа БДУ (па сумяшчальніцтве), а з 2022 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2000 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Наследование имущества по законодательству Великого княжества Литовского». Дацэнт (2004).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі і 3 вучэбных дапаможнікаў.

**Грунтоў Ігар Алегавіч**



Нарадзіўся 17 мая 1950 г. у г. Віцебску.

У 1975 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1979 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2006 па 2019 г. – загадчык названай кафедры.

У 1985 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Адміністрацыйная прэюдыцыя ў крымінальным праве», а ў 2015 г. – доктарскую дысертацыю «Прынцып асабістай віноўнай адказнасці ў крымінальным заканадаўстве». Прафесар (2017). Падрыхтаваў трох кандыдатаў юрыдычных навук.

З'яўляецца членам навукова-кансультатыўных саветаў пры Камісіі па заканадаўстве Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь, Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь і Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З 2015 па 2023 г. – член экспертнага савета Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь па юрыдычных навуках.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2020).

Аўтар 215 навуковых прац, у тым ліку 4 індывідуальных і 11 калектыўных манаграфій, 2 падручнікаў і 5 вучэбных дапаможнікаў.

**Грыгаровіч Васілій Леанідавіч**



Нарадзіўся 20 лютага 1968 г. у г. Мінску.

У 1992 г. скончыў факультэт радыёфізікі і электронікі БДУ, а ў 2000 г. з адзнакай – Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

З 2017 г. – дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2005 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Теоретико-прикладные аспекты использования голографии в борьбе с преступностью».

Аўтар звыш 250 навуковых прац.



**Гур’ева Алена Аляксандраўна**

Нарадзілася 4 сакавіка 1986 г. у г. Мінску.

У 2009 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2019 г. – дацэнт кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры гаспадарчага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве).

У 2017 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Гісторыя інстытута адвакатуры Беларусі (XVI–XVIII стст.)».

Аўтар звыш 60 навуковых прац.



**Гучок Аляксандр Яўгенавіч**

Нарадзіўся 30 кастрычніка 1965 г. у г. Мінску.

У 1988 г. скончыў энергетычны факультэт Беларускага палітэхнічнага інстытута, а ў 1997 г. – юрыдычны факультэт БДУ.

З 1995 па 2004 г. – загадчык лабараторыі кафедры крыміналістыкі, выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ. З 2004 па 2016 г. служыў у органах пракуратуры на пасадах пракурора аддзела Пракуратуры Рэспублікі Беларусь і намесніка дырэктара Навукова-практычнага цэнтра праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь. У 2016 г. прызначаны на пасаду Намесніка Старшыні ВАК Рэспублікі Беларусь, а з 2018 г. з’яўляецца Старшынёй названай камісіі.

У 1999 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Применение метода криминалистического матрицирования при расследовании преступлений». Дацэнт. У 2014 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Криминалистическое учение о материальной структуре преступления».

Аўтар звыш 150 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій, 7 вучэбных, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і даведачных выданняў (у суаўтарстве), а таксама 12 патэнтаў на вынаходствы і карысныя мадэлі тэхніка-крыміналістычных сродкаў.



**Гуцка Паліна Аляксандраўна**

Нарадзілася 26 мая 1989 г. у г. Мінску.

У 2012 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2016 г. – выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2020 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне прафесійнага стажу». Дацэнт (2022).

Узнагароджана дыпломам лаўрэата конкурсу на найлепшую дысертацыю 2020 г. у намінацыі «Сацыяльна-эканамічныя і грамадскія навукі» (2021).

Аўтар звыш 60 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі.

**Дабрадзей Анатоль Іванавіч**



Нарадзіўся 3 мая 1968 г. у п. Мікашэвічы Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці.

У 1993 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2014 г. – дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2005 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Уголовно-правовая оценка получения взятки».

Аўтар 20 навуковых прац.

**Далгарукаў Сяргей Валер'евіч**



Нарадзіўся 27 снежня 1952 г. у г. Гродне.

У 1975 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1975 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ. З 1988 па 1993 г. – загадчык названай кафедры.

У 1986 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Принцип неприкосновенности личности в уголовном процессе». Дацэнт (1988).

Аўтар шэрага навуковых прац.

**Данілевіч Анатоль Аляксандравіч**



Нарадзіўся 25 жніўня 1951 г. у в. Янушкевічы Лагойскага раёна Мінскай вобласці.

У 1974 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1974 па 1975 г. – памочнік дэкана юрыдычнага факультэта БДУ. З 1975 г. – выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ. З 1992 па 2021 г. – намеснік дэкана юрыдычнага факультэта па завочнай форме навучання для асоб, якія атрымліваюць другую вышэйшую адукацыю. У гэты перыяд уваходзіў у склад савета БДУ. З 1994 г. – загадчык кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1982 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Основы теории и профессиональной культуры судебных прений». Прафесар (2006).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны работнік БДУ. Выказана Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2021). Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2000). Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты ў намінацыі «Адукацыя» (2018). Лаўрэат прэміі «Феміда» (2022). Быў занесены на Дошку гонару БДУ (2023).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфій (у суаўтарстве), 4 падручнікаў (у суаўтарстве) і 11 вучэбных дапаможнікаў (у суаўтарстве).



**Дзенісюк Ніна Паўлаўна**

Нарадзілася 30 кастрычніка 1948 г. у в. Чамярын Пінскага раёна Брэсцкай вобласці.

У 1971 г. з адзнакай скончыла філалагічны факультэт БДУ.

З 1976 г. – выкладчык, дацэнт кафедры навуковага камунізму БДУ, дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ. З 2012 па 2022 г. – старшыня прафбюро супрацоўнікаў названага факультэта.

У 1977 г. абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук «Народныя традыцыі, звычаі і іх роля ў фарміраванні асобы». Дацэнт (1980). Падрыхтавала 12 кандыдатаў філасофскіх і палітычных навук.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар 140 навуковых прац, у тым ліку шэрага манаграфій, брашур, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.



**Доўгань Алена Фёдараўна**

Нарадзілася 1 снежня 1979 г. у г. Магілёве.

У 2001 г. з адзнакай скончыла факультэт міжнародных адносін БДУ.

З 2004 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры міжнароднага права факультэта міжнародных адносін БДУ, а з 2019 па 2022 г. – прафесар кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ.

З 2024 г. – старшыня экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь.

У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прынцып неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы дзяржаў і яго трактоўка ў сучасным міжнародным праве». Дацэнт (2008). У 2014 г. абараніла доктарскую дысертацыю «Рэгіянальны механізм сістэмы калектыўнай бяспекі ў сучасным міжнародным праве». Прафесар (2018).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 3 індывідуальных і 21 калектыўнай манаграфіі, а таксама 6 вучэбных дапаможнікаў.



**Доўнар Таісія Іванаўна**

Нарадзілася 15 кастрычніка 1944 г. у в. Шацк Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

У 1973 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1977 г. – выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1986 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Пераемнасць у канстытуцыйным будаўніцтве Беларускай ССР», а ў 1997 г. – доктарскую дысертацыю «Развіццё агульназемскага права Беларусі ў XV–XVI ст.ст.». (першая доктарская дысертацыя, якая была абаронена на беларускай мове). Прафесар (1999). Падрыхтавала дзевяць кандыдатаў і аднаго доктара юрыдычных навук. З пачатку XXI ст. – кіраўнік навуковай школы гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Доўгі перыяд з’яўлялася сакратаром савета юрыдычнага факультэта БДУ, членам двух саветаў па абароне доктарскіх дысертацый па юрыдычных навуках і інш. Зараз уваходзіць у склад савета па абароне доктарскіх дысертацый.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджана прызам імя У. Д. Спасовіча Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (2003, 2014, 2019), медалём Францыска Скарыны (2020). Лаўрэат прэміі БДУ імя У. І. Пічэты (2010). Заслужаны работнік БДУ. Ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Аўтар звыш 400 навуковых прац, у тым ліку 11 манаграфій, а таксама больш за 30 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў. Аўтар першага падручніка «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2014, 2021, 2023).

**Дубко Міхаіл Анатольевіч**



Нарадзіўся 4 лютага 1987 г. у г. Оршы Віцебскай вобласці.

У 2010 г. скончыў юрыдычны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а ў 2014 г. – аспірантуру юрыдычнага факультэта БДУ.

З 2019 г. – дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2018 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Неправамернае прысвайванне камп’ютарнай інфармацыі як злачынства супраць інфармацыйнай бяспекі».

Аўтар звыш 60 навуковых прац.

**Емельяновіч Вольга Віктараўна**



Нарадзілася 22 красавіка 1982 г. у г. Мінску.

У 2018 г. скончыла аспірантуру факультэта міжнародных адносін БДУ.

З 2019 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ. З 2023 г. – намеснік дэкана па міжнародным супрацоўніцтве і інтэрнацыяналізацыі адукацыі (на грамадскіх асновах).

У 2024 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Міжнародна-прававое процідзеянне гандлю жанчынамі».

Аўтар звыш 60 навуковых прац.

**Жлоба Альберт Анатольевіч**



Нарадзіўся 20 верасня 1980 г. у г. Мінску.

У 2002 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2002 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2006 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававы рэжым нацыянальных паркаў». Дацэнт (2010).

Аўтар звыш 80 навуковых прац.



**Зайцава Людміла Львоўна**

Нарадзілася 30 сакавіка 1957 г. у г. Мінску.

У 1979 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1980 г. – выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ. З 2005 г. – загадчык кафедры пракурорскай дзейнасці Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ.

У 1986 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Вярхоўны Суд БССР як суд першай інстанцыі па крымінальных справах». Дацэнт (1990). Падрыхтавала чатырох кандыдатаў юрыдычных навук.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны работнік БДУ. Выдатнік адукацыі.

Аўтар звыш 300 навуковых прац.



**Здрок Аксана Мікалаеўна**

Нарадзілася 3 ліпеня 1973 г. у г. Данецку.

У 1995 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ, а ў 2013 г. – факультэт перападрыхтоўкі дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «кіраванне персаналам».

З 1998 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2008 па 2016 г. – начальнік аддзела даследаванняў у сацыяльнай сферы Інстытута прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь. З 2016 па 2019 г. – загадчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2019 па 2022 г. – прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях БДУ. З 2022 г. – дырэктар Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ, прафесар кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1999 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Абарона правоў і інтарэсаў непаўналетніх у грамадзянскім судаводстве», а ў 2019 г. – доктарскую дысертацыю «Прымірэнчыя працэдуры ў цывілістычным працэсе». Прафесар (2023). Падрыхтавала аднаго кандыдата юрыдычных навук.

Ажыццяўляе актыўную грамадскую дзейнасць па развіцці медыяцыі ў Рэспубліцы Беларусь. З 2013 па 2017 г. – член савета і трэнер навучальна-практычнай установы «Цэнтр “Медыяцыя і права”» пры ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў». У 2017 г. атрымала грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у адукацыі на распрацоўку першага ў краіне навучальнага дапаможніка па медыяцыі. У 2018 г. прызначана намеснікам дырэктара Міжнароднага навукова-адукацыйнага цэнтра медыяцыі і трацейскіх працэдур юрыдычнага факультэта БДУ.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджана вышэйшай юрыдычнай прэміяй «Феміда» (2010). Лаўрэат конкурсу на прыз імя У. Д. Спасовіча (2019). Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты (2019).

Аўтар 160 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфій.

**Землякоў Леанід Яўгенавіч**



Нарадзіўся 2 верасня 1939 г. у г. Шылцы Чыцінскай вобласці.

У 1968 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ.

З 2005 г. – прафесар кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1972 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Пытанні марксісцкай этыкі ў Савецкай Беларусі 20-х гадоў», а ў 2000 г. – доктарскую дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара палітычных навук «Дзяржаўна-канфесійныя адносіны ў Рэспубліцы Беларусь». Прафесар (2003). Падрыхтаваў пяць кандыдатаў палітычных навук.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджаны медалём «Ветэран працы».

Аўтар звыш 260 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфій і больш за 20 вучэбных дапаможнікаў.

**Ільіна Алена Міхайлаўна**



Нарадзілася 18 сакавіка 1981 г. у г. Мінску.

У 2003 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2006 г. – выкладчык, дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2007 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Фарміраванне і рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у сферы інфарматызацыі». Дацэнт (2010).

Двойчы лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных студэнтаў (2000, 2002).

Адзначана стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам (2012).

Мае шэраг узнагарод БДУ.

Аўтар звыш 80 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі і 5 вучэбных дапаможнікаў (у суаўтарстве).

**Кадурын Аляксей Юр'евіч**



Нарадзіўся 15 лютага 1987 г. у г. Мінску.

У 2010 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2011 па 2022 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці юрыдычнага факультэта БДУ. З 2022 г. – дацэнт кафедры права інтэлектуальнай уласнасці названага факультэта.

У 2017 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Злоўжыванне грамадзянскім правам».

Аўтар звыш 25 навуковых прац.



**Казак Святлана Валер’еўна**

Нарадзілася 29 лістапада 1974 г. у в. Шыпы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

У 1996 г. скончыла Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

З 2022 г. – дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Тэарэтыка-прававыя і арганізацыйныя аспекты выканання пакаранняў, не звязаных з ізаляцыяй асуджаных ад грамадства». Дацэнт (2009).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў.

Аўтар звыш 70 навуковых прац.



**Калінін Сяргей Артуравіч**

Нарадзіўся 7 лістапада 1974 г. у г. Гарадку Віцебскай вобласці.

У 1996 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1996 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2008 па 2021 г. – загадчык названай кафедры. З 2021 г. – намеснік дэкана юрыдычнага факультэта БДУ па навуковай рабоце.

У 2001 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Праблемы рэформы сістэмы права Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2003). Падрыхтаваў трох кандыдатаў юрыдычных навук. Кіраўнік навуковай школы кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права «Канцэптуальна-тэарэтычныя заканамернасці развіцця і функцыянавання дзяржавы і права, прававое заканадаўства і заканамернасці яго ўдасканалення» (пераемнік С. Р. Драбязкі і А. М. Абрамовіча).

Намеснік старшыні журы заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Грамадазнаўства» (2005–2019). Намеснік старшыні аргкамітэта Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (2009). Выказана Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2015). Заслужаны работнік БДУ. Лаўрэат вышэйшай юрыдычнай прэміі «Феміда» ў намінацыі «Юрыдычная адукацыя і прававая навука» (2024).

Аўтар звыш 280 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі і 1 падручніка (у суаўтарстве).



**Калядка Іван Мікалаевіч**

Нарадзіўся 12 студзеня 1952 г. у в. Казловічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці.

У 1974 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1977 г. – выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 1994 па 2016 г. – загадчык, а з 2021 г. – навуковы кансультант названай кафедры.

У 1986 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Судаводства па скаргах на пастановы па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях». Дацэнт (1989). Падрыхтаваў восем кандыдатаў юрыдычных навук.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар звыш 200 навуковых прац.

**Камянкоў Віктар Сяргеевіч**



Нарадзіўся 29 сакавіка ў 1956 г. у в. Мокравічы Магілёўскай вобласці.

У 1978 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2004 па 2020 г. – загадчык кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці юрыдычнага факультэта БДУ. З 2020 г. – навуковы кансультант кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры гаспадарчага права названага факультэта. Узначальвае Міжнародны навукова-адукацыйны цэнтр медыяцыі і трацейскіх працэдур юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1990 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Удзел пракурора ў разглядзе судамі грамадзянскіх спраў», а ў 2004 г. – доктарскую дысертацыю «Прававыя гарантыі абароны інтарэсаў юрыдычных асоб і грамадзян у гаспадарчым (арбітражным) працэсе». Прафесар (2004). Падрыхтаваў 10 кандыдатаў і 2 дактароў юрыдычных навук.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (1994).

Аўтар звыш 700 навуковых прац, у тым ліку 10 манаграфій і 10 вучэбных дапаможнікаў.

**Votes**

**Кананевіч Юрый Рыгоравіч**



Нарадзіўся 23 ліпеня 1978 г. у г. Мінску.

У 2021 г. скончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 2021 г. працуе на кафедры гаспадарчага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2024 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Гаспадарчая дзейнасць як аб’ект прававога рэгулявання».

Аўтар звыш 140 навуковых прац.

**Кандратовіч Наталля Міхайлаўна**



Нарадзілася 1 студзеня 1967 г. у г. Заслаўі Мінскага раёна Мінскай вобласці.

У 1989 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1994 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1995 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Суб’екты заканатворчага працэсу». Дацэнт (2001).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 180 навуковых прац, у тым ліку 7 манаграфій, а таксама 17 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.



**Канюк Аляксандр Уладзіміравіч**

Нарадзіўся 11 ліпеня 1960 г. у г. Гродне.

З 1984 г. працаваў на розных пасадах у ваенных судовых інстанцыях: служыў судовым сакратаром у Кызыл-Ардынскай вобласці ў Казахстане (1984–1985). У 1985–1987 гг. праходзіў службу ў Рэспубліцы Афганістан. З 1987 г. – член ваеннага трыбунала Мінскага гарнізона. З 1993 па 1997 г. – суддзя Беларускага ваеннага суда. З 1997 г. – старшыня Мінскага міжгарнізоннага ваеннага суда. З 2006 па 2009 г. – суддзя і старшыня Беларускага ваеннага суда. З 2009 па 20 верасня 2011 г. – намеснік старшыні, старшыня Ваеннай калегіі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

З 2011 па 2020 г. – Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь.

З 2020 па 2025 г. – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Арменія.

З 2025 г. – прафесар кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных сілах СССР» III ступені, а таксама медалямі.

Аўтар звыш 40 навуковых прац.



**Карамышаў Аляксандр Уладзіміравіч**

Нарадзіўся 21 верасня 1963 г. у в. Чорнай Упораўскага раёна.

У 1986 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1989 г. – выкладчык, дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1996 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававыя праблемы мясцовага самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь».

Аўтар каля 50 навуковых прац.



**Караткевіч Марыя Паўлаўна**

Нарадзілася 2 мая 1981 г. у г. Гомелі.

У 2003 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

З 2009 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2008 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Заключэнне і спыненне шлюбу з замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянстваў Рэспубліцы Беларусь». Дацэнт (2012).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.



**Карповіч Наталля Аляксандраўна**

Нарадзілася 20 сакавіка 1967 г. у в. Дакудава Лідскага раёна Гродзенскай вобласці.

У 1989 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ, а ў 1992 г. – аспірантуру Інстытута філасофіі і права НАН Беларусі.

З 1992 па 2014 г. працавала ў Парламенце Рэспублікі Беларусь, у тым ліку з 2001 г. – на пасадзе начальніка Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Прымала ўдзел у падрыхтоўцы і прыняцці Парламентам Рэспублікі Беларусь шэрага кодэксаў і законаў. З 2005 г. – дацэнт, прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве). З 2014 г. – суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, а з 2017 г. – Намеснік Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. Дэлегат Усебеларускага народнага сходу.

У 2000 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Рэалізацыя экалагічнай функцыі дзяржавы ў заканадаўчай дзейнасці Парламента Рэспублікі Беларусь», а ў 2012 г. – доктарскую дысертацыю «Тэарэтычныя праблемы рэалізацыі экалагічнай функцыі дзяржавы». Прафесар (2020). Падрыхтавала двух кандыдатаў юрыдычных навук.

У 2021–2022 гг. уваходзіла ў склад Канстытуцыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

Намеснік старшыні Камісіі па пытаннях грамадзянства пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, галоўны рэдактар часопіса «Веснік Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь», Намеснік старшыні Рэспубліканскага савета суддзяў, член Цэнтральнага савета Саюза юрыстаў Рэспублікі Беларусь. З 2015 па 2023 г. – член экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі» (2004), ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, іншых дзяржаўных органаў і арганізацый, а таксама медалём Міжпарламенцкай Асамблеі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).

Аўтар звыш 140 навуковых прац.



**Кісялёва Таццяна Маратаўна**

Нарадзілася 11 мая 1977 г. у г. Мінску.

У 2011 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2014 г. – выкладчык, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2015 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Канстытуцыйныя абавязкі дзяржавы і грамадзян у сферы інфармацыйных адносін». Дацэнт (2019).

Аўтар звыш 90 навуковых прац.



**Красікаў Уладзімір Сяргеевіч**

Нарадзіўся 6 студзеня 1965 г. у г. Глыбокім Віцебскай вобласці.

У 1991 г. скончыў Мінскую Вышэйшую школу Міністэрства ўнутраных спраў СССР.

З 2016 г. – дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ

У 2005 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Теоретико-прикладные аспекты выявления и предупреждения правонарушений в учреждениях уголовно-исполнительной системы».

Узнагароджаны медалямі «За бездакорную службу» I, II і III ступені.

Аўтар звыш 140 навуковых прац.



**Краснабаева Людміла Аляксандраўна**

Нарадзілася 29 красавіка 1975 г. у в. Мілашэвічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

У 1998 г. скончыла юрыдычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 2018 г. – дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ. З 2021 па 2022 г. – намеснік дэкана па вучэбнай рабоце названага факультэта.

У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Тэндэнцыі фарміравання і функцыянавання дзяржаўнага апарату краін – членаў СНД (на прыкладзе Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Украіны)». Дацэнт (2008).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій (у суаўтарстве).



**Круглова Галіна Анатольеўна**

Нарадзілася 3 чэрвеня 1960 г. у в. Запруддзе Віцебскага раёна Віцебскай вобласці.

У 1982 г. з адзнакай скончыла гістарычны факультэт БДУ.

З 1991 г. – дацэнт, прафесар кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1987 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Крытыка рэлігійна-ідэалістычных канцэпцый узаемадзеяння грамадства і прыроды». Дацэнт (1991). У 2008 г. абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара філасофскіх навук «Хрысціянская глабалістыка: генезіс і асноўныя канцэпцыі». Падрыхтавала аднаго кандыдата палітычных навук.

Мае шэраг узнагарод БДУ. Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар звыш 170 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій і 14 падручнікаў.

**Кузьміч Ірына Пятроўна**



Нарадзілася 23 сакавіка 1970 г. у г. Таліне.

У 1993 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2007 г. – дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2002 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў як арганізацыйна-прававая форма вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці». Дацэнт (2011).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 150 навуковых прац.

**Куніцкая Вольга Міхайлаўна**



Нарадзілася 7 лютага 1973 г. у в. Яромічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

З 2011 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры гаспадарчага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2015 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Паняцце і прававыя формы дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь (у інвестыцыйнай сферы)». Дацэнт (2016).

Аўтар звыш 140 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфій і 5 вучэбных дапаможнікаў.

**Курыловіч Марыя Пятроўна**



Нарадзілася 13 кастрычніка 1995 г. у г. Гомелі.

У 2017 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2019 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2023 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Правовое обеспечение публично-частного партнерства в экологических отношениях».

Аўтар звыш 50 навуковых прац.

**Кухаркоў Юрый Уладзіміравіч**



Нарадзіўся 3 лютага 1966 г. у г. Мінску.

У 1989 г. скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, а ў 2009 г. – юрыдычны факультэт БДУ.

З 1998 г. – дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1998 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Даследванне ДНК і кератынаў пры судова-медыцынскай экспертызе адзіных валос».

Аўтар звыш 50 навуковых прац.



**Лагун Дзмітрый Анатольевіч**

Нарадзіўся 4 ліпеня 1977 г. у г. Мінску.

У 1999 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2002 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2003 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Правовые акты Президента Республики Беларусь». Дацэнт (2007).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 150 навуковых прац.



**Ладуцька Віялета Канстанцінаўна**

Нарадзілася 3 мая 1978 г. у г. Мінску.

У 2001 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2014 г. – дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2014 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Адміністрацыйная адказнасць за парушэнне падатковага заканадаўства». Дацэнт (2016).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.



**Лапіна Ірэна Аляксандраўна**

Нарадзілася 2 сакавіка 1978 г. у г. Мінску.

У 2000 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2011 г. – дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ. З 2022 г. – старшыня прафсаюзнай арганізацыі работнікаў названага факультэта.

У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Злачынства ў сістэме прадмета крыміналістыкі». Дацэнт (2011).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 180 навуковых прац.



**Лізгара Вікторыя Яўгенаўна**

Нарадзілася 19 чэрвеня 1971 г. у г. Мінску.

У 1993 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1998 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1999 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававы рэжым асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый і аб'ектаў Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2005). Падрыхтавала аднаго кандыдата юрыдычных навук.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Пераможца конкурсу Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» (2017).

Аўтар звыш 200 навуковых прац.



**Лопуць Надзея Аляксандраўна**

Нарадзілася ў 1984 г. у г. Баранавічы Брэсцкай вобласці.

У 2007 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2011 г. – выкладчык, дацэнт кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2014 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь».

Аўтар каля 20 навуковых прац.



**Макарава Надзея Уладзіславаўна**

Нарадзілася 7 кастрычніка 1981 г. у г. Мінску.

У 2004 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2010 г. – практыкуючы юрыст, адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў. З 2020 г. – выкладчык, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2021 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне абыходжання з аб’ектамі раслiннага свету».

Аўтар звыш 20 навуковых прац.



**Макарава Тамара Іванаўна**

Нарадзілася 1 студзеня 1957 г. у с. Анохаве Балейскага раёна Чыцінскай вобласці.

У 1981 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1985 г. працуе на юрыдычным факультэце БДУ. З 1991 г. – выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2017 г. – загадчык названай кафедры.

У 1992 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Присоединение Беларуси к России в конце XVIII века (государственно-правовой аспект)», а ў 2008 г. – доктарскую дысертацыю «Теоретические проблемы правового положения физических лиц в экологических отношениях». Прафесар (2010). Падрыхтавала сем кандыдатаў юрыдычных навук, уключаючы аднаго замежнага грамадзяніна (Рэспубліка Казахстан).

Член савета БДУ, старшыня экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь (2015–2024), член групы экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, член рэдакцыйных саветаў (калегій) шэрага навуковых выданняў у Рэспубліцы Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Казахстан.

Занесена на Дошку гонару БДУ (2013). Узнагароджана медалём Францыска Скарыны, Падзякай Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаўных органаў і БДУ. Пераможца конкурсу імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» (2017). Заслужаны работнік БДУ. Выдатнік адукацыі.

Аўтар звыш 250 навуковых прац, у тым ліку 15 кніг і манаграфій, 8 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.



**Мароз Алег Васільевіч**

Нарадзіўся 11 красавіка 1981 г. у г. Слуцку Мінскай вобласці.

У 2003 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2007 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававое забеспячэнне экалагічнай экспертызы». Дацэнт (2013).

Аўтар звыш 150 навуковых прац.



**Маслоўская Таццяна Станіславаўна**

Нарадзілася 17 красавіка 1977 г. у г. Заслаўі Мінскага раёна Мінскай вобласці.

У 1999 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2002 г. – выкладчык, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Інстытут прэзідэнцтва ў Рэспубліцы Беларусь». Дацэнт (2007).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Адзначана стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам (2013).

Член навукова-кансультатыўных саветаў пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (2021–2022) і Міжнароднай асацыяцыі канстытуцыйнага права.

Аўтар звыш 180 навуковых прац, у тым ліку 1 індывідуальнай і 12 калектыўных манаграфій, 6 вучэбных (з іх 5 у суаўтарстве) і 3 вучэбна-метадычных дапаможнікаў (1 у суаўтарстве).



**Матарас Валянцін Нікіфаравіч**

Нарадзіўся 4 лютага 1960 г. у в. Любовічы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

У 1986 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1998 г. – дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1995 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававыя аспекты выканаўчай улады ў Рэспубліцы Беларусь». Дацэнт (2016).

Аўтар звыш 60 навуковых прац.

**Міхайлоўскі Вадзім Сяргеевіч**



Нарадзіўся 9 ліпеня 1987 г. у г. Гродне.

У 2010 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2014 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ. З 2022 г. – загадчык кафедры дзяржаўнага кіравання названага факультэта.

У 2015 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Неамарксізм: тэарэтыка-метадалагічныя падставы даследавання палітыкі». Дацэнт (2019). У 2025 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Палітычныя канцэпцыі сінергетычнага неамарксізму».

Пераможца конкурсу ВАК Рэспублікі Беларусь найлепшую кандыдацкую дысертацыю (2015).

Аўтар звыш 100 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій.

**Моціна Яўгенія Уладзіміраўна**



Нарадзілася 16 студзеня 1976 г. у г. Мінску.

У 1998 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2007 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2002 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Кампенсаванне маральнай шкоды ў працоўным праве». Дацэнт (2011).

З 2015 г. – член Навукова-кансультатыўнага савета пры Эканамічным Судзе Садружнасці Незалежных Дзяржаў. З 2022 г. узначальвае вучэбна-метадычную камісію юрыдычнага факультэта БДУ.

Аўтар звыш 160 навуковых прац.

**Мяшчанава Марыя Валянцінаўна**



Нарадзілася 8 мая 1972 г. у г. Запарожжы.

У 1994 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1999 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2017 г. – загадчык названай кафедры.

У 1998 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Суадносіны міжнароднага прыватнага і міжнароднага публічнага права». Дацэнт (2006). У 2022 г. абараніла доктарскую дысертацыю «Сістэма міжнароднага прыватнага права Рэспублікі Беларусь».

Удзельнічае ў рабоце групы экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Член навукова-кансультатыўных саветаў пры Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь і Эканамічным судзе Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Член савета па абароне дысертацый пры БДУ.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Неаднаразовы ўладальнік дыплома конкурсу на прыз імя У. Д. Спасовіча (2017, 2018).

Аўтар звыш 150 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфій.



**Ніканава Наталія Мікалаеўна**

Нарадзілася 30 кастрычніка 1978 г. у г. Ягор'еўску.

У 2001 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2008 г. – дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2006 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Працэсуальная адказнасць у судаводстве па грамадзянскіх справах». Дацэнт (2019).

Аўтар звыш 60 навуковых прац.



**Орса Аляксандр Яўгенавіч**

Нарадзіўся 7 лютага 1979 г. у г. Мінску.

У 2001 г. з адзнакай скончыў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт.

З 2015 г. – дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2006 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне выдаткаў вытворчасці прадукцыі (работ, паслуг) і рэалізацыі тавараў».

Аўтар звыш 40 навуковых прац.



**Пабярэжная Вольга Яўгенаўна**

Нарадзілася 14 лютага 1977 г. у г. Мар'іна Горка Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

У 1998 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2007 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ. З 2013 па 2020 г. – загадчык вучэбнай лабараторыі палітычных тэхналогій названай кафедры. З 2020 па 2022 г. – старшыня вучэбна-метадычнай камісіі юрыдычнага факультэта БДУ. З 2022 г. – намеснік дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях.

У 2015 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Тэарэтычныя аспекты фарміравання і развіцця сацыяльнай палітыкі ў сучасным свеце». Дацэнт (2019).

Мае шэраг узнагарод БДУ.

Аўтар звыш 50 навуковых прац, у тым ліку 1 калектыўнай манаграфіі і 5 вучэбных дапаможнікаў (у суаўтарстве).



**Папова Ірына Васільеўна**

Нарадзілася 9 снежня 1953 г. у г. Мінску.

У 1976 г. скончыла факультэт прыкладной матэматыкі БДУ.

З 1999 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1999 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Праграма для ЭВМ у сістэме аб'ектаў аўтарскага права». Дацэнт (2012).

Аўтар звыш 30 навуковых прац.

**Парэчына Святлана Генадзьеўна**



Нарадзілася 14 лістапада 1972 г. у г. Мінску.

У 1997 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2009 г. – дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2001 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прэзідэнцтва ў палітычнай сістэме грамадства: параўнальны аналіз». Дацэнт (2008).

Мае шэраг узнагарод БДУ.

Аўтар звыш 60 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфій і 5 вучэбных дапаможнікаў.

**Паставалава Таццяна Аляксандраўна**



Нарадзілася 19 лютага 1975 г. у г. Жодзіне Мінскай вобласці.

У 1997 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2001 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2000 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне дапамогі па часовай непрацаздольнасці». Дацэнт (2005).

Аўтар звыш 120 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій.

**Пацкевіч Аляксандр Пятровіч**



Нарадзіўся 19 жніўня 1956 г. у г. Жлобіне Гомельскай вобласці.

У 1981 г. скончыў Мінскую вышэйшую школу Міністэрства ўнутраных спраў СССР, а ў 2007 г. – Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка.

З 2020 г. – дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2000 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Вопросы теории и практики повышения эффективности использования криминалистических учетов в раскрытии, расследовании и предупреждении преступлений».

Аўтар звыш 200 навуковых прац.

**Петачэнка Тамара Міхайлаўна**



Нарадзілася 8 верасня 1966 г. у г. Мінску.

У 1988 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1998 г. – дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1995 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Праблемы прававога становішча жанчын у сувязі з мацярынствам па працоўным заканадаўстве». Дацэнт (2003).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.



**Піліпенка Аляксандр Анатольевіч**

Нарадзіўся 30 студзеня 1970 г. у г. Мінску.

У 1995 г. з адзнакай скончыў філасофска-эканамічны факультэт БДУ, а ў 1998 г. таксама з адзнакай – юрыдычны факультэт БДУ.

З 2000 па 2001 г. – намеснік начальніка ўпраўлення работы з моладдзю БДУ. З 2001 па 2021 г. – дацэнт кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці юрыдычнага факультэта БДУ. З 2021 па 2022 г. – намеснік дэкана па завочным навучанні (другая вышэйшая адукацыя). З 2021 г. – дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання названага факультэта.

У 2004 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававое забеспячэнне фарміравання падатковай сістэмы Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2008).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі і 3 вучэбных дапаможнікаў.



**Пісарчык Алеся Сяргееўна**

Нарадзілася 15 мая 1992 г. у г. Мінску.

У 2014 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2018 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2018 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Глабальныя выклікі сучаснасці: уздзеянне на нацыянальную дзяржаву і яе знешнепалітычныя прыярытэты (на прыкладзе Рэспублікі Беларусь)». Дацэнт (2023).

Аўтар звыш 20 навуковых прац.



**Пратасавіцкі Сяргей Пятровіч**

Нарадзіўся 29 снежня 1972 г. у г. Пінску Брэсцкай вобласці.

У 1994 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1997 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1999 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Банкруцтва суб’ектаў гаспадарання: прававы аспект». Дацэнт (2006).

Аўтар звыш 70 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі.

**Пятрова Вольга Валянцінаўна**



Нарадзілася 28 лістапада 1977 г. у г. Віцебску.

У 1999 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2003 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2003 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Абарона правоў і свабод асобы ў крымінальным працэсе Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2005).

Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты (2018).

Аўтар звыш 120 навуковых прац.

**Раманава Вольга Мікалаеўна**



Нарадзілася 10 ліпеня 1974 г. у г. Мінску.

У 1996 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2000 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2020 г. – загадчык названай кафедры. З 2016 па 2020 г. узначальвала вучэбна-метадычную камісію юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2001 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Разгляд спраў аб абароне гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі ў грамадзянскім і гаспадарчым судаводстве». Дацэнт (2005).

Член навукова-кансультатыўных саветаў пры Эканамічным Судзе Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Аўтар звыш 80 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі.

**Рапян Юрый Хачатуравіч**



Нарадзіўся 13 чэрвеня 1999 г. у г. Мінску.

У 2019 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2022 г. – выкладчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2024 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Судовае абскарджанне дзеянняў службовых асоб органаў прымусовага выканання».

Аўтар звыш 30 навуковых прац.

**Рашэтнікаў Сяргей Васільевіч**



Нарадзіўся 22 ліпеня 1949 г. у г. Гродне.

У 1972 г. скончыў гістарычны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута.

З 1993 па 2019 г. – загадчык кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ, а з 2019 г. – прафесар названай кафедры. З 1994 па 1995 г. – прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ.

У 1981 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Інтэрнацыяналізацыя працэсу сцірання класавых адрозненняў на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва», а ў 1995 г. – дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара палітычных навук «Аналіз працэсу прыняцця палітычных рашэнняў у палітычнай навуцы ЗША (функцыянальна-дынамічны аспект)». Прафесар (1997). Падрыхтаваў сем кандыдатаў і шэсць дактароў палітычных навук.

Заснавальнік навуковай школы палітычных навук у БДУ.

Старшыня савета пры БДУ па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па палітычных навуках.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2011). Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2019). Заслужаны работнік БДУ. Ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 10 манаграфій.



**Рыбаключава Вольга Зайніеўна**

Нарадзілася 20 лістапада 1976 г. у г. Мінску.

У 1997 г. з адзнакай скончыла Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

З 2020 г. – дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2024 г. – дырэктар Дэпартамента кантролю якасці адукацыі.

У 2003 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Крымінальная адказнасць супрацоўнікаў органаў унутраных спраў за перавышэнне ўлады ці службовых паўнамоцтваў». Дацэнт (2013).

Узнагароджана медалямі «За бездакорную службу» II і III ступені. Мае шэраг іншых узнагарод дзяржаўных органаў.

Аўтар звыш 75 навуковых прац.



**Савенок Анатоль Леанідавіч**

Нарадзіўся 5 верасня 1964 г. у в. Моклішчы Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці.

У 1990 г. скончыў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. З 1997 па 2020 г. працаваў у названай установе на розных пасадах: выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага права і крыміналогіі, начальнік вучэбнага аддзела, намеснік начальніка акадэміі па вучэбнай рабоце, першы намеснік начальніка акадэміі. З 2014 па 2020 г. – загадчык кафедры крымінальнага права і крыміналогіі Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. З 2020 г. – загадчык кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1997 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Рызыка ў крымінальным праве», а ў 2017 г. – доктарскую дысертацыю «Тэарэтычныя і прыкладныя праблемы эфектыўнасці крымінальнага закона». Прафесар (2019). Падрыхтаваў трох кандыдатаў юрыдычных навук.

Узнагароджаны медалямі «За бездакорную службу» I, II і III ступені. Мае шэраг памятных медалёў, нагрудных знакаў і падзяк. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2019).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 1 індывідуальнай і 4 калектыўных манаграфій, а таксама 5 вучэбных дапаможнікаў.

**Салтановіч Андрэй Уладзіміравіч**



Нарадзіўся 24 лістапада 1961 г. у в. Вялікая Пярэспа Сенненскага раёна Віцебскай вобласці.

У 1989 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1992 – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1992 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Права падазронага на абарону ў крымінальным працэсе Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (1994).

Аўтар звыш 80 навуковых прац.

**Самарын Вадзім Ігаравіч**



Нарадзіўся 25 лютага 1980 г. у г. Мінску.

У 2002 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2006 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2006 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Взаимодействие органов Республики Беларусь, ведущих уголовный процесс, с учреждениями иностранных государств по уголовным делам». Дацэнт (2010).

Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (2002). Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты сярод маладых навукоўцаў (2013). Адзначаны стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам (2014).

Аўтар звыш 150 навуковых прац.

**Саскевіч Вераніка Васільеўна**



Нарадзілася 7 лістапада 1979 г. у г. Мінску.

У 2002 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2004 г. – выкладчык, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2008 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававы рэжым зямель прамысловасці, транспарту, сувязі, энергетыкі». Дацэнт (2014).

Аўтар звыш 80 навуковых прац.

**Сатолін Уладзімір Мікалаевіч**



Нарадзіўся 28 лістапада 1953 г. у в. Лычнікі Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці.

У 1980 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1987 г. – выкладчык, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ. З 1988 па 1998 г. – дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі БДУ. З 1998 па 2020 г. – намеснік дэкана юрыдычнага факультэта па вучэбнай рабоце.

У 1998 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Гісторыя станаўлення і развіцця заканадаўства аб шлюбе і сям'і Беларусі».

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Заслужаны работнік БДУ.

Аўтар звыш 50 навуковых прац.

**Свадкоўская Алена Аляксандраўна**



Нарадзілася 1 ліпеня 1980 г. у г. Мінску.

У 2002 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2003 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2022 г. – загадчык кафедры права інтэлектуальнай уласнасці названага факультэта.

З 2018 па 2021 г. – вучоны сакратар экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь. З 2023 па 2024 г. – вучоны сакратар савета па абароне дысертацый пры БДУ.

У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Заключэнне дагавора ў абавязковым парадку». Дацэнт (2008).

Аўтар звыш 110 навуковых прац.

**Семяніхін Міхаіл Аляксандравіч**



Нарадзіўся 6 кастрычніка 1982 г. у г. Мінску.

З 2018 г. – дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве).

У 2016 г. абараніў кандыдацкую «Грамадзянска-прававое рэгуляванне аўдытарскай дзейнасці». Дацэнт (2019).

Член Навукова-кансультатыўнага савета пры Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, а таксама рэдакцыйнага савета часопіса «Законнасць і правапарадак».

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў.

Аўтар звыш 40 навуковых прац.

**Сідарчук Валерый Кірылавіч**



Нарадзіўся 16 жніўня 1957 г. у в. Чыжэвічы Брэсцкага раёна.

У 1984 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1997 па 2007 г. – дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2007 па 2022 г. – дацэнт кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці. З 2022 г. – дацэнт кафедры права інтэлектуальнай уласнасці.

У 1987 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававы стан дзяржаўных камітэтаў саюзнай рэспублікі». Дацэнт (2002).

Аўтар звыш 110 навуковых прац.

**Сіманоўскі Сяргей Іванавіч**



Нарадзіўся 19 кастрычніка 1957 г. у г. Добрушы Гомельскай вобласці.

У 1980 г. скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

З 2000 г. – дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1990 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Фарміраванне асобы будучага рабочага ў сістэме прафтэадукацыі (па матэрыялах БССР)». Дацэнт (1997). Падрыхтаваў аднаго кандыдата палітычных навук.

Мае шэраг узнагарод БДУ.

Аўтар звыш 130 навуковых прац.

**Сініцына Ганна Міхайлаўна**



Нарадзілася 20 мая 1994 г. у г. Брэсце.

У 2016 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2019 г. – выкладчык, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2021 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Тэарэтыка-прыкладныя праблемы аптымізацыі судовага канстытуцыйнага кантролю ў Рэспубліцы Беларусь».

Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (2018). Адзначана стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам (2023).

Аўтар звыш 35 навуковых прац.

**Скобелеў Уладзімір Пятровіч**



Нарадзіўся 16 ліпеня 1979 г. у г. Оршы Віцебскай вобласці.

У 2001 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2002 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2020 г. – намеснік дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях (завочная форма навучання).

У 2005 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Законная сила постановлений суда первой инстанции в гражданском процессе». Дацэнт (2007).

У 2018 і 2025 гг. атрымаў гранты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на правядзенне навуковых даследаванняў у галіне адукацыі і навукі.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Неаднаразовы ўладальнік прыза імя У. Д. Спасовіча ў намінацыях «Навука і права» (2018, 2019), «Выканаўчая

вытворчасць» (2023), а таксама дыплома конкурсу на прыз імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Суд» (2016).

Аўтар звыш 650 навуковых прац, у тым ліку 13 манаграфій.



**Слуцкая Людміла Уладзіміраўна**

Нарадзілася 24 студзеня 1974 г. у г. Свярдлоўску.

У 1997 г. скончыла гістарычны факультэт Уральскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. М. Горкага.

З 2011 г. – дацэнт кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2009 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Французские левые интеллектуалы в Советской России в 1917–1929 гг.». Дацэнт (2014).

З 2019 г. – вучоны сакратар савета пры БДУ па абароне дысертацый па палітычных навуках.

Мае шэраг узнагарод БДУ.

Аўтар звыш 90 навуковых прац.



**Стрыжак Марына Станіславаўна**

Нарадзілася 11 чэрвеня 1981 г. у г. Рэчыцы Гомельскай вобласці.

У 2003 г. скончыла юрыдычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны.

З 2021 г. – дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2009 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Грамадзянска-прававая адказнасць за шкоду, прычыненую непаўналетнімі». Дацэнт (2012).

Аўтар звыш 100 навуковых прац.



**Сухапараў Віктар Паўлавіч**

Нарадзіўся 13 кастрычніка 1994 г. у г. Мінску.

У 2017 г. з адзнакай скончыў факультэт права Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, а ў 2019 г. – магістратуру юрыдычнага факультэта БДУ. З 2019 па 2023 г. – аспірант кафедры канстытуцыйнага права названага факультэта.

З 2023 г. – намеснік дэкана па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце юрыдычнага факультэта БДУ.

Аўтар звыш 50 навуковых прац.



**Сысуеў Цімур Валер’евіч**

Нарадзіўся 28 лістапада 1973 г. у г. Мінску.

У 1995 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1995 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

Член Мінскай абласной калегіі адвакатаў, член Прэзідыума і арбітр Міжнароднага арбітражнага суда пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Неаднаразовы ўладальнік дыплома конкурсу на прыз імя У. Д. Спасовіча (2011, 2023).

Аўтар звыш 300 навуковых прац.



**Сямашка Алена Валянцінаўна**

Нарадзілася 8 ліпеня 1975 г. у п. Зялёны Бор Мінскай вобласці.

У 1996 г. з адзнакай скончыла Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 2019 па 2024 г. – кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь. З 2024 г. – намеснік дырэктара – кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. З 2022 г. – дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ. Штогод узначальвае Дзяржаўную экзаменацыйную камісію на факультэце.

У 2003 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Юрыдычная прырода нарматыўных актаў дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2007).

Узнагароджана Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, медалём «За трудовые заслуги», Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.



**Талочка Вольга Мікалаеўна**

Нарадзілася 13 ліпеня 1967 г. у г. Гродне.

У 1989 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 2018 г. – прафесар кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1993 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Псіхалагічная тэорыя права Л. І. Петражыцкага». Дацэнт (1999). У 2013 г. абараніла доктарскую дысертацыю на тэму «Міжнароднае эканамічнае права і імплементацыя яго норм у нацыянальнае заканадаўства (на прыкладзе Рэспублікі Беларусь)». Прафесар (2025).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій, 1 падручніка і 4 вучэбных дапаможнікаў.



**Тамковіч Раман Раманавіч**

Нарадзіўся 16 кастрычніка 1973 г. у в. Траскоўшчыне Мінскага раёна Мінскай вобласці.

У 2000 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2006 – дацэнт кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры гаспадарчага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве).

У 2008 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дагавор бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку».

Аўтар звыш 100 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій і 2 вучэбных дапаможнікаў.



**Траццякова Ірына Пятроўна**

Нарадзілася 27 снежня 1966 г. у г. Маладзечне Мінскай вобласці.

У 1989 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1999 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1998 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Права ўласнай маёмасці грамадзян на жылы дом». Дацэнт (2004).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.



**Фіронаў Анатоль Мікалаевіч**

Нарадзіўся 4 снежня 1988 г. у г. Ціраспалі.

У 2011 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2011 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2024 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Ценностные аспекты правовой культуры».

Аўтар звыш 50 навуковых прац.



**Фралова Яўгенія Яўгенаўна**

Нарадзілася 3 мая 1977 г. у г. Маскве.

У 1999 г. з адзнакай скончыла Маскоўскую дзяржаўную акадэмію (сёння – Маскоўскі дзяржаўны юрыдычны ўніверсітэт імя. А. Е. Кутафіна), а ў 2002 г. – аспірантуру Інстытута дзяржавы і права Расійскай акадэміі навук.

У 2009 г. – загадчык кафедры гаспадарчага і фінансавага права Байкальскага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі і права (г. Іркуцк).

З 2012 г. – начальнік Юрыдычнага інстытута Байкальскага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі і права, адначасова прафесар Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы.

З 2014 г. – загадчык кафедры канкурэнтнага і прадпрымальніцкага права Далёкаўсходняга федэральнага ўніверсітета. З 2024 г. – прафесар кафедры міжнароднага публічнага і прыватнага права названага ўніверсітэта (па сумяшчальніцтве).

З 2016 г. па цяперашні час – загадчык кафедры грамадзянскага права і працэсу і міжнароднага прыватнага права Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы.

З 2017 па 2018 г. – намеснік дырэктара Інстытута дзяржавы і права Расійскай акадэміі навук.

У цяперашні час з’яўляецца навуковым кансультантам кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ. Член савета БДУ, а таксама савета па абароне дысертацый.

У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Лицензирование банковских операций как форма государственного регулирования банковской деятельности (теория, практика, проблемы)». Дацэнт (2009). У 2011 г. абараніла доктарскую дысертацыю «Государственный финансовый контроль в сфере денежного обращения». Прафесар (2019). Падрыхтавала сем кандыдатаў і двух дактароў юрыдычных навук.

Ганаровы прафесар юрыдычнага факультэта БДУ.

Ганаровы прафесар Шанхайскага ўніверсітэта палітыкі і права (2015).

Мае шэраг узнагарод. За значны ўклад у развіццё парламентарызму ў Расійскай Федэрацыі, удасканаленне яе заканадаўства, умацаванне дэмакратыі і канстытуцыйнага ладу ў Расійскай Федэрацыі, а таксама забеспячэнне правоў і свабод яе грамадзян Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі ўзнагароджана медалямі «Совет Федерации. 20 лет», «Совет Федерации. 25 лет». Заслужаны юрыст Расійскай Федэрацыі (2012). Прысвоены ганаровыя званні «Почетный работник высшего профессионального образования Российской Федерации» і «Почетный работник науки и высоких технологий Российской Федерации» (2020). Узнагароджана Ордэнам дружбы (2021).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 11 манаграфій.

**Функ Ян Іосіфавіч**



Нарадзіўся 19 жніўня 1967 г. у г. Калінкавічы Гомельскай вобласці.

У 1991 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2004 г. – дацэнт, прафесар кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры гаспадарчага права юрыдычнага факультэта БДУ (па сумяшчальніцтве). З 2023 г. – прафесар кафедры права інтэлектуальнай уласнасці (па сумяшчальніцтве).

У 2002 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Поўнае таварыства ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь», а ў 2009 г. – доктарскую дысертацыю «Удасканаленне прававых сродкаў вытворчай кааперацыі (каапераравання) шляхам увядзення новага тыпу дагавора». Прафесар (2013).

Аўтар і суаўтар больш за 1500 навуковых прац, у тым ліку больш за 55 кніг, а таксама больш за 3500 навуковых прац, размешчаных у электронных базах.

**Хацько Вольга Аляксандраўна**



Нарадзілася 27 чэрвеня 1981 г. у г. Паставы Віцебскай вобласці.

У 2003 г. скончыла юрыдычны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 2012 па 2023 г. – выкладчык, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права, а з 2023 г. – дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2013 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне абмежаванняў і абцяжаранняў праў на зямельныя ўчасткі». Дацэнт (2015).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфій і 2 вучэбных дапаможнікаў.



**Хлус Аляксандр Міхайлавіч**

Нарадзіўся 1 сакавіка 1964 г. у в. Рылавічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

У 1992 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1995 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1996 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Организационно-тактические проблемы расследования вымогательства».

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар каля 500 навуковых прац.



**Цагельнік Вольга Уладзіміраўна**

Нарадзілася 21 жніўня 1979 г. у г. Пінску Брэсцкай вобласці.

У 2001 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2009 г. – старшы выкладчык, дацэнт кафедры фінасавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2008 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Інвестыцыйнае абавязацельства пры куплі-продажы прадпрыемства, акцый, якія належаць дзяржаве, па конкурсе ў працэсе прыватызацыі». Дацэнт (2014).

Аўтар звыш 60 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі.



**Чарналеўскі Аляксей Юр'евіч**

Нарадзіўся 18 верасня 1978 г. у г. Мінску.

У 2000 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2020 г. – дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта БДУ. Супрацоўнік Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

У 2015 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Адміністратыўна-юрысдыкцыйная дзейнасць органаў пагранічнай службы ў сістэме мер забеспячэння нацыянальнай бяспекі».

Аўтар звыш 25 навуковых прац, у тым ліку 1 манаграфіі.

**Чупрыс Вольга Іванаўна**



Нарадзілася 9 снежня 1969 г. у г. Мінску.

У 1992 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

У 1992 г. – дзяржаўны натарыус дзяржаўнай натарыяльнай канторы Маскоўскага раёна г. Мінска ўпраўлення юстыцыі выканкама Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў.

З 1992 па 1997 г. – аспірантка юрыдычнага факультэта БДУ. З 1997 па 2004 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права названага факультэта. З 2004 па 2005 г. – намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Юрыдычнага каледжа БДУ. З 2005 па 2010 г. – дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2010 па 2015 г. – намеснік дэкана названага факультэта БДУ. З 2015 па 2018 г. – загадчык кафедры дзяржаўнага кіравання. З 2018 па 2019 г. – прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях БДУ.

З 2019 г. – Намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У 1998 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Канстытуцыйна-прававыя праблемы грамадзянства ў краінах Садружнасці Незалежных Дзяржаў: параўнальна-прававы аналіз». Дацэнт (2003). У 2010 г. абараніла доктарскую дысертацыю «Тэарэтычныя праблемы прававога рэгулявання дзяржаўнай службы Рэспублікі Беларусь». Прафесар (2017).

Член рабочай групы па пытаннях змянення Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Прымала непасрэдны ўдзел у распрацоўцы шэрага важнейшых заканадаўчых актаў, у тым ліку па пытаннях крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці, прававога статуса дзяржаўнай службы і інш.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджана Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2012). Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь (2022).

Аўтар звыш 200 навуковых і навукова-метадычных прац, больш за 20 падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і манаграфій.

**Чупрыс Максім Кірылавіч**



Нарадзіўся 18 красавіка 1993 г. у г. Мінску.

З 2022 г. – дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2022 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Административно-правовое обеспечение прав несовершеннолетних комиссиями по делам несовершеннолетних в Республике Беларусь». Дацэнт (2024).

Аўтар звыш 20 навуковых прац.

**Чэшка Уладзімір Юр’евіч**



Нарадзіўся 11 мая 1988 г. у г. Мар’іна Горка Мінскай вобласці.

У 2011 г. скончыў Ваенную акадэмію Рэспублікі Беларусь.

З 2021 г. – дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2019 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дысцыплінарна-прававы прымус вайскоўцаў па адміністрацыйным заканадаўстве Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2021).

Аўтар звыш 70 навуковых прац.



**Шабанаў Вячаслаў Барысавіч**

Нарадзіўся 24 лютага 1959 г. у г. Магілёве.

У 1983 г. скончыў Віленскую спецыяльную школу Міністэрства ўнутраных спраў СССР, а ў 1991 г. – юрыдычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 1983 па 2015 г. служыў у органах унутраных спраў Беларусі.

З 1999 па 2002 г. – намеснік начальніка Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, з 2008 па 2010 г. – начальнік крымінальна-выканаўчага факультэта акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, а з 2010 па 2015 г. – намеснік начальніка па навуковай рабоце.

З 2016 г. – загадчык кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1995 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Расследование насильственных преступлений в исправительных учреждениях», а ў 2002 г. – доктарскую дысертацыю. Прафесар (2004). Падрыхтаваў 12 кандыдатаў і 1 доктара юрыдычных навук. Член вучоных саветаў шэрага ўстаноў і арганізацый. Член групы экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Намеснік старшыні савета па абароне дысертацый.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджаны медалямі «За бездакорную службу» І і ІІ ступені.

Аўтар звыш 400 навуковых прац, у тым ліку больш за 15 манаграфій, 20 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.



**Шаблінская Дзіяна Віктараўна**

Нарадзілася 5 лютага 1977 г. у в. Дубраве Маладзечненскага раёна Мінскай вобласці.

З 2021 г. – дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2010 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Канфіскацыя маёмасці ў крымінальным праве: удасканаленне заканадаўства і практыкі прымянення». Дацэнт (2014).

Аўтар звыш 150 навуковых прац.



**Шаршун Віктар Аляксандравіч**

Нарадзіўся 15 ліпеня 1970 г. у в. Лішчыцы Лагойскага раёна Мінскай вобласці.

У 1997 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2022 г. – дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2003 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Нарматворчая дзейнасць органаў узброеных сіл у сістэме праватворчасці сацыяльнай прававой дзяржавы». Дацэнт (2020).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Узнагароджаны Падзякай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2013).

Аўтар звыш 130 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфій.

**Шаўцова Ала Васільеўна**



Нарадзілася 30 мая 1968 г. у г. Чырчыку.

У 1990 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1994 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 1997 г. абараніла кандыдацкую дысертацю «Дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь». Дацэнт (2003).

Член Навукова-кансультатыўнага савета пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

У 2021 г. за актыўнае інфармацыйнае ўзаемадзеянне і ўдзел у працы СМІ ў намінацыі «Актуальны мікрафон» узнагароджана дыпломам «Чалавек года».

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфій і 14 вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

**Шаўцоў Юрый Леанідавіч**



Нарадзіўся 22 лютага 1963 г. у в. Грыгор’ева Холм-Жыркоўскага раёна Смаленскай вобласці.

У 1989 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1992 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ (з 2021 г. – па сумяшчальніцтве). З 2010 па 2020 г. – намеснік дэкана па завочным навучанні.

У 1992 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Крымінальна-прававая барацьба з вымагальніцтвам маёмасці (па матэрыялах Рэспублікі Беларусь)». Дацэнт (2015).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 180 навуковых прац.

**Шахрай Ірына Сяргееўна**



Нарадзілася 24 ліпеня 1977 г. у г. Ленінградзе.

У 1999 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1999 г. – выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2003 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Право специального лесопользования». Дацэнт (2008). У 2023 г. абараніла доктарскую дысертацыю «Теоретико-прикладные проблемы реализации субъективного права природопользования».

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый пры БДУ.

Пераможца конкурсу Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» (2018).

Аўтар звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфій.



**Шпілеўская Таццяна Эдуардаўна**

Нарадзілася 29 красавіка 1981 г. у г. Мінску.

У 2003 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 2007 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2010 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Асаблівасці прававога рэгулявання працы прафесарска-выкладчыцкага саставу вышэйшай навучальнай установы».

Аўтар звыш 40 навуковых прац.



**Шчэрбік Дзмітрый Васільевіч**

Нарадзіўся 20 снежня 1979 г. у г. Наваполацку Віцебскай вобласці.

У 2002 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 2015 па 2019 г. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 2019 г. – дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2010 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дыскрэтнасць і пераемнасць у развіцці права Беларусі». Дацэнт (2013).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар звыш 100 навуковых прац.



**Шыдлоўскі Андрэй Віктаравіч**

Нарадзіўся 23 жніўня 1976 г. у г. Капылі Мінскай вобласці.

У 1998 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 1998 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2006 па 2020 г. – намеснік дэкана юрыдычнага факультэта па вучэбна-выхаваўчай рабоце. З 2020 па 2021 г. – першы намеснік дырэктара Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ. З 2021 г. – дэкан юрыдычнага факультэта БДУ.

У 2002 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Інстытут назначэння пакарання ў крымінальным праве Рэспублікі Беларусь: сістэмна-функцыянальны аналіз». Дацэнт (2007). Падрыхтаваў двух кандыдатаў юрыдычных навук.

Уваходзіць у састаў Вышэйшай кваліфікацыйнай калегіі суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, групы экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, навукова-кансультатыўных саветаў пры Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь. Член Кваліфікацыйнай камісіі па пытаннях адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. З’яўляўся вучоным сакратаром савета па абароне доктарскіх дысертацый па юрыдычных навуках пры БДУ (2012–2021). З 2022 г. – старшы-

ня арганізацыйнага камітэта штогадовай Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды.

Намеснік старшыні ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў». З 2015 г. – кіраўнік беларускага прадстаўніцтва міжнароднага аб’яднання «Саюз крыміналістаў і крымінолагаў». Член рэдкалегій часопісаў «Союз криминалистов и криминологов» (Масква), «Право.by», «Журнал Белорусского государственного университета. Право».

Лаўрэат прыза імя У. Д. Спасовіча (2016, 2020) і абладальнік прыза конкурсу «Вяршыня права» – пераможца конкурсу Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Навука і права» (2024).

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ. Занесены на Дошку гонару БДУ (2018). Узнагароджаны Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2019).

Аўтар звыш 290 навуковых і навукова-метадычных прац, у тым ліку 4 манаграфій, 2 падручнікаў і 10 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

**Шынгель Наталля Адамаўна**



Нарадзілася 11 кастрычніка 1961 г. у г. Мінску.

У 1983 г. з адзнакай скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

З 1993 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнача факультэта БДУ.

У 1999 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Прававая ахова навакольнага асяроддзя гарадоў». Дацэнт (2005). Падрыхтавала двух кандыдатаў юрыдычных навук.

Мае шэраг узнагарод дзяржаўных органаў і БДУ.

Аўтар каля 160 навуковых прац.

**Ядрэўскі Алег Алегавіч**



Нарадзіўся 6 кастрычніка 1985 г. у г. Мінску.

У 2009 г. з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт БДУ.

З 2012 па 2021 г. – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ. З 2021 г. – дацэнт кафедры права інтэлектуальнай уласнасці названага факультэта.

У 2019 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Геаграфічнае ўказанне як аб’ект інтэлектуальнай уласнасці». Дацэнт (2023).

Аўтар звыш 30 навуковых прац.



# АСНОЎНЫЯ ВЕХІ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

## 1921 год

**18 красавіка.** Прэзідыум ЦВК БССР прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску БДУ і пачатку заняткаў на рабочым, медыцынскім, сельскагаспадарчым і фізіка-матэматычным факультэтах, а таксама факультэце грамадскіх навук[1].

**11 ліпеня.** У Беларускім дзяржаўным тэатры г. Мінска адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае адкрыццю БДУ.

**12 жніўня.** Аб’яўлены прыём абітурыентаў на прававое аддзяленне факультэта грамадскіх навук.

**9 верасня.** Дзяржаўны вучоны савет зацвердзіў першымі прафесарамі факультэта грамадскіх навук В. Г. Кнорына, С. Г. Гурвіча, В. Н. Дзьякава, В. Н. Іваноўскага, Д. А. Жарынава, В. П. Канчалоўскага, С. Г. Лозінскага, Н. М. Нікольскага, В. Н. Перцава, У. І. Пічэту, І. М. Салаўёва, Ф. Ф. Турука, Н. А. Янчука і інш.

**21 кастрычніка.** На факультэце грамадскіх навук створана прадметная камісія па прававых і эканамічных дысцыплінах.

*Дэканам факультэта грамадскіх навук прызначаны доктар гістарычных навук, прафесар Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі.*

**30 кастрычніка.** Адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае адкрыццю БДУ. На факультэце грамадскіх навук пачаліся заняткі.

## 1922 год

**31 жніўня.** Праўленнем БДУ *дэканам факультэта грамадскіх навук абраны прафесар Саламон Захаравіч Кацэнбоген.*

На прававым аддзяленні факультэта грамадскіх навук створаны кабінеты крымінальнага права, грамадзянскага права, дзеючага заканадаўства РСФСР і судовай медыцыны.

**Восень.** Пасля рэарганізацыі ўніверсітэта на факультэце грамадскіх навук засталіся два аддзяленні: эканамічнае і прававое.

---

[1] Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1.

## 1923 год

**Верасень.** Упершыню ўведзены ўступныя экзамены для абітурыентаў, а таксама вытворчая практыка для студэнтаў.

*Дэканам факультэта грамадскіх навук прызначаны доктар юрыдычных навук, прафесар Міхаіл Восіпавіч Грэдзінгер.*

## 1924 год

**Жнівень.** Пастановай калегіі Народнага камісарыята асветы БССР спынены прыём на факультэт грамадскіх навук, які ліквідуецца. Студэнты працягнулі вучобу ў іншых навучальных установах.

## 1925 год

**21 лютага.** Адбыўся першы выпуск факультэта грамадскіх навук. Дыпломы аб заканчэнні БДУ атрымалі 60 чалавек, з якіх 28 – юрысты і 32 – эканамісты.

**13 ліпеня.** Адбыўся другі выпуск факультэта грамадскіх навук. Дыпломы аб заканчэнні БДУ атрымалі 178 чалавек, з якіх 91 – юрысты і 85 – эканамісты.

**26 жніўня.** СНК БССР пастанавіў *адкрыць у БДУ факультэт права і гаспадаркі* ў складзе двух аддзяленняў: прававога і эканамічнага. *Дэканам назначаны прафесар Сямён Якаўлевіч Вольфсан.*

**1 верасня.** У адпаведнасці з пастановай СНК БССР у БДУ *адкрыты факультэт права і гаспадаркі.*

## 1926 год

**Снежань.** За 5 гадоў БДУ падрыхтаваў 130 юрыстаў.

## 1927 год

На факультэце права і гаспадаркі вучацца 648 студэнтаў.

На названым факультэце заснавана кафедра ленінізма і гісторыі УКП(б).

## 1928 год

**Люты.** СНК БССР зацвердзіў праект пабудовы ўніверсітэцкага гарадка.

**7 лістапада.** Адбылася ўрачыстая закладка студэнцкага гарадка.

## 1929 год

Праўленне БДУ прыняло рашэнне правесці датэрміновы выпуск спецыялістаў – 50 студэнтаў старэйшых курсаў факультэта права і гаспадаркі.

**7 кастрычніка.** Адбыўся выпускны вечар на факультэце права і гаспадаркі. Дыпломы атрымалі 57 юрыстаў.

**Снежань.** Прафесары БДУ С. Я. Вольфсан, М. В. Грэдзінгер, У. М. Ігнатоўскі, У. І. Пічэта і А. Н. Ясінскі абраны членамі АН БССР.

## 1930 год

**Снежань.** У сувязі з заканчэннем будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка аб'яўлены дадатковы зімовы прыём на факультэт савецкага будаўніцтва.

Універсітэт мае ў сваім саставе шэсць факультэтаў, у тым ліку і *факультэт савецкага права і будаўніцтва.*

## 1931 год

**Ліпень.** У сувязі з 10-годдзем БДУ прафесар С. Я. Вольфсан узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Ліпень.** СНК БССР прыняў Пастанову «О реорганизации Белорусского государственного университета». Факультэт савецкага будаўніцтва і права быў рэарганізаваны ў самастойны *Інстытут савецкага будаўніцтва і права*. Тэрмін навучання складаў 3 гады.

## 1932 год

**Ліпень.** Інстытут савецкага будаўніцтва і права пераўтвораны ў *Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут*.

## 1933 год

У вышэйшых навучальных установах БССР змяніўся сацыяльны састаў студэнтаў, колькасць якіх з рабочага асяроддзя склала 40,3 %, што ў два разы больш, чым у 1928 г.

## 1934 год

**13 студзеня.** Прыняты Пастанова СНК СССР «О подготовке научных и научно-педагогических работников», якая змяніла парадак залічэння ў аспірантуру і навучання аспірантаў, і Пастанова «Об ученых степенях и званиях», згодна з якой уводзіліся вучоныя ступені кандыдата і доктара навук і вучоныя званні асістэнта або малодшага навуковага супрацоўніка, прафесара або дзеючага члена навукова-даследчай установы.

## 1935 год

Пастановай СНК БССР прафесару М. М. Нікольскаму прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

## 1936 год

**23 чэрвеня.** Прынята Пастанова ЦК УКП(б) і СНК СССР «О работе высших учебных заведений и руководстве высшей школой», якая вызначыла асноўныя формы вучэбнай работы ў вышэйшых навучальных установах: лекцыі, семінарскія заняткі, вытворчая практыка. Замест абароны дыпломных работ уведзены дзяржаўныя экзамены.

## 1937 год

Навуковая распрацоўка праблем грамадзянскага права і працэсу, працоўнага права і іншых грамадзянска-прававых дысцыплін праходзіла на кафедры грамадзянскага права, якой да 1937 г. кіраваў акадэмік АН БССР М. В. Грэдзінгер, а ў 1937–1941 гг. – *дацэнт А. Н. Юрашкевіч, які ў 1937 г. стаў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута*.

## 1938 год

**25 верасня.** На савеце Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута зацверджаны Устаў Мінскага юрыдычнага інстытута.

**Восень.** Адбылася першая Усесаюзная нарада навуковых работнікаў права, на якой былі прааналізаваны погляды на паняцце права: замест сістэмы адносін або праваадносін яно пачало разглядацца як сукупнасць або сістэма юрыдычных нормаў.

*Дырэктарам Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута прызначаны дацэнт Міхаіл Н. Цвяткоў.* У гэтым жа годзе *дырэктарам названага інстытута прызначаны прафесар А. М. Штэйнгарт.*

## 1939 год

У Беларускім дзяржаўным інстытуце дзейнічае некалькі абаронных гурткоў.

## 1940 год

Прынята Пастанова СНК СССР «О мероприятиях по выполнению Постановления Совнаркома СССР об установлениии платности обучения в высших учебных заведениях и об изменении порядка назначения стипендий студентам».

## 1941 год

**18 лютага.** Адбылася калегія НКЮ БССР па пытанні «Аб падрыхтоўцы да новага набору ў юрыдычныя вучэбныя ўстановы Беларусі». Калегія заслухала і абмеркавала даклады дырэктара Мінскага юрыдычнага інстытута А. М. Штэйнгарта і дырэктара юрыдычнай школы І. І. Гарэліка па падрыхтоўцы да новага набору студэнтаў на 1941/1942 навучальны год. Ім было прапанавана звярнуць увагу не толькі на колькаснае выкананне плана прыёму, але і на якасны састаў абітурыентаў.

**Чэрвень – снежань.** Вайна прыпыніла дзейнасць Мінскага юрыдычнага інстытута. Нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яго вучэбны корпус. Былі разбураны студэнцкія інтэрнаты і жылыя дамы навуковых супрацоўнікаў, у Германію вывезлі бібліятэку і вучэбнае абсталяванне.

**Ліпень – жнівень.** У Мінску арганізавана і дзейнічае падпольная патрыятычная антыфашысцкая група выкладчыкаў і студэнтаў Мінскага юрыдычнага інстытута пад кіраўніцтвам яго выпускніцы – выкладчыка інстытута М. Б. Осіпавай. Явачная кватэра – студэнцкі інтэрнат па вул. Заслаўскай, 33.

## 1942 год

**22 лютага.** Дацэнт кафедры крымінальнага працэсу Мінскага юрыдычнага інстытута член падпольнай групы М. Б. Осіпавай А. Сакалова замучана ў турме і расстраляна фашыстамі.

**17 красавіка.** Смяротна паранены ўдзельнік Мінскага падполля студэнт трэцяга курса Мінскага юрыдычнага інстытута В. Жудро. Ён памер 20 красавіка.

## 1943 год

**22 верасня.** У выніку выбуху міны, перададзенай М. Б. Осіпавай А. Г. Мазанік, у акупаванай Беларусі знішчаны гаўляйтэр В. Кубе – нацысцкі генеральны камісар.

## 1944 год

**20 верасня.** Прынята Пастанова СНК БССР «О возобновлении деятельности Белорусского юридического института в г. Минске».

**11 снежня**. Мінскі юрыдычны інстытут прыступіў да заняткаў у складзе трох першых курсаў. На першы курс было прынята 150 чалавек, а на другі і трэці курсы – былыя студэнты інстытута (на другі – 183, на трэці – 16).

*Дырэктарам Мінскага юрыдычнага інстытута ў 1944–1945 гг. з'яўляўся кандыдат юрыдычных навук дацэнт Іосіф Сямёнавіч Андрэйчык.*

## 1945 год

**4 лістапада**. *Дырэктарам Мінскага юрыдычнага інстытута прызначаны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Гаўрыла Аляксеевіч Павецьеў.*

## 1946 год

У Мінскім юрыдычным інстытуце адкрыта аспірантура. Членам-карэспандэнтам АН СССР выбраны М. М. Нікольскі.

У 1945/1946 навучальным годзе 60 студэнтаў Мінскага юрыдычнага інстытута са 187 з'яўляюцца ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, у 1946/1947 – 204 з 506, у 1947/1948 – 253 з 675, у 1948/1949 – 273 з 794 і на 1 красавіка 1949 г. – 265 з 766.

Студэнты Мінскага юрыдычнага інстытута выступілі ініцыятарамі патрыятычнага праекта – узнаўлення разбураных вучэбнага корпуса па вул. Акадэмічнай, 4 і інтэрната па вул. Кірава, 56-а.

## 1947 год

Адноўлены інтэрнат студэнтаў і навуковых работнікаў па вул. Кірава, 56-а.

## 1948 год

**Жнівень.** Адноўлены вучэбны корпус Мінскага юрыдычнага інстытута па вул. Акадэмічнай, 4.

## 1949 год

**Сакавік.** Кіраўніком Навуковага студэнцкага таварыства Мінскага юрыдычнага інстытута вучоным саветам інстытута зацверджаны кандыдат юрыдычных навук М. Н. Меркушаў. У склад Навуковага студэнцкага таварыства ўваходзяць 63 чалавекі.

## 1950 год

**18 жніўня**. Дазволена вучэбная работа па сумяшчальніцтве ў Мінскім юрыдычным інстытуце: Намесніку Пракурора БССР П. М. Пракудовічу – на кафедры крымінальнага права, Намесніку Старшыні Вярхоўнага Суда БССР С. Ц. Шардыку – на кафедры грамадзянскага права, загадчыку аддзялення 2-й клінічнай бальніцы В. І. Альшэўскай – на кафедры крымінальнага працэсу, дацэнту Мінскага педагагічнага інстытута П. М. Кірушыну – на кафедры асноў марксізму-ленінізму (чытаў курс логікі), начальніку следчага аддзела Пракуратуры БССР І. М. Зыкаву – на кафедры крымінальнага працэсу.

## 1951 год



У Мінскім юрыдычным інстытуце адкрыта завочнае аддзяленне.

## 1952 год

Штатнымі супрацоўнікамі Мінскага юрыдычнага інстытута залічаны: С. Р. Драбязка – старшым выкладчыкам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, П. К. Еўдакімаў – выкладчыкам кафедры крымінальнага права, Н. А. Кудзінаў – выкладчыкам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, В. Ф. Чыгір – выкладчыкам кафедры грамадзянска-прававвых дысцыплін. Выкладчыкам кафедры крымінальнага працэсу 15 снежня зацверджана І. І. Марціновіч.

## 1953 год

Дырэктар Мінскага юрыдычнага інстытута Г. А. Павецьеў узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць».

## 1954 год

**Кастрычнік.** Выдадзены Загад па Міністэрстве вышэйшай адукацыі СССР *«О реорганизации Минского юридического института в юридический факультет Белорусского государственного университета».*

На дзённым аддзяленні юрыдычнага факультэта БДУ навучаецца 950 студэнтаў, на завочным – 700. На факультэце дзейнічаюць чатыры кафедры: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, дзяржаўнага і міжнароднага права, грамадскіх прававых дысцыплін, крымінальнага права і крымінальнага працэсу.

**2 лістапада.** Пастановай Савета Міністраў СССР Г. А. Павецьеў вызвалены ад пасады дырэктара Мінскага юрыдычнага інстытута ў сувязі з яго рэарганізацыяй.

*Дэканам юрыдычнага факультэта прызначаны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Яўген Міхайлавіч Семярыхін.*

## 1955 год

На юрыдычным факультэце навучаюцца 305 студэнтаў: на першым курсе – 53, на другім – 91, на трэцім – 75, на чацвёртым – 86 і на пятым курсе студэнтаў не было.

## 1956 год

*Дэканам юрыдычнага факультэта прызначаны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Васіль Аляксандравіч Дарогін.*

**30 чэрвеня.** Зборная каманда краіны, у складзе якой выступала студэнтка юрыдычнага факультэта В. Кошалева, устанавіла сусветны рэкорд на першынстве СССР у эстафетным бегу 4/100. У складзе зборнай каманды краіны яна ўдзельнічала ў XVI Алімпійскіх гульнях.

## 1957 год

**27 жніўня.** *Дэканам юрыдычнага факультэта прызначаны Мадэст Мікалаевіч Меркушаў.*

**Верасень.** Абавязкі дэкана выконвае Язэп Аляксандравіч Юхо.

**16 лістапада.** За выдатныя спартыўныя дасягненні студэнтка юрыдычнага факультэта В. Кошалева ўзнагароджана медалём «За працоўную доблесць».

## 1958 год

Вучэбны працэс на юрыдычным факультэце ажыццяўлялі тры спецыяльныя кафедры: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права і працэсу.

*Дэканам юрыдычнага факультэта стаў кандыдат юрыдычных навук дацэнт Яўген Міхайлавіч Семярыхін.*

## 1959 год

**6 сакавіка.** Загадам рэктара ўніверсітэта ўпершыню на юрыдычным факультэце створаны вучоны савет. Акрамя навуковых работнікаў факультэта, у яго ўвайшлі прадстаўнікі ведамстваў і АН БССР (усяго 26 членаў): Пракурор БССР А. Г. Бондар, Старшыня Вярхоўнага Суда БССР С. Ц. Шардыка, Міністр юстыцыі БССР І. Д. Ветраў, загадчык сектарам права АН СССР С. П. Маргунскі.

*Дэканам факультэта абраны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Васіль Аляксандравіч Дарогін.*

## 1960 год

**6 чэрвеня.** Рашэннем ВАК БССР А. В. Дулаў зацверджаны ў вучоным званні дацэнта па кафедры крымінальнага права і працэсу.

## 1961 год

**21 сакавіка.** Саветам Міністраў СССР зацверджана палажэнне аб вышэйшых вучэбных установах, згодна з якім удакладнена структура, арганізацыя вучэбнай і навукова-даследчай работы, а таксама ўведзена выбарнасць дэканаў факультэта.

**11 кастрычніка.** Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР В. А. Дарогіна.

## 1962 год

**Чэрвень.** Адбылося сумеснае пасяджэнне кафедры грамадзянскага права і працэсу з рабочай групай юрыдычнай камісіі пры Савеце Міністраў БССР па падрыхтоўцы праектаў Грамадзянскага і Грамадзянскага працэсуальнага кодэксаў БССР. У пасяджэнні ўдзельнічалі прадстаўнікі прававога аддзела Савета Міністраў БССР, Пракуратуры БССР і Вярхоўнага Суда БССР.

## 1963 год

**Май – чэрвень.** Дацэнты В. Ф. Чыгір, Ф. І. Гаўзэ, С. В. Курылёў і І. А. Юхо прымаюць удзел у дапрацоўцы праектаў Грамадзянскага і Грамадзянскага працэсуальнага кодэксаў БССР. Яны накіраваны ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР для абмеркавання артыкулаў праектаў Грамадзянскага і Грамадзянскага працэсуальнага кодэксаў БССР.

Створана вучэбная лабараторыя заканадаўства. Яе першы загадчык – Леанарда Адольфаўна Андрэева.

Абаронена доктарская дысертацыя: Ф. І. Гаўзэ «Социалистический гражданско-правовой договор».

## 1964 год

*Дэканам юрыдычнага факультэта прызначаны доктар гістарычных навук прафесар Іларыён Мяфодзьевіч Ігнаценка.*

**18 красавіка.** На юрыдычным факультэце створаны грамадскі Савет прававой дапамогі насельніцтву, у якім актыўна працавалі студэнты. На працягу 1964/1965 навучальнага года яны далі больш за 200 кансультацый па розных прававых пытаннях, з якімі звярталіся грамадзяне.

Абаронена доктарская дысертацыя: А. В. Дулаў «Процессуальные проблемы судебной экспертизы».

## 1965 год

**9 студзеня.** Рашэннем ВАК БССР А. В. Дулаву прысвоена навуковая ступень доктара юрыдычных навук.

*Дэканам юрыдычнага факультэта абраны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Васіль Адамавіч Шкурко.*

**5 сакавіка.** Рэарганізаваны дзве кафедры – тэорыі і гісторыі дзяржавы і права і крымінальнага права і працэсу.

На факультэце дзейнічае шэсць кафедр: тэорыі дзяржавы і права, гісторыі дзяржавы і права, дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права, а таксама крымінальнага працэсу і крыміналістыкі.

Абаронена доктарская дысертацыя: І. І. Гарэлік «Преступления, опасные для жизни и здоровья».

## 1966 год

На работу ў Пракуратуру БССР накіраваны 19 студэнтаў дзённага аддзялення, у Міністэрства аховы грамадскага парадку – 19, у судовыя органы – 3, у Камісію пры Савеце Міністраў БССР – 6 студэнтаў.

**10 снежня.** Прынята Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «О мерах по улучшению работы следственного аппарата органов прокуратуры и охраны общественного порядка».

## 1967 год

Абаронены доктарскія дысертацыі: М. М. Авакаў «Правопреемство государств, возникших в результате социальных революций и национально-освободительной борьбы» і С. В. Курылёў «Установление истины в советском правосудии».

## 1968 год

Абаронены доктарскія дысертацыі: І. І. Марціновіч «Развитие суда и уголовно-процессуальных форм судебной деятельности в БССР» і М. Р. Юркевіч «Брак и его правовое регулирование в СССР».

## 1969 год

**9 верасня.** Савет юрыдычнага факультэта прыняў рашэнне арганізаваць на факультэце метадычную камісію.

Абаронены доктарскія дысертацыі: Л. В. Багрый-Шахматаў «Система наказаний по советскому уголовному праву, их классификация и правовое регулирование», С. Р. Драбязка «Эффективность законодательства в создании материально-технической базы коммунизма» і І. С. Цішкевіч «Оборона от общественно опасного посягательства и меры по задержанию преступника».

## 1970 год

**20 сакавіка.** Загадам Міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі зацверджаны новы састаў савета ўніверсітэта па прысуджэнні вучоных ступеней па юрыдычных навуках.

Абаронены доктарскія дысертацыі: С. Р. Віхараў «Суверенитет советских союзных республик в свете ленинской национальной политики КПСС», С. П. Маргунскі «Создание и развитие белорусской государственности (1917–1925 гг.)», Г. Г. Цернавая «Политическая организация США (общественные институты и их взаимодействие с государством). Политико-юридическое исследование» і В. Ф. Чыгір «Жилищное правоотношение».

## 1971 год

**29 кастрычніка.** Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. С. Цішкевічу і В. Ф. Чыгіру прысвоена ганаровае званне заслужанага юрыста БССР.

## 1972 год

Кафедра крымінальнага працэсу і крыміналістыкі рэарганізавана, і створаны дзве асобныя: кафедра крымінальнага працэсу і кафедра крыміналістыкі.

Абаронена доктарская дысертацыя: А. А. Галаўко «Организационно-правовые проблемы в деятельности Советов по руководству колхозным строительством (по материалам Белорусской ССР)».

## 1973 год

*Дэканам факультэта абраны доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст БССР Васіль Фёдаравіч Чыгір.*

**Чэрвень.** С. Р. Драбязка прызначаны загадчыкам кафедры тэорыі дзяржавы і права.

## 1974 год

Загадам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР кафедра тэорыі дзяржавы і права пераўтворана ў кафедру тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

## 1975 год

Выдадзена сем манаграфій і пяць падручнікаў. У манаграфіях прадстаўлены прапановы па ўдасканаленні савецкага заканадаўства, практыкі яго прымянення і дзейнасці дзяржаўнага апарата.

## 1976 год

**24 ліпеня.** На чэмпіянаце СССР у Кіеве студэнтка юрыдычнага факультэта Т. Бойка заваявала званне чэмпіёнкі краіны па прыжках у вышыню. У складзе

зборнай каманды СССР па лёгкай атлетыцы яна ўдзельнічала ў XXI Алімпійскіх гульнях.

## 1977 год

**25 лютага.** На зімовым першынстве СССР па лёгкай атлетыцы ў Мінску студэнтка юрыдычнага факультэта Т. Бойка заваявала званне чэмпіёнкі краіны па прыжках у вышыню.

**26 жніўня.** На Сусветнай студэнцкай універсіядзе ў Сафіі студэнтка юрыдычнага факультэта Т. Бойка заняла 3-е месца па прыжках у вышыню.

**5 кастрычніка.** На факультэце ўведзена спецыялізацыя «советское право».

**24 лістапада.** На факультэце адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі, прысвечанай памяці 13 студэнтаў і выкладчыкаў Мінскага юрыдычнага інстытута, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**1977/1978 навучальны год.** На факультэце выдадзена 16 манаграфій.

## 1978 год

**1978/1979 навучальны год.** На факультэце выдадзены падручнікі і практыкумы з грыфам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР: «Уголовное право БССР. Общая часть» пад рэд. І. І. Гарэліка, «Уголовное право БССР. Особенная часть» пад рэд. І. С. Цішкевіча, «Гражданское право БССР» т. 3; пад рэд. В. Ф. Чыгіра, «Судебная фотография» і «Практикум по следственной практике» А. В. Дулава.

Студэнцкая група «Поиск» устанавіла імёны 15 невядомых герояў юрыдычнага факультэта (Мінскага юрыдычнага інстытута) – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Абаронена доктарская дысертацыя: М. В. Сторажаў «Правовое положение колхозов в СССР на современном этапе (внутрихозяйственные аспекты)».

## 1979 год

Пачала работу школа «Юны юрыст» пры Палацы культуры чыгуначнікаў, якую арганізавалі выкладчыкі і студэнты юрыдычнага факультэта.

Па выніках 1979 г. юрыдычны факультэт заняў першае месца сярод гуманітарных факультэтаў універсітэта.

## 1980 год

Абаронена доктарская дысертацыя: І. А. Юхо «Общественно-политический строй и право Белоруссии в XVI веке».

## 1981 год

**17 чэрвеня.** За дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў X пяцігодкі па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў дэкана юрыдычнага факультэта прафесара В. Ф. Чыгіра ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Абаронена доктарская дысертацыя: М. Г. Проніна «Обеспечение исполнения норм обязательственного права».

## 1982 год

**21 студзеня.** Ганаровае званне заслужанага работніка вышэйшай школы БССР прысвоена І. І. Марціновіч.

Абаронена доктарская дысертацыя: У. П. Сярэбранікаў «Праблемы канстытуцыйнага права сучаснай Францыі (аналіз дзяржаўна-прававых інстытутаў V Рэспублікі 1958–1982 гг.»).

## 1983 год

**Лістапад.** У Свярдлоўску адбыўся трэці тур Усесаюзнай алімпіяды па правазнаўстве «Студент и научно-технический прогресс». У камандным заліку зборная БССР заняла 1-е месца. У выніку правядзення конкурсу студэнт чацвёртага курса І. Ждановіч заняў 2-е месца ў краіне, а А. Самойлаў – 3-е месца.

Па развіцці фізкультуры і спорту факультэт другі год займае 1-е месца ва ўніверсітэце.

*Дэканам юрыдычнага факультэта абраны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Валерый Гур'евіч Ціхіня.*

## 1984 год

Студэнт першага курса юрыдычнага факультэта К. Маджыдаў на чэмпіянаце Еўропы ў Швецыі заняў 1-е месца па грэка-рымскай барацьбе.

**Ліпень.** Пераможца міжнародных спаборніцтваў «Дружба-84» К. Маджыдаў атрымаў ганаровае званне заслужанага майстра спорту СССР.

Абаронены доктарскія дысертацыі: В. Г. Ціхіня «Тэарэтычныя праблемы прымянення дадзеных крыміналістыкі ў грамадзянскім судаводстве» і В. М. Шпілёў «Сутнасць, змест і формы савецкага крымінальнага судаводства».

## 1985 год

Студэнт другога курса юрыдычнага факультэта К. Маджыдаў на чэмпіянаце Еўропы ў Лейпцыгу заняў 1-е месца па грэка-рымскай барацьбе.

## 1986 год

**5 мая.** Адкрыты музей гісторыі юрыдычнага факультэта БДУ.

**31 жніўня.** Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за актыўны ўдзел у студэнцкіх будаўнічых атрадах медалём «За трудовую доблесть» узнагароджаны намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ І. Р. Вярэнчыкаў.

**9 кастрычніка.** Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны В. Г. Ціхіня.

Студэнт трэцяга курса юрыдычнага факультэта К. Маджыдаў стаў чэмпіёнам свету па грэка-рымскай барацьбе (Будапешт, Венгрыя).

Абаронена доктарская дысертацыя: А. М. Абрамовіч «Организационно-правовые проблемы государственного управления строительством в СССР».

## 1987 год

**Сакавік.** Па выніках вытворчай практыкі студэнтаў на факультэце праведзена канферэнцыя, дзе заслуханы і абмеркаваны даклады і паведамленні

па актуальных пытаннях дзеючага закандаўства, зробленыя на аснове абагульнення пракурорскай і судовай практыкі па грамадзянскіх і крымінальных справах.

## 1988 год

Студэнт чацвёртага курса юрыдычнага факультэта К. Маджыдаў стаў чэмпіёнам свету і чэмпіёнам Алімпійскіх гульняў у Сеуле па класічнай барацьбе.

Абаронена доктарская дысертацыя: А. Ц. Лейзераў «Теоретические проблемы совершенствования демократических начал в формировании и деятельности местных Советов депутатов (социально-правовой аспект)».

## 1989 год

Адкрыты і пачалі дзейнічаць восем філіялаў кафедр юрыдычнага факультэта:

– крымінальнага права – у Вярхоўным Судзе БССР;

– грамадзянскага і сямейнага права – у Дзяржаўным арбітражы БССР;

– крымінальнага працэсу – у Мінскім судзе і пракуратуры г. Мінска;

– грамадзянскага працэсу і сямейнага права – у Вярхоўным Судзе і Пракуратуры БССР;

– крыміналістыкі – у Міністэрстве ўнутраных спраў БССР і навукова-даследчым інстытуце судовай экспертызы Міністэрства юстыцыі БССР.

Студэнт пятага курса юрыдычнага факультэта К. Маджыдаў стаў чэмпіёнам свету па грэка-рымскай барацьбе (Марціні, Швейцарыя).

Падрыхтавана выданне: Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1989. 573 с.

**16 лістапада.** У Маскве пачаў работу Усесаюзны студэнцкі форум. Студэнтаў БДУ на ім прадставіў студэнт юрыдычнага факультэта У. Хвалей.

*Дэканам юрыдычнага факультэта абраны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Валерый Мікалаевіч Гадуноў.*

Абаронена доктарская дысертацыя: А. І. Бабылёў «Проблема правового регулирования социального развития трудовых коллективов колхозов (внутриколхозный аспект)».

## 1990 год

На ўмовах пагадзіннай аплаты працы на юрыдычным факультэце працуюць 24 выкладчыкі, сярод якіх вучоныя АН БССР і вышэйшых навучальных устаноў Мінска: члены-карэспандэнты АН БССР В. І. Семянкоў, М. В. Старажаў, В. І. Шабайлаў, прафесар Н. Н. Мітрохін (МУС СССР), П. А. Вадап’янаў; члены Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь І. В. Лобач, І. К. Пташнік (быў прызначаны на пасаду Суддзі Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь 23 студзеня 1997 г.); старшыня Мінскага гарадскога суда М. М. Ардзяка, Намеснік Пракурора БССР І. Ф. Сашчэка, намеснік Міністра юстыцыі БССР Л. А. Дашук і інш.

Студэнт трэцяга курса юрыдычнага факультэта С. Демяшкевіч стаў чэмпіёнам свету па грэка-рымскай барацьбе (Рым, Італія).

На юрыдычным факультэце адкрыта новая (восьмая) кафедра экалагічнага і сельскагаспадарчага права. Загадчык кафедры – прафесар А. І. Бабылёў.

Адбыўся першы набор на завочную форму навучання (другая вышэйшая адукацыя).

## 1991 год

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР званне заслужанага юрыста БССР прысвоена прафесару А. А. Галаўко.

**1991/1992 навучальны год.** Уведзена новая спецыялізацыя «міжнароднае права і прававое забеспячэнне знешнеэканамічнай дзейнасці».

Абаронены доктарскія дысертацыі: Ю. П. Броўка «Становление и развитие международной правотворческой деятельности Белорусской ССР » і Ю. І. Новік «Психологические аспекты правового регулирования».

## 1992 год

На юрыдычным факультэце ўпершыню адкрыты беларускамоўнае і рускамоўнае аддзяленні. План прыёму на беларускамоўнае аддзяленне склаў 100 чалавек (было пададзена 347 заяў, з іх 158 – медалістамі). Па выніках уступных экзаменаў на беларускамоўнае аддзяленне было залічана 112 чалавек, з іх 63 – медалісты. План прыёму на рускамоўнае аддзяленне склаў 50 чалавек (было пададзена 210 заяўленняў, з іх 86 – медалістамі). Залічана 156 чалавек, з якіх 37 – медалісты.

Выдадзены першы на беларускай мове «Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік» (пад рэд. С. В. Кузьміна і інш.).

**1992/1993 навучальны год.** На юрыдычным факультэце ўведзена новая спецыялізацыя «падаткавае і банкаўскае права».

## 1993 год

Абаронена доктарская дысертацыя: А. Г. Цікавенка «Теоретические проблемы авторитета государственной власти».

## 1994 год

**14 красавіка.** Прафесар М. Р. Юркевіч прызначаны старшынёй Міжнароднага Суда пры БелГПП.

Кафедра паліталогіі і студэнты, якія навучаюцца па спецыяльнасці «паліталогія», пераведзены на юрыдычны факультэт БДУ.

**31 кастрычніка.** Вучоны савет БДУ прысудзіў прэмію імя У. І. Пічэты доктару юрыдычных навук прафесару І. А. Юхо за сукупнасць работ па гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Абаронена доктарская дысертацыя: Р. А. Васілевіч «Проблемы законотворческой деятельности Верховного Совета Республики Беларусь».

## 1995 год

Агульная колькасць навуковых публікацый, падрыхтаваных выкладчыкамі і вучонымі юрыдычнага факультэта ў 1995 г., склала 145 найменняў.

Абаронена доктарская дысертацыя: С. В. Рашэтнікаў «Анализ процесса принятия политических решений в политической науке США (функционально-динамический аспект)».

## 1996 год

**Люты.** Створана вучэбная лабараторыя інфарматыкі і тэхнічных сродкаў навучання.

Студэнт трэцяга курса юрыдычнага факультэта С. Ліштван стаў чэмпіёнам Еўропы па грэка-рымскай барацьбе (Будапешт, Венгрыя) і сярэбраным прызёрам Алімпійскіх гульняў (Атланта, ЗША).

Абаронена доктарская дысертацыя: В. М. Бібіла «Социально-правовые основы правосудия по уголовным делам».

## 1997 год

Абаронены доктарскія дысертацыі: Д. М. Дземічаў «Государственно-правовые проблемы преодоления последствий Чернобыльской катастрофы (по материалам Республики Беларусь 1986–1996 гг.)», Т. І. Доўнар «Развіццё агульназемскага права Беларусі ў XV–XVI стагоддзях» і У. М. Хоміч «Тэарэтычныя праблемы крымінальнай адказнасці (канцэпцыя і юрыдычная мадэль інстытута крымінальнай адказнасці)».

## 1998 год

**30 чэрвеня.** Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіч прызначаны загадчыкам кафедры канстытуцыйнага права.

**25 верасня.** В. М. Гадуноў прызначаны выконваючым абавязкі дырэктара Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ.

Прыняты Грамадзянскі і Грамадзянскі працэсуальны кодэксы Рэспублікі Беларусь.

## 1999 год

Па ініцыятыве студэнтаў і выкладчыкаў адбылося ўрачыстае святкаванне Дня юрыдычнага факультэта БДУ ў Палацы культуры чыгуначнікаў. Юрыдычны факультэт адзначыў сваё 74-годдзе.

## 2000 год

На юрыдычным факультэце адкрыта спецыяльнасць «эканамічнае права».

Утворана Юрыдычная клініка БДУ, у якой студэнты набывалі практычныя навыкі па аказанні юрыдычных паслуг малазабяспечаным і іншым сацыяльна неабароненым катэгорыям грамадзян.

Юрыдычны факультэт адсвяткаваў 75-годдзе.

Абаронена доктарская дысертацыя: Л. Я. Землякоў «Государственно-конфессиональные отношения в Республике Беларусь».

## 2001 год

**25 красавіка.** На юрыдычным факультэце праведзена 59-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў БДУ.

**16 лістапада.** На юрыдычным факультэце праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў, прысвечаная 80-годдзю БДУ, «Удасканаленне заканадаўства і правапрымянення на сучасным этапе: праблемы і перспектывы».

Абаронена доктарская дысертацыя: С. А. Балашэнка «Государственное управление в области охраны окружающей среды».

## 2002 год

**17–18 кастрычніка.** На юрыдычным факультэце праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Канстытуцыйны працэс і развіццё сістэмы грамадства».

*Дэканам юрыдычнага факультэта прызначаны доктар юрыдычных навук прафесар Сяргей Аляксандравіч Балашэнка.*

## 2003 год

**23 жніўня.** На чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы (Парыж, Францыя) студэнт юрыдычнага факультэта А. Міхневіч выйграў залаты медаль.

## 2004 год

Утворана кафедра фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці.

**Ліпень – верасень.** Выйшла першая кніга (даведачнае выданне), прысвечаная гісторыі развіцця факультэта: Юрыдычны факультэт: Гісторыя. Сучаснасць. Імёны / адк. рэд. С. А. Балашэнка. Мінск : БДУ, 2004. 134 с.

**Лістапад.** Аб'яўлена аб правядзенні 1-й Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды.

**9 снежня.** Апублікавана палажэнне аб Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіядзе – 2005.

Абаронены доктарскія дысертацыі: В. М. Гадуноў «Правовые средства обеспечения государственных нужд в товарах, работах и услугах» і В. С. Камянкоў «Правовые гарантии защиты интересов юридических лиц и граждан в хозяйственном (арбитражном) процессе».

## 2005 год

**Люты.** Упершыню на юрыдычным факультэце праведзена Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда, якая аб'яднала ўсе юрыдычныя ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь па падрыхтоўцы юрыстаў.

**30 жніўня.** Адбылося ўрачыстае адкрыццё новага корпуса юрыдычнага факультэта па вул. Ленінградскай, 8.

**Кастрычнік.** Юрыдычны факультэт адсвяткаваў 80-годдзе. Праведзена міжнародная канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў «Актуальныя праблемы правазнаўства: гісторыя і сучаснасць». У Палацы культуры чыгуначнікаў арганізаваны вечар студэнтаў і выпускнікоў. Урачыстае пасяджэнне вучонага савета і святочны канцэрт адбыліся ў Палацы Рэспублікі (Малая зала).

## 2006 год

На юрыдычным факультэце адкрыты новы камп'ютарны клас (каб. 304) і арганізавана работа буфета.

## 2007 год

**Студзень.** На базе Юрыдычнай клінікі адкрыты Цэнтр юрыдычнай клінічнай адукацыі БДУ.

На пасяджэнні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў юрыдычнага факультэта прыняты Маральна-этычны кодэкс студэнта юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**26 лютага.** Студэнтамі факультэта ўпершыню праведзены конкурс «Містар юрфак».

**Май.** Адбыўся першы гісторыка-патрыятычны злёт студэнтаў юрыдычнага факультэта на базе САК БДУ «Брыганціна», прысвечаны Дню Перамогі.

**Кастрычнік.** Створана пярвічная арганізацыя грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў».

Выйшаў у свет 1-ы том «Беларускай юрыдычнай энцыклапедыі».

## 2008 год

**29 студзеня.** Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка ўручыў дыпломы доктара навук і атэстаты прафесара 25 навуковым работнікам, сярод якіх быў прафесар С. А. Балашэнка.

**11–12 сакавіка.** Адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Беларуская дзяржаўнасць і развіццё нацыянальнай прававой сістэмы: ад Статута 1588 года да сучаснай канстытуцыі».

**19 чэрвеня.** Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка прысутнічаў пры закладцы першага каменя на будаўнічай пляцоўцы комплексу «Студэнцкая вёска». Першы корпус быў пабудаваны для студэнтаў юрыдычнага факультэта БДУ.

**12 снежня.** Арганізавана сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў з вядомым пісьменнікам М. Дуброўскім, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння выпускніцы юрыдычнага факультэта БДУ (Мінскага юрыдычнага інстытута) Героя Савецкага Саюза М. Б. Осіпавай.

Абаронена доктарская дысертацыя: Т. І. Макарава «Теоретические проблемы правового положения физических лиц в экологических отношениях».

## 2009 год

**Студзень.** Створана вучэбная лабараторыя інавацыйных тэхналогій навучання.

**Люты.** Па выніках конкурсу на найлепшую малатыражную студэнцкую газету сярод факультэцкіх выданняў БДУ газета юрыдычнага факультэта «Востраў ЮФ» заняла 1-е месца.

Праведзена 5-я Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда.

**Верасень.** Студэнтка юрыдычнага факультэта К. Санковіч заваявала сярэбраны медаль на чэмпіянаце свету па мастацкай гімнастыцы.

Студэнтка трэцяга курса юрыдычнага факультэта М. Есьман атрымала тытул першай Віцэ-Міс Міжнароднага конкурсу «Міс Інтэркантыненталь», які прайшоў у Мінску.

Выйшаў у свет 2-і том «Беларускай юрыдычнай энцыклапедыі».

Абаронена доктарская дысертацыя: Я. І. Функ «Совершенствование правовых средств производственной кооперации путем введения нового вида договора».

## 2010 год

**19 студзеня.** Адбылося ўрачыстае адкрыццё новага інтэрната БДУ № 11 з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі. Новы інтэрнат прыняў

студэнтаў юрыдычнага факультэта па адрасе прасп. Дзяржынскага, 87 («Студэнцкая вёска»).

**Красавік.** Прызам імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» ўзнагароджаны загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта, доктар юрыдычных навук, прафесар Р. А. Васілевіч.

**Май.** Да 65-годдзя Вялікай Перамогі выйшла кніга Л. П. Максімавай «Огненный выпуск», прысвечаная ветэранам юрыдычнага факультэта.

Упершыню праведзены конкурс на лепшую студэнцкую работу па тэме «Спартыўнае права ў Рэспубліцы Беларусь». У намінацыі «Лепшая студэнцкая работа» перамогу атрымаў студэнт чацвёртага курса юрыдычнага факультэта БДУ У. Клімаў.

**Кастрычнік.** Падрыхтавана юбілейнае выданне БДУ «Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года».

Адбыўся пераезд студэнтаў з інтэрната № 4 па адрасе: прасп. Пераможцаў, 9 (раней – прасп. Машэрава, вул. Паркавая магістраль).

Абаронены доктарскія дысертацыі: Н. Л. Бандарэнка «Принципы гражданского права Республики Беларусь, их реализация в нормотворческой и правоприменительной деятельности» і В. І. Чупрыс «Теоретические проблемы правового регулирования государственной службы Республики Беларусь».

## 2011 год

**18–19 сакавіка.** Праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук прафесара І. А. Юхо.

**Кастрычнік.** На рэспубліканскім чэмпіянаце па «Брэйн-рынгу» ў галіне крымінальнага права (Гродна) каманда юрыдычнага факультэта атрымала перамогу.

**Лістапад.** На форуме пярвічных арганізацый БРСМ БДУ каманда БРСМ юрыдычнага факультэта «Стань лепшым! » заняла 1-е месца.

Выйшаў у свет 3-і том «Беларускай юрыдычнай энцыклапедыі».

## 2012 год

**Сакавік.** Сайт юрыдычнага факультэта стаў пераможцам першага конкурсу сайтаў факультэтаў і структурных падраздзяленняў БДУ ў намінацыі «Факультэты і падраздзяленні».

**Красавік.** Прызам імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» ўзнагароджаны дэкан юрыдычнага факультэта, доктар юрыдычных навук, прафесар С. А. Балашэнка.

Каманда студэнтаў юрыдычнага факультэта атрымала перамогу ў І Рэспубліканскім конкурсе па працоўным праве і працэсе.

**Жнівень.** Студэнтка чацвёртага курса К. Санковіч заваявала сярэбраны медаль па мастацкай гімнастыцы на ХХХ Алімпійскіх гульнях.

**Кастрычнік.** Праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь С. Р. Драбязкі.

Абаронена доктарская дысертацыя: Н. А. Карповіч «Теоретические проблемы реализации экологической функции государства».

## 2013 год

**Люты.** Дэкан юрыдычнага факультэта БДУ С. А. Балашэнка ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Сайт юрыдычнага факультэта стаў пераможцам конкурсу сайтаў факультэтаў і структурных падраздзяленняў БДУ у намінацыі «Падраздзяленні, якія вядуць сайты з найлепшай дынамікай».

Выйшаў у свет 4-ы том «Беларускай юрыдычнай энцыклапедыі».

## 2014 год

Газета «Востраў ЮФ» прызнана найлепшай студэнцкай малатыражнай газетай БДУ 2013 г.

Праведзена юбілейная 10-я Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда. Зацверджаны новы Парадак правядзення алімпіяды, а таксама лагатып і дэвіз алімпіяды – «Твой крок да поспеху».

**Май.** Прызам імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» ўзнагароджана прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, доктар юрыдычных навук, прафесар Т. І. Доўнар.

Абаронена доктарская дысертацыя: А. Я. Гучок «Криминалистическое учение о материальной структуре преступления».

## 2015 год

**Красавік.** Загадам рэктара БДУ створана кафедра дзяржаўнага кіравання. Першым яе загадчыкам прызначана доктар юрыдычных навук прафесар В. І. Чупрыс.

**16 мая.** Праведзены спартыўна-патрыятычны злёт на базе САК БДУ «Брыганціна» ў гонар 70-годдзя Вялікай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Чэрвень.** Першакурсніца юрыдычнага факультэта БДУ А. Амялюсік заваявала залаты медаль у жаночай групавой гонцы на Еўрапейскіх гульнях (Баку, Азербайджан).

**28 жніўня.** Створана каардынацыйная група студэнцкага актыву юрыдычнага факультэта.

**Кастрычнік.** Юрыдычны факультэт урачыста адсвяткаваў сваё 90-годдзе. Прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Тэарэтыка-метадалагічныя і канстытуцыйныя асновы ўстойлівага развіцця нацыянальнай прававой сістэмы ва ўмовах глабальных і рэгіянальных працэсаў у кантэксце абароны праў чалавека і пабудовы прававой дзяржавы».

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам 19 кастрычніка 2015 г. накіраваны віншавальны адрас прафесарска-выкладчыцкаму калектыву і супрацоўнікам юрыдычнага факультэта БДУ ў сувязі з 90-годдзем з дня заснавання.

Святочны канцэрт, прысвечаны 90-годдзю юрыдычнага факультэта, адбыўся ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Заключана Пагадненне аб супрацоўніцтве юрыдычнага факультэта БДУ з Міжнародным саюзам крыміналістаў і крымінолагаў. Кіраўніком беларускага прадстаўніцтва міжнароднага аб'яднання «Саюз крыміналістаў і крымінолагаў»

абраны намеснік дэкана юрыдычнага факультэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт А. В. Шыдлоўскі.

Абаронена доктарская дысертацыя: І. А. Грунтоў «Принцип личной виновной ответственности в уголовном законодательстве».

### 2016 год

**Красавік.** Прызам імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» ўзнагароджаны намеснік дэкана па вучэбна-выхаваўчай рабоце, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт А. В. Шыдлоўскі; у намінацыі «Гаспадарка і права» – старшы выкладчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права Ц. В. Сысуеў.

Каманда студэнтаў юрыдычнага факультэта стала пераможцам V Рэспубліканскага конкурсу па працоўным праве і працэсе імя В. І. Семянкова.

**Ліпень.** Загадчык кафедры канстытуцыйнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіч узнагароджаны нагрудным знакам «Ганаровы пракурор краін СНД».

**Жнівень.** На XXXI Алімпійскіх гульнях студэнт юрыдычнага факультэта Д. Гамзатаў стаў бронзавым прызёрам у грэка-рымскай барацьбе.

**Верасень.** Студэнт юрыдычнага факультэта І. Бокі на Паралімпійскіх гульнях 2016 г. (Рыа-дэ-Жанэйра, Бразілія) выйграў шэсць залатых і адзін бронзавы медалі.

**Лістапад.** Каманда юрыдычнага факультэта атрымала абсалютную перамогу ў студэнцкім футбольным турніры «International BSU-CUP».

### 2017 год

**Люты.** Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» прысвоена доктару юрыдычных навук, прафесару, загадчыку кафедры грамадзянскага права, дырэктару Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ В. М. Гадунову.

**Май.** Прызам імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» ўзнагароджаны аўтарскі калектыў: дэкан юрыдычнага факультэта, загадчык кафедры экалагічнага і аграрнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар С. А. Балашэнка, прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар Т. І. Макарава і кандыдат юрыдычных навук дацэнт В. Я. Лізгара.

**16 лістапада.** Загадчык кафедры канстытуцыйнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіч абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі.

Абаронена доктарская дысертацыя: А. Л. Савенок «Теоретические и прикладные проблемы эффективности уголовного закона».

### 2018 год

**Люты.** Арганізавана сустрэча студэнтаў юрыдычнага факультэта БДУ са Старшынёй Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Л. М. Ярмошынай.

**Сакавік.** Студэнцкім актывам арганізаваны «Прававы інтэлектуальны квіз», у якім прынялі ўдзел 13 каманд з 9 вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь. Першае месца заняла каманда юрыдычнага факультэта БДУ.

**Май.** Прызам імя У. Д. Спасовіча ў намінацыі «Навука і права» ўзнагароджаны дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт І. С. Шахрай, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права Н. А. Шынгель і дацэнт кафедры канстытуцыйнага права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт С. Р. Васілевіч.

**Лістапад.** Аўтарскаму калектыву кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду – А. А. Данілевічу, В. В. Пятровай і В. І. Самарыну – прысуджана прэмія імя У. І. Пічэты.

**Снежань.** Па выніках штогадовай спартакіяды БДУ юрыдычны факультэт у 15-ы раз заняў 1-е месца.

Абаронена доктарская дысертацыя: Н. А. Антановіч «Тэорыя і метады аналізу дзяржаўнага кіравання ў палітычнай навуцы».

## 2019 год

**Сакавік.** Праведзена 15-я Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда.

**24–25 мая.** Адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь А. М. Абрамовіча.

**25 кастрычніка.** Арганізавана міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь А. В. Дулава.

**5 лістапада.** Адбыўся міжнародны круглы стол, прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь В. Ф. Чыгіра.

Абаронена доктарская дысертацыя: А. М. Здрок «Примирительные процедуры в цивилистическом процессе».

## 2020 год

**Сакавік.** *Дэканам юрыдычнага факультэта прызначана кандыдат юрыдычных навук дацэнт Таццяна Мікалаеўна Міхалёва.*

Адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 95-годдзю юрыдычнага факультэта БДУ.

## 2021 год

**19–20 сакавіка.** Праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук прафесара І. А. Юхо.

**8 верасня.** *Дэканам юрыдычнага факультэта прызначаны кандыдат юрыдычных навук дацэнт Андрэй Віктаравіч Шыдлоўскі.*

**Кастрычнік.** Да 100-годдзя БДУ на ўрачыстым пасяджэнні савета ўніверсітэта ордэнам Пашаны ўзнагароджаны загадчык кафедры канстытуцыйнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіч; медалём Францыска Скарыны – загадчык кафедры экалагічнага і аграрнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар Т. І. Макарава; Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – загадчык кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, кан-

дыдат юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь А. А. Данілевіч.

Работнікам юрыдычнага факультэта на ўрачыстым пасяджэнні савета факультэта ўручаны юбілейныя медалі «100 год БДУ».

**21 снежня.** На базе юрыдычнага факультэта арганізаваны І Рэспубліканскі прававы турнір «Сіла закона», у якім прынялі ўдзел навучэнцы ўстаноў сярэдняй адукацыі (школ, гімназій, ліцэяў) Рэспублікі Беларусь.

## 2022 год

**Студзень – люты.** Вучоныя юрыдычнага факультэта – загадчык кафедры канстытуцыйнага права, доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіч і дацэнт кафедры канстытуцыйнага права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Т. С. Маслоўская – прынялі ўдзел у рабоце Канстытуцыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

**Май – ліпень.** Упершыню адбыўся прыём абітурыентаў для атрымання вышэйшай адукацыі на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі для Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь. У склад студэнтаў увайшлі па 3–4 прадстаўнікі ад кожнай вобласці і Мінска (усяго 25).

Дэкан юрыдычнага факультэта А. В. Шыдлоўскі абраны намеснікам старшыні ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў» (узначальвае камісію па пытаннях навуковай і адукацыйнай дзейнасці).

**23–24 верасня.** Праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь С. Р. Драбязкі.

## 2023 год

**Люты.** Юрыдычны факультэт сумесна з Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь стаў арганізатарам міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Белорусское правосудие: исторический опыт и современность», прысвечанай 100-годдзю Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Вучоныя факультэта – Л. Л. Голубева, І. М. Калядка, А. А. Свадкоўская, А. В. Шыдлоўскі – выступілі з пленарнымі дакладамі.

А. В. Шыдлоўскі, Л. Л. Голубева і С. А. Калінін у якасці аўтараў прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы навукова-папулярнага выдання «100 лет Верховному Суду Беларуси. Право. Закон. Справедливость».

**Сакавік.** Утвораны савет куратараў вучэбных груп БДУ. Старшынёй савета абрана загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Л. Л. Голубева.

**Красавік.** Пры падтрымцы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь створана Студэнцкая мабільная інфармацыйная група (СМІГ) па прававым выхаванні і асвеце студэнцкай і працуючай моладзі.

**28–29 лістапада.** Юрыдычны факультэт сумесна з ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў» выступіў суарганізатарам І Беларускага юрыдычнага форуму «Право в современном мире».

**Снежань.** На базе юрыдычнага факультэта праведзены ІІІ Рэспубліканскі прававы турнір «Сіла Закона», які аб'яднаў больш за 25 тысяч навучэнцаў устаноў сярэдняй адукацыі.

Абаронены доктарскія дысертацыі: М. В. Мяшчанава «Система международного частного права Республики Беларусь» і І. С. Шахрай «Теоретико-прикладные проблемы реализации субъективного права природопользования».

## 2024 год

**20–22 сакавіка.** Адбылася 20-я Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда. У камандным і індывідуальным заліках студэнты юрыдычнага факультэта БДУ сталі абсалютнымі пераможцамі і былі ўключаны ў спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы здольнай моладзі і студэнтаў.

**5–6 сакавіка.** На юрыдычным факультэце праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Белорусский конституционализм: теория и практика», прысвечаная 30-годдзю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і інстытута Прэзідэнцтва Рэспублікі Беларусь.

**24–25 мая.** Арганізавана міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь А. М. Абрамовіча.

**13 чэрвеня.** Вучоныя юрыдычнага факультэта прынялі ўдзел у конкурсе Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь «Вяршыня права». Прызам конкурсу ў намінацыі «Навука і права» за манаграфію «Дифференциация и индивидуализация лишения свободы: правовое и криминологическое обеспечение» ўзнагароджаны дэкан юрыдычнага факультэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт А. В. Шыдлоўскі. Прызам конкурсу ў намінацыі «Суд» узнагароджаны аўтарскі калектыў кнігі «Белорусское правосудие: исторический опыт и современность», прысвечанай 100-годдзю Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (пад рэд. Л. Л. Голубевай).

**5 верасня.** Юрыдычны факультэт сумесна з Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь урачыста адкрыў клас «Юны пракурор» на базе гімназіі № 38 г. Мінска імя М. А. Шугаева.

**24–25 верасня.** Праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста БССР В. Ф. Чыгіра.

**17–18 кастрычніка.** Адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 80-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара Т. І. Доўнар.

**25–26 кастрычніка.** Праведзены круглы стол з міжнародным удзелам, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь А. В. Дулава.

## 2025 год

**Сакавік.** Адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Развитие белорусской юридической науки в контексте современных идей конституционализма», прысвечаная 70-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіча.

**Май.** Студэнтамі і выкладчыкамі юрыдычнага факультэта рэалізаваны патрыятычны інтэрактыўны праект «Памяць і слава», прысвечаны 80-годдзю Вялі-

кай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: відэафільм, экспазіцыя, прэзентацыя калекцый памятных і каштоўных рэчаў ваеннага часу, выстаўка партрэтаў ветэранаў – прафесараў юрыдычнага факультэта (полк Бессмяротных).

**Кастрычнік**. Юрыдычны факультэт БДУ адзначыў сваё 100-годдзе.

Праведзены Беларускі навукова-адукацыйны кангрэс «Універсітэцкая прававая навука і юрыдычная адукацыя: да 100-годдзя юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».

У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь адбыўся ўрачысты сход і канцэрт з прэзентацыяй відэафільма, прысвечанага юрыдычнаму факультэту.

Падрыхтаваны шэраг юбілейных выданняў, прымеркаваных да векавога юбілею юрыдычнага факультэта.

Зацверджаны нагрудны знак адзнакі «За заслугі» – афіцыйны геральдычны сімвал, вышэйшая ўзнагарода юрыдычнага факультэта БДУ. Уручаецца па рашэнні Савета юрыдычнага факультэта за асобыя заслугі ў галіне юрыдычнай адукацыі, навукі і правапрымяняльнай практыкі.





# ГЕРАЛЬДЫКА І СІМВАЛЫ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА




Штандарт
юрыдычнага факультэта




Сцяг
юрыдычнага факультэта




Нагрудны значок
юрыдычнага
факультэта




Нагрудны знак «Залаты статут».
Прыняты вучоным саветам юрыдычнага
факультэта БДУ да 90-годдзя факультэта




Афіцыйныя шыльды юрыдычнага факультэта




Нагрудны знак адзнакі «За заслугі» –
афіцыйны геральдычны сімвал,
вышэйшая ўзнагарода юрыдычнага факультэта БДУ.
Заснаваны загадам рэктара БДУ ад 22.05.2025
№302-ОД на падставе заключэння Геральдычнага савета
пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь
(пратакол ад 11.04.2025 №2 (149))




 Пасведчанне да нагруднага знака адзнакі «За заслугі»



# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

*Максимова, Л. П.* Огненный выпуск. Факты. Документы / Л. П. Максимова. – Минск : Изд. Центр БГУ, 2010. – 159 с.

*Максимова, Л. П.* Юридический факультет Белорусского государственного университета. История и современность. – Минск : БГУ, 1998. – 224 с. : ил.

Юрыдычны факультэт: Гісторыя. Сучаснасць. Імёны / адк. рэд. С. А. Балашэнка. – Мінск : БДУ, 2004. – 134 с.

Юрыдычны факультэт. Гісторыя. Сучаснасць. Імёны / рэдсавет: С. А. Балашэнка (старш.) [і інш.] ; рэдкал.: С. А. Балашэнка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2015. – 263 с. : іл.



# ЗМЕСТ


ЗАРАДЖЭННЕ І СТАНАЎЛЕННЕ ЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ І НАВУКІ Ў БЕЛАРУСІ ........ 5

ВЕКАВАЯ ГІСТОРЫЯ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ........ 12

- Станаўленне ўніверсітэцкай юрыдычнай адукацыі ў даваенны час ........ 12
- Светлая памяць і слава юрыдычнага факультэта: «Вогненны» выпуск ........ 19
  - Выкладчыкі, студэнты і выпускнікі Мінскага юрыдычнага інстытута – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны ........ 19
  - Выкладчыкі юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны ........ 28
- Аднаўленне і развіццё юрыдычнага факультэта ў савецкі пасляваенны перыяд ........ 38
- Развіццё юрыдычнага факультэта ў перыяд незалежнасці Рэспублікі Беларусь (1991–2025) ........ 42
- Знакамітыя выпускнікі юрыдычнага факультэта ........ 78
  - Вядомыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы ........ 78
  - Заслужаныя дзеячы навукі і работнікі адукацыі Рэспублікі Беларусь ........ 96
  - Члены-карэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ........ 98
  - Заслужаныя юрысты Беларусі ........ 99
- Прафесары юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ........ 101
- Дэканы юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ........ 105

ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА СЁННЯ: ЮРЫДЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ І НАВУКА ........ 111

- Адукацыйны працэс на юрыдычным факультэце. Дэканат ........ 111
- Навуковыя школы юрыдычнага факультэта. Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда ........ 118
- Ідэалагічная і выхаваўчая работа на юрыдычным факультэце ........ 124

Спорт высокіх дасягненняў ........ 142
Найлепшыя спартсмены – студэнты і выпускнікі юрыдычнага факультэта ........ 147
Міжнародная дзейнасць юрыдычнага факультэта. Інтэрнацыяналізацыя адукацыі ........ 150

КАФЕДРЫ І ПАДРАЗДЗЯЛЕННІ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ........ 160
Кафедры юрыдычнага факультэта ........ 160
Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права ........ 160
Кафедра канстытуцыйнага права ........ 169
Кафедра дзяржаўнага кіравання ........ 175
Кафедра грамадзянскага права ........ 178
Кафедра гаспадарчага права ........ 187
Кафедра права інтэлектуальнай уласнасці ........ 193
Кафедра грамадзянскага працэсу і працоўнага права ........ 197
Кафедра крымінальнага права ........ 204
Кафедра крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду ........ 216
Кафедра экалагічнага і аграрнага права ........ 223
Кафедра паліталогіі ........ 229
Кафедра крыміналістыкі ........ 234
Вучэбная лабараторыя крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз кафедры крыміналістыкі ........ 240
Цэнтр адукацыйных інавацый юрыдычнага факультэта ........ 244
Юрыдычная клініка ........ 247
Бібліятэка юрыдычнага факультэта ........ 250
Музей юрыдычнага факультэта ........ 253

СУЧАСНЫ САСТАЎ ВУЧОНЫХ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ........ 263

АСНОЎНЫЯ ВЕХІ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ........ 308

ГЕРАЛЬДЫКА І СІМВАЛЫ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ........ 331

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ ........ 333

Навукова-папулярнае выданне

**ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ:**
**ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ**

**ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ**

Рэдактар *Т. С. Петрачэнка*
Мастак вокладкі *А. А. Рабкевіч*
Тэхнічны рэдактар *В. П. Явуз*
Камп'ютарная вёрстка *В. Ю. Шантаровіч, В. П. Явуз*
Карэктары *А. Г. Панчанкаў, М. А. Ракуць*

Падпісана да друку 11.09.2025. Фармат 70×100/16. Папера мелаваная.
Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 27,09. Ул.-выд. арк. 37,11.
Тыраж 150 экз. Заказ 273.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/270 ад 03.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Інфармацыйна-вылічальны цэнтр
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/41 ад 29.01.2014.
Вул. Кальварыйская, д. 17, п. 201А, 220004, Мінск